Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Інстытут культуры Беларусі»

**Алесь Шамак**

# МІФАЛОГІЯ БЕЛАРУСАЎ

Мінск
Інстытут культуры Беларусі
2013

УДК 398.5(476)(075.8)
ББК 82.3(0)(4Беи)я73
Ш19

*Выданне падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Люты

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар А. І. Мальдзіс;
дацэнт кафедры тэорыі і метадыкі выкладання мастацтва
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка,
кандыдат філалагічных навук У. В. Васілевіч

**Шамак А. А.**
Ш19 Міфалогія беларусаў / А. А. Шамак. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. — 256 с.

ISBN 978-985-7045-17-4.

У кнізе кандыдата гістарычных навук А. Шамака разглядаюцца пытанні даследавання міфалогіі беларусаў, а таксама пададзены тэксты, якія адлюстроўваюць міфічныя ўяўленні продкаў беларусаў аб будове свету, багах, духах, жывёлах.

Выданне адрасавана шырокаму колу чытачоў, можа быць выкарыстана ў практычнай дзейнасці арганізацый культуры, у адукацыйным працэсе ўстаноў сістэмы асноўнай і дадатковай адукацыі ў сферы культуры.

**УДК 398.5(476)(075.8)**
**ББК 82.3(0)(4Беи)я73**

**ISBN 978-985-7045-17-4**

© А. А. Шамак, 2013
© ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2013

## Прадмова

ЯЗЫЧНІЦКАЯ міфалогія беларусаў, адна са старажытнейшых сярод міфалогій еўрапейскіх народаў, — вынік духоўных намаганняў продкаў, аснова іх светапоглядных уяўленняў, важная частка духоўнага жыцця першабытнага і раннесярэднявечнага грамадства на тэрыторыі Беларусі.

Міфалогія беларусаў як навуковая дысцыпліна мае пэўную гісторыю развіцця. Фарміраванне яе ў рэчышчы агульнаеўрапейскай міфалагічнай школы пачалося ў XIX ст. Адбываўся гэты працэс у межах навукі Расійскай імперыі, таму ў той час яна аўтаматычна прымяркоўвалася да расійскай міфалагічнай школы. Беларускія і расійскія навукоўцы адзначалі наяўнасць значнага пласта старажытных міфічных уяўленняў у беларускага сялянства XIX ст.

У XX ст., у савецкі перыяд гісторыі Беларусі, стаўленне да міфалогіі беларусаў наогул было негатыўным, як да перажытку мінуўшчыны, а ў рэчышчы тагачаснай палітычнай савецкай сістэмы нацыянальнай міфалогіяй немагчыма было глыбока займацца. Асобныя яе элементы павярхоўна і фрагментарна разглядаліся ў межах этнаграфіі і фальклору.

Яшчэ ў 70—80-я гг. XX ст. вывучэнне беларускай міфалогіі выклікала пярэчанні ў значнай колькасці вучоных-марксістаў: яно лічылася недарэчным і нацыяналістычным. Нават у фундаментальнай працы савецкіх часоў «Мифы народов мира», якая выйшла ў двух тамах, дзе ёсць артыкулы па міфалогіі зусім дробных народаў тагачаснага СССР (абхазаў, якутаў), няма артыкулаў па міфалогіі беларусаў.

У сувязі з вышэйадзначанай сітуацыяй працэс станаўлення беларускай міфалогіі як навукі ў XIX — XX стст. праходзіў няроўна і да гэтага часу незавершаны. У вывучэнні сваёй міфалогіі беларусы прыпазніліся ў параўнанні з навукоўцамі заходнееўрапейскіх краін, дзе пытанні нацыянальнай міфалогіі ўжо добра распрацаваны.

Толькі ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст., калі Беларусь выйшла са складу СССР, на хвалі нацыянальнага адраджэння вывучэнне міфалогіі беларусаў пачало набываць пэўную дынаміку, навуковую акрэсленасць, пашырылася праблематыка.

У XIX — XX стст. навукоўцы Беларусі сабралі надзвычай багаты і разнастайны матэрыял па язычніцкай міфалогіі, але ў большасці сваёй ён фрагментарны. Да таго ж гэтыя матэрыялы падаюцца і разглядаюцца імі з розных пазіцый, што не дазваляе радавому чытачу атрымаць цэласнае ўяўленне непасрэдна аб найбольш старажытнай частцы культуры беларусаў — язычніцкай міфалогіі.

У аб'екце даследавання — міфалогіі беларусаў — аўтар вызначыў для сябе прадмет для вывучэння — сістэмныя характарыстыкі міфічных уяўленняў беларускага этнасу.

У працэсе даследавання вырашаліся наступныя задачы:

- абагульніць і асэнсаваць вынікі вывучэння міфалогіі беларусаў, атрыманыя ў папярэднія часы;
- вызначыць структуру міфаў і персанажаў міфалогіі беларусаў;
- сфарміраваць тэксты міфаў адпаведна ўнутранай логіцы міфічных уяўленняў продкаў беларускага народа.

Вынікі даследавання выкладзены ў гэтай працы і прапануюцца да ўвагі не толькі навукоўцаў, але і шырокага кола аматараў беларускай культуры.

*Частка першая*

# УВОДЗІНЫ Ў МІФАЛОГІЮ БЕЛАРУСАЎ



# Глава 1. **Міфалогія — феномен нацыянальнай культуры**

## Міфалогія ў жыцці сучаснага беларускага грамадства

ЧАЛАВЕК часта сутыкаецца з такімі паняццямі, як «міф», «міфалогія». Імі азначаюць нейкія з'явы, што лічацца неіснуючымі рэальна ці маюць адценне звышнатуральнасці. Нават адукаваныя групы насельніцтва, не ўнікаючы глыбока ў змест і структуру інфармацыі ці тэксту, адносяць да міфа паданні, легенды або рэальныя з'явы жыцця толькі таму, што не маюць аб іх дастатковага ўяўлення.

З другога боку, у паўсядзённым ужыванні слова «міф» асацыіруецца з апавяданнямі пра багоў і герояў. Пры гэтым большасць людзей лічыць, што міф — гэта з'ява, якая належыць старажытнаму мінуламу і якой няма месца ў сучасным жыцці.

Міфы і міфалагічныя элементы працягваюць сваё існаванне ў сучаснай культуры. У размовах мы выкарыстоўваем фразеалагізмы «рог дастатку», «ахілесава пята», «пракруставы ложак», «сізіфава праца», «траянскі конь», якія прыйшлі да нас са старажытнагрэчаскай міфалогіі. Імёны яе персанажаў выкарыстоўваем у пераносным сэнсе, называючы моцнага мужчыну ці юнака Гераклам, а прыгожую дзяўчыну Венерай. У сучаснай мове дастаткова слоў, якія вядуць сваё паходжанне ад міфаў антычнасці: *пігмей*, *тытан*, *эгіда*, *атлас* і інш.

Нямала выразаў увайшло ў нашу свядомасць з біблейскай міфалогіі: *альфа і амега*, *блудны сын*, *кінуць камень*, *змей-спакушальнік*, *вавілонская вежа*, *садом і гамора*, *пацалунак іўды* і інш. Спосабы летазлічэння таксама ідуць ад міфалогіі і рэлігіі: хрысціянскі каляндар — ад Нараджэння Хрыстова ці стварэння сусвету, мусульманскі — ад даты Хіджры (уцёкаў Мухамада з Мекі ў Медыну).

Выкарыстоўваючы метафарычныя выказванні, запазычаныя з язычніцкай ці хрысціянскай міфалогіі, большасць людзей не здольна дакладна вытлумачыць іх першасны сэнс. Гэта вынік недастатковага знаёмства з грэчаскай і хрысціянскай міфалогіямі. Веданне іх неабходна выкладчыкам гісторыі,

мовы, літаратуры, філасофіі, мастацтвазнаўчых дысцыплін і студэнтам адпаведных спецыяльнасцей.

У культуры беларускага грамадства функцыянуе яшчэ адзін пласт міфалагічных элементаў, аб якім самі беларусы маюць яшчэ меншае ўяўленне. Гэта язычніцкая міфалогія саміх беларусаў.

Элементы язычніцкай міфалогіі займаюць значнае месца ў побыце і мове беларусаў. Беларуская мова насычана міфалагічнымі паняццямі (*пярун*, *ліхаманка*, *трасцы*, *злыдні* і інш.), якія не кожны суадносіць з міфалагічнымі персанажамі. Магія як элемент міфічных уяўленняў аб магчымасці ўздзеяння на навакольны свет і людзей, рэальная магічная практыка жывуць у сучасным беларускім грамадстве. Людзі стукаюць па дрэве, каб засцерагчыся ад бяды, носяць абярэгі, звяртаюцца да знахароў і чараўнікоў. У рэштах земляробчай абраднасці, якія не толькі захоўваюць сяляне, але пераймаюць і дачнікі, ёсць міфічныя элементы.

Міфалогія — яскравая і значная з’ява ў культуры сучаснага беларускага грамадства. Як бачна, яна і сёння прысутнічае ў паўсядзённым жыцці беларусаў, праяўляецца праз словы, дзеянні, мысленне. У ёй пераплятаюцца элементы ведаў і няведання, веры, ідэалогіі, магічнай практыкі.

Міф — універсальная якасць культуры. Міфалогія стаяла ля вытокаў нацыянальнай культуры, існуе зараз і, безумоўна, захавае сваё месца ў культуры Беларусі ў будучым.

## Паняцці «міф» і «міфалогія»

ПАНЯЦЦІ «міф» і «міфалогія» ў сучасным беларускім грамадстве ўжываюцца з рознымі адценнямі і ў розных сэнсах, што часам вядзе да не заўсёды апраўданага пашырэння іх значэння. Гэта вынік таго, што большасць грамадства ведае міф праз вопыт, пачуццёвае пазнанне, а не праз мінімальныя навуковыя веды. Большасць людзей, нават дастаткова адукаваных, лічыць міф і легенды тоеснымі жанрамі літаратуры.

Пытанне аб тым, што такое міфалогія, хвалюе і выклікае спрэчкі навукоўцаў ужо не адно стагоддзе. На гэтую тэму напісана вялікая колькасць прац, існуе шмат тэорый, якія даюць тлумачэнне міфалогіі як у цэлым, так і ў асобных яе элементах. Амерыканскі вучоны І. Дуглас у працы пра дэфініцыі тэрміна «міф» прыйшоў да высновы, што ў яго столькі ж азначэнняў, колькі існуе вучоных, якія яго выкарыстоўваюць. Разнастайныя азначэнні паняццяў «міф» і «міфалогія» даваліся не толькі ў розныя гістарычныя перыяды, але і ў адным перыядзе, пры выкарыстанні розных навуковых

метадаў вывучэння міфалогіі. Таму філосафы, этнографы, фалькларысты, антраполагі, гісторыкі, мовазнаўцы, псіхолагі даюць сваі азначэнні міфа.

Для прыкладу прывядзем некалькі найбольш супрацьлеглых азначэнняў: «Міф — пасрэднік паміж чалавекам і яго жахамі» (М. Эліядэ); «Міф — алегорыя і іншаказанне» (Ф. Бекан); «Міф — прымітыўная навука для тлумачэння абрадаў» (Дж. Фрэйзер); «Міф — байка» (школа Грыма); «Міф — гэта вобразы, зафіксаваныя ў слове, якія сталі здабыткам калектыву. Міф — рэальнасць… ён не прыдумка» (А. Лосеў).

І. Дуглас адзначае, што міф у XX ст. пачаў ужывацца ў такіх сэнсах, як ілюзія, хлусня, ілжывая прапаганда, забабоны, стварэнне вобразаў у фантастычнай форме, сакралізацыя сацыяльных звычаяў і каштоўнасцей. Далей ён канстатуе, што міф стаў больш палітычным, чым аналітычным тэрмінам. Неабходна прызнаць, што паняцці «міф» і «міфалогія» займалі значнае месца ў сацыялогіі і культуралогіі XX ст. і захоўваюць гэтую значнасць у пачатку XXI ст.

Слова «міф» (ад гр. mythos — слова, паданне, апавяданне) выкарыстоўвалі яшчэ старажытныя грэкі. Будучы шматзначным, яно мела ў іх тры асноўныя значэнні: міф — як слова, міф — як эпас, міф — як логас.

Пры наяўнасці вялікай колькасці азначэнняў паняцця «міфалогія» (ад гр. mythologia < mythos + logos — слова, паняцце, вывучэнне), пазбягаючы ўсялякіх дробных і неістотных нюансаў, можна сказаць, што яно ў наш час выкарыстоўваецца ў трох значэннях.

1. Міфалогія — гэта сукупнасць уласна міфалагічных тэкстаў. Тут неабходна зрабіць удакладненне. Для нас больш звыкла разумець пад тэкстам паведамленне ў пісьмовым выглядзе, таму што ў культуры нашага часу пераважаюць пісьмовыя тэксты. Але сучасная навука пад тэкстам (ад лац. textum — тканіна, спляценне) разумее не толькі пісьмовы, але і іканаграфічны прадукт маўленча-мысліцельнай дзейнасці. Як бачым, па форме фіксацыі тэксты дзеляць на пісьмовыя і іканаграфічныя, разумеючы пад апошнімі малюнкі, чарцяжы, сімвалы. Зыходзячы з гэтага, пад тэкстам мы будзем разумець спецыяльна створаны чалавекам прадмет культуры, які прызначаны для перадачы і захавання міфічнай інфармацыі. Таму элементы міфалогіі ў жыцці грамадства могуць прысутнічаць складанай сукупнасцю вусных, пісьмовых, іканаграфічных тэкстаў. Да таго ж трэба ўвесь час памятаць, што ў жыцці і ў мастацтве міф апрадмечваецца не толькі праз літаратурныя тэксты, але і іншымі спосабамі — танцам, песняй, абрадам, кінафільмам.

2. Міфалогія — сістэма ўяўленняў аб свеце, спосаб разумення свету. У такім азначэнні паняцце «міфалогія» адлюстроўвае гістарычна першую

форму мыслення людзей, якая цалкам не знікла да нашага часу. Элементы міфічнага мыслення праяўляюцца ў сучасным грамадстве пры адлюстраванні свету як у паўсядзённым жыцці, так і ў навуковай дзейнасці.

3. Міфалогія — гэта навука, якая вывучае міфы і сістэму міфічных уяўленняў аб свеце, распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя праблемы свайго аб’екта даследавання.

Вызначэнне міфа толькі як жанру літаратуры — гэта звужаны навуковы падыход, які выкарыстоўваецца пры разглядзе месца міфа ў літаратуры.

## Глава 2. Гістарыяграфія міфалогіі беларусаў

### Вывучэнне міфалогіі беларусаў у XIX — пачатку XX ст.

ЗНАЧНЫ і прадуктыўны перыяд у вывучэнні міфалогіі беларусаў — XIX ст. На працягу стагоддзя з’яўляюцца працы, у якіх не толькі фіксуюцца рэшткі язычніцтва і міфічных уяўленняў беларусаў, што захаваліся да таго часу, але робяцца спробы асэнсаваць іх, прывесці ў пэўную сістэму, знайсці падабенства з міфалогіямі заходнееўрапейскіх народаў. Першай такой працай, надрукаванай на польскай мове ў «Віленскім дзённіку» (1817), быў артыкул М. Чарноўскай «Рэшта славянскай міфалогіі, якая захавалася ў звычаях вясковага люду на Беларусі». Аўтар дае апісанне асобных абрадаў, павер’яў, вераванняў, значнае месца адводзіць язычніцкай міфалогіі. У працы выкарыстаны матэрыялы, сабраныя ў вёсках, размешчаных паблізу ад г. Чэрыкава тагачаснай Магілёўскай губерні.

Выдатную ролю ў вывучэнні язычніцкай культуры беларусаў адыграў З. Даленга-Хадакоўскі (1784—1825), які ў 1819 г. выдаў працу «Аб славяншчыне перад хрысціянствам». У ёй ён даследуе рэшткі язычніцкіх уяўленняў, робіць спробу рэканструкцыі славянскай міфалогіі. Параўнаўшы рускую, украінскую і беларускую міфалогіі, прыходзіць да высновы, што апошняя лепш зберaглася.

Варшаўскае таварыства аматараў навукі, даследуючы культуру Польшчы, нярэдка ў сваіх выданнях друкавала матэрыялы, сабраныя ў Беларусі, асабліва ў яе заходняй і цэнтральнай частках, якія палякі называлі «крэсы всходне» і культуру якіх, зыходзячы з шавіністычых пазіцый, лічылі і падавалі як польскую. Так, Л. Галембіеўскі выдаў у 1830 г. працу «Польскі народ, яго звычаі і прымхі», якая ўключала раздзелы «Люд беларускі» і «Люд мінскі».

У 1844—1846 гг. вынікі свайго вывучэння міфалогіі беларусаў выклаў у літаратурнай форме Я. Баршчэўскі. У яго кнізе «Шляхціц Завальня» шырока выкарыстаны сюжэты язычніцкай і хрысціянскай міфалогіі Беларусі.

Вялікая заслуга ў вывучэнні міфалогіі нашага народа належыць П. Шпілеўскаму (1823—1861). У працы «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных казках» ён найбольш поўна ў параўнанні са сваімі папярэднікамі азначыў персанажы беларускай міфалогіі, падаў шэраг міфалагічных казак і паданняў у літаратурнай апрацоўцы. Вызначаецца цікавасцю і значнасцю яго праца «Даследаванні аб ваўкалаках на аснове беларускіх павер'яў».

З сярэдзіны XIX ст. актывізуецца вывучэнне Беларусі Расійскай імператарскай акадэміяй навук. Экспедыцыі, навуковыя таварыствы, аддзяленні акадэміі навук вырашаюць розныя задачы на карысць імперыі. Калі адкінуць вялікадзяржаўныя расійскія падыходы ў інтэрпрэтацыі матэрыялаў, то дзеля аб'ектыўнасці неабходна адзначыць, што дадзеная праца мела пэўны плён і для самой Беларусі. Дзякуючы гэтым даследаванням мы зараз маем значныя па аб'ёму матэрыялы, якія ўтрымліваюць звесткі аб міфічных уяўленнях беларусаў, што функцыянавалі ў асяроддзі вясковага насельніцтва тых часоў. У расійскім перыядычным выданні «Этнографический сборник», што выдаваўся ў 1853—1858 гг., беларускія матэрыялы займалі значнае месца[1].

Беларускія матэрыялы часта з'яўляліся ў перыядычным выданні «Этнографическое обозрение», якое выходзіла да 1916 г. Найбольш значныя аналітычныя матэрыялы, што друкаваліся ў ім, належалі пяру такіх выдатных этнографаў і фалькларыстаў, як Я. Ляцкі, М. Доўнар-Запольскі, М. Нікіфароўскі[2].

Добрым знаўцам міфалогіі беларусаў быў А. Кіркор. Яшчэ студэнтам ён напісаў працу «Аб язычніцкіх абрадах у Беларусі» (1838), якая выйшла

---

[1] Быт белорусских крестьян // Этногр. сб. — СПб., 1856. — Вып. 2. Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этногр. сб. — СПб., 1858. — Вып 3.

[2] *Ляцкий*, *Е*. Болезнь и смерть по представлениям белорусов / Е. Ляцкий // Этногр. обозрение. — М., 1892. — № 2—3. Представления белоруса о нечистой силе // Этногр. обозрение. — Кн. 7, 4. — М., 1880. *Довнар-Запольский*, *М. В*. Чародейство в Северо-Западном крае в XVII — XVIII вв. / М. В. Довнар-Запольский // Этногр. обозрение. — 1890. — № 2. *Никифоровский*, *Н. Я*. Очерки Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский // Этногр. обозрение. — 1897. — № 3.

ў расійскім зборніку прац навучэнцаў Беларусі[1]. Вынікі сваіх даследаванняў міфалогіі беларусаў ён выклаў у артыкулах, прысвечаных гэтай тэме, у трэцім томе «Жывописной России» (1882), дзе выказаўся так: «Беларусь багацей за ўсе славянскія землі міфалагічнымі паданнямі і песнямі...».

З утварэннем у Вільні Паўночна-Заходняга аддзела Расійскага гістарычнага таварыства (РГТ) у 1867 г. да этнаграфічнай і фальклорнай працы падключаюцца значныя сілы беларускай інтэлігенцыі. Актыўна з РГТ супрацоўнічаюць беларускія навукоўцы.

Міфалагічная праблематыка распрацоўвалася беларускімі навукоўцамі ў межах тагачаснай агульнаеўрапейскай натуралістычнай плыні вывучэння міфалогіі, якая знайшла прыхільнікаў і ў Расіі. Матэрыялы даследчыкаў з Беларусі шырока выкарыстоўваліся расійскімі навукоўцамі (Афанасьевым, Далем, Весялоўскім, Зяленіным і інш.). Але часцей за ўсё яны падаюцца як агульнаславянскія ці наогул расійскія.

У канцы XIX — пачатку XX ст. выходзіць шэраг асобных прац беларускіх навукоўцаў і фалькларыстаў, у якіх акцэнтуецца ўвага на міфалагічных элементах. Трэба адзначыць, што гэтыя навукоўцы — паслядоўнікі натуралістычнай міфалагічнай школы. Тут неабходна вылучыць Е. Раманава (1855—1922) з яго вялікім «Беларускім зборнікам». У трэцім выпуску яго ён выдае міфалагічныя казкі, але міфалагічныя мікратэксты размешчаны па ўсіх тамах.

М. Нікіфароўскі (1845—1910) выдаў у 1907 г. працу «Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе». Гэта аналітычная праца, у якой упершыню зроблена спроба класіфікацыі персанажаў міфалогіі беларусаў. Асобныя яе элементы выкарыстоўваюцца беларускімі навукоўцамі і сёння.

Выдатная праца А. Багдановіча (1862—1940) «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (1895) не страціла сваёй каштоўнасці да гэтага часу як па абагульненнях і вывадах, зробленых навукоўцам, так і па факталогіі, прыведзенай у ёй.

Вельмі каштоўныя для навукі працы па этнаграфіі і фальклору смаленскіх беларусаў, напісаныя У. Дабравольскім, у якіх пэўны аб'ём займаюць матэрыялы па міфалогіі беларусаў[2].

---

[3] Опыт русской словесности воспитанников Белорусской учебной округи. — Вильно, 1839.

[1] *Добровольский, В. Н.* Смоленский областной словарь / В. Н. Добровольский. — Смоленск, 1914. Смоленский этнографический сборник. — Ч. 1—4. — СПб., 1891—1903.

Значнае месца міфалагічным казкам, легендам, паданням адведзена П. Шэйнам (1826—1900). Ён змясціў іх у кнізе «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887—1902).

Надзвычай каштоўныя матэрыялы сабраў выдатны беларускі навуковец А. Сержпутоўскі, дзейнасць якога належыць двум эпохам. Да 1917 г. ім напісана шмат артыкулаў і выдадзены ў 1911 г. зборнік «Сказки и рассказы белорусов-полешуков», у якім ёсць і міфалагічныя тэксты. Але найбольш значная для міфалогіі беларусаў яго праца выйшла ўжо ў савецкі час.

XIX — пачатак XX ст. — вельмі плённы перыяд у пытаннях распрацоўкі міфалогіі беларусаў, але яго метадалагічныя падыходы не заўсёды прымальныя для нашага часу. Гэта не віна беларускіх навукоўцаў, іх даследаванні адпавядалі ўзроўню тагачаснай навукі. Працы напісаны ў межах грамадазнаўчай навукі імперскай Расіі, што таксама накладвае на іх пэўны адбітак.

## Вывучэнне міфалогіі ў савецкі перыяд

У ПЕРШАЕ дзесяцігоддзе ўсталявання савецкай улады ў Беларусі працягвалася вывучэнне традыцыйнай культуры і элементаў беларускай міфалогіі. Аднаўленне, у многім фармальнае, беларускай дзяржаўнасці стымулявала інтарэс да нацыянальнай культуры, у тым ліку і да міфалогіі. Даследаванні набылі пэўную арганізаванасць. Каардынуючым цэнтрам з’явіўся сектар этнаграфіі Інстытута беларускай культуры, створаны ў 1922 г., а пазней — сектар этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

У 30-я гг. XX ст. выйшла шмат прац, дзе праблема міфічных уяўленняў нашага народа займала значнае месца. Адной з першых такіх прац было даследаванне М. Мялешкі «Камень у вераваннях і паданнях беларуса» (1929). У 1930 г. А. Сержпутоўскі выдаў кнігу «Прымхі і забабоны беларусаўпалешукоў». У раздзеле «Прырода» ён даў запісы ўяўленняў сялян Палесся аб паходжанні сусвету, неба, сонца, жывёл, раслін; у раздзеле «Вера» — аб Богу і святых, нячыстай сіле. Матэрыялы кнігі з’яўляюцца каштоўнай крыніцай па міфалогіі беларусаў.

Цікавыя даследаванні ў галіне міфалогіі беларусаў надрукаваў М. Нікольскі. У першым з іх — «Міфалогія і абрадавасць валачобных песень» (1931) робіцца спроба рэканструкцыі міфаў і абрадаў на падставе цыкла валачобных песень. У 1933 г. выдаецца яго другая праца «Жывёла ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства», дзе ён падагульняе ўсе вядомыя яму на

той час крыніцы па тэме, робіць высновы, але сацыялагічны падыход на прынцыпах марксісцкай тэорыі значна зніжае яе каштоўнасць.

Пераход СССР у 30-я гг. да ідэалогіі таталітарызму, устаноўкі камуністычнай партыі на знішчэнне нацыянальных культур і зліццё нацый у адзіны так званы савецкі народ, барацьба з рэлігіяй у любых яе праяўленнях, праследаванне нацыянальна свядомых навукоўцаў прывялі да згортвання даследаванняў па ўсіх напрамках традыцыйнай культуры Беларусі. У выніку амаль увесь перыяд сталінскага рэжыму міфалогія беларусаў для гістарыяграфіі з'яўляецца белай плямай, у навуковым плане «пустым» і непрадуктыўным этапам. Некаторыя працы выдаваліся, але гэта было, хутчэй, выключэннем з агульнага правіла. Сярод іх можна назваць працу Л. Барага аб беларускіх асілках і іх вобразах у беларускіх паданнях[1].

У канцы 50-х — пачатку 60-х гг. XX ст. пачынаецца так званы перыяд адлігі і вывучэнню язычніцтва надаецца больш увагі. З'явіўся шэраг значных прац Рыбакова, Іванова, Тапарова, Русанавай, Цімашчук і інш. Амаль усе савецкія навукоўцы разглядалі праблемы язычніцтва ў агульным усходнеславянскім кантэксце. На падставе ўсяго комплексу фальклорна-этнаграфічных, археалагічных і іншых матэрыялаў Беларусі, Украіны, Расіі яны спрабавалі рэканструяваць больш-менш адзіную сістэму ўсходнеславянскай міфалогіі, у якой рэгіянальным асаблівасцям амаль не надавалася ўвагі. Пэўныя назіранні і ідэі, выказаныя савецкімі навукоўцамі з выкарыстаннем матэрыялаў беларускай міфалогіі, маюць для нас каштоўнасць. Тут мы можам назваць працы Б. Рыбакова, А. Байбурына[2].

У 1957 г. са стварэннем Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору пры Акадэміі навук БССР даследаванні ў галіне традыцыйнай культуры беларусаў набылі сістэмнасць і шырыню. З пачатку 70-х гг. пачала выходзіць акадэмічная серыя «Беларуская народная творчасць», у якой былі падведзены вынікі працы беларускіх навукоўцаў за паўтара стагоддзя. Ва ўступных артыкулах да тамоў серыі звярталася ўвага на наяўнасць міфалагічных элементаў у творах, якія ўключаны ў выданне. Былі выдадзены зборнікі са значнай колькасцю міфалагічных тэкстаў і мікратэкстаў: «Чарадзейныя казкі» (1973, ч. 1; 1978, ч. 2); «Прыказкі і прымаўкі» (1976); «Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі» (1981); «Паданні і легенды» (1983); «Замовы» (1992).

---

[1] *Бараг*, *Л.* Да пытання аб волатах-асілках старажытных беларускіх паданняў / Л. Бараг // Полымя. — 1945. — № 10.

[2] *Байбурин*, *А. К.* Жилище в обрядах и представлениях восточных славян / А. К. Байбурин. — Л., 1983. *Рыбаков*, *Б. А.* Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. — М., 1988.

Савецкі перыяд вывучэння міфалогіі беларусаў, як сведчаць вынікі даследаванняў, можна лічыць супярэчлівым і малапрадуктыўным, нягледзячы на наяўнасць асобных выдатных работ.

## Сучасны этап даследавання міфалогіі беларусаў

З РАСПАДАМ у 1991 г. Савецкага Саюза, у склад якога ўваходзіла Беларусь, пачынаецца новы этап у развіцці міфалогіі як навукі. Усе краіны былога СССР актыўна звяртаюцца да праблем сваёй гісторыі і нацыянальнай культуры. Тое ж адбываецца і ў Беларусі.

Новая нацыянальная палітыка беларускай дзяржавы дала штуршок для вывучэння нацыянальнай гісторыі і культуры з пазіцый менавіта саміх беларусаў. У перыядычным друку з’яўляецца мноства публікацый, звязаных з традыцыйнай культурай, дзе адзначаюцца міфалагічныя элементы. Шэраг артыкулаў непасрэдна прысвечаны міфалогіі беларусаў. Значная іх колькасць з’явілася ў часопісах, матэрыялах семінараў і канферэнцый. Яны рознай якасці, частка наогул не мае навуковай каштоўнасці, але дадзенае пытанне пачынае займаць сваё месца ў культурным жыцці грамадства, у навуцы і навучальных праграмах адукацыі.

Адначасова з хваляй артыкулаў выходзяць працы манаграфічнага плана. Сярод іх неабходна адзначыць адну з першых, значную па аб’ёму і выкарыстанню крыніц кнігу А. Ненадаўца «Святло таямнічага вогнішча». Кола інтарэсаў даследчыка — прыродны свет у беларускай традыцыйнай культуры і міфалогіі. Аўтар глыбока пранікае ў сутнасць пытанняў шанавання беларусамі дуба, каменя, вужа, мядзведзя і пакланення ім.

Кнігі Ненадаўца каштоўныя не толькі выкарыстаннем прац этнографаў і фалькларыстаў мінулага часу, але, што не менш значна, асабістых палявых назіранняў, зробленых у розных мясцінах Беларусі ўжо ў наш час. На базе фальклорных крыніц аўтар даследуе асноўныя формы татэмізму і фетышызму, што бытавалі ў Беларусі. Ім напісана шмат артыкулаў па гэтай праблематыцы, большая частка якіх надрукавана ў часопісе «Роднае слова». Язычніцкая і міфалагічная праблематыка знайшла месца ў манаграфічных працах даследчыка «Каму пакланяліся продкі», «За смугою міфа»[1].

У 1994 г. выйшла кніга «Міфы бацькаўшчыны», складальнік якой У. Васілевіч. У ёй выкарыстаны матэрыялы па беларускай міфалогіі, узятыя

[1] *Ненадавец, А. М.* Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. — Мінск, 1993. *Ненадавец, А. М.* Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец. — Мінск, 1996. *Ненадавец, А. М.* За смугою міфа / А. М. Ненадавец. — Мінск, 1999.

з прац этнографаў і фальклarystaў XIX — пачатку XX ст., многія з якіх былі недасягальнымі для чытачоў, настаўнікаў і навукоўцаў. Не з'яўляючыся аўтарскім, выданне стала крыніцай тэкстаў па міфалогіі беларусаў як для аматараў, так і для навукоўцаў, хрэстаматыяй для студэнтаў ВНУ пры вывучэнні міфалогіі роднага краю. Яна стымулявала зварот многіх навукоўцаў да праблем міфалогіі і забяспечыла іх матэрыяламі. Пазней, у 2002 г., пад назваю «Беларуская міфалогія» У. Васілевіч робіць другое выданне тэкстаў міфаў беларусаў. У ім ён размясціў матэрыялы па групах, што, па сутнасці, з'яўляецца спробай класіфікацыі і структурызацыі тэкстаў беларускай міфалогіі. Не з усім можна пагадзіцца, але гэта першы крок у распрацоўцы праблемы.

Не менш каштоўная для навукоўцаў і вялікая праца У. Васілевіча, якая выйшла ў трох кнігах пад рознымі загалоўкамі, але адзіным падзагалоўкам — «Беларускія народныя прыкметы і павер'і»: «Зямля стаіць пасярод свету» (1996), «Жыццё адвечны лад» (1998), «Зямная дарога ў вырай» (1999). У гэтых кнігах сабраны акрамя этнаграфічных фактаў міфалагічныя тэксты і мікратэксты. Матэрыялы, якія згрупаваны, пранумараваны і забяспечаны прадметным паказальнікам, з'яўляюцца каштоўным дапаможнікам і крыніцай па беларускай міфалогіі як для студэнтаў, так і для навукоўцаў.

Цікавая і патрэбная праца выдадзена У. Ковалем — «Народныя ўяўленні, павер'і, прыкметы. Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі» (1995). Кніга ўтрымлівае міфонімы, пададзеныя ў алфавітным парадку, тлумачэнні іх са спасылкамі на літаратуру. Нягледзячы на даведачны характар і азначэнне «усходнеславянскай», кніга ўключае значны абагульняючы матэрыял па беларускай міфалогіі.

Звярнуліся да міфалогіі і беларускія гісторыкі. Сярод іх неабходна ў першую чаргу назваць археолага Э. Зайкоўскага, які займаецца рэканструкцыяй міфічных уяўленняў старажытных беларусаў і язычніцкага пантэона па матэрыялах археалагічных даследаванняў і вывучэння старажытных помнікаў[1]. Другі беларускі археолаг Л. Дучыц у грунтоўнай працы «Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў» (1993) разглядае захаванасць міфалагічных элементаў, звязаных з помнікамі археалогіі.

---

[1] *Зайкоўскі, Э. М.* Месца Вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі / Э. М. Зайкоўскі. — Мінск, 1998. Язычніцтва ў светапоглядзе беларусаў // Беларусь : шляхі абнаўлення і развіцця : матэрыялы навук. сесіі аддзялення гуманіт. навук (г. Мінск, 3—4 ліст. 1993 г.). — Мінск, 1993. Касмалагічныя ўяўленні старажытнага насельніцтва Беларусі // Гісторыка-археалагічны зборнік. — Ч. 1. — Мінск, 1993. Багі старажытнай Беларусі // Роднае слова. — 1996. — № 8, 12; 1997. — № 6. Язычніцкія ідалы Беларусі // Час, помнікі, людзі : тэз. дакл. міжнар. канф. (г. Мінск, 27—30 кастр. 1993 г.). — Мінск, 1993. Новыя звесткі пра паганскія культавыя помнікі на Беларусі // Тутэйшыя. — Мінск, 1984. Камяні-краўцы як помнікі паганскага культу // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : тэз. дакл. навук. канф. — Полацк, 1992.

Асобнае месца займаюць работы філосафа і культуролага У. Конана — першага навукоўца, які пачаў філасофска-культуралагічнае асэнсаванне міфалогіі беларусаў. Наогул, па пытаннях міфалогіі У. Конан напісаў шэраг грунтоўных прац[1]. Самая значная — «Архетыпы нашай культуры», якая выйшла ў 1996 г. у часопісным варыянце. У ёй робіцца спроба вызначэння першаэлементаў культуры, асэнсавання іх месца і ролі ў станаўленні нацыянальнай культуры беларусаў.

Карысны вучэбны дапаможнік падрыхтаваў А. Шамак — «Уводзіны ў міфалогію беларусаў» (1997). У ім лаканічна адзначаны асноўныя моманты гістарыяграфіі і крыніцазнаўства міфалогіі беларусаў і складзены міфалагічны слоўнік. Кароткі гістарыяграфічны агляд вывучэння міфалогіі беларусаў прадставіў А. Буглак[2].

На думку аўтара, не заўсёды навуковыя даследаванні праблем міфалогіі беларусаў маюць станоўчыя вынікі. Так, кніга Т. Шамякінай «Беларуская міфалогія» (2001) атрымалася, на жаль, эклектычнай, непасрэдна беларускія матэрыялы займаюць у ёй нязначнае месца, назва яе не адпавядае зместу.

Значны ўклад у гістарыяграфію язычніцтва і міфалогіі зрабілі беларускія фалькларысты і этнографы: Л. Салавей, І. Крук, У. Сысоў, І. Швед, І. Казакова[3] і інш.

---

[1] *Конан, У. М.* Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі / У. М. Конан // Адукацыя і выхаванне. — 1994. — № 4. *Конан, У. М.* Сусветнае дрэва / У. М. Конан // Крыніца. — Мінск, 1995. — № 5. *Конан, У. М.* Архетыпы нашай культуры / У. М. Конан // Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 1.

[2] *Буглак, А. А.* Навейшая беларуская гістарыяграфія язычніцтва / А. А. Буглак // Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя : матэрыялы II Міжнар. кангр. (17—19 мая 2000 г.). — Мінск, 2001.

[3] *Салавей*, *Л*. Пантэон багоў у міфалогіі беларусаў / Л. Салавей // Спадчына. — 1992. — № 3. *Крук*, *І. І.* Следам за сонцам / І. І. Крук. — Мінск, 1994. *Крук*, *И. И*. Диалог язычества и христианства... / И. И. Крук // Духовное, нравственное и культурное значение православия. — Минск, 1998. *Сысоў*, *У. М*. З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. — Мінск, 1997. *Сысоў*, *У. М*. Пахавальныя рытуалы : семантыка-камунікатыўны аспект / У. М. Сысоў // Весці АН Беларусі. — 1994. — № 4. *Сысоў*, *У. М*. Міфалагічныя істоты ў жыцці і абрадах беларусаў / У. М. Сысоў // Беларусь. — 1996. — № 6. *Швед*, *І. А*. Калінавы мост / І. А. Швед / Праблемы сучаснай беларусікі. — Брэст, 1999. *Швед*, *І. А*. Сусветнае дрэва... / І. А. Швед // Матэрыялы навук. канф. — Гомель, 1995. *Казакова*, *І. В*. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. — Мінск, 1995. *Казакова*, *І. В*. Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры / І. В. Казакова. — Мінск, 1997

Пачатак XXI ст. быў адзначаны шэрагам значных па зместу і аб'ёму прац, дзе міфічным уяўленням беларусаў надавалася пэўнае месца. У 2003 г. выйшла кніга «Народная міфалогія Гомельшчыны», у якой утрымліваюцца сучасныя запісы, зробленыя студэнтамі гомельскага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам В. Новак. Каштоўнасць выдання перш за ўсё ў тэкстах канкрэтна акрэсленага рэгіёна. Гэта дазваляе вызначыць характарыстыкі захаванасці міфічных уяўленняў на Гомельшчыне ў наш час, прасачыць праз параўнанне з больш раннімі запісамі, якія змены адбыліся, што знікла з народнай памяці.

Кніга І. Цішчанкі «З творчай спадчыны» (2004) уключае артыкулы, прысвечаныя беларускай міфалогіі. Грунтоўнасцю, навуковай змястоўнасцю вылучаюцца артыкулы «Міфалагічны светапогляд беларусаў», «Вярхоўныя багі. Пярун», «Вярхоўныя багі. Ярыла і яго персаніфікацыя св. Юрый», «Вышэйшыя багі. Волас і яго персаніфікацыя Улас». Здзіўляе, што яны амаль не адзначаюцца ў працах маладых навукоўцаў і, па сутнасці, выпалі з навуковага ўжывання.

У 2004 г. выйшла навукова-папулярнае выданне А. Шамака «Міфалогія Старажытнай Беларусі», а ў 2005 г. — яго вучэбны дапаможнік «Міфалогія беларусаў».

У гэтым жа годзе пабачыў свет энцыклапедычны слоўнік «Беларуская міфалогія», (перавыдадзены ў 2006 г.) — першае ў Беларусі выданне падобнага роду. Не ўсе артыкулы ў ім маюць міфалагічны змест. Складальнікам і аўтарам слоўніка не ўдалося пераадолець этнаграфічны і фальклорны падыход да матэрыялу. Пэўная частка артыкулаў не мае ці мае нязначнае дапасаванне да міфалогіі. У пазнейшым грунтоўным выданні «Міфалогія беларусаў»[1], зробленным на падмурку «Беларускай міфалогіі», захаваліся тыя ж пралікі па зместу, але павялічылася колькасць артыкулаў, былі дабаўлены гласарый і вялікі спіс літаратуры.

Разгляд гістарыяграфіі міфалогіі беларусаў будзе няпоўным, калі мы не адзначым прац, зробленых беларусамі замежжа. У першую чаргу гэта артыкулы Л. Гарошкі, які даследуе склад беларускага язычніцкага пантэона[2]. Цікавая, але не бясспрэчная спроба рэканструкцыі касмагенезу і тэагенезу міфалогіі беларусаў (крывічоў — у аўтарскай назве) зроблена П. Хмарай[3].

---

[1] Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка. — Мінск, 2011.

[2] *Гарошка*, *Л.* Дахрысціянская вера нашых продкаў / Л. Гарошка // Крыніца. — 1994. — № 8. *Гарошка*, *Л.* Уводзіны ў беларускую міфалогію / Л. Гарошка // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. — № 3.

[3] *Хмара*, *П.* Аб багах крывіцкіх сказы / П. Хмара. — Таронта, 1986.

Пераважная большасць навуковых прац па міфалогіі беларусаў канца XX — пачатку XXI ст. прысвечана даследаванню праблем язычніцкай міфалогіі беларусаў. У той жа час ёсць невялікая колькасць работ, скіраваных на перыяд Сярэднявечча[1].

## Глава 3. Крыніцы вывучэння міфалогіі беларусаў

### Пісьмовыя крыніцы

**УЛАСНА беларускія пісьмовыя крыніцы** — гэта *тэкставыя* матэрыялы, якія зафіксаваны навукоўцамі, маюць друкаваныя копіі і даступны шырокаму колу не толькі даследчыкаў, але і грамадскасці.

Адзіны аўтэнтычны твор пісьмовага перыяду нашай гісторыі, у якім арганічна гучаць матывы язычніцкай міфалогіі, — «Слова аб палку Ігаравым», створаны ў другой палове XII ст. У ім значнае месца адведзена падзеям, звязаным з Полацкім княствам і асобай Усяслава Чарадзея. Верагодна, што «Слова…» было створана на зямлі беларусаў і нашым продкам. У свой час гэтую думку выказаў М. Багдановіч. У творы шмат рэфлексіі на архетыпы культуры, якія сучасная навука прызнае прыналежнымі да беларускай культуры.

Пазнейшыя беларускія мастацкія творы адлюстроўваюць сітуацыю з рэлігійнымі і міфічнымі ўяўленнямі, якія былі характэрны ці для саміх аўтараў, ці для тагачаснага грамадства. Найбольш значныя з іх — «Пруская вайна» Я. Вісліцкага, «Песня пра зубра» М. Гусоўскага, «Прамова Мялешкі» і інш.

Другаснымі пісьмовымі крыніцамі з’яўляюцца беларускія летапісы. У першую чаргу гэта агульнадзяржаўныя, якія складаліся з сярэдзіны XIII і да сярэдзіны XVI ст. Вялікую колькасць фактаў аб язычніцкай і хрысціянскай міфалогіі захоўваюць беларускія хронікі. Адна з каштоўных летапісных

[1] *Ваюшына*, *Т.* Вітаўт як магічна-міфічны сімвал моцнага ўладара / Т. Ваюшына // Национально-культурный компонент в тексте и языке : материалы II Междунар. науч. конф. (Минск, 7—9 апр. 1999 г.) : в 3 ч. — Ч. 1. — Минск, 1999. *Вуглік*, *І.* Імя — міф — этнакультурны сімвал / І. Вуглік // Национально-культурный компонент в тексте и языке : Материалы II Междунар. науч. конф. (Минск, 7—9 апр. 1999 г.) : в 3 ч. — Ч. 1. — Минск, 1999.

крыніц — Радзівілаўскі летапіс, які ўтрымлівае не толькі цікавыя звесткі па беларускай міфалогіі, але і багатую іканаграфію — каля 600 малюнкаў, сярод якіх некалькі ілюструюць міфічныя ўяўленні нашых продкаў. Акрамя язычніцкіх і хрысціянскіх міфаў у беларускіх летапісах і хроніках змешчаны першыя сацыяльныя міфы беларусаў. Усе беларускія летапісы і хронікі надрукаваны ў Поўным зборы рускіх летапісаў[1], частка з іх выдадзена ў перакладах на сучасную беларускую мову[2].

Факты міфічных уяўленняў ёсць нават у юрыдычных дакументах. Напрыклад, у дагаворы літоўскіх князёў з польскім каралём 1349 г. можна прачытаць выраз, які сведчыць аб паралельным існаванні ў Беларусі фіксацыі часу як па хрысціянскім, так і па язычніцкім абрадавым календары: «А мір ад Пакрова Багародзіцы да Іванава дня, да Купал». Падобнае вызначэнне дат календара ў язычніцкім і хрысціянскім злічэнні сустракаецца ў грамаце Вітаўта (1369) і іншых дакументах. У XVII ст. адбываецца шэраг судовых працэсаў над гараджанамі, абвінавачанымі ў чараўніцтве. Судовыя пастановы нясуць інфармацыю аб сродках і метадах чаравання.

Россып фактаў знаходзім у павучаннях і казаннях хрысціянскіх дзеячаў Беларусі. У творах Кірылы Тураўскага не аднойчы ў кантэксце хрысціянскай ідэалогіі адзначаюцца язычніцкія ўяўленні беларусаў. А ў казанні «О девах смаленскіх како ігры творілі»[3], напісаным у Смаленску невядомым аўтарам, падаецца пэўны матэрыял па абраднасці нашых продкаў. Трываласць язычніцкіх уяўленняў у традыцыйнай культуры беларускага сялянства не раз прымушае хрысціянскіх святароў звяртаць увагу на пазнейшыя праявы язычніцтва. Так, у XVI ст. беларускі святар Іаан з Вішні ў сваім лісце да князя Васіля Астрожскага пералічвае і ганьбіць язычніцкія абрады беларускіх сялян, якія ўдзельнічаюць у іх[4].

Расійскія праваслаўныя святары XIX ст., якія прыязджалі працаваць у Беларусь, былі ў роспачы ад рэальнага існавання элементаў язычніцтва сярод беларускага сялянства. Аб гэтым сведчаць іх афіцыйныя службовыя запіскі, успаміны. Нават у пачатку XX ст. у «Минских епархиальных ведомостях» разглядаюцца пытанні аб дзейнасці рускіх праваслаўных

[1] Полное собрание русских летописей. — Т. 32, 35. — М., 1976.

[2] Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.

[3] Гл.: *Ластоўскі, В.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В. Ластоўскі. — Коўна, 1926.

[4] Послание ко князю Василию Острожскому и ко всем православным христианам в Малой Руси // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. — Т. 2. — СПб., 1865.

святароў па выкараненню язычніцкіх прымхаў і забабонаў у беларускім народзе[1].

Мноства фактаў, звязаных з язычніцкім і хрысціянскім светаўспрыманнем, захоўваюць фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Тут знаходзяцца дакументы XV — пачатку XX ст. І ў наш час у архівах можна адшукаць новыя матэрыялы аб язычніцтве, якія да гэтага часу наогул не былі вядомы навукоўцам. Так, М. Ліннікава ў 1994 г. знайшла новыя звесткі пра Усяслава Чарадзея[2]. Гэта лепшы прыклад таго, што навукоўцаў яшчэ чакаюць адкрыцці.

У гістарычных архівах Беларусі захоўваюцца дакументы органаў улады беларускіх губерняў, якія давалі заданні на даследаванне традыцыйнай культуры, ці рэлігійнага светапогляду беларускага сялянства, дзе вызначалі нават язычніцкія элементы.

Цікавай крыніцай з'яўляюцца друкаваныя справаздачы дзяржаўных і грамадскіх устаноў у выглядзе памятных кніг беларускіх губерняў, якія выдаваліся на працягу XIX — пачатку XX ст. і ўтрымлівалі афіцыйныя факты. Разам з тым там знаходзілі месца і цікавыя этнаграфічныя замалёўкі.

Шмат матэрыялаў этнаграфічнага і рэлігійнага зместу захоўваюць перыядычныя выданні XIX — XX стст. Губернскія і прыватныя газеты, часопісы дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый выдаваліся як на польскай, так і на рускай мовах, а ў пачатку XX ст. і на беларускай.

Асобную цікавасць уяўляюць архівы навуковых устаноў Рэспублікі Беларусь. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук захоўвае палявыя запісы даследчыкаў другой паловы XX ст. Вялікую дакументальную базу (больш за 100 тыс. адзінак захавання) мае архіў кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, якую сфарміраваў дацэнт кафедры У. Васілевіч па студэнцкіх запісах, зробленых падчас фальклорных практык.

**Замежныя пісьмовыя крыніцы.** Значнай крыніцай звестак па старабеларускай і сярэдневяковай беларускай міфалогіі з'яўляюцца працы ці дакументы, створаныя замежнымі гісторыкамі, падарожнікамі, каталіцкімі місіянерамі, навукоўцамі, якія сутыкаліся з нашымі продкамі і пакінулі занатоўкі аб іх быце і абрадах. Гэта хронікі, аналы, напісаныя чужаземцамі на нямецкай, польскай ці лацінскай мовах. Таму неабходна весці паглыбленае

[1] *Товаров, А. В.* Деятельность русских пастырей для искоренения языческих суеверий в народе / А. В. Товаров // Минские епархиальные ведомости. — 1902. — № 9—12.

[2] Новае пра Усеслава Чарадзея // Спадчына. — 1994. — № 3.

і мэтанакіраванае вывучэнне замежных пісьмовых крыніц — польскіх, нямецкіх, расійскіх, чэшскіх, скандынаўскіх.

У гістарычных і мастацкіх творах іншых народаў ёсць сведчанні аб язычніцтве і міфалогіі на зямлі Беларусі, якія даюць падчас вельмі каштоўную інфармацыю. Гэта тычыцца польскіх крыніц XV — XVIII стст., калі аўтары назіралі ў быце і апісвалі абрады («шаленствы») жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Вядомыя на гэты час найбольш значныя з іх: Kronira Polska, Litewska i wszystkej Rusi Macija Stryjkowskiego[1]; De Russorum, Moscovitarum et Tartarorum. Religione, sacroficii nurtiurum funerum vitu ... Spirae, 1582.

Заканчваючы разгляд пісьмовых крыніц, неабходна спыніцца на мемуарнай літаратуры. Дыярушы, дзённікі, запіскі свецкіх асоб Сярэднявечча і Новага часу (беларусаў, палякаў, рускіх і прадстаўнікоў іншых краін) фіксуюць факты міфічных уяўленняў як саміх аўтараў, так і іх сучаснікаў. Таму, нягледзячы на суб'ектыўныя пазіцыі аўтараў мемуараў, выпадкovасць фіксацыі такіх фактаў, яны даюць цікавы і каштоўны матэрыял.

## Фальклор

АБ КАШТОЎНАСЦІ беларускага фальклору для рэканструкцыі старажытных з'яў культуры і міфалогіі сведчаць беларускія і замежныя навукоўцы, якія больш ці менш грунтоўна знаёмы з ім.

У працэсе развіцця беларуская міфалогія не прайшла апошняга этапу, характэрнага для класічных міфалогій іншых народаў: сістэматызацыі і фіксацыі міфаў у пісьмовых крыніцах, выкарыстання ў час іх рэальнага бытавання ў прафесійным мастацтве. Паскораны пераход плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, да стадыі цывілізацыі, а феадальнай вярхушкі яшчэ і да хрысціянства не пакінуў для гэтага часу. Пад ціскам хрысціянскай ідэалогіі адбывалася звужэнне сацыяльнай прасторы актыўнага бытавання язычніцкай міфалогіі ў грамадстве, ішло насаджэнне хрысціянскай.

Старажытны беларускі міф застаўся бытаваць у традыцыйнай культуры народа і знайшоў сваё месца ў фальклорных жанрах. Традыцыйная культура беларусаў нясе і захоўвае да гэтага часу вялікую колькасць элементаў міфалогіі і з'яўляецца асноўнай базай для рэканструкцыі міфічных уяўленняў продкаў. Таму навукоўцы-фалькларысты, якія вывучаюць вусна-паэтычную творчасць беларусаў, даюць значную частку звестак па міфалогіі. Але

[1] Kronira Polska, Litewska i wszystkej Rusi Macija Stryjkowskiego. — T. 1—2. — Warszawa, 1846.

матэрыялы з гэтых крыніц патрабуюць уважлівага і крытычнага падыходу, глыбокага аналізу і ўдакладнення інфармацыі па іншых крыніцах.

Трансфармаваныя язычніцкія і хрысціянскія міфы ці міфалагічныя сюжэты ўвайшлі ў многія жанры беларускага фальклору. Чарадзейныя казкі зберагаюць тэмы і сюжэты язычніцкіх міфаў, характарыстыкі міфічных персанажаў. Каляндарна-абрадавая паэзія адлюстроўвае міфічны змест абрадаў, да якіх яна адносіцца. Замовы маюць магічныя формулы язычніцтва, нават калі ў зачыне і канцоўцы ўтрымліваюць хрысціянскія элементы. Прыказкі і прымаўкі, выслоўі не абыходзяцца без імёнаў язычніцкіх багоў, хрысціянскіх святых, язычніцкіх духаў, персаніфікацыі з'яў прыроды. У народных гульнях захаваліся рэшты язычніцкіх абрадаў.

Зборы фальклору даюць вялікі і ў цэлым яшчэ не дастаткова глыбока асэнсаваны матэрыял для вывучэння як старажытнай, так і сярэдневяковай міфалогіі беларусаў.

Для даследаванняў міфалогіі на базе фальклору беларускія навукоўцы стварылі добры падмурак — шматтомную акадэмічную серыю «Беларуская народная творчасць», дзе зафіксавана вялікая колькасць тэкстаў і праведзена іх першасная апрацоўка. Ні адна краіна Еўропы не можа пахваліцца такім фундаментальным зборам твораў народнай вусна-паэтычнай творчасці. Акрамя таго, за апошнія 20—30 гадоў выйшла шмат зборнікаў па фальклору, падрыхтаваных асобнымі аўтарамі.

## Этнаграфічныя крыніцы

ЭТНАГРАФІЧНЫЯ матэрыялы дазваляюць аднавіць многія элементы беларускай міфалогіі. Найбольш значныя з гэтых крыніц абрады, у першую чаргу каляндарныя і земляробчыя, потым сямейныя.

Міфічная семантыка закладзена нават у жыллі беларускага селяніна: у выбары месца пабудовы хаты, яе прасторавай арганізацыі і дэкаратыўным аздабленні. Хатняе начынне, бытавыя рэчы выкарыстоўваліся ў абрадах, пры замовах, рытуалах, што таксама дазваляе весці рэканструкцыю міфічных уяўленняў. Арнаменты на адзенні, ручніках, посцілках зберагаюць сімволіку язычніцтва, хрысціянства.

Безумоўна, найбольшую каштоўнасць маюць этнаграфічныя матэрыялы XIX ст. Але пры выкарыстанні іх неабходна памятаць, што дзяржаўныя межы сучаснай Беларусі не супадаюць з беларускім этнічным рэгіёнам. Частка матэрыялаў яшчэ ў XIX ст. зыходзячы з палітычнай кан'юнктуры прыпісвалася нашым суседзям — Польшчы, Расіі, Літве, Латвіі, Украіне. Іх неабходна

вывучаць вельмі ўважліва, а тое, што сапраўды належыць беларусам, уводзіць у навуковы ўжытак.

Патрабуе франтальнага прагляду перыёдыка Беларусі XIX — пачатку XX ст. Газеты, часопісы, што выдаваліся ў Беларусі, утрымліваюць замалёўкі жыцця беларускага сялянства.

Этнаграфічныя крыніцы Беларусі надзвычай глыбокія і значныя. Спіс найбольш значных прац этнографаў XIX — XX стст. можна знайсці ў энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» (1989).

### Археалагічныя крыніцы

ДАДАТКОВУЮ, меншую па аб'ёму, але каштоўную сваёй аб'ектыўнасцю інфармацыю дае археалогія. Звесткі археолагаў дапаўняюць матэрыялы этнографаў і фалькларыстаў, дазваляюць дакладней вызначыць тыя ці іншыя элементы міфалогіі ў часе і прасторы.

Хоць і паволі, але ідзе працэс назапашвання адпаведнай інфармацыі па археалагічных крыніцах, звязаных з тэрыторыяй Беларусі. Безумоўна, археалагічныя дадзеныя — адна з найбольш дакладных крыніц звестак аб жыцці продкаў, нягледзячы на пэўныя цяжкасці ў асэнсаванні ўплыву матэрыяльных прадметаў на духоўную культуру ў цэлым, а тым больш у аднясенні іх да сферы міфалогіі.

Для вывучэння міфалогіі беларусаў маюць значэнне ідэаграфічныя тэксты, якія захаваліся на костках, кераміцы, культавых прадметах і іншых артэфактах.

Пахаванні даюць магчымасць рэканструяваць пахавальную абраднасць і ўяўленні людзей аб Тым Свеце.

Язычніцкія капішчы таксама маюць значэнне для рэканструкцыі абраднасці, раскрываюць формы і віды ахвярапрынашэнняў. Абярэгі, знойдзеныя на раскопках старажытных паселішчаў ці пахаванняў, даюць звесткі аб татэмных жывёлах, зберагаюць міфічную сімволіку. Прадметы быту ўпрыгожваліся сімваламі і арнаментамі.

За XX ст. назапашаны значны археалагічны матэрыял, які зафіксаваны ў друкаваных выданнях і справаздачах археалагічных экспедыцый, але яшчэ чакае даследавання і асэнсавання з пазіцый міфалогіі. Амаль поўны спіс археалагічных прац, што датычацца тэрыторыі Беларусі і надрукаваны ў розныя гады XIX — XX стст., утрымліваюць чатыры тамы энцыклапедычнага выдання «Археалогія Беларусі» (1997—2002).

## Мова і тапаніміка

МОВА І МІФ непарыўныя. Многія словы нараджаліся дзеля абазначэння тых ці іншых міфічных уяўленняў і да нашага часу захоўваюць гэты ўзровень. У беларускай мове ёсць словы, якія ўзніклі 1000 гадоў таму. Многія з іх абазначаюць імёны язычніцкіх багоў і духаў, міфічныя ўяўленні, сакральныя прадметы. Рэканструкцыя міфаў беларусаў патрабуе этымалагічнага, семантычнага вывучэння міфонімаў, вызначэння арэала іх бытавання, замацавання іх сродкамі картаграфіі. У першую чаргу дадзенымі пытаннямі займаецца этналінгвістыка, якая вывучае мову ў адносінах да культуры народа, адлюстраванне ў мове міфічных уяўленняў. Частка слоў беларускай мовы мае адзінкавае значэнне, якое звязана з вераваннямі і міфічнымі ўяўленнямі. Значныя матэрыялы па Беларусі ўтрымлівае серыя этналінгвістычных даследаванняў, праведзеных у 80-я гг. XX ст. на Беларускім і Украінскім Палессі[1]. Ужо першыя даследаванні на тэрыторыі Палесся пацвердзілі выніковасць гэтага напрамку.

Многія кірункі мовазнаўства, нават такія вузкія, як антрапаніміка, якая вывучае асабовыя імёны людзей, іх паходжанне, здольны даць матэрыял па міфалогіі беларусаў. Вызначэнне язычніцкіх і хрысціянскіх імёнаў дазваляе правесці мяжу выкарыстання язычніцкіх імёнаў па часе і тэрыторыі[2].

Распаўсюджанасць язычніцкіх найменняў і фіксацыя іх на карце Беларусі разглядаюць тапаніміка і мікратапаніміка, якія вывучаюць уласныя імёны геаграфічных аб'ектаў. Тапаніміка Беларусі адзначае наяўнасць назваў розных гістарычных перыядаў, культур, зберагае падчас тое, што не трапіла ў пісьмовыя крыніцы. Сярод іх засталіся і назвы, звязаныя з міфічнымі ўяўленнямі. Тапонімы вызначаюць пnásторавыя характарыстыкі распаўсюджвання тых ці іншых міфалагічных элементаў на тэрыторыі Беларусі, акрэсліваюць рэгіянальныя асаблівасці міфалогіі беларусаў.

[1] Полесский этнолингвистический сборник : материалы исследования. — М., 1983.

[2] *Усціновіч, Г. К.* Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны (XIV — XX стст.) / Г. К. Усціновіч. — Мінск, 1975.

## Глава 4. **Генезіс і фарміраванне міфічных уяўленняў беларусаў**

ПЕРШАБЫТНАЯ культура — міфічная культура. Міфалогія ўваходзіла ва ўсе сферы жыцця (духоўную, матэрыяльную, сацыяльную) першабытнага і раннекласавага грамадства, якія ў свой час існавалі на тэрыторыі Беларусі.

Міф з'яўляўся сродкам канцэнтрацыі вопыту, формай яго арганізацыі, захавання і перадачы новым пакаленням. Міфалогія — інфармацыйны банк першабытнага грамадства, які ўтрымліваў накопленыя людзьмі эмперычныя веды аб прыродным асяроддзі Беларусі, традыцыях, што існавалі ў грамадстве, тым самым выконваючы і гнасеалагічную, і ідэалагічную функцыі.

Міфалогіі і міфу ўласцівы шэраг сацыяльных функцый. Міф узмацняў грамадскую мараль, даказваў мэтазгоднасць абраду і культу, замацоўваў правілы паводзін чалавека ў грамадстве і ў адносінах да прыроды. Таму ён з'яўляецца не толькі прадуктам уяўленняў, але і актыўнай сацыяльнай сілай.

Фарміраванне міфалогіі суадносіцца з асяроддзем пражывання і жыццядзейнасці людзей. Міфічныя ўяўленні эвалюцыянавалі разам з развіццём грамадства, адначасова адлюстроўваючы яго стан. Развіццё міфалогіі беларусаў адбывалася па агульных міфічных законах, але ў той жа час мела і пэўную спецыфіку, якая звязана з гісторыяй фарміравання беларускага этнасу, народнасці.

Толькі ў 10-м тысячагоддзі да н. э., калі ледавік канчаткова сышоў з тэрыторыі сучаснай Беларусі, у яе паўднёвай частцы з'явіліся паўднёвыя еўрапеоіды, якія паступова, на працягу двух тысячагоддзяў, засялілі ўсю гэту тэрыторыю. З 9—8-га тысячагоддзяў да н. э., калі сфарміравалася пастаяннае насельніцтва і пачалося ўстойлівае існаванне першабытнага грамадства, мы можам весці адлік узнікнення і фарміравання міфічных уяўленняў.

Безумоўна, першабытныя людзі, якія засялялі тэрыторыю Беларусі, ужо мелі пэўныя міфічныя ўяўленні, сфарміраваныя папярэдняй гісторыяй. Бясспрэчным з'яўляецца і тое, што ў новых умовах іх уяўленні павінны былі эвалюцыянаваць і надалей развівацца пад уздзеяннем не толькі агульнагістарычных законаў, але гісторыка-культурных і прыродных фактараў, набываць пэўную спецыфічнасць, звязаную з канкрэтным рэгіёнам іх жыццядзейнасці.

Развіццё міфалогіі беларусаў неабходна разглядаць у гісторыка-храналагічным аспекце, абапіраючыся на важнейшыя этапы жыццядзейнасці чалавечага грамадства на нашай зямлі. Свет прыроды заставаўся амаль нязменным, але на працягу тысячагоддзяў мянялася ступень яе пазнання,

асэнсавання чалавекам навакольных з’яў. У сувязі з гэтым змянялася ўспрыманне карціны рэальнага свету і яго адлюстраванне ў свядомасці людзей праз класіфікацыю і фарміраванне вобразаў. Зыходзячы з якасных змен, што адбываліся на працягу 10 тысяч гадоў, і нашых ведаў пра іх, мы можам вызначыць асобныя перыяды развіцця беларускай міфалогіі.

## Архаічны перыяд развіцця міфічных уяўленняў

ДА АРХАІЧНАГА перыяду развіцця міфалогіі мы адносім час з 9-га тысячагоддзя па VIII — VII стст. да н. э., калі ў межах сучаснай Беларусі існавала першабытнае грамадства. Рэканструкцыю міфічных уяўленняў гэтага перыяду мы можам рабіць гіпатэтычна, зыходзячы толькі з артэфактаў, даследаваных археолагамі.

Паўднёвыя еўрапейцы, якія прыйшлі на зямлю Беларусі, былі на той стадыі культурнага развіцця, калі асноўныя формы міфічных уяўленняў — татэмізм, анімізм, фетэшызм, магія — ужо існавалі. **Палеаліт** — час паляўнічых і збіральнікаў. Гэта знайшло свой адбітак у мысленні чалавека і адлюстраванні яго ўяўленняў аб свеце. Прырода займала галоўнае месца ў вобразнай карціне свету.

Матэрыяльныя рэшткі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі захоўваюць выявы людзей і жывёл. Археолагамі знойдзены ўпрыгажэнні, якія ў той час выконвалі не эстэтычную, а магічную функцыю. Цела і вопратку людзі аздаблялі рознымі амулетамі з зубоў звяроў. Пра існаванне культу ваўка сведчаць выяўленыя ў розных месцах Беларусі яго рытуальныя пахаванні і экспанаванне воўчых чарапоў, што пацвярджае існаванне татэмічных уяўленняў. Палеаліт — час матрыярхату. Месца і роля жанчыны ў жыцці тагачаснага грамадства была вызначальнай. Выробленыя з косці фігуркі жанчын, «палеалетычныя Венеры», сведчаць аб ушанаванні жанчыны і існаванні ўяўленняў аб продках па мацярынскай лініі. «Палеалетычныя Венеры» сімвалізавалі адзінства членаў роду, а таксама жаночую плоднасць. Многія навукоўцы схіляюцца да думкі, што гэтыя фігуркі — помнікі культу звышнатуральнай усемагутнай істоты, якая была вядома пазней у некаторых народаў як Вялікая багіня, што ўвасабляла паняцці нараджэння і смерці, спрыяла як прыплоду ў дзікіх звяроў, так і паляванню на іх.

У перыяд **мезаліту** (8—5-е тысячагоддзі да н. э.) асноўным заняткам першабытных людзей па-ранейшаму застаецца збіральніцтва і паляванне. На нашай зямлі адбываецца змена культур, у працэсе чаго штосьці знікае бяс-

следна, а нешта пераймаецца і захоўваецца. Безумоўна, адбываецца міксацыя культур.

Але, на жаль, нават гепатэтычна цяжка выказваць думкі аб наяўнасці ў гэты перыяд нейкіх міфічных элементаў: на сёння вельмі мала знаходак з рога і косці, якія былі асноўным матэрыялам для арнаментацыі і дробнай пластыкі. Бясспрэчна адно: павінен быў адбывацца працэс ускладнення міфічных уяўленняў часоў палеаліту.

У **неаліце** (5—3-е тысячагоддзі да н. э.) пачынаецца працэс пераходу да ранняга земляробства, а разам з гэтым адбываюцца значныя змены ў ладзе жыцця першабытных людзей і, адпаведна, у міфалогіі.

Жывёльныя матывы пачынаюць адыходзіць на другі план. На першае месца выходзіць шанаванне раслін, зямлі, сонца, вады. У сувязі з гэтым адбываецца працэс пераасэнсавання сімволікі палеаліту.

У неаліце адзначаюцца выявы антрапаморфных істот. Выявы з Асаўца (Бешанковіцкі раён), выкананыя з дрэва і косці, адлюстроўваюць еўрапеоідны антрапалагічны тып. Частка навукоўцаў лічыць, што гэта вобразы супляменнікаў, некаторыя бачаць у іх вобразы міфічных істот.

Калі ў мастацтве палеаліту антрапаморфныя выявы прысвечаны пераважна жанчынам, то ў неаліце сустракаюцца толькі мужчынскія. Гэта выклікана пераходам раннеродавага грамадства да познеродавага і патрыярхату, узрастаннем ролі мужчын у грамадстве, што, вядома, пацягнула змены ў сацыяльных прыярытэтах і ў міфічных уяўленнях тагачасных людзей.

Культ жывёл у неаліце яшчэ захоўваецца. Нягледзячы на тое, што паляванне адыходзіла на другое месца, роля яго ў жыцці людзей была ўсё ж такі значнай. Мяркуючы па касцяных фігурках жывёл, мы можам сцвярджаць, што ўшаноўваліся лось, качка, чапля, змяя. Існаваў культ лася, які, верагодна, паходзіў яшчэ з палеаліту. Выявы качак маглі быць адлюстраваннем як хтанічных вераванняў, так і культу сонца. Вядомы розныя амулеты, у тым ліку з прасвідраваных зубоў мядзведзя і дзіка. Хутчэй за ўсё, яны павінны былі перадаваць людзям сілу і спрыт адпаведных звяроў. Не выключана, што амулетамі маглі быць і зубы звяроў — татэмаў роду[1]. Беларускія археолагі адзначаюць у неаліце факты шанавання крыніц. Ёсць думка, што ў гэты перыяд ушаноўваліся і асабліва вялікія валуны.

З'яўленне керамікі — гэта крок у развіцці матэрыяльнай культуры. Гліняны посуд неаліту пакрываўся разнастайным арнаментам, які меў магічны сэнс.

---

[1] Гісторыя Беларусі : у 6 т. — Т. 1 : Старажытная Беларусь : ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XII ст. — Мінск, 2000. — С. 61.

Арнаментальныя элементы ўтваралі паясы, вертыкальныя лініі, рамбічныя кампазіцыі.

З канца неаліту захавалася некалькі пахаванняў, якія адносяцца да культуры шарападобных амфар. Канструкцыя магіл і тое, што ў іх змяшчалася, сведчаць: «шарападобнікі» практыкавалі як культ памерлых, так і культ плоднасці.

У час **бронзавага веку** (2-е тысячагоддзе да н. э. — VIII—VII стст. да н. э.) адбываецца канчатковы пераход людзей, што жылі на тэрыторыі Беларусі, да земляробства і замацаванне патрыярхату як формы сацыяльнай арганізацыі грамадства.

Значная культурная і гістарычная падзея — прыход на беларускія землі індаеўрапейцаў, якія аказалі ўплыў на культуру абарыгенаў, у многім асімілявалі яе, але не змаглі поўнасцю выцясніць. Міфалогія нашых продкаў папаўняецца новымі індаеўрапейскімі элементамі і надалей развіваецца як міфалогія земляробчага народа. У гэты перыяд пачынаюць фарміравацца архетыпы і міфалагемы, якія захаваліся ў міфалогіі беларусаў да нашага часу. У выніку змешвання індаеўрапейцаў і аўтахтонаў на террыторыі Беларусі фарміруюцца плямёны балтаў.

У перыяд бронзы ўдасканальваецца зямляробства. Стаўшы асноўным заняткам насельніцтва, яно спрыяе пашырэнню культу сонца, паколькі ад гэтага свяціла залежала прарастанне і рост раслін. Распаўсюджвалася шанаванне дажджу і звязаных з ім навальніц і маланак[1].

У бронзавым веку працягваў існаваць культ жывёл. Гэта пацвярджаюць знаходкі амулетаў з прасвідраваных зубоў дзіка, мядзведзя, ваўка, лася, бабра, а таксама скульптурныя выявы звяроў, птушак і змей.

Аб тым, што ў гэты час міфічныя ўяўленні былі дастаткова складанымі і існавалі разам з рэлігійнымі, сведчыць наяўнасць адпаведных збудаванняў для правядзення абрадаў. Так, насельніцтва тшцінецкай культуры (Паўднёвая Беларусь) будавала круглыя бажніцы са слупоў і жэрдак, у сярэдзіне якіх знаходзіліся ахвярнікі і нават пахаванні. Для розных культавых мэт выкарыстоўваліся мініяцюрныя арнаментаваныя пасудзінкі, гліняныя рагатыя праслачкі і некаторыя іншыя рэчы[2].

Міфічныя ўяўленні знайшлі сваё адлюстраванне ў першабытным мастацтве. На посудзе ў арнаменце намаляваны сімвалы салярнага культу — радыяльныя ўзоры на донцах пасудзін. Сімваламі салярных божастваў былі крыжападобныя фігуры, адзінарныя або двайныя кругі на дне пасудзін, шмат-

[1] Гісторыя Беларусі : у 6 т. — Т. 1. — С. 84.

[2] Там жа. — С. 85.

прамянёвыя выявы. Заштрыхаваныя трохкутнікі з’яўляліся як сімвалам багіні неба, так і знакам зямлі. Арнамент у выглядзе паўкругоў з кропкамі па перыметры знойдзены на адной са стаянак. Гэта ўзор паўночнабеларускай культуры, які мог абазначаць зерне, арашаемае нябеснай вільгаццю. Яе сімвалізаваў зігзаг — папулярны сярод раннебронзавых «шнуравікоў» арнаментальны матыў. Даследчыкі лічаць, што некаторыя матывы арнаменту керамікі з перыяду бронзы захаваліся да нашага часу ў беларускіх народных ткацтве і вышыўцы.

## Старажытная міфалогія беларусаў

СТАРАЖЫТНЫ перыяд развіцця міфалогіі беларусаў цягнецца з IX — VIII стст. да н. э. і да X — XI стст. н. э. Гэта жалезны век, час сацыяльнай іерархізацыі і пераходу да раннекласавага грамадства. Сацыяльная структура грамадства ўскладняецца, а разам з гэтым — і сацыяльнае жыццё, што аказвае значны ўплыў на свядомасць людзей. З’явы сацыяльнага жыцця пераносяцца на сферу міфічных уяўленняў.

Згодна з логікай міфічнай свядомасці ўяўныя акты стварэння космасу неабходна было паўтараць у выглядзе рытуальных абрадаў у час важнейшых свят, звязаных з кругаваротам у прыродзе ці важнейшымі падзеямі жыцця чалавека, такімі як нараджэнне, вяселле, пахаванне і г. д.[1]. Усе абрады, што захаваліся ў беларускай вёсцы да XIX ст., маюць свой пачатак у гэтым часе.

У ***жалезным веку*** пачынае фарміравацца пантэон багоў. Элементы сацыяльнай культуры пераносяцца і на яго. Навукоўцы лічаць, што ўзрастае значэнне бога-грамавіка, распарадчыка навальніц, маланак і дажджу, апекуна ваеннай справы. Але паводле сярэднявечных пісьмовых крыніц можна меркаваць, што не менш уплывовым лічылася нейкае бажаство, якое ўяўлялася апекуном жывёлы, было богам багацця і апекавала старажытных жрацоў. Пазней гэта бажаство замяніць славянскі Вялес, якога заўсёды адзначаюць разам з Перуном.

У насельніцтва днепра-дзвінскай культуры існавалі свяцілішчы чатырохвугольнай у плане формы, з падмазанай глінай падлогай і спецыяльнымі гліністымі агнішчамі-ахвярнікамі. Пазней распаўсюдзіліся круглыя ў плане гарызантальныя пляцоўкі-свяцілішчы.

Пачаткам нашай эры датуюцца самыя раннія на тэрыторыі Беларусі выявы свастык, якія даследчыкі звычайна лічаць сімваламі агню ці сонца. Прадметы са свастыкамі знаходзяць на гарадзішчах культур штрыхавой керамікі,

[1] *Элиаде, М.* Космос и история / М. Элиаде. — М., 1987. — С. 112.

днепра-дзвінскай і кіеўскай, на заходнебалцкім могільніку каля в. Нача (Воранаўскі раён). Амаль усе гэтыя свастыкі, у адрозненне ад больш позніх, правабокія, гэта значыць павернутыя канцамі па гадзіннікавай стрэлцы[1]. Яны сімвалізуюць сонца, мужчынскі пачатак.

Аб захаванні ў гэты час культу жывёл сведчаць археалагічныя знаходкі. Так, на мілаградскіх гарадзішчах у Паўднёвай Беларусі знойдзена больш за 100 фігурак жывёл. Гэта выявы каня, радзей — буйной рагатай жывёлы і сабак. Знойдзены фігуркі кароў, а на гарадзішчы Падгор'е (Добрушскі раён) — фігурка бабра і падвеска з мядзведжага клыка[2]. У мілаградцаў сустракаліся таксама ахвярныя пахаванні дзікіх і свойскіх жывёл. Так, на Гарошкаўскім гарадзішчы і за яго валамі выяўлена некалькі такіх пахаванняў. Косці ляжалі ў анатамічным парадку, а ў адным з пахаванняў сабакі знаходзілася разбітая пасудзіна[3].

Культ жывёл меў распаўсюджанне і ў плямён зарубінецкай культуры. Пры раскопках могільніка Атвержачы (Столінскі раён) у адным з пахаванняў трапіліся абгарэлыя косці мядзведзя[4], а на могільніку Чаплін (Лоеўскі раён) у пахаваннях былі косці казулі, зуб сабакі, зуб каровы. У культурным пласце Чаплінскага гарадзішча знойдзены прасвідраваныя клыкі ваўка, зуб мядзведзя і зуб бабра[5]. Для плямён Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі былі характэрны амулеты з іклаў мядзведзя і дзіка, што сведчыць пра існаванне тут культу гэтых жывёл. Магчыма, «Камаедзіца», рытуал у гонар мядзведзя, зафіксаваны у XIX ст. на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці, — рэшткі гэтага культу.

Значныя змены ў міфічных уяўленнях беларусаў адбываюцца ў VI — IX стст. н. э. Прыход на тэрыторыю будучай Беларусі славян, працэсы асіміляцыі і сінтэзу балцкай і славянскай культур сфарміравалі апошнія элементы міфалогіі беларусаў. У беларускім грамадстве адбываюцца значныя сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя і духоўныя змены. Узнікаюць гарады,

---

[1] Гісторыя Беларусі : у 6 т. — Т. 1. — С. 121.

[2] *Рассадин, С. Е.* К вопросу о религиозных верованиях жителей Белорусского Посожья в скифское время / С. Е. Рассадин // Религиозные представления в первобытном обществе : тез. докл. конф. — М., 1987. — С. 185.

[3] Гісторыя Беларусі : у 6 т. — Т. 1. — С. 119.

[4] *Поболь, Л. Д.* Славянские древности Белоруссии (могильники раннего этапа зарубинецкой культуры) / Л. Д. Поболь. — Минск, 1975. — С. 40.

[5] *Поболь, Л. Д.* Славянские древности Белоруссии (ранний этап зарубинецкой культуры) / Л. Д. Поболь. — Минск, 1971. — С. 85, 149.

ідзе выдзяленне і фарміраванне сацыяльных эліт — грамадскіх і духоўных кіраўнікоў, надзеленых палітычнай і рэлігійнай уладай. Усё гэта, безумоўна, адбівалася на духоўнай і сакральнай сферах жыцця грамадства.

Язычніцкую міфалогію беларусаў нельга ўяўляць чымсьці адзіным, паколькі саюзы плямёнаў, што насялялі тэрыторыю Беларусі, адрозніваліся паміж сабой па ўзроўню культурнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця і, адпаведна, міфічных элементаў. Па-рознаму зберагаліся старажытныя традыцыі і складваліся адносіны з балтамі. Розніўся тэмп і ўзровень развіцця грамадства на землях Беларусі. Усе гэтыя фактары непазбежна ўносілі карэктывы ў працэс развіцця міфалогіі плямён, што насялялі нашу зямлю. Таму ў міфалогіі беларусаў можна адзначыць рэгіянальныя асаблівасці, звязаныя з тэрыторыямі жыццядзейнасці асноўных плямёнаў: крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў.

Да канца X ст. адбываецца завяршаючы этап развіцця язычніцкай міфалогіі беларусаў — рэгіянальнага варыянта ўсходнееўрапейскай міфалогіі, які яднае асобныя славянскія і балцкія элементы.

## Глава 5. Міфалогія беларусаў: агульная характарыстыка

### Міфалогія — першы этап развіцця культуры

ВЫТОКІ язычніцкай міфалогіі беларусаў ляжаць у міфічных і рэлігійных уяўленнях плямёнаў, якія насялялі Беларусь яшчэ ў 2—1-м тысячагоддзях да н. э. Навукоўцы адзначаюць, што насельніцтва Беларусі з таго і да нашага часу застаецца аўтахтонным[1]. Гэта стварыла ўмовы для захавання і трансляцыі элементаў культуры ў часе і фарміравання этнічнай тэрыторыі. У геаграфічным плане этнічную тэрыторыю беларусаў вызначылі Я. Карскі і М. Доўнар-Запольскі.

У першабытным грамадстве, што існавала на тэрыторыі Беларусі, міфалогія ўяўляла асноўны спосаб разумення свету, а міф адлюстроўваў светаадчуванне і светаразуменне эпохі яго ўтварэння, месца і ролю чалавека ў ёй.

На працягу трох тысячагоддзяў развіцця міфалогіі адбываюцца працэсы асіміляцыі запазычанага (ці прынесенага звонку) матэрыялу. Язычніцкая

[1] *Мікуліч, А.* Беларусы ў генетычнай прасторы : антрапалогія этнасу / А. Мікуліч. — Мінск, 2005.

міфалогія беларусаў развівалася як самастойная з’ява, але нельга не браць пад увагу працэсы ўзаемадзеяння з міфалогіямі народаў Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы і ўздзеянне міфічных уяўленняў славян, якія прыйшлі на землі Беларусі ў IV—VI стст.

Язычніцкая міфалогія беларусаў робіцца зразумелай толькі пры ўліку асаблівасцей першабытнаабшчыннага ладу беларусаў, якія ўспрымалі свет як жыццё родавай абшчыны, а ў міфах абагульнялі ўсю разнастайнасць чалавечых і грамадскіх адносін, прыродных з’яў.

Міф узмацняў грамадскую мараль, даказваў мэтазгоднасць абраду і культу, замацоўваў правілы паводзін чалавека ў грамадстве і ў адносінах да прыроды. Таму міф з’яўляецца не толькі прадуктам уяўленняў, але і актыўнай сацыяльнай сілай. Міф — свайго роду прагматычны закон, які вызначае рэлігійную веру і маральную мудрасць, цалкам падобную той, што захавана ў кнігах монатэістычных рэлігій — Бібліі, Каране.

Міф быў шчыльна пераплецены з рытуальным жыццём плямён і адлюстроўваў татэмічныя культы, каляндарныя абрады. Некаторыя міфы дакладна звязаны з абрадамі, з’яўляючыся іх часткай. Як бы ні суадносіліся асобныя міфы і абрады, іх аб’ядноўвае адзіная міфічная семантыка, адзіная сімвалічная сістэма.

Міфалагічная сістэма язычніцтва падверглася значнай трансфармацыі ў часы ўсталявання хрысціянства. Таму сёння магчыма толькі рэканструкцыя асноўных міфічных элементаў на падмурку другасных пісьмовых, фальклорных, этнаграфічных, археалагічных і іншых крыніц.

## Спецыфічныя рысы язычніцкай міфалогіі беларусаў

ЯЗЫЧНІЦКАЯ МІФАЛОГІЯ беларусаў мае агульныя рысы, уласцівыя ўсім язычніцкім міфалогіям народаў свету, і спецыфічныя, якія характэрны толькі ёй і звязаны як з працэсам яе развіцця, так і з наяўнасцю структурных элементаў.

Тыпалагічна язычніцкая міфалогія беларусаў адносіцца да ўсходнеславянскай, але мае значныя рэгіянальныя асаблівасці, якія адрозніваюць яе ад украінскай і рускай.

Язычніцкая міфалогія беларусаў у сваёй аснове — міфалогія земляробчых плямён. Але ў ёй захаваліся значныя рэшткі старажытных уяўленняў, звязаных з перыядам жыцця да земляробства.

Галоўныя рысы міфалогіі беларусаў знаходзяць вызначэнне ў наборы асноўных семантычных супрацьпастаўленняў, якія даюць часава-прастора-

вые, сацыяльныя, ацэначныя характарыстыкі свету (добрыя і нядобрыя да чалавека): доля — нядоля, жыццё — смерць, цот — няцот, правы — левы, верх — ніз, Багонь — Гэты Свет, Гэты Свет — Той Свет, поўдзень — поўнач, усход — захад, агонь — вада, дзень — ноч, вясна — зіма, сонца — месяц, белы — чорны, блізкі — далёкі, дом — лес, мужчынскі — жаночы.

У той жа час спецыфічным для міфалогіі беларусаў з'яўляецца панаванне ў прасторавых уяўленнях мезакосмасу ў выглядзе лакальных тэрыторый з асабістымі сакральнымі цэнтрамі і яе бліжэйшых суседзяў. Таму найбольш распаўсюджаныя міфы беларусаў маюць характар мясцовых паданняў, што тлумачаць паходжанне колькі-небудзь значных месц і прыродных аб'ектаў: гор (узгоркаў), азёраў, крыніц, ям, якія ёсць вынік дзейнасці духаў, асілкаў, чараўнікоў.

Язычніцкая міфалогія беларусаў утрымлівае значную колькасць індаеўрапейскіх элементаў, якія захаваліся ад балцкага субстрату ці былі прынесены славянамі.

Характэрным для язычніцкай міфалогіі беларусаў з'яўляецца наяўнасць значнай колькасці элементаў магіі. Яны знайшлі сваё адлюстраванне ў міфалагічных тэкстах і абрадавай практыцы. Шляхам выканання магічных дзеянняў старажытны беларус намагаўся ўздзейнічаць на прыроду і духаў дзеля дасягнення сваіх мэт: зберагчы ўраджай, вылечыць хворага і г. д. Што да другасных бытавых праблем, то іх рэалізацыя здзяйснялася, як правіла, з дапамогай актыўных метадаў уздзеяння: прыкмет, прадбачанняў — усяго таго, што вызначаецца сучаснай навукай як павер'і.

Найбольш поўна захаваліся міфічныя ўяўленні 1-га тысячагоддзя н. э. Значная іх частка суадносіцца з духамі прыроды і хваробы, а таксама з уяўленнямі аб духах і божаствах, звязаных з земляробствам.

## Асаблівасці міфічнага мыслення беларусаў-язычнікаў

ПАД МЫСЛЕННЕМ у сучаснай навуцы разумеюць працэс пазнавальнай дзейнасці чалавека, які характарызуецца абагульненым і апасродкаваным адлюстраваннем рэчаіснасці. У гісторыі чалавецтва вызначаюць тры асноўныя формы мыслення: міфічнае, рэлігійнае, філасофскае (навуковае).

Міфічнае мысленне — асаблівая форма мыслення, характэрная для першабытнага і раннекласавага перыяду развіцця грамадства. Нягледзячы на сваю спецыфіку, яно дазваляла мадэліраваць, класіфікаваць і інтэрпрэтаваць свет, грамадства і самога чалавека.

Л. Леві-Бруль выказаў думку, што мысленне першабытнага чалавека не адрознівалася ад мыслення сучаснага чалавека. К. Леві-Строс лічыў, што ў першабытнага чалавека апарат мыслення (мозг) быў такі, як і ў нас, толькі матэрыял, якім ён аперыраваў, адрозніваўся. Э. Тэйлар сцвярджаў, што першабытнае мысленне цалкам рацыянальнае, скіраванае на практычную жыццядзейнасць.

Беларускі міф — вынік мысліцельнай дзейнасці этнаса, які яго ствараў. Сусвет для старажытнага беларуса зразумелы, таму што ён вытлумачаны міфам. Міфічная свядомасць беларусаў-язычнікаў дае вобразнае адлюстраванне Сусвету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Мысленне старажытных беларусаў будавалася па агульнаміфалагічных законах. Галоўным было агульнае для ўсіх язычніцкіх міфалогій уяўленне, што за ўсім нежывым стаіць жывое, кожны працэс кіруецца чыімсьці розумам, Сусвет у кожнай сваёй частцы населены і залежыць ад чыёйсьці волі.

У язычніцкай міфалогіі беларусаў мелі месца і пэўныя асаблівасці. Гэта, у першую чаргу, высокая ступень злітнасці чалавека з прыродай. Для старажытнага беларуса навакольны свет быў жывы. Прадметы навакольнага асяроддзя — гэта суб’екты, якія маюць характар асобы.

Беларус-язычнік верыў: Сусвет напоўнены багамі; прырода жывая, у ёй усё думае, гаворыць з людзьмі. «Язычніцкі політэізм засяляў прыроду шматлікімі божаствамі і тым самым рабіў яе свяшчэннай для чалавека, непадуладнай ягонай сваволі»[1].Чалавек быў адказны за свае ўчынкі як перад чалавечай грамадой, так і перад сакралізаванай прыродай. Паразуменне з прыродай — характэрная з’ява для беларуса-язычніка. На гэтай глебе сфарміравалася ўшанаванне камянёў, дрэў, жывёл.

Міфалогія беларусаў утрымлівае значны пласт анімістычных уяўленняў, адным з характэрных элементаў якіх з’яўляюцца міфы аб душах памерлых продкаў — аб дзядах.

Элементаў татэмічных уяўленняў у язычніцкай міфалогіі беларусаў таксама шмат. Гэта добра прасочваецца не толькі ў міфах, але і ў абрадах. Існуюць міфы, якія носяць сляды старажытных татэмістычных вераванняў аб продках у вобразах жывёл.

Кіравалі светам багі, за імі стаяў шэраг ніжэйшых божастваў і духаў, якія былі ў старэйшых багоў на паслугах. Багоў шмат, яшчэ больш бажкоў, але падзелу на сапраўдных і несапраўдных не было. Кожны з іх займаў сваё месца ў Сусвеце і ў жыцці чалавека і рабіў сваю справу. Багі змагаюцца паміж

[1] *Панарин, А.* Культурная революция «новых правых» / А. Панарин // Франция глазами французских социологов. — М., 1990. — С. 90.

сабой, але гэта барацьба не на знішчэнне, а дзеля ўсталявання раўнавагі ў Сусвеце, што ідзе на карысць чалавеку. «Белбог мог знішчыць усе злыя сілы, але не робіць гэтага, каб чалавек не забыў пра багоў… Бывае, што злое перамагае і Бога…»[1]. Жыццё — бясконцая барацьба дабра і зла, у якой няма пераможцаў.

Беларус аднолькава шанаваў і добрых, і нядобрых багоў. І да тых, і да іншых адносіўся з аднолькавай павагай. Беларус-язычнік не бегаў ад лёсу, ён прымаў яго такім, якім ён быў. «Дзіўная паняверка славян, калі яны на сваіх святах і гульбішчах носяць чашу па крузе, прамаўляючы над ёй словы … у імя багоў добрага і злога, бо чакаюць ад добрага бога шчаслівай долі, а ад злога — няшчасця»[2]. Беларусы шануюць і тых, і другіх, але перавагу аддаюць першым за іх «людскасць», набліжанасць да людзей і вобразамі, і ўчынкамі.

Богі Багоні — мудрыя дарадцы і апекуны ў адносінах да беларуса-язычніка, фактычна першапродкі. Нават смерць не раздзяляе чалавека ні з багамі, ні з яго суродзічамі: душа памерлага будзе жыць у Выраі, што месціцца ў Багоні і зможа наведваць блізкіх на Гэтым Свеце. Жыццё ў Багоні — працяг зямнога.

Усе з’явы чалавечага жыцця ўплецены ў тканіну існавання Сусвету і, як усе з’явы і працэсы, падлягаюць ураўнаважанню. Таму на крайніх полюсах знаходзяцца нараджэнне і смерць. «Менавіта праз глыбіннае асэнсаванне супрацьстаяння жыцця і смерці нашы продкі акрэслілі смерць як з’яву ў кантэксце вечнасці жыцця, а не наадварот»[3].

Значнае месца ў жыцці і, адпаведна, у язычніцкай міфалогіі беларусаў аддадзена міфам пра чараўнікоў — людзей, якія маглі паспрачацца з духамі ці нават прымусіць іх выконваць волю чалавека.

## Міфалогія беларусаў як сістэма тэкстаў

МЫ РАЗГЛЯДАЕМ язычніцкую міфалогію беларусаў як сістэму ўяўленняў і спосаб разумення Сусвету. Уяўленні аб Сусвеце і разуменне яго як выніковыя акты мысліцельнай дзейнасці знайшлі

---

[1] *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі; прадм. У. К. Касько. — Мінск : Універсітэцкае, 1998. — С. 236—237.

[2] *Сысоў, У. М.* Беларуская пахавальная абраднасць : структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння / У. М. Сысоў. — Мінск, 1995. — С. 131.

[3] Там жа. — С. 131.

сваё адлюстраванне ў вербальных і сімвальных тэкстах, якія мы называем міфамі і сімваламі. Да нашага часу яны дайшлі дзякуючы іх фіксацыі з дапамогай пісьмёнаў ці праз выявы сімвалаў. Такім чынам, міфалогія для сучаснага чалавека — гэта, у першую чаргу, сукупнасць уласна тэкстаў міфаў. Яны ж з'яўляюцца асноўным матэрыялам для рэканструкцыі міфаў.

Язычніцкая міфалогія беларусаў функцыянавала і захоўвалася толькі ў вуснай традыцыі. Аўтэнтычныя тэксты язычніцкіх міфаў беларусаў не зберагліся. Фіксацыя міфаў пачынаецца толькі з XVI ст., вывучэнне навукоўцамі — з XIX ст., калі язычніцкія міфічныя ўяўленні былі ўжо ў значнай ступені дэфармаваны хрысціянствам. Але існуе вялікая колькасць другасных тэкстаў і мікратэкстаў, звязаных з язычніцкай міфалогіяй.

Пад тэкстам міфа мы разумеем разгорнуты тэкст з закончаным аповедам аб міфічным персанажы ці з'яве, а пад мікратэкстам — невялікі (30—50 слоў) тэкст, які ўтрымлівае міфічны факт, міфонім, міфалагему, ці ўрывак з вялікага тэксту. Мікратэксты выразна адлюстроўваюць нейкі элемент міфічнага мыслення, але не з'яўляюцца міфам. У той жа час мікратэксты дазваляюць зрабіць сінтэз новага міфалагічнага тэксту ці, сабраныя па кавалках, аднавіць міф.

У язычніцкай міфалогіі беларусаў шэраг тэм і матываў паўтараецца, што дазваляе падзяліць міфы на пэўныя групы. Такія групы ў міфалогіі вызначаюць як катэгорыі (лац. categoricus — выказванне, суджэнне). Пад катэгорыяй разумеюць групу міфаў, якія аб'яднаны агульнай тэмай ці матывам.

У язычніцкай міфалогіі беларусаў існуюць усе класічныя катэгорыі міфаў, але не ўсе яны прадстаўлены аднолькава поўна.

Найбольш значная група — гэта міфы **этыялагічныя**, у якіх тлумачыцца паходжанне жывёл, раслін, прыродных аб'ектаў. У яе ўваходзяць міфы аб паходжанні дрэў і кветак (бярозы, рабіны, явару, дуба, папараць-кветкі, зязюльчыных слёз), птушак і жывёл (ластаўкі, зязюлі, бусла, дзятла, мядзведзя, ваўка), азёр, рэк, гор.

**Касмаганічныя** міфы, якія прысвечаны паходжанню Сусвету і яго частак, захаваліся горш.

**Татэмічныя** міфы апавядаюць аб паходжанні людзей ці багоў ад тых ці іншых жывёл і аб іх ушанаванні. Татэмнымі жывёламі ў беларусаў былі каза, вуж, мядзведзь, воўк. Міфічныя ўяўленні пра ваўка займаюць асаблівае месца. Але чыста татэмічных міфаў у язычніцкай міфалогіі беларусаў няма, прынамсі на дадзены момант яны нам невядомы.

**Антрапаганічных** міфаў, у якіх разглядаецца паходжанне чалавека, першапродкаў, у беларускай міфалогіі няшмат. Гэта міфы аб волатах, асілках,

паходжанні беларусаў. Антрапаганічныя міфы з'яўляюцца часткай касмаганічных.

Нязначную групу складаюць **астральныя міфы** — пра зоркі, сонца, месяц.

**Эсхаталагічныя** міфы, звязаныя з пакараннем людзей за нейкія правіны перад багамі, прадстаўляюць у міфалогіі беларусаў нязначную групу. Тэкстаў, дакладней, мікратэкстаў, у якіх зафіксаваны ўяўленні аб магчымым канцы Сусвету, усяго некалькі. Яны ўтрымліваюць тры матывы, што прывядуць да канца свету: знішчэнне лясоў, падзенне мятлы, прарыў залатога дна ў калодзежы.

**Гераічныя міфы** апавядаюць аб незвычайных дзеяннях персанажаў, якіх старажытныя беларусы лічылі героямі.

Катэгорыі міфалагічных тэкстаў вызначаны ў гэтай працы па тэкстах, вядомых нам на сённяшні дзень.

Галоўным у міфалогіі беларусаў з'яўляецца міф аб нараджэнні Белбога і Чарнабога. З яго выцякаюць усе бінарныя апазіцыі ў тэкстах міфаў і персанажаў.

## Глава 6. **Касмагонія і міфічная тапаграфія**

КОСМАС у міфалагічнай традыцыі — светабудова, упарадкаваная і арганізаваная адпаведна пэўным законам. Касмагонія (ад гр. kosmogonia — паходжанне свету) у дадзеным кантэксце разглядае ўяўленні пра стварэнне Сусвету і яго значных частак. Сусвет язычніцкай міфалогіі беларусаў не вельмі дэталёва выпісаны, але і тое, што захавалася, — гэта цікавы і лагічны, у межах міфічнага мыслення, матэрыял. Касмаганічныя міфы апісваюць прасторава-часавыя параметры Сусвету. Яны, як правіла, пачынаюцца з апісання тварэння ці небыцця, якое звычайна прыпадобнена да Хаосу.

### Паходжанне і стварэнне Сусвету

ГАЛОЎНЫМІ элементамі светабудовы, па ўяўленнях беларусаў, з'яўляюцца вада, агонь і паветра. З іх утворана зямля і ўсё на свеце.

**Агонь** для нашых продкаў — мужчынская аснова Сусвету. Ён можа быць розным: нябесным, падземным, жывым. Нябесны агонь — маланка і сонца. Асаблівую ролю ў жыцці беларуса

і ў міфалогіі адыгрываў жывы агонь, які выкарыстоўваўся ў шматлікіх абрадах. Жывы агонь — рытуальны, здабыты з дапамогай трэння аднаго кавалка дрэва аб другі.

**Вада** — жаночая аснова Сусвету. Яна таксама бывае некалькіх відаў: нябесная, зямная, падземная, жывая і мёртвая. Адзін з відаў вады — раса. Вада — мяжа паміж Багоннем, Гэтым Светам і Тым Светам. Жывую і мёртвую ваду ўтрымліваюць крыніцы, якія знаходзяцца недзе на краі Гэтага Свету. Толькі вешчыя птушкі і звяры (сокал, арол, воран, воўк) прыносяць яе.

Агонь і вада аб'ядноўваюцца ў вобразах Перуна, Купалы, вогненнай ракі.

**Паветра,** як і агонь, суадносіцца з мужчынскім, лёгкім, духоўным, пачаткам у працілегласць зямлі і вадзе, якія часцей адпавядаюць пачатку жаночаму, цяжкаму, матэрыяльнаму. Паветра — дыханне Стрыбога. Яго хаатычныя сілы — вецер, віхор.

З гэтых трох галоўных першаэлементаў Хаосу быў створаны Сусвет. Адбылося гэта так.

Калі свет толькі начынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод яе тырчаў нібы камень, нібы яшчэ нешта. Адзін раз Пярун як разыграўся і давай кідаць стрэламі ў гэты камень. Яго стрэлы выбілі тры іскаркі — белую, жоўтую і чырвоную. Упалі тыя іскаркі на ваду. Ад гэтага ўся вада скаламуцілася і свет памуціўся, як хмары. Але праз некаторы час, калі ўсё супакоілася, дык і адзначылася — дзе вада, а дзе зямля. А яшчэ праз некаторы час завялося ўсялякае жыццё і ў вадзе, і на зямлі[1].

Створаная **Зямля** падобна агню, вадзе і паветру становіцца адной са стыхій Сусвету. Зямля — жаночая аснова Сусвету. У касмаганічных міфах утрымліваецца значная колькасць сюжэтаў з удзелам зямлі. Язычніцкая міфалогія беларусаў таксама мае мноства міфалагем, звязаных з ёй. Аб тым, як утварыўся Гэты Свет з яго галоўнай часткай — зямлёй і Той Свет, ёсць адпаведныя тэксты.

## Асноўныя часткі Сусвету

СУСВЕТ у язычніцкай міфалогіі беларусаў не з'яўляўся нечым адзіным, а складаўся з некалькіх частак.

Сусвет беларусы дзялілі па вертыкалі на тры галоўныя часткі: верхнюю, сярэднюю і ніжнюю. Верхняя частка — Багонь. Гэта месца знаходжання галоўных нябесных багоў — багоў святла, дабра. Сярэдняя частка — Гэты Свет. Тут жывуць людзі, жывёлы, растуць дзіўныя расліны, у асобных яго

[1] Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні. — Кн. 1. — Вільня, 1933. — С. 188.

мясцінах (у полі, лесе, балоце, вадзе) — зямныя багі, мноства добрых і нядобрых духаў. Ніжняя частка — Той Свет (Апраметная). У ім існуюць падземныя багі і духі, у большасці сваёй нядобрыя, якія супрацьстаяць багам неба ў барацьбе за чалавека, нясуць зло, холад, смерць.

Кожная асноўная частка Сусвету мае свайго гаспадара — галоўнага Бога: Багонь — Белбога, Той Свет — Чарнабога. У Гэтым Свеце няма галоўнага боскага ўладара.

Галоўным багам падпарадкоўваюцца ўсе астатнія багі, а тым, у сваю чаргу, духі. Людзі прызнаюць вяршэнства над сабою Белбога і яго атачэння. У Гэтым Свеце дзейнічаюць багі і духі як Багоні, так і Таго Свету, якія размяшчаюцца ў асобных зямных гаспадарствах ці побач з людзьмі.

## Багонь

БАГОНЬ — нябеснае гаспадарства, якое размяшчаецца над Гэтым Светам і складаецца з Неба, Выраю, Птушынай дарогі.

**Неба** — гэта перш за ўсё абсалютнае вызначэнне верху. Паводле ўяўленняў беларусаў гэта вялізарны купал, які мае сем столак. Багі жывуць на сёмым небе ў вялікім палацы. З чаго зроблена неба, ніхто не ведае. Першапачаткова неба падыходзіла да зямлі так, што можна было на яго ўзыходзіць, але як людзі пачалі грашыць, то Белбог аддзяліў неба ад зямлі і закрыў тую дарогу.

**Сонца** раненька падымаецца з-за зямлі і коціцца па небе на захад. Кожны вечар яно купаецца, потым заходзіць пад зямлю і там адпачывае. Пакуль сонца адпачывае, у Гэтым Свеце — ноч. Потым яно зноў падымаецца[1].

Сонца — гэта той агонь, што грэе неба, каб там было цёпла. Няма на свеце мацней агню, чым сонечны. Ад сонейка ўсяму на свеце радасна, бо яно свеціць, грэе ды дае рост усялякім раслінам і жывёлам. Сонейка ніколі не злуе, яно заўжды ласкава пазірае на Гэты Свет ды хукае на ўсіх, як матка на сваіх дзетак.

Навыперадкі з сонцам ходзіць **месяц**, але ніяк не можа яго дагнаць. Калі месяц састарыцца, бог крышыць яго на зоры. Адзін кавалачак месяца ён кладзе ў дзяжу на закваску — падымаецца апара. Зоры падаюць туды, з іх пачынае рабіцца рошчына, цеста падыходзіць і пераліваецца цераз край. Гэтак нараджаецца малады месяц. Ён мае вялікую ўладу над раслінамі, жывёламі, людзьмі і нават надвор'ем.

З'яўленне на небе **мятлы**[2] — гэта прадвесце вялікага няшчасця: вайны, голаду, мору на людзей ці скаціну. Калі вайна, то вялікая — «замяцe»

---

[1] *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. — С. 28—29.

[2] Мятла — так называлі камету.

шмат людзей, а той бок, у каторы апушчаны рогі, будзе «змецены» дашчэнту.

Чараўнікі кажуць, што калісьці прыйдзе такая страшэнная мятла, што закрые ўсё неба, а потом ляжа на зямлю — тады ўсе загінуць, будзе канец свету.

Першае неба ўтрымлівае ваду. Яе на неба цягне з рэк і азёр **вясёлка**. Яна апускае адзін канец у мора, ці ў раку, ці ў луг і цягне ваду. Падчас вясёлка бярэ ваду з усім, што ёсць у ёй. А каб чалавек у той час падышоў, то ўцягнула б і яго. Таму маці забараняюць сваім дзецям выходзіць на двор, калі на небе з'яўляецца вясёлка, і ўжо зусім нельга было бегаць па вадзе[1].

Вясёлка ўцягвае ваду ў сябе, а тая ідзе ў хмару. Вада хмарамі разносіцца па ўсяму свету, прасяваецца праз хмары, як праз сіта, і падае на зямлю дажджом. Часам хмары прадзяруцца, тады ліне дождж бы з вядра, а з ім разам падаюць і кавалкі хмар. Людзі, бывае, знаходзяць іх пасля дажджу. Па знешняму выгляду іх можна параўнаць са «сцюдзенем» — яны так і трасуцца, але на смак «гідкія».

Хоць бы як захмарылася, але пакуль вясёлка не накачае вады — дождж не пойдзе.

Мы бачым толькі першае неба, але і яно закрыта ад нас вадой, а што там вышэй — ніхто не бачыў.

**Вырай**. Далёка ад зямлі, дзесь на поўдні, за гарамі ды за марамі, непадалёку ад цэнтра свету каля яснага сонейка ёсць Вырай — мясціна, куды адлятаюць птушкі і душы памерлых людзей. Там чалавечыя душы працягваюць жыць, не ведаючы пакут і гора. Але не кожная душа трапляе ў Вырай, а толькі тая, якую багі неба адзначаць.

Вырай — краіна вечнага святла і цяпла, цудоўных садоў і жывёл. Людзі пры жыцці туды трапіць не могуць. У гэтым жыцці Вырай даступны толькі птушкам. Птаства жыве ў Вырai толькі зіму, а на лета зноў ляціць да нас.

Птушак, як і людзей, Бог дзеліць на добрых і ліхіх. Як і душы ліхіх людзей ніколі не трапяць у Вырай, так і ліхія птушкі сланяюцца па зямлі, забіваюць іншых, пакуль, нарэшце, самі дзе-небудзь не загінуць. Вялікі грэх забіваць птушак, якія восенню ляцяць у Вырай.

**Птушыная дарога**. Каб птушкі не збіваліся з дарогі, не блудзілі ды не гінулі, калі ляцяць у Вырай ці з Выраю, Бог пралажыў на небе з зорак дарогу, якая вядзе проста ў Вырай.

Птушыная дарога цягнецца цераз усё неба і называецца ў народзе яшчэ Гусінаю дарогаю[2], таму што гэтай дарогай гусі ляцяць у Вырай.

---

[1] *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. — С. 29—30.

[2] Птушыная дарога, Гусіная дарога — Млечны шлях.

### Той Свет

ПАД ЗЯМЛЁЙ існуе другі свет — Той Свет, які ўключае Падземнае гаспадарства, Падводнае гаспадарства, Наўе. А яшчэ вужы, змеі, гадзюкі маюць, кожны свой, Падземны Вырай.

У **Падземным гаспадарстве** таксама жывуць людзі, толькі яны малыя, нядужыя, бо ў іх там не свеціць сонейка. Ёсць рэкі, азёры і так шмат вады, што каб яна выступіла на зямлю, то быў бы патоп, які затапіў бы Гэты Свет.

Пад зямлёю існуе вялікая колькаць лёхаў, якія злучаюць паміж сабой азёры, рэкі, крыніцы. З бяздонных крыніц падземныя лёхі вядуць да бяздонных віроў вялікіх рэк, да дзікіх азёраў і да гэткіх самых бяздонных крыніц-вокнаў на паплавах. Таму ў невялікія глыбокія ямы, якія сустракаюцца на лузе, беларусы баяцца кідаць што-небудзь ці мераць іх глыбіню, каб не дражніць духаў Падземнага гаспадарства ці Наўя.

Водная паверхня рэк і азёр — мяжа паміж Гэтым Светам і **Падводным гаспадарствам**. Беларус добра гэта ўсведамляе, таму кажа, што калі ён плыве ў чоўне, то на смерць паглядае. Перад першым купаннем беларус кідае ў ваду скарынку хлеба, каб не ўтапіцца. Калі скарынка патанула раней, чым выкупаўся чалавек, ці калі яе праглынула рыба, то лепш у тое лета не купацца.

**Наўе** — прастора ў нетрах зямлі, дзе ўладарыць гаспадар над душамі памерлых, якія скрадзены нядобрымі духамі ці не прыняты Белбогам у Вырай. Разам з імі знаходзяцца смяротныя багі і духі, якія забіваюць людзей і імкнуцца скрасці душы памерлых з мэтай прыпыніць вечнае жыццё чалавека. Уяўленні аб тапаграфіі Наўя не вельмі выразныя.

**Падземныя Выраі** — месцы, куды на зіму ідуць паўзуны: змеі, вужы, гадзюкі. Ёсць Вырай змяіны, ёсць гадзючы, ёсць вужыны. Гэта вялікія схованкі пад зямлёй, дарогу да якіх ведаюць толькі гаспадары змей, вужоў, гадзюк, і яны вядуць туды сваіх падданых на зіму.

Багі Таго Свету, як і багі Неба, актыўна ўдзельнічаюць у жыцці людзей. Яны могуць з’явіцца перад чалавекам самі, але часцей дзейнічаюць праз сваіх паведачоў — багоў і духаў, якія ім служаць.

### Гэты Свет

**ЗЯМЛЯ** стаіць пасярод Сусвету, а сонейка і месяц ходзяць кругам ды свецяць, як ім Бог загадаў. Зямля стаіць на вадзе, а вада — на зямлі. Зямля ёсць не што іншае як скура, якая пакрывае вялізны слой вады. Недзе далёка край зямлі сходзіцца з небам, але ніхто туды не даходзіў, бо там вельмі горача[1].

---

[1] *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. — С. 47.

У Гэтым Свеце зямля — месца жыцця людзей. Становішча зямлі, акружанай морам, — сярэдзіннае па гарызантальнай праекцыі. Падарожжа ў Багонь ці Той Свет абавязкова аказваецца падарожжам ці ўверх, ці ўніз.

**Горы**[1] і даліны на Зямлі парабіла вада, калі збягала ў мора пасля патопу. Панасыпалі горкі і волаты, якія калісь жылі на зямлі. Міфічныя функцыі гары разнастайныя. Шырока вядомы звычай ствараць на вяршынях гор ахвярнікі, капішчы, могілкі, распальваць агонь. ***Лысыя горы***[2] з'яўляюцца месцам зборышча злых духаў. Ад іх тупацення вяршыні гор аблыселі.

**Рэкі** ўзніклі пасля патопу. Як пачала вада сыходзіць у адно месца, размыла зямлю і зрабіла рэкі. Дзе вада ў яме затрымалася, там стала возера. Рака — важны міфалагічны сімвал, элемент сакральнай тапаграфіі, можа быць сусветным шляхам. Сімвалічнае значэнне ракі — перашкода, небяспека, патоп, уваход у Падземнае гаспадарства. Пераправа праз раку — подзвіг, набыццё героем новага статусу. Існуе вялікі фальклорны матэрыял, які матывуе паходжанне ракі і яе функцыі як межы паміж рознымі часткамі Гэтага Свету.

**Каменне** — гэта не што іншае, як зачараваная зямля, людзі, жывёлы, пні, спечаныя хлябы. Што гэта так, відаць з таго, што многія каменні захоўваюць формы нейкіх рэчаў, а таксама з таго, што любы камень, перапалены ў лазні ці ў восеці на каменцы, ці ў печы або на вогнішчы, ператвараецца спачатку ў жарстьву, а потым, паступова драбнеючы, яднаецца з зямлёй.

Каменне даўней расло хутка, як усялякая расліна. Але яно глушыла ўсё на зямлі. Бог распарадзіўся яму расці ў 100 гадоў толькі на адну пушку ў вышкі. Вось таму мы не прыкмячаем зараз, як каменне расце.

Не ўвесь свет, што ў акне, — ёсць яшчэ за акном. У міфалогіі беларусаў надаецца вялікае значэнне **шляху**. У язычніцкай міфалогіі шлях — вобраз сувязі паміж рознымі кропкамі міфічнай прасторы. Нярэдка значным элементам на шляху з'яўляецца **мост**, па якім пераадольваюць мяжу паміж сваім светам і чужым ці Тым Светам.

Беларус жыве на сваёй зямлі. Усё, што па-за межамі яго зямлі, — чужы свет, невядомы, незразумелы, варожы, цяжка дасягальны. Чужы свет знаходзіцца за лясамі, гарамі, марамі, адгароджаны вогненнай ракой; пераадолець гэтыя перашкоды здольны толькі героі, ды і то з дапамогай багоў ці іх памагатых — свяшчэнных жывёл.

Падарожжа ў чужую краіну — цяжкая і небяспечная справа. Пераадолеўшы лясы, балоты і горы, чалавек дабіраецца да мора.

1 Пад гарамі ў Беларусі разумеюць вялікія ўзгоркі.

2 Гэта значыць тыя, вяршыні якіх пазбаўлены расліннасці.

**Мора** — гэта так шмат вады, што ёй і краю няма, а глыбіня бяздонная. Дзе пачатак і дзе канец мора — ніхто не ведае. Тое ведае толькі птаства, якое лятае ў Вырай. У моры сустракаюцца дзіўныя істоты — ядзеркі, сарэны.

### Уяўленні аб міфічным часе

У ЯЗЫЧНІЦКАЙ міфалогіі беларусаў вызначаюць два віды часу: міфічны і мірскі. Час у міфе — заўсёды міфічны, але сам міф — гэта вербальны ці абрадавы паўтор у рэальным часе. Мірскі час — час жыцця чалавека ў абыдзенным свеце.

Міфічны час уяўляе першасны прачас, калі першапродкі і багі ствараюць Сусвет старажытнага беларуса і ўсталёўваюць для яго звычаі — кананічныя ўзоры паводзін, якія ўтвараюць архетыпы.

Міфічны час — першапачатковы час, час першадзеянняў, першапрадметаў і стварэння асноўных частак Сусвету. Гэта, «калі Бог хадзіў па зямлі». Міфічнаму часу папярэдне адпавядае вечнасць.

Першачас найбольш важны і таму патрабуе пастаяннага аднаўлення праз рытуалы і абрады. У час рытуалу разам з чалавекам былі багі. Чалавек на нейкі час вяртаўся да міфічнага часу, аднаўляў яго і тым самым працягваў сваё быццё.

Мірскі час адпавядаў уяўленню аб прыродных і жыццёвых умовах як чаргаванні гадоў, месяцаў, тыдняў, сутак, дня і ночы (частак сутак).

Фіксаваныя пачатак і канец абрадаў стваралі цыклічную мадэль часу. Яна адлюстроўваецца ў матывах з’яўлення і зыходу багоў у Гэтым Свеце, гадавых цыклах. Час цыклічны фіксаваўся і земляробчым календаром. Замацаваныя язычніцкім календаром з’явы прыроды кожны год паўтараюцца, і аднаўленне іх сведчыць аб далейшым працягу жыцця. Таму варажба і прадказанні адпавядалі бягучаму году. Далей не загадвалі. Адсюль панаванне ў нашых продкаў аптымізму.

Міфалагічны час знаходзіў адлюстраванне ў міфах. Салярныя і месяцовыя міфы лічацца больш архаічнымі, чым земляробчыя, як і знікненне і вяртанне міфічных персанажаў, якія ўвасабляюць сонца, святло, цяпло.

Сістэма злічэння часавых прамежкаў выступае ў міфалогіі адным са спосабаў засваення міфічнай свядомасцю прыродных з’яў. У першую чаргу год дзяліўся на дзве часткі: летнюю і зімовую. «Зіма працуе на лета, а лета на зіму», — сцвярджалі нашы продкі. Новы год у беларусаў-язычнікаў пачынаўся 1 сакавіка.

Дні тыдня персаніфікаваліся і звязваліся з тым ці іншым міфалагічным персанажам: чацвер — дзень Перуна, пятніца — багіні Макаш. У дзень Макашы забаранялася прасці, купаць дзяцей. Пазней культ Макашы аб'ядноаецца з хрысціянскім культам святой Параскевы.

Дзяленне сутак на дзень і ноч — гэта спаборніцтвы паміж сабой сонца і месяца, якія бягуць навыперадкі.

Але і ў мірскім часе беларуса-язычніка ёсць сакральныя хвіліны. Двойчы ў суткі — апоўдні і апоўначы — надыходзяць такія хвіліны, калі любы чалавек можа выкарыстаць звышнатуральныя сілы Сусвету. У гэтую часіну збываецца ўсё, што толькі пажадае ўголас чалавек.

## Глава 7. **Сістэма персанажаў міфалогіі беларусаў**

У СВЯДОМАСЦІ беларусаў-язычнікаў шматлікія з'явы прыроды і нават сацыяльнага жыцця персаніфікаваліся, таму міфалогія беларусаў захоўвае значную колькасць персанажаў. Сістэма персанажаў міфалогіі беларусаў досыць разгалінаваная і не ва ўсім адпавядае класічным узорам.

З класічных катэгорый міфічных персанажаў у ёй шырока прадстаўлены багі, духі, слабей першапродкі, зусім адсутнічаюць трыксцеры. У той жа час ёсць свае, спецыфічныя. Гэта дзяды, паведачы, чараўнікі.

Вызначэнне катэгорый персанажаў праведзена па іх месцы сярод іншых персанажаў у міфалогіі беларусаў. У кожнай катэгорыі персанажы выстрайваюцца іерархічна, зыходзячы з іх функцый.

У язычніцкай міфалогіі беларусаў сустракаюцца персанажы розных тыпаў па знешняму выгляду: антрапаморфныя (чалавекападобныя), зааморфныя (жывёлападобныя), антрапазааморфныя (прамежкавага тыпу, які ўключае спалучэнні чалавечых і жывёльных элементаў), тэрыаморфныя (пачварныя).

Катэгорыі міфічных персанажаў вызначаны ў гэтай працы па тэкстах, вядомых нам на сённяшні дзень.

### Пантэон багоў і духаў

**БАГІ** — галоўныя персанажы язычніцкай міфалогіі беларусаў. Яны валодаюць надзвычайнымі магчымасцямі, індывідуальнай адметнасцю і пазнавальнай атрыбутыкай, кіруюць пэўнымі часткамі Сусвету. Ім пакланяюцца як уладарам прыроды і чалавечага лёсу.

Слова «бог» уваходзіць у імёны розных багоў — Дажбог, Чарнабог, Стрыбог і інш. Пантэон беларускіх багоў вялікі па колькасці імёнаў, але пра іх захавалася нязначная колькасць тэкстаў (большасць багоў толькі ўпамінаецца ў міфах); асобных мы ведаем толькі па імёнах, якія падказваюць іх функцыі. Пра многіх багоў мы знаходзім успаміны толькі ў летапісах ці працах хрысціянскіх святароў, дзе падаюцца кароткія звесткі аб іх дзейнасці. На жаль, міфы аб багах захаваліся дрэнна, таму нам не ўсё вядома пра боскі пантэон.

Усе багі і большасць духаў міфалогіі беларусаў належаць да антрапаморфнага тыпа — маюць мужчынскі ці жаночы выгляд. Характэрным для міфалогіі беларусаў з’уляецца малалікасць жаночых персанажаў у боскім пантэоне. Гэта сведчанне таго, што ён фарміраваўся ў часы патрыярхату.

Нягледзячы на недастатковасць тэкстаў, прасочваецца падзел багоў на добрых і нядобрых. Дуалістычны прынцып дзялення багоў вызначаецца праз іх станоўчыя ці адмоўныя адносіны да чалавека. У большасці сваёй добрыя багі нябеснага паходжання, нядобрыя — з Таго Свету. Але сярод і тых, і другіх ёсць выключэнні, якія не падпадаюць пад гэты падзел.

Для міфалогіі беларусаў характэрны стваральныя рысы багоў. Яны надзяляюць людзей агнём (Белбог), вучаць земляробству (Вялес), апякуюць рамёствы (Макаш, Сварог).

Сярод багоў існуе іерархія. Найболей значнымі і старажытнымі багамі з’яўляюцца два браты — Белбог і Чарнабог.

Белбог — галоўны Бог, бацька ўсіх багоў. Ён адзін са стваральнікаў Сусвету (разам з Чарнабогам). Беларусы завуць яго яшчэ Белуном.

На другім месцы знаходзяцца багі — уладары той або іншай часткі Сусвету. Першы сярод іх — Пярун, сын Белбога, захавальнік нябеснага агню.

Сярод багоў беларускага пантэона ёсць такія, якіх беларусы паважаюць не толькі за іх боскае паходжанне, але і за тое, што яны ў адносінах да чалавека выконваюць ролю абаронцы. На першым месцы тут, безумоўна, стаіць Ярыла. Ён спалучае ў сабе і прыродную, і культурную гераічнасць. Ярыла забівае Цмока, і Белбог аддае яму пад кіраванне звяроў. У той жа час Ярыла клапоціцца аб полі, дапамагае сялянам атрымаць добры ўраджай.

За галоўнымі багамі стаяць багі ніжэйшага ўзроўню, звязаныя з гаспадарчымі справамі, порамі года і стыхіямі.

**Паведачы** — багі і духі, прызначэнне якіх служыць галоўным багам, змагацца з іх ворагамі, несці іх волю стыхіям, выконваць розныя даручэнні. Паведачы — пасрэднікі паміж багамі і людзьмі. Яны сочаць за зямнымі гаспадарствамі і людзьмі, перадаюць ім волю багоў, па боскаму загаду дапамагаюць ці шкодзяць людзям.

Гарцукі — духі-паведачы, падначаленыя Перуну. Дзянніца — багіня ранішняга святла, паведач сонца. Вятры — паведачы і памагатыя Стрыбога. Мароз — памагаты бога зімы Зюзі. Паведачкай заканчэння зямнога жыцця чалавека з'яўляецца Белая баба альбо прадвесніца смерці — Смерць.

Вера ў духаў — успрыняцце з'яў прыроды як жывой і адушаўлёнай сілы. Калі духі атаясамліваюцца з рэчамі — гэта фетышызм, калі ж асобна ад іх — анімізм. Духі — міфічныя істоты, звязаныя з чалавекам, яго целам і жыццёвым асяроддзем, у тым ліку і прыродным. Яны бесперапынна ўзаемадзейнічаюць з чалавекам, нават азначаюць асаблівасці яго душэўнага і псіхічнага стану.

Духі маюць уласцівасць быць нябачнымі і з'яўляцца людзям па свайму жаданню. Яны здольны прымаць і розныя вобразы. Нядобрыя духі з'яўляюцца перад людзьмі няйначай як у выглядзе жывёл, а калі ж у вобліку чалавека, што здараецца вельмі рэдка, — то самага мярзотнага, агіднага выгляду. Наогул, сярод духаў больш за ўсё прамежкавых спалучэнняў — антрапазааморфных і тэрыяморфных.

Духаў прыроднай прасторы дзеляць на групы, звязаныя з Багонню, Гэтым Светам, Тым Светам. Акрамя таго, асобныя значныя тэрыторыі — лес, балота, вада, Наўе — маюць сваіх духаў.

У Гэтым Свеце побач з людзьмі жыла значная колькасць духаў. Усе пабудовы сядзібы, паводле паданняў нашых продкаў, былі заселеныя духамі. Адны дапамагалі гаспадарам, другія ні пра што не клапаціліся, але таксама патрабавалі ад чалавека ўвагі. Самымі паважанымі былі духі сядзібы і хаты; самымі любімымі — Хатнік і Хлеўнік. Калі селянін пераязджаў у новую хату, то запрашаў іх з сабою.

Духі іншых гаспадарчых пабудоў маглі прыносіць карысць, але былі вельмі свавольнымі. Беларус лічыў: лепш цярпець іх прысутнасць, чым канфліктаваць з імі.

Шэраг духаў беларус не любіў за тое, што яны наносілі шкоду гаспадарцы, і імкнуўся не пускаць іх на сядзібу. У першую чаргу гэта духі ночы, якія імкнуцца пракрасціся на сядзібу або ў гаспадарчыя пабудовы, каб рабіць свае ліхія справы.

Палявыя і агародныя духі жывуць і дзейнічаюць на мяжы культурнай і прыроднай прасторы. Яны з'яўляюцца пасрэднікамі паміж духамі сядзібы і прыроднымі. З палявых духаў беларус любіў Спешку-Спарышку — духа, які даваў поспех ва ўсякай рабоце, Палявога Дзедку і Жітнюю Бабу.

Лес у жыццядзейнасці селяніна займаў другое месца пасля поля. Лес засяляла мноства духаў, якія былі, па меркаванню сялян, не вельмі прыязныя да

чалавека з-за таго, што ён сёк дрэвы, паляваў на жывёл. Таму неабходна было наладжваць з імі кантакты праз рытуальныя дзеянні і прынашэнні.

Духі вады стаяць бліжэй да чалавека і больш добразычліва ставяцца да яго. Яны адрозніваюцца і па вонкавым выглядзе ад іншых духаў — у большасці сваёй яны антрапаморфныя.

**Асноўныя багі і духі міфалогіі беларусаў у прасторавай структуры Сусвету**

<table>
<tr><td rowspan="3">Багонь</td><td colspan="2">БЕЛБОГ (Бялун)</td></tr>
<tr><td>Нябеснае гаспадарства</td><td>Вырай</td></tr>
<tr><td>Пярун, Цётка, Малання, Стрыбог, Ярыла, Макаш, Сварог, Дажбог, Ляля, Лада, Любмел, Кляскун, гарцукі, Зніч, Дзявоя, Дзянніца, Шчадрэц, Каляда</td><td>Дзяды</td></tr>
<tr><td rowspan="8">Гэты Свет</td><td>Духі гаспадарчых пабудоў</td><td>Духі хаты</td></tr>
<tr><td>Хлеўнік, Баган, Вісус, Вазіла, Рай, Гуменнік, Гуменіха, Ёўнік, Пуннік, Лазнік</td><td>Хатнік, Хатніца, Бай, Пячурнік, кікімары, Валасень, Бадзюля, Сербай, Меша, шэшкі, злыдні</td></tr>
<tr><td>Багі і духі лесу</td><td>Багі і духі палёў і агародаў</td></tr>
<tr><td>Купальскі Дзядок, Дабрахочы, Лясун, лесавіцы, Гаюн, гаёўкі, Зазоўка, Кук, Лойма, Гаспадар вужоў, вужалкі, Гаспадар змей, Гаспадар гадзюк</td><td>Талака, Жыцень, Палявы Дзедка, Палявік, жытніцы, Спарышка, Спарышэнь, Жытняя Баба, Падвей, Жалезная Баба</td></tr>
<tr><td>Багі і духі балот</td><td>Духі хвароб</td></tr>
<tr><td>Лазавік, Кадук, лознікі, Хапун, Балотнік, Багнік, Аржавеннік, балотніцы, паветрыкі</td><td>Паветрые, Воспа, паралікі, Паморак, Чума, Моравая Дзева</td></tr>
<tr><td colspan="2">Духі ночы</td></tr>
<tr><td colspan="2">Паўночнікі, Кумельган, Стрыга, Мара, начніцы, касны, шатаны, ератнікі, прахі, Чорная Баба</td></tr>
<tr><td rowspan="5">Апраметная</td><td>Падводнае гаспадарства</td><td>Падземнае гаспадарства</td></tr>
<tr><td>Вадзянік, вадзяніцы, Баламуцень, Гаспадар рыб, азярніцы, Расамаха</td><td>Ох, Жыжаль, Вялес, Кладнік, Зюзя, Зіма, Мароз, Халера, трасцы</td></tr>
<tr><td colspan="2">Наўе</td></tr>
<tr><td colspan="2">Паляндра, Смерць, Дзева смерці, Марэна</td></tr>
<tr><td colspan="2">ЧАРНАБОГ</td></tr>
</table>

Балота і ўсякую тхлань стварыў Чарнабог, таму ў іх пануюць толькі нядобрыя духі і багі. Беларус сцеражэцца, але не баіцца балотных духаў, бо ён здольны знішчыць іх, асушыўшы балота.

Спецыфічнай групай духаў міфалогіі беларусаў з'яўляюцца русалкі. Беларусы вызначаюць чатыры тыпы русалак: вадзяніцы, палявіцы, лесавіцы, балотніцы. Прычым гэта абсалютна антрапаморфныя постаці без дабаўкі зааморфных элементаў у адрозненне, напрыклад, ад русалак заходнееўрапейскіх міфалогій, дзе іх уяўлялі як жанчын з рыбінымі хвастамі.

У асобную катэгорыю вылучалі духаў хваробы. Беларус-язычнік персаніфікаваў вялікую колькасць духаў хвароб, ведаў, што ёсць хваробы, якія аднолькава шкодныя як для людзей, так і для свойскіх жывёл. Селянін выкарыстоўваў розныя сродкі лячэння хвароб (не толькі магічныя, але і прыродныя) і мог справіцца са шматлікімі захворваннямі чалавека.

Калі багоў беларус-язычнік шанаваў і прымаў такімі, якімі яны з'яўляюцца, то з духамі яго адносіны былі досыць супярэчлівыя. Іх ён дзяліў на добрых і нядобрых, не акцэнтуючы ўвагі на тое, да якой часткі Сусвету яны належалі.

Спосабам выжывання беларуса-язычніка стала пачуццё яго параднёнасці з грознымі прыроднымі стыхіямі. Ён адчуваў іх падобнымі да сябе, адушаўлёнымі істотамі, якіх можна як-небудзь улітасцівіць, загаварыць, а калі-некалі нават напужаць. Добра гэта адзначыў З. Фрэйд: «Самым первым шагом достигается уже очень многое. И этот первый шаг — очеловечение природы. С безличными силами и судьбой не вступишь в контакт, они останутся вечно чужды нам. Но… если повсюду в природе тебя окружают существа, известные тебе из опыта твоего собственного общества, то ты облегченно вздыхаешь, чувствуешь себя как дома среди жути, можешь психически обрабатывать свой безрассудный страх. …А может быть, ты даже и не беззащитен, ведь почему бы не ввести в действие против сверхчеловеческих насильников, т. е. сил внешней природы, те же средства, к которым мы прибегаем в своем обществе; почему бы не попытаться заклясть их, умилостивить, подкупить, отняв у них путем такого воздействия какую-то часть их могущества»[1].

Дуалістычны прынцып супрацьстаяння добрага — нядобрага ў адносінах да чалавека, чалавечага калектыву лепш за ўсё рэалізуецца праз духаў. Яны больш выразна, у параўнанні з багамі, падзяляюцца на добрых і нядобрых.

[1] *Фрейд, З.* Психоанализ. Религия. Культура / З. Фрейд. — М., 1992. — С. 29.

## Чараўнікі

ЗНАЧНАЕ МЕСЦА ў жыцці беларуса-язычніка займалі чараўнікі і чараўніцы, што знайшло адлюстраванне ў міфах.

Чараўнікі — людзі, якія валодаюць уменнямі ўздзейнічаць на іншых людзей і прыродныя аб’екты, узаемадзейнічаць з духамі і пераўтварацца ў жывёл. Уменне чараваць людзі атрымлівалі ў спадчыну ад бацькоў, ці як узнагароду за свае ўчынкі ад добрых духаў, ці ўсталяваўшы адносіны з нядобрымі духамі. Чараўнікі і чараўніцы былі пасрэднікамі паміж багамі, духамі і людзьмі.

Чараўнікі валодалі таемнай сілай, і сіла гэтая, як лічылі беларусы, надта вялікая. Але яшчэ мацней яна выяўляецца пры ўздзеянні на людзей. Пры гэтым яны могуць і шкодзіць чалавеку, і ратаваць яго ў бядзе. Гэта якасць ставіць іх у выключнае становішча.

Жанчыны-чараўніцы займаюцца больш лёгкімі справамі. Зразумела, што мужчыны-чарадзеі могуць рабіць тое ж, што і жанчыны, але яны амаль не апускаюцца да «бабскіх» спраў. Хоць і рэдка, але чарадзеямі бываюць падлеткі, якія атрымліваюць здольнасць чарадзейства ад паміраючых бацькоў, аднак чары іх набываюць поўную сілу толькі пасля дасягнення сталага ўзросту.

Чараўнікі могуць усё: сапсаваць хлеб на корані, перашкодзіць усходам, напусціць на збожжа гніль у сціртах, патравіць мышамі збожжа, напусціць ліхога чалавека, які абярэ да ніткі, адняць малако ў каровы, а то і скаціну звесці з двара. Але яшчэ мацней выяўляецца сіла чараўнікоў на людзях. Яны могуць напусціць хваробу на іх, папсаваць ім вочы, наслаць на дзяцей падучку або нават і смерць. Ваўкалакі, якія добра вядомы кожнаму беларусу, былі створаны чараўнікамі.

Да чараўніка звяртаюцца за парадай і дапамогай, калі захварэе чалавек ці жывёла. Яго просяць зняць чары і закляцці, накладзеныя ворагамі, пакараць іх.

Звычайна чараўнікі — маўклівыя, паважныя людзі, з уладным позіркам, фізічна вельмі дужыя. Умовы і абставіны чараўніцтва ніхто не ведае, чараўнік перадае сваю сілу паслядоўніку толькі перад смерцю. Пры жыцці ж гэтыя веды перадаваць нельга, у адваротным выпадку чараўнік сам губляе сілу[1].

Згодна з падзелам багоў і духаў на дзве асноўныя групы, якія ўзначальваюць Белбог і Чарнабог, чараўнікі абапіраюцца на сілу той ці іншай групы і адпаведна адзначаюцца людзьмі як добрыя ці нядобрыя.

[1] Гл.: *Богданович, А.* — С. 133—144; *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... / Н. Я. Никифоровский. — Витебск, 1897. — С. 90—95.

**Героі**

ГЕРОІ ўтвараюць універсальную катэгорыю персанажаў, якая ёсць у міфалогіі любога народа. Гэта паняцце бярэ свой пачатак у класічнай грэчаскай міфалогіі, у якой герой нараджаецца ў выніку любоўных адносін паміж богам і звычайнай смяротнай жанчынай.

Героі і геранічнасць у міфалогіі беларусаў маюць сваю спецыфіку. Героямі з'яўляюцца персанажы, якія выяўляюць сябе неардынарна ў адносінах з людзьмі або багамі і духамі. Асобасны індывідуалізм непрымальны для роду, абшчыны, племені, і любая яго праява выклікае пэўную рэакцыю. Вобразы такіх людзей і іх учынкі захоўваліся ў памяці суплеменнікаў і перадаваліся новым пакаленням як прыклады станоўчых або адмоўных паводзін.

Героі займаюць значнае месца ў міфалогіі беларусаў. Сярод іх прадстаўнікі ўсіх сацыяльных груп старажытнага грамадства: сяляне, князі, рамеснікі, музыкі, ведзьмары, гандляры. Іх дзеянні не заўсёды маральныя з пазіцый нашага часу, дакладней, яны адпавядалі маралі старажытнага грамадства.

Неабходна адзначыць два тыпы герояў:

1) натуральныя (прыродныя) героі. Яны валодалі вялікай фізічнай сілай і былі адданымі сям'і (роду);

2) культурныя героі. Іх прызначэнне звязана з рэалізацыяй сацыяльных і культурных задач роду, племені. Больш за ўсё ў культурнай геранічнасці шануецца розум, кемлівасць. Героі дзейнічаюць не спантанна. Яны перамагаюць і дасягаюць сваёй мэты з дапамогай ведаў, уменняў, розуму.

Вялікую групу персанажаў складаюць асілкі, характэрнай асаблівасцю якіх з'яўляецца велізарная, не ўласцівая простым людзям фізічная сіла. Іх моц выклікала здзіўленне і павагу, таму і зафіксавалася ў памяці пакаленняў. Адгэтуль перанос паняцця «асілак» з эпохі другога пакалення людзей на звычайных, але дужых людзей трэцяга пакалення.

Асілак — тыповы персанаж геранічных міфаў у беларусаў. Такому герою, як правіла, цяжка прыстасавацца да звычайнага чалавечага жыцця, ён не можа выкарыстаць сваю сілу ў дазволеных для простага чалавека межах. Не выпадкова абавязковым атрыбутам асілка з'яўляецца шматпудовая зброя, з якой ён выпраўляецца вяршыць подзвігі, абараняць людзей ад пачвар.

Калі ў стаўленні да багоў непашана ў любой форме недапушчальна і патрабавала пакарання, то ў адносінах з духамі беларус лічыў магчымым розныя формы супрацьстаяння і да многіх з іх адносіўся не вельмі пачціва. Чалавек, які пры сутыкненні з духамі не толькі выжываў, але і выходзіў пера-

можцам і атрымліваў ад іх нейкія звышнатуральныя здольнасці, заўсёды выклікаў захапленне іншых людзей. Калі ж дух быў нядобрым па стаўленню да людзей, то перамога чалавека над ім расцэньвалася як подзвіг і была станоўчым прыкладам для нашчадкаў. У такім жа плане можна разглядаць і тэксты міфаў, дзе чалавек супрацьстаіць нядобраму чараўніку.

Значная частка гераічных міфаў сваім стрыжнем мае сюжэт аб любоўных адносінах мужчыны і жанчыны і адлюстроўвае ўвесь спектр чалавечых адносін: ад фізічнага выкрадання, да высокамаральных, нават з пазіцый нашага часу, пачуццяў. Да кахання імкнуліся і багі, і духі, і людзі. Да таго ж багі і духі не аднойчы ўсталёўвалі любоўныя адносіны з простымі людзьмі. Знявага, ганарлівасць, здрада, адданасць любаму чалавеку — усё знайшло адлюстраванне ў сюжэтах і вобразах герояў гэтых міфаў.

## Глава 8. Чалавек у міфалогіі беларусаў

### Тры пакаленні людзей

У МІФАЛОГІІ беларусаў чалавеку адведзена першаснае месца. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў міфах сярод персанажаў шмат простых людзей. Чалавек у міфах выяўлены досыць актыўным суб’ектам. Беларус-язычнік разумее, што ў Гэтым Свеце не ўсё падуладна яму, але назваць яго цацкай у руках духаў таксама нельга.

Беларусы адзначалі змену трох «пакаленняў» людзей. Першымі людзьмі на нашай зямлі былі вялікалюды — **волаты**. Яны гінуць, пакараныя багамі за свавольствы і непавагу да іх. Перамога багоў над волатамі — гэта перамога над Хаосам і крок да ўсталявання парадку на зямлі.

Потым прыйшлі **асілкі**. Іх нельга атаясамліваць з волатамі. У параўнанні з чалавекам яны валодаюць значна большай сілай, але ў параўнанні з волатамі — бліжэй да звычайных людзей. Асілкі прыйшлі на нашу зямлю і сышлі з яе, пасля чаго пачаўся час жыцця звычайных людзей. Толькі асобныя асілкі працягвалі яшчэ пэўны час жыць сярод людзей.

Пасля волатаў і асілкаў на зямлі засталіся жыць **звычайныя людзі**. Але фізічна моцных людзей называлі асілкамі, адзначаючы наяўнасць у іх фізічнай сілы, волі, мужнасці, розуму і гатоўнасць супрацьстаяць нядобрым духам.

**Першапродкі**. Звычайна яны ўяўляюцца як прабацькі родаў, плямёнаў. Яны апякаюць род як сацыяльную групу, якая супрацьстаіць іншым родам

і навакольным сілам. Гэта міфічныя персанажы эпохі пershатварэння, сярод якіх: Бой і яго сыны; Крыў, які, на думку асобных навукоўцаў, — родапачынальнік племені крывічоў. Калі Крыў памёр, нашчадкі пачалі называць сябе крывамі. Тое ж адзначаюць аб Радзіме як родапачынальніку племені радзімічаў.

**Дзяды**. Памерлыя продкі ў беларусаў лічыліся членамі роду і ўтваралі з тымі, хто працягваў жыць, адну сакральную абшчыну. Дзяды — гэта ўсе продкі дадзенага роду незалежна ад узросту, у якім яны памерлі. Паняцце «дзяды» займала сакральную пазіцыю ў соцыуме, распаўсюджвалася і на жывых старэйшых родзічаў, якія таксама былі аб'ектам шанавання. Дзяды залежаць менавіта ад сваіх нашчадкаў і не пануюць над членамі іншай роднаснай групы.

Лічылася, што дзяды ўвесь час прысутнічаюць у жыцці сям'і. У беларусаў з дзядамі звязаны асноўныя культы продкаў, якія адбываліся вясной (траецкія дзяды), восенню (восеньскія дзяды).

Звычаі, па якіх жыве беларус, усталяваў Бог. Таму нашы продкі былі ўпэўнены, што трэба трымацца звычаю, калі хочаш, каб Бог не пакараў. Розныя людзі маюць свой звычай: што сяло, то нораў, што галава, то розум, а што край, то звычай. Пры гэтым людзі трымаюцца таго звычаю, які пайшоў ад дзядоў ды прадзедаў.

## Зямное жыццё беларуса-язычніка

ЧАЛАВЕК, разумеючы складанасць жыцця ў калектыве, прымаў той парадак, які ўсталявалі багі, і імкнуўся яго падтрымліваць. «Ад самага пачатку свету Бог так даў, што ні горы, ні лес, ні людзі не роўныя. Яны і цяпер не роўныя і ніколі не параўнаюцца»[1].

Беларус-язычнік лічыў, што пры нараджэнні яму прызначана, якой смерцю ён памрэ. Кожны чалавек рана ці позна павінен тое перажыць, што яму наканавана. Даўней людзі ведалі і той час, калі да іх прыйдзе смерць. Але Бог пазбавіў іх гэтых ведаў, таму што былі яны не на карысць ім.

З нараджэння кожны чалавек атрымлівае сваю долю. Каму якая трапіцца, такое ў яго і будзе шчасце. Для беларуса-язычніка існавалі толькі тры долі: доля паляўнічага і рыбалова, доля земляроба і нядоля.

[1] *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. — С. 64.

У сваіх адносінах з духамі беларус не быў безабаронным. Ён ведаў, як задобрыць адных, напалохаць другіх, трэціх падмануць і нават прымусіць папрацаваць на сябе. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся чарадзейныя сродкі, якія давалі людзям багі ці духі. Значную дапамогу ў гэтым аказвалі чараўнікі, за што іх паважалі і баяліся. Простыя беларусы ведалі тыя ці іншыя чары, але, калі чалавек не мог даць рады ў барацьбе з духамі, ён звяртаўся па дапамогу да чараўніка.

Магія ў жыцці беларуса-язычніка займала значнае месца, і ён шчыра верыў у яе магчымасці. Народы-суседзі былі ўпэўнены, што беларус здольны пераўтварыцца ў жывёлу. Для пераўтварэння ў ваўка, лісу, тхара ці ласку ён выкарыстоўваў магічныя прадметы, але, каб пераўтварыцца ў дробную птушку, паўзуна ці кузурку, абыходзіўся і без іх.

Небяспеку такіх дзеянняў чалавек добра разумеў. Пярэварацень, калі скране з месца адзін з абрадавых прадметаў ці гэта зробіць іншы чалавек, назаўсёды застанецца ў прынятым выглядзе, хіба што яго выручыць азнаёмлены з яго таямніцай.

Пераўтварэнне не адбываецца беспакарана. Кожнае такое дзеянне скарачала жыццё пярэваратняў на некалькі дзён. Таму пад старасць яны адступаліся ад сваёй дэманічнай дзейнасці, тымі ці іншымі сродкамі загладжвалі жыццёвыя грахі і паміралі звычайнымі добрапрыстойнымі людзьмі.

Каб прайсці ў нейкае месца незаўважаным, чалавек здольны зрабіцца нябачным з дапамогай чарадзейных сродкаў, якія ён атрымліваў ад птушак і жывёл, ці шапкі-невідзімкі, якую трэба было ўкрасці ў адпаведнага духа.

Беларус здольны вывесці штучна двух жывёл са звышнатуральнымі ўласцівасцямі — ката і змея, якія потым дапамагаюць свайму гаспадару набыць багацце.

Пасля смерці жыццё чалавека, як верылі беларусы, не заканчваецца. Гіне цела, а душа, якую нашы продкі ўяўлялі нечым матэрыяльным, але больш тонкім, чым навакольныя рэчы, працягвае жыць. Душа — гэта дух, пара (як у лазні), яна можа бясконца мяняць сваю форму і прымаць разнастайныя вобразы, а таксама быць нябачнай.

Шчырая вера ў вечнасць існавання чалавека ў Сусвеце сфарміравала ў беларуса няверʼе ў тое, што чалавек па ўласнай волі можа пасягаць на сваё жыццё. Кожнае самагубства, на яго думку, — справа нядобрага духа, бо толькі ён падштурхоўвае чалавека на гэта або непасрэдна забівае ці топіць. Да душ памерлых адносіны былі дваістымі: з аднаго боку, шанавалі апекуноў роду, сямʼі — дзядоў, з другога — асцерагаліся душ самагубцаў, якія сталіся стыхійнымі істотамі, што належаць да гаспадарстваў Лесуна, Вадзяніка.

Самым страшным пакараннем для беларуса было праваліцца скрозь зямлю, таму што пры гэтым гінула не толькі цела, але і душа. Такое пакаранне чакала чалавека за ўчынкі, накіраваныя супраць людзей, непаслухмянасць дарослых перад багамі, а дзяцей перад бацькамі.

## Чалавек у зямных гаспадарствах багоў і духаў

ПАКІДАЮЧЫ межы свайго двара, чалавек пападаў у прыродную прастору. Там існавалі зямныя гаспадарствы, у якіх знаходзіліся патрэбныя чалавеку прадметы (дрэва, ягады, грыбы, лекавыя травы, рыба). Але тут жа жыло шмат багоў і духаў, якія аберагалі гэтыя тэрыторыі ад людзей. З імі неабходна было паразумецца. Такіх гаспадарстваў было тры: лясное, балотнае, воднае.

## Лясное гаспадарства

ЛЕС — прастора існавання раслін, жывёл, вешчых птушак і шэрага багоў і духаў. За лесам пачынаецца чужы свет. Недзе там хаваецца сонца. Аднекуль з-за лесу з’яўляюцца невядомыя духі і пачвары. Ідучы ў лес, лепш за ўсё надзець сарочку навыварат, тады ніякі лясун не падманіць і не будзе блытаць.

Над усім уладарыць **Гаспадар лесу**. Ён велізарнага росту, на цэлую галаву вышэй за свой лес. На яго руках і нагах закручаныя кіпцюры, падобныя на сабачыя. Барада доўгая, сівая, носіць ён яе ў руках. Волю яго выконваюць **лесуны** — гаспадары асобных частак лесу. Абсяг дзейнасці лесуна — уся лясная плошча ад узлеску да ўзлеску, з усімі ўзгоркамі, нізінамі, ярамі і палянамі, за выключэннем вадаёмаў, дзе гаспадарыць Вадзянік. Лясун не толькі палохае, але і дапамагае людзям.

Акрамя названых галоўных духаў у лесе існуюць і дзейнічаюць іншыя. Лясны дух **Пушчавік** робіць людзям толькі зло. Ён не можа дараваць ім, што з-за іх яму давялося сыйсці ў векавыя дубровы. Пушчавік не шкадуе ні людзей, ні памочнікаў чалавека — свойскіх жывёл.

**Дабрахочы** — лясны бажок. Рост яго залежыць ад вышыні дрэва, да якога ён набліжаецца: бажок заўсёды роўны з ім. Гэта справядлівы суддзя, апякун людзей пачцівых, але ён сурова карае нецнатлівых.

**Гаёвы** Дзед, альбо **Гаюн**, сочыць за парадкам у лесе. Усе звяры і птушкі падпарадкоўваюцца і служаць яму. Без яго дазволу лепш не секчы дрэвы для пабудовы: не будзе карысці.

У Гаюна ёсць унучкі — **гаёўкі**. Гэта маладыя гарэзлівыя дзяўчаты, якія любяць усё жывое. І лось, і маленькая птушачка, калі захварэюць ці параняцца, звяртаюцца да гаёвак па дапамогу, бо ведаюць: тыя залечаць іх раны.

Жыве ў лесе і дзіўная істота **Зазоўка**. Яна мае выгляд невыказна прыгожай дзяўчыны з русымі валасамі, такімі доўгімі і густымі, што ёй нават не патрэбна адзенне. Зазоўка жыве ў лесе здаўна, і шмат маладых мужчын і хлопцаў паддаліся на яе чары.

## Балотнае гаспадарства

БАЛОТА і ўсялякую тхлань утварыў Чарнабог. Гэта небяспечнае для чалавека зямное гаспадарства, у якім пануюць толькі нядобрыя духі і багі.

Балоты і азёры нярэдка знаходзяцца побач, і духі вады жывуць поруч з бруднымі і ва ўсім неахайнымі духамі балот, хаця і пазбягаюць іх.

Непасрэдна ў балоце жывуць тры браты: **Балотнік, Аржавеннік і Багнік**. Беларус асцерагаецца, але не баіцца балотных духаў, бо здольны процістаяць ім.

Самы старэйшы нядобры дух балот — **Кадук**. Жыве ў самым цёмным лесе, да таго ж у самым багністым балоце. Пракляцце імем Кадука было для беларуса найбольш небяспечным.

У лазе, што расце каля балот, жыве бог **Лазавік.** Гэта старэнькі карлік, не большы за пазногаць. Ён аднавокі, з аршынным барадой і заўсёды носіць з сабой доўгую пугу. Што робіць Лазавік сваёй пугай і навошта носіць з сабой, ніхто не ведае.

**Лознікі** ўтвараюць асобны гурт хутчэй надводных, чым падводных духаў. Жытлом ім служаць густыя кусты пераплеценага лазняку, у залежнасці ад якога афарбавана іх цела. Самі па сабе лознікі — драбнюткія, гуллівыя духі.

Недзе пасярод балота пад карчом жыве **Хапун** — маленькі, скурчаны дзядок з доўгай сівой барадой і вельмі вялікай торбай. Ён лётае і прыглядаецца, дзе якое дзіця не слухаецца старэйшых. Тады, падпільнаваўшы, каб дзіця адышлося далей ад дому, хапае яго, саджае ў сваю торбу і нясе да сябе.

## Воднае гаспадарства

БЕЛАРУСЫ шануюць азёры, крыніцы, ручаі. Асабліва надаюць увагу крыніцам, вада якіх лічыцца жывой. Кожная з іх мае сваю асаблівую ваду. Чарадзеі добра ведаюць, у якой крыніцы якая вада, і даюць яе жывёлам або людзям.

Духі вады стаяць бліжэй да чалавека і больш прыхільна адносяцца да яго, да таго ж маюць знешняе адрозненне ад іншых духаў — у большасці сваёй

яны антрапаморфныя. Нярэдка яны апякаюць чалавека амаль з той жа бескарыслівасцю, што і дамавікі.

Недзе ў Падводным гаспадарстве жыве **Гаспадар рыб**, які кіруе і распараджаецца ўсімі імі. Да гэтага часу яшчэ ні адзін чалавек не толькі не злавіў, але і не бачыў яго. Як ён выглядае, ніхто не ведае. Аднак бачылі шмат разоў, як нібы па загаду рыба пераплывае вялікімі чародамі з аднаго возера ў другое, з адной ракі ў другую. Гэта пераганяе рыбу Гаспадар рыб, у выніку чаго адны месцы пусцеюць, а другія перапаўняюцца рыбай.

**Вадзянікоў** параўнальна няшмат — па адным на кожны вадаём: возера, стаў, раку, лужыну, якая не высыхае, калодзеж. Калі нехта акажа Вадзяніку паслугу, такому чалавеку ён будзе дапамагаць лавіць рыбу, не дасць яму ўтапіцца, калі ён зваліцца знянацку ў ваду.

**Русалкі-вадзяніцы —** маладыя прыгожыя жанчыны з доўгімі, да пят, валасамі. Яны служкі Вадзяніка.

У гонар русалак беларусы спраўляюць асобныя святы, напрыклад Сямік. У такія дні нельга працаваць, а ў доме таго гаспадара, хто парушыць гэты старажытны звычай, русалкі абавязкова перадушаць усю скаціну.

Каб уратавацца ад русалак, чалавеку трэба намаляваць на зямлі крыж, абвесці кругам і ў гэтым крузе стаць. Русалкі тады не падступяцца, паходзяць вакол, а потым і схаваюцца.

У азёрах жыве **Баламуцень** — вадзяны чалавек, вельмі непрыгожы. Ён халасцяк і заляцаецца да жанчын, калі тыя прыходзяць да вады мыць бялізну.

У возеры жывуць істоты, падобныя на маладых жанчын, — **азярніцы**. У іх доўгія зеленаватыя валасы, цёмная скура, ступні ў выглядзе плаўнікоў. І хоць знешне яны нагадваюць людзей, замест крыві ў іх нібыта вада і навобмацак яны халодныя. Калі раптам чалавек убачыць азярніц, то не павінен сябе выдаваць, бо яны зацягнуць яго ў возера і не адпусцяць. Гэта ж чакае і таго, хто асмеліцца выкупацца ў гэтым возеры.

## Глава 9. Жывёльны і раслінны свет у міфалогіі беларусаў

### Жывёлы

РОЛЯ ЖЫВЁЛ як анімальнага (заамарфнага ці тэрыяморфнага) элемента ў язычніцкай міфалогіі беларусаў выключна вялікая. Гэта вызначаецца тым, якое месца займалі жывёлы ў жыцці перша-

бытнага грамадства, асабліва да перыяду земляробства. Уяўленні аб рэальных асаблівасцях жывёл і іх выкарыстанне ў міфалагічнай класіфікацыі былі спосабам тлумачэння чалавекам самога сябе і навакольнай прыроды. Жывёла-татэм гуртавала род, племя ў адзіны калектыў, звязвала яго з дадзенай тэрыторыяй, сённяшняе існаванне з міфалагічным мінулым, культурнае і сацыяльнае з прыродным. Да таго ж татэмная жывёла ў міфалогіі беларусаў выконвала дэскрыптыўную і этыялагічную функцыі.

Элементаў татэмічных уяўленняў у язычніцкай міфалогіі беларусаў захавалася шмат. Гэта добра прасочваецца як у абраднасці, так і ў міфалагічных тэкстах. Розныя формы культу жывёлы (заалатрыі) і іх перажыткі пашыраюць кола рытуальных матываў, якія адносяцца да жывёлы, і, адначасова, колькасць міфалагічных матывіровак.

У язычніцкай міфалогіі беларусаў можна вызначыць дзве групы жывёльных персанажаў: 1) міфалагізаваныя вобразы прадстаўнікоў беларускай фаўны; 2) міфічныя вобразы жывёл, якія рэальна ў прыродзе не існуюць і з'яўляюцца вынікам чалавечай фантазіі. Але фантазія абапіраецца на рэальныя элементы і стварае міфічных жывёл, гіпертрафіруючы памеры, спалучаючы ў адзінае цэлае часткі розных жывёл, павялічваючы колькасць асобных частак цела.

## Міфалагізаваныя жывёлы

ГЕРОЯМІ татэмічных міфаў беларусаў з'яўляюцца мядзведзь, воўк, вуж і інш. Існуе шмат міфаў аб паходжанні жывёл. Частка з іх паходзіць ад людзей як вынік канфлікту паміж чалавекам і Богам ці чарадзеем (мядзведзь, бусел, дзяцел), людзьмі і птушкамі (чорны бусел), людзьмі і Гаспадаром вужоў (зязюля, салавей, жаўранак). Толькі ваўкі — вынік добрых адносін Бога да дзяцей, якія засталіся без бацькоў.

Міф пра **мядзведзя** і яго паходжанне дайшоў у некалькіх варыянтах. Чарадзейныя казкі захавалі згадку пра шлюб мядзведзя з жанчынай. Яго плён — герой-асілак. У сакралізацыі жывёл ім надаецца нават уласцівасць нецнатлівага зачацця.

У рытуалах беларусаў-язычнікаў мядзведзь можа выступаць як бажаство, якому прысвечана абрадавае дзеянне — камаедзіца. У той жа час паходжанне мядзведзя звязваецца з пакараннем злачынца чарадзеем ці Богам за непавагу.

**Ваўкоў** Бог стварыў, каб дзеці-сіроты як пастухі маглі зарабіць сабе на жыццё. Пашкадаваў Бог адных, ды нарабіў клопату другім. Пачалі ваўкі

моцна сваволіць, нават і пастухі не заўсёды маглі даць рады. Тады прызначыў Бог над усімі ваўкамі гаспадаром Ярылу і загадаў ім слухацца яго.

З вобразам ваўка звязана такая з’ява, як ваўкалацтва. **Ваўкалак** — чалавек, пераўтвораны кім-небудзь у ваўка. Ён падобны да звера, але ў яго вакол шыі белая паласа ды вочы чалавечыя. Ваўкалак нікому не шкодзіць. Уяўленне аб пераўтварэнні чалавека ў ваўка, які з’яўляецца адначасова і ахвярай, і зверам, аб’ядноўвае многія міфы.

Вобраз **Гаспадара вужоў** перадаюць шматлікія міфы. Ён займае ў іх значнае месца. У паўночна-заходніх рэгіёнах Беларусі вуж яшчэ ў XIX ст. лічыўся свойскай, а то і хатняй жывёлай.

Гаспадар-вуж — самы вялікі вуж, якому няма роўнага між іншых вужоў. У яго карона бліскучая і залатыя завушніцы. Уецца ён, ходзіць на хвасце стаймя, нібы чалавек. А склікае Гаспадар вужоў сваіх падданых такім волатавым посвістам, што чуваць па ўсёй Беларусі.

Гаспадар-вуж можа надзяліць чалавека звышнатуральнымі ўласцівасцямі, калі падарыць яму сваю залатую карону. Ён можа пераўтварыцца ў чалавека — і ніхто яго не пазнае, уступіць у шлюб з дзяўчынай — народзяцца вужалкі, антрапазааморфныя істоты: прыгожыя маладыя дзяўчаты, але замест ног у іх змяіныя хвасты. Вужалкі звычайна жывуць у лесе, паблізу вадаёмаў, вельмі любяць сядзець на старых разгалістых дрэвах і часаць залатымі грабеньчыкамі свае цудоўныя валасы.

Як вужы ідуць у Вырай, то кожную зялінку, травінку, пянёк, дрэва — усё нюхаюць. І калі чалавек адразу за імі панюхае, то стане вужом і з імі разам пойдзе. Вужа, што ўкусіць чалавека, іншыя вужы не пусцяць у падземны Вырай, і ён будзе самотна цягацца па свеце, пакуль хто не заб’е яго або ён не змерзне.

Сваіх гаспадароў маюць гадзюкі, змеі (іх можна пазнаць па залатых рожках на галаве). Гаспадары гадзюк і змей, паводле ўяўленняў беларусаў, надзяляюць людзей чароўнымі ўласцівасцямі. Але да гэтых жывёл у беларусаў супярэчлівыя адносіны: гаспадароў змей і гадзюк любяць, а іх падданых асцерагаюцца, паколькі яны шкодзяць людзям і свойскім жывёлам.

**Кот** у міфалогіі беларусаў займае асобае месца: ён міфалагізаваная жывёла, якая выводзіцца штучна, можа быць нябачнай, дапамагае свайму гаспадару набыць багацце.

Асобная група персанажаў міфаў і міфічных ўяўленняў беларуса-язычніка — вешчыя птушкі, паведачы багоў: сарока, крумкач, зязюля і сава. Гэтыя птушкі ведаюць чалавечы лёс і прадказваюць яго, толькі трэба разумець іх мову. Чараўнікі і варажбіты валодаюць ёю, таму здольны прадказваць

будучыню. Але і простыя людзі, назіраючы за вешчымі птушкамі, могуць прадбачыць магчымыя ў будучым падзеі.

### Міфічныя жывёлы

У СВАІХ МІФАХ беларусы стварылі вобразы міфічных жывёл, якія рэальна не існуюць у прыродным асяроддзі.

**Цмок** — крылаты змей, міфічная істота ў выглядзе пачвары, якая спалучае элементы розных жывёл: галава (часта некалькі галоў) і тулава паўзуна (змяі, яшчара, кракадзіла) і крылы птушак. Цмок вялізны, як будынак. Мае 3, 6, 9, а то і 12 вялікіх, як цэбры, галоў. Зубы ў яго, як нарогі, пазногці, як сярпы, а крылы, як палашы, вострыя.

**Змей** выводзіцца чалавекам штучна. Гэта жывёла, падобная на звычайнага вужа, толькі значна большая за яго і мае крылы. Ён увесь залаты, гарыць як жар. Змей жыве ў клеці таго чалавека, які яго вывеў. Калі ён падрастае, то пачынае лятаць па свеце, шукаць скарбы і насіць іх гаспадару.

**Ваўкалак** — чалавек-пярэварацень, які ведае, як пераўтварацца ў ваўка. Такі воўк мае звышнатуральныя ўласцівасці. Вера ў тое, што чараўнік і нават просты чалавек здольны на такое пераўтварэнне, рэальна існавала ў старажытнай Беларусі. Аб гэтым сведчыць старадаўняя славянская кніга «Чараўнік», якая была забаронена праваслаўнай царквою. Здольнасцю пераўтварэння ў ваўка надзялялі полацкага князя Усяслава Чарадзея (XI ст.).

Міфічныя птушкі таксама прысутнічаюць у міфалогіі беларусаў. Яны выконваюць функцыі боскіх паведачоў ці ездавых жывёл багоў (гарцукі), татэмных продкаў. Гаспадаром і абаронцам птушак быў **Кук** — вобраз міфічны, аб якім, на жаль, захавалася мала тэкстаў.

На Сусветным дрэве месца птушак на вершаліне. Сімволіка асобных птушак мае вялікае значэнне ў прымхах і забабонах беларусаў.

### Расліны

НЕ МЕНШАЕ месца, чым жывёлам, у міфічных уяўленнях беларусаў аддадзена расліннаму свету. Міфы пра расліны маюць дачыненне не толькі да дзікай прыроды, уключаюцца ў іх і сельскагаспадарчыя расліны.

У касмаганічных міфах расліны фактычна выступаюць як першы аб'ект з усяго таго, што было створана багамі. У той жа час як аб'ект міфалагічных і рытуальных сістэм яны выкрышталізаваліся пазней, чым жывёлы. Частка раслін, паводле ўяўленняў беларусаў, мае магічныя ўласцівасці. Больш таго,

расліна ў міфе набывае касмаганічнае гучанне. Так, **дуб** — дрэва Перуна — лічыўся Сусветным дрэвам.

### Міфалагізаваныя расліны

ДЗЕ ТОЛЬКІ зямля, вада і трохі цяпла, там і расліны, сцвярджае беларус. У сваіх уяўленнях беларус-язычнік падзяляе ўвесь раслінны свет на добрыя (карысныя) і нядобрыя (тыя, што перашкаджаюць весці гаспадарку) расліны і звязвае іх з’яўленне з дзейнасцю Белбога ці Чарнабога адпаведна. Добрую расліну Белбог даў на патрэбу людзям, а ўсялякае паганае зелле Чорнабог выплюнуў. Добрую расліну чалавек сам сее або садзіць, даглядае яе, і то яна не заўжды радуе яго. А ліхая расце сама па сабе, ды так, што часам чалавек не здольны яе знішчыць.

У народных уяўленнях расліны нярэдка паўстаюць як жывыя істоты: яны адчуваюць, дыхаюць, гавораць з людзьмі, якія здольны іх разумець.

Беларус-язычнік лічыў, што ўсе расліны размаўляюць між сабой. Але ёсць такія людзі, што разумеюць іх гаворку і таму могуць даведацца, якая тоіцца ў іх сіла — гаючая ці атрутная, пры якіх хваробах тая ці іншая расліна дапамагае. У даўнія часы шмат было такіх людзей, а цяпер іх стала вельмі мала.

У купальскую ноч расліны не толькі размаўляюць між сабою, але і ходзяць адзін да аднаго ў госці, нават скачуць, толькі звычайныя людзі гэтага не бачаць.

Нярэдка расліны даюць жыллё духам і нават багам (напрыклад, лознікам і лазавікам). Распаўсюджаны ўяўленні аб духах, што з’яўляюцца носьбітамі якасцей раслін. Сярод іх хлебныя духі, якія нярэдка паўстаюць ў выглядзе чалавека ці жывёлы (прыклад — Хлебная Баба).

Асобныя міфы тлумачаць, што і духі перадаюць свае якасці раслінам. На асіне заўсёды сядзяць трасцы, таму дрэва заўжды дрыжыць — яго трасца трасе.

Культурныя расліны дадзены людзям Белбогам. Больш за ўсё шануюць жыта, з ім звязана некалькі міфаў. Адзін з іх аб тым, што людзі аказаліся няздольнымі ацаніць гэты падарунак Белбога, за што ён іх ледзь не пакараў.

Шэраг дрэў паходзіць ад людзей. Так, асіна і бяроза з’явіліся ў выніку бацькоўскіх праклёнцаў.

Нахіліўшаяся над вадой **вярба** — гэта праклятая Богам маці, што страціла сваё дзіця.

Боскімі з’яўляюцца пэўныя кветкі і травы. **Папараць-кветка** цвіце адзін раз на год, у ноч на Купалу. Хто знойдзе яе, будзе ведаць усё на свеце і разу-

мець мову жывёл і раслін. Яна робіць яе ўладальніка нябачным. Завалодаць ёй вельмі цяжка, бо нядобрыя духі чыняць розныя перашкоды: адводзяць вочы, а найбольш палохаюць рознымі жахамі.

**Наготкі, медуніца** адводзяць маланкі ад хаты. Так, наготкі, на думку палешукоў, надзелены ўласцівасцю не дапускаць перуноў, таму ў кожным агародзе можна іх знайсці. Шмат людзей верыць у тое, што перад бурай сярод кветак з'яўляюцца агеньчыкі, падобныя на мініяцюрныя бліскавіцы.

Беларус выкарыстоўвае расліны і для вырашэння сваіх праблем. Калі яму дрэнна жыць на свеце, ён пагражае: «Уцяку ды асінкаю заламаю дарогу». Гэта значыць, што ўжо ніколі ў гэтае месца не вернецца. Заламванне асінкаю дарогі мела страшную сілу. Беларускі-паляшучкі праклінаюць асінаю: «штоб ты павесіўся на сухой асіне», «няхай цябе трасца трасе, як асінавы ліст».

На Купалле дзяўчаты, наскакаўшыся і натанцаваўшыся, рассыпаюцца па лесе ці полі для пошуку вешчых, лекавых траў, такіх як **медуніца, купальніца, росічкі, буковіцы, браткі, расходнік, васілёк, піжма**. Звычайна іх набіраюць да 9 відаў і берагуць увесь год. Імі абкурваюць дзяцей ад хваробы і ліхога вока, яны ратуюць ад навальніцы і іншых напасцяў.

## Міфічныя расліны

У ЯЗЫЧНІЦКАЙ міфалогіі беларусаў акрамя рэальна існуючых у навакольнай прыродзе раслін ёсць і такія, што створаны багатай фантазіяй нашых продкаў, якія ўвасобілі ў іх пэўныя паняцці ці памкненні чалавека. Гэта **разрыў-трава, пералёт-трава, сон-трава, божае дрэўка**.

Расце недзе ў полі зелле шчасця — пералёт-трава. Расказваюць, што яна здольна пераносіцца з месца на месца. Кветка яе з колераў вясёлкі, надзвычай жывая і прыгожая, а ў сваім начным палёце блішчыць, нібы зорка. Шчаслівы той, хто яе сарве, бо не зазнае ён перашкод у сваім жыцці, усе яго жаданні збудуцца. Але ў пагоні за ёю шмат хто збіўся з дарогі і не вярнуўся да сваёй роднай хаты.

Ёсць такая трава, што дзівосна ўздзейнічае на жалеза: рве ланцугі, адчыняе любыя замкі. Калі на лузе ў час сенакосу каса натрапіць на яе, дык расколецца на некалькі частак. Гэта разрыў-трава. Яе ведаюць толькі вешчыя птушкі — сарока, сава, сойка і асобныя жывёлы. Таму чалавек здабывае гэтую расліну своеасаблівым спосабам — прымушае птушак ці жывёл знайсці яе і прынесці яму.

Ёсць дзіўная расліна, якую ведаюць толькі чарадзеі, — сон-трава. Калі насенне гэтай травы рассыпаць паблізу людзей, то ўсе, хто пачуе яе пах, на

нейкі час паснуць бы мёртвыя. Яе скарыстоўваюць зладзеі і чараўнікі дзеля сваіх нядобрых мэт.

Божае дрэўка цвіце ў той жа час, што і папараць-кветка. Той, хто сарве яго кветку, зможа адшукваць скарбы, схаваныя ў зямлі.

## Глава 10. Сімволіка ў міфалогіі беларусаў

СІМВАЛ (ад гр. symbalon — знак, апазнавальная прыкмета) — катэгорыя міфалагічных элементаў, якія адлюстроўваюць уяўленні аб персанажах, з’явах, прыродных аб’ектах; канцэнтраваная ўмоўная форма адлюстравання і фіксацыі ведаў чалавека пры дапамозе стылізаванага знака; іканаграфічны тэкст, вынік міфічнага мыслення.

Міфалагічная сімволіка — сістэма знакаў, сімвалічных паняццяў, якія сфарміраваліся ў працэсе развіцця міфалогіі. Любы міф з’яўляецца сімвалам, адлюстроўвае ідэю, з’яву ў выглядзе міфічнага персанажа. Але не кожны сімвал ёсць міф. Узровень міфалагічнай сімволікі залежыць ад узроўню развіцця міфалагічнай сістэмы. Шматварыянтнасць сімвалаў — вынік захавання сімвалаў розных перыядаў развіцця міфалогіі.

Сімвалы ў міфічным мысленні адыгрываюць ролю спецыфічных адзінак. Яны займаюць месца паміж канкрэтна-пачуццёвымі і абстрактнымі паняццямі. Тым самым сімвалічнае ўспрыманне свету — адна з характэрных рыс міфічнай свядомасці.

У працэсе пераходу на новыя этапы гісторыка-культурнага развіцця міфалагічная сімволіка падвяргаецца пэўным зменам. Захоўваючы форму знака, яна можа набываць іншы сэнс.

Міфалагічная сімволіка, адлюстроўваючы этнічную культуру, пераходзіць у народную, а потым у нацыянальную.

### Віды сімволікі

ІСНУЮЦЬ розныя віды сімволікі: аб’ектная (прыродныя і культурныя прадметы, рэчы), персанажная, знакавая. У той жа час у знакавай сімволіцы выдзяляюць падвіды, якія вызначаюцца геаметрычнымі і графічнымі знакамі, лічбамі, колерамі.

Сімвалы ў беларускім язычніцтве не толькі выконвалі функцыі адзінак мыслення, але і былі адным з магічных сродкаў: нанесеныя на прадметы, яны выконвалі функцыю абярэгу.

**Сімволіка вобразаў** звязана з персанажамі міфалогіі. Пярун атаясамляў навальніцу. Белбог і Чарнабог сімвалізавалі дыхатамію Сусвету і ўсіх працэсаў, што ў ім адбываліся: святло і цемру, жыццё і смерць, добрае і злое.

Змены пор года суадносяцца з вобразамі багоў: вясна — багіня Ляля і жаўранак, лета — багі Купала і Цёця, восень — багі Жыцень і Талака, зіма — Зюзя і яго памагаты дух Мароз.

Пэўныя жывёльныя персанажы дапаўняюць вобразную сімволіку: певень — птушка Перуна; конь — сімвал сонца; казёл, воўк — сімвалы бога зямлі Вялеса. З казой і яе дзеяннямі нашы продкі-язычнікі звязвалі свае спадзяванні аб добрых выніках земляробчай працы.

**Сімволіка колераў**. У каляровай гаме беларусаў два асноўныя колеры: белы і чырвоны. Беларускія тканіны ў асноўным шэра-белыя, узоры на іх бела-чырвоныя з невялікімі дабаўкамі чорнага або сіняга колераў.

Белы колер — сімвал неба, чысціні, святасці, у той жа час — сімвал хваробы, смерці. Чырвоны колер — сімвал сонца, агню, жыцця, дабрабыту, адначасова — сімвал бога зямлі Вялеса.

Чорны колер атасаямліваецца з нядобрымі багамі і духамі, небяспекай. Чорных жывёл, казу ці курыцу, прыносілі ў ахвяру нядобрым багам і іх памагатым.

У супрацьпастаўленні белага і чорнага адлюстроўваецца дзяленне пантэона багоў на дзве часткі, якія, адпаведна, узначальваюць Белбог і Чарнабог. Гэта ж адносіцца і да варажбы, прымхаў, прыкмет, дзе белы колер суадносіцца са станоўчым пачаткам, чорны — з адмоўным (для параўнання: белая і чорная магіі).

**Сімволіка прыродных прадметаў**. Фетышызацыя прадметаў прыроды спрыяла пераўтварэнню часткі іх у сімвалы: дуб — сімвалічнае адлюстраванне Сусвету, бяроза — жаночага пачатку; асіна — дрэва нядобрых духаў; Лысая гара — месца, дзе збіраюцца нядобрыя духі.

Галоўным касмаганічным сімвалам з'яўляецца **Сусветнае дрэва**, якое адлюстроўвае абагульненае апісанне усяго Сусвету.

## Геаметрычныя сімвалы

ГЕАМЕТРЫЧНЫЯ ФІГУРЫ, а таксама знакі існавалі ў беларусаў са старажытных часоў і займалі ў сістэме сімвалаў значнае месца. Геаметрычныя сімвалы шырока выкарыстоўваліся ў жыццядзейнасці язычніка-беларуса. Яны былі выціснутымі ці надрапанымі на кераміцы, выгравіраванымі на касцях жывёл ці каменнях. Пазней сімваламі, вышытымі,

вытканымі на адзенні, выразанымі на рэчах і прадметах, зробленымі з дрэва, беларусы ўпрыгожвалі свой быт. Імі азначалі стыхіі, міфічных персанажаў, чалавека і нават пэўныя абстрактныя паняцці.

Геаметрычныя сімвалы — клас міфічных знакаў, якія па форме адпавядаюць асноўным геаметрычным элементам. Да іх адносяцца геаметрычныя фігуры, лініі, а таксама целы (шар, куб, конус і г. д.), якія ў двухмернай прасторы фіксуюцца як фігуры. Геаметрычны код, звязаны з устаноўкай на ідэалізацыю і ўніфікацыю рэальных аб’ектаў, служыў зручным сродкам для класіфікацыйных мэт, у прыватнасці, для стварэння ўніверсальных схем, якія падкрэсліваюць адзінства розных сфер быцця. Геаметрычныя фігуры апісваюць структуру космасу ў яго вертыкальным і гарызантальным аспектах, у прасторавых і часавых планах, а таксама вобразы Гэтага Свету: зямлі, краіны, паселішча, сацыяльных элементаў і такіх этычных паняццяў, як вера, любоў.

Такія сімвалы ўтвараюць значны слой міфічных знакаў і сімвалаў, якія, аказваючы ўплыў на адпаведныя структуры псіхікі, могуць мадэляваць новыя сітуацыі. У прыватнасці, на гэтых іх уласцівасцях заснавана выкарыстанне геаметрычных сімвалаў для псіхафізічнага ўздзеяння на падсвядомасць у практычнай магіі.

Сімвалы могуць існаваць у якасці асобных ізаляваных аб’ектаў ці ў рознага роду спалучэннях, утвараючы арнамент. Арнаментальныя ўзоры не толькі сімвалы, але і дэкор, які становіцца элементам мастацтва.

## Адлюстраванне аб’ектаў прыроды

АДЗІН з самых распаўсюджаных і старажытных геаметрычных сімвалаў у беларусаў — ромб. Яго выява ўзнікла ў познім палеаліце. Як толькі людзі, што жылі на нашай тэрыторыі, пачалі апрацоўваць зямлю, з’явіўся ромба-кропкавы арнамент як сімвал апрацаванага і засеянага поля (рыс. 1, 2). Найбольш пашыраны варыянт — ромб, падзелены на чатыры квадраты з кропкамі ў цэнтры кожнага з іх (рыс. 3). Ён часта сустракаецца ў тканых вырабах.



Рыс. 1



Рыс. 2



Рыс. 3



Рыс. 4

У XIX ст. такім арнаментам упрыгожвалі вясельныя строі, святочныя ручнікі, абрусы. Лічылася, што гэты знак забяспечвае дабрабыт, урадлівасць палёў. У вышыўцы ці ткацтве гэты сімвал зямлі атрымаў далейшае развіццё (рыс. 4).

На тэрыторыі Беларусі існаваў абрад, які выконваўся перад пабудовай новай хаты. На зямлі, выбранай для месца пабудовы, чарціўся квадрат памерам з будучае жыллё. Яго дзялілі роўна на 4 квадраты. Затым гаспадар ішоў ад яго на 4 бакі, прыносіў 4 камяні і ўкладваў іх па адным у цэнтры кожнага малога квадрата. Толькі пасля гэтага прыступаў да будоўлі.

**Крыж**. У міфалагічных і рэлігійных сістэмах ён адзін з найбольш распаўсюджаных сімвалаў, які функцыянаваў як умоўны знак вышэйшых сакральных каштоўнасцей. Крыж сімвалізуе агонь (рыс. 5). Але ён часта выступае і як сімвал чалавека ці антрапаморфнага бажаства.



Рыс. 5

Разнавіднасць крыжа — **Свастыка**, з’яўляецца адным з найбольш архаічных сімвалаў. Малюецца ў выглядзе крыжа з загнутымі пад вуглом ці авальна канцамі. Свастыка з канцамі, загнутымі ўправа, — сімвал вясны, лета, дабра, мужчынскага пачатку (рыс. 6). Свастыка з канцамі, загнутымі ўлева, сімвалізуе восень, зіму, нядобры знак, жаночы пачатак (рыс. 7). Гэты даволі распаўсюджаны ў традыцыйнай культуры беларусаў сімвал дастаткова часта сустракаецца ў ткацтве, вышыўцы і карунках. У вышыўцы і карунках ён нагадвае чатырохпялёсткавую кветку, пялёсткі якой выгнуты па ходу гадзіннікавай стрэлкі або ў супрацьлеглы бок.



Рыс. 6



Рыс. 7

У аздобе хат і хатняга начыння беларусаў часта сустракаюцца салярныя знакі — сімвалы сонца. Гэта кола з крыжам (рыс. 8) ці 6 або 8 спіцамі

ў сярэдзіне (рыс. 9, 10). Крыж у крузе сімвалізуе не толькі сонца, але і агонь. Шасціканцовая разетка шырока выкарыстоўвалася ў разьбе па дрэву пры аздабленні хаты, бытавога начыння (рыс. 11).



Рыс. 8



Рыс. 9



Рыс. 10



Рыс. 11

Касы крыж (рыс. 12) азначаў зімовае сонцастаянне, здвоены касы крыж (рыс. 13) — летняе сонцастаянне (яго называюць яшчэ купалаўскім знакам).



Рыс. 12



Рыс. 13

Нашы продкі вельмі шанавалі ваду. Яны лічылі, што вада зямная, крынічная, калодзежная можа прыцягваць да сябе ваду нябесную, можа паклікаць яе ў час засухі. Беларусы-язычнікі пакланяліся калодзежам, крыніцам, прыносілі ім у ахвяру ручнікі. Выявай дажджу — хвалепадобным арнаментам — упрыгожвалі ручнікі і адзенне, а выявы дажджавых кропель — зубчыкі з закругленнямі, проста зубчыкі — сталі ўпрыгажэннем падстрэшнікаў хат і ліштвы (рыс. 14, 15).



Рыс. 14



Рыс. 15

Арнаментальныя кампазіцыі, створаныя чалавекам, перадавалі яго жаданні на будучае. Арнамент на адзенні выконваў магічную функцыю. Ён размяшчаўся па яе краях ці разрэзах з мэтай засцерагчы чалавека ад пранікнення ў яго цела і душу нядобрых духаў.

### Адлюстраванне міфічных уяўленняў

СІМВАЛЫ персанажаў міфалогіі беларусаў найбольшае выкарыстанне знайшлі ў вышыўцы і ткацтве. Яны адлюстроўвалі веданне беларусамі-язычнікам боскага пантэона.

Сімволіка персанажаў вельмі багатая і адлюстроўвае значную частку персанажаў язычніцкай міфалогіі беларусаў. Тут былі сімвалы нябесных і зямных багоў: Перуна, Ярылы, Жыценя (рыс. 16—18). Не забывалі беларусы і сваіх продкаў, адзначыўшы сімваламі волатаў, Дзядоў (рыс. 19, 20). Шанавалі карыснага для гаспадаркі духа поля — Жытнюю Бабу (рыс. 21), памяталі аб загубленых бацькамі дзяўчатах, якія сталі істотамі стыхіі вады, — русалках (рыс. 22). Бессмяротная чалавечая душа таксама знайшла сваё адлюстраванне ў сімвале (рыс. 23). Адзначылі пэўным сімвалам і абрадавы прадмет — купальскі вянок (рыс. 24).



Рыс. 16. Сімвал Перуна



Рыс. 17. Сімвал Ярылы



Рыс. 18. Сімвал Жыценя



Рыс. 19. Сімвал волатаў



Рыс. 20. Сімвал Дзядоў



Рыс. 21. Сімвал Жытняй Бабы



Рыс. 22. Сімвал русалкі



Рыс. 23. Сімвал душы



Рыс. 24. Сімвал купальскага вянка

Колькасць сімвалаў, якімі карысталіся беларусы, дазваляла перадаць не толькі ўяўленні аб Сусвеце і багах. Іх спалучэнні ў арнаментальных кампазіцыях утваралі іканаграфічныя мікратэксты. Яны былі і сакральныя — як звароты да багоў і духаў, і бытавыя, у якіх чалавек выказваў свае думкі аб жыцці ў Гэтым Свеце.

* * *

Па выніках даследавання аўтар лічыць неабходным зрабіць некаторыя найбольш важныя высновы.

Сістэму міфічных уяўленняў беларускага этнасу мы вызначаем як вялікую, складаную і адну са старажытнейшых сярод міфалогій еўрапейскіх народаў.

Тыпалагічна міфалогія беларусаў адносіцца да ўсходнеславянскай. Але спецыфічнасць зместу міфаў, структуры міфічных персанажаў патрабуе вывучэння яе як самастойнай культурнай з’явы. Яна мае значныя рэгіянальныя асаблівасці, якія адрозніваюць яе ад украінскай і рускай.

У аснове сваёй гэта міфалогія земляробчых плямёнаў. Але ў ёй ёсць рэшткі старажытных уяўленняў, звязаных з перыядам жыцця да земляробства. Яна ўтрымлівае значную колькасць індаеўрапейскіх элементаў, якія захаваліся ад балцкага субстрату, а потым былі прыўнесены славянамі.

Міфалогія беларусаў была сродкам канцэнтрацыі вопыту, формай арганізацыі, захавання і перадачы яго новым пакаленням, своеасаблівым інфармацыйным банкам першабытнага грамадства, які ўтрымліваў накопленыя людзьмі эмперычныя веды аб прыродным асяроддзі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, традыцыях, сацыяльных з’явах. Тым самым яна выконвала і гнасеалагічную, і ідэалагічную функцыі.

Спецыфічным для міфалогіі беларусаў з’яўляецца панаванне ў прасторавых уяўленнях мезакосмасу ў выглядзе лакальных тэрыторый з асабістымі сакральнымі цэнтрамі. Таму значная частка міфаў беларусаў мае характар мясцовых паданняў, якія тлумачаць паходжанне колькі-небудзь значных месц і прыродных аб’ектаў рэгіёна.

Характэрным для язычніцкай міфалогіі з’яўляецца наяўнасць у ёй значнай колькасці элементаў магіі, што знайшло адлюстраванне ў міфічных тэкстах і сімвалах, якія захаваліся ў традыцыйным беларускім ткацтве, вышыўцы і разьбе па дрэву.

Значная частка міфічных уяўленняў, зафіксаваных у тэкстах, звязана з духамі прыроды і хваробы, а таксама з духамі і бажаствамі, што суадносяцца з земляробчай справай.

Міфы продкаў беларусаў функцыянавалі і захоўваліся толькі ў вуснай традыцыі. Фіксацыя асобных міфаў пачынаецца з XVI ст., вывучэнне навукоўцамі — з XIX ст., калі міфічныя ўяўленні былі ўжо ў значнай ступені дэфармаваны хрысціянствам. Але існуе вялікая колькасць другасных тэкстаў і мікратэкстаў, якія дазваляюць правесці стуктурную рэканструкцыю гэтых уяўленняў і паказаць іх як цэласнае сістэмнае ўтварэнне.

Міфалогія беларусаў — духоўная каштоўнасць нашага народа і помнік культуры. Яна непарыўна звязана з мовай і традыцыйнай культурай беларусаў, зберагае найбольш старажытны яе пласт, у якім сфарміраваліся архетыпы, што пазней увайшлі ў этнічную і нацыянальную культуру.

У сваім развіцці язычніцкая міфалогія беларусаў не атрымала лагічнага завяршэння ў сувязі з паскораным пераходам грамадства да цывілізацыі, а феадальнай вярхушкі да хрысціянства, але нават тое, што захавалася, уяўляе вялікую культурную каштоўнасць.

Міфалагізацыя элементаў культуры пры ўсёй сваёй зменлівасці з’яўляецца неад’емнай атрыбутыўнай уласцівасцю гісторыка-культурнага працэсу. Вывучэнне праблем міфалогіі патрабуе значных намаганняў, але адкрывае шырокае поле для навуковай дзейнасці. Першачарговымі задачамі беларускіх міфолагаў, на думку аўтара, з’яўляюцца:

— абагульненне і асэнсаванне вынікаў навуковага вывучэння міфалогіі беларусаў, атрыманых у папярэднія часы;

— выхад на новы ўзровень даследавання міфаў, які суправаджаецца выкарыстаннем сучаснага навуковага інструментарыя;

— вызначэнне аспектаў і праблем міфалагічных даследаванняў, звязаных з этнічнай спецыфікай, што будзе не толькі мець навуковую і практычную

каштоўнасць для беларускага грамадства, але і прадстаўляць цікавасць для навукоўцаў іншых краін;

— асэнсаванне міфалогіі беларусаў у кантэксце агульнаславянскай і міфалагічных сістэм іншых народаў свету.

Сістэмная рэканструкцыя міфічных уяўленняў старажытнага грамадства Беларусі, праведзеная аўтарам, мае не толькі навуковую каштоўнасць, але і вялікае практычнае значэнне: дазваляе зразумець многія з’явы культуры тагачаснага беларускага грамадства, пазбегнуць ідэалізацыі і рамантызацыі мінулага ў навуковым плане і ў той жа час дае матэрыял для творчай рэфлексіі пісьменнікаў, мастакоў, сцэнарыстаў.

Частка другая

# ТЭКСТЫ МІФАЎ І ПАДАННЯЎ



# * СУСВЕТ. БАГІ І ДУХІ

## Стварэнне Сусвету

### Нараджэнне Белбога і Чарнабога

НЕКАЛІ даўно-даўно Зямлі яшчэ не было. Замест яе быў густы туман ці воблака.

Аднойчы па абодвух баках гэтага воблака з'явіліся дзве зоркі. Адна пазірала зверху, другая — знізу. Кожны раз яны пускалі свае праменьчыкі на гэтае воблака, стараліся прабіцца святлом скрозь яго.

Аднаго разу адна з зорак скацілася і дакранулася да воблачка. Ад гэтага дотыку раптам усё закруцілася, зацягло недзе зорку. І воблака стала Зямлёю, зорка перастала ззяць, ператварылася ў белае воблачка. І магло яно рабіць цуды, пераўтварацца ў што захоча.

Другая ж зорка таксама пакацілася да былога туману, ды не ведала яна, што там ужо цвердзь. Моцна ўдарылася, загарэлася і стала чорным дымам, які таксама мог пераўтварацца ў што захоча.

Так і з'явіліся Белбог і Чарнабог.

Сталі яны абодва Зямлю даглядаць. Ды толькі Чорны бог пакрыўдзіўся і выбраў сабе жыллё пад Зямлёй. Памятаючы зямную цвердзь, Чарнабог прыдумаў і насцяліў па зямлі балоты, якія ператваралі цвёрдае ў мяккае. Што ні рабіў Белы бог, Чарнабог заўсёды зробіць наадварот. Адзін тварыў днём, другі — ноччу. Белы даў жыццё чалавеку, а Чорны зрабіў яго век кароткім і прыдумаў смерць. Першы даў людзям ежу, а другі голад насылае. Белы зрабіў чалавека добрым, цярплівым, працавітым, а Чорны насеяў зло, зайздрасць, ляноту.

Белы бог жыве на небе. Часам ён сыходзіць на зямлю, пераварочваецца чалавекам. І ўбачыць яго можа толькі добры і працавіты чалавек.

Чарнабог жыве пад Зямлёю. Ён таксама можа з'яўляцца на Зямлі. Рабіць нядобрае яму дапамагаюць Нядобрыя Духі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*

---

* Усе тэксты другой часткі кнігі прыводзяцца з захаваннем напісання збіральнікаў-навукоўцаў.

## Як Белбог змагаўся з Чарнабогам

БЕЛБОГ правіў усім светам. І ўсё было б добра, калі б не Чарнабог, які жадаў перамагчы Белбога. Зробіць Белбог нешта добрае, а Чарнабог на свой лад перарабляе — хай дрэнна, ды толькі каб не пабоску ўсё было.

Спрачаліся, спрачаліся два Богі адзін з адным, ды надакучыла Белбогу час марна траціць. І вырашыў Белбог прагнаць Чарнабога з белага свету. Чарнабог па ўсім свеце блукае-хаваецца, а як убачыць яго Белбог, дык схопіць, што пад руку трапляе і кідае ў Чарнабога. Доўга Белбог ганяўся за Чарнабогам па ўсім свеце, кідаў у яго то каменнем, то зямлёй. Закруціла Чарнабога як у віры, абляпіла з усіх бакоў каменнем ды зямлёй, так што сілы яго зусім пакінулі. А ком зямлі ўсё рос ды большаў, пакуль не стаў Зямлёй.

Ачуняў крыху Чарнабог ды стаў хады-выхады з глыбіні Зямлі наверх шукаць. Як пачуе Белбог, што Чарнабог зямлю рые, то так і чакае, пакуль той з нары пакажацца, ды вадой нару залівае. Як пачне Чарнабог рыць з другога боку, то і там Белбог залівае. І дзе ў зямлі былі Чарнабогавы норы, там пацяклі рэкі ды ўтварыліся азёры.

І зразумеў тады Чарнабог, што яму ўжо не выбрацца на паверхню, бо Белбог сонца распаліў, каб відно было, а як сонца стоміцца, дык месяц свеціць, каб можна было Чарнабога вартаваць. І тады пачаў Чарнабог у глыбіні Зямлі ўладкоўвацца ды думаць, як Белбога перамагчы.

Украў ён трохі сонечнага агню ды раздуў агонь у глыбіні Зямлі. Такое вогнішча распаліў, што рэкі, якія побач цяклі, кіпець пачалі. А як стоміцца Чарнабог ды ляжа адпачываць, дык тыя рэкі ад кіпення аж на паверхню Зямлі выплёскваюцца ці агонь так разгарыцца, што аж з Зямлі полымя шугае. Тады трасяне Белбог Зямлю, каб Чарнабога разбудзіць.

А на Зямлі шмат усяго развялося. Бо як ганяўся Белбог за Чарнабогам ды адрываў кавалкі зямлі, каб у Чарнабога кінуць, то было ў тых землях шмат семя living рознага. А як паліў Бог вадой тое семя, з глыбіні Зямлі Чарнабога выганяючы, дык ад вады і ад цяпла сонечнага стала тое семя прарастаць. І расплодзіліся на Зямлі птушкі, звяры, ды расліны розныя. І чалавечае семя на Зямлю папала. Ды з розных кавалкаў зямлі рознае — таму і людзей шмат розных. І як людзі на Зямлі расплодзіліся, убачыў Чарнабог, што яны разумнейшыя за іншых жывых істот, і давай з некаторымі з іх дружбу ладзіць. Хто слабейшы ды розуму менш мае, той і паддасца на ўгаворы Чарнабога, памагае яму дрэннае рабіць.

Але рана ці позна Белбог аб тым чалавеку даведаецца ды і пакарае яго ці хваробай, ці бяду нашле якую. Як адумаецца чалавек, перастане з Чарнабогам

дружбу вадзіць, то Бог яму ўсё дарue. А калі той чалавек душу Чарнабогу ці яго памагатым аддаў, дык Белбог карае яго, дзяцей і ўнукаў, каб іншым людзям непавадна было з Чарнабогам знацца ды дрэннае тварыць.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 123/06.*

### Рабіў Белбог Зямлю

Рабіў Белбог Зямлю. Вырабіў, выгладзіў — люба паглядзець. Гладзенькая, кругленькая, як шпакова яйка. Адляцеў троху воддаль ды і дзівіцца са сваёй працы: добра атрымалася.

Тым часам Чарнабог ад злосці аж тросся,назіраючы за гэтым. Зайздрасць яго брала, што Белбог гэтак добра зрабіў.

Як толькі Белбог схаваўся за нябеснымі брамамі (а іх цэлых сем), Чарнабог давай са злосці зямлю дзерці ды кідаць. Куды кіне — гара, куды са злосці плюне — балота. Зрабіў Зямлю такой, як мы зараз бачым. Сам зарыўся глыбока ў Зямлю і зрабіў там сваё гаспадарства.

Зямлю Белбог перарабляць не захацеў, бо на ёй ужо жылі людзі, а іх не было куды выганяць.

Так усё і засталося да нашых часоў.

*ЛіП, № 7.*

## Тры пакаленні людзей

### Волаты

ПЕРШЫМІ людзьмі на нашай Зямлі былі вялікалюды — волаты. Гэта такія вялізныя людзі, што цяперашнія нават ім да калена не дасталі б. Найглыбейшыя рэкі ім не вышэй як да калена былі. Галовы ў іх былі, як цэбры. Ідзе волат праз лес, возьме за верх агромністую сасну, вырве з карэннем і падпіраецца ёю, як кіем.

Волаты папракопвалі рэкі, панасыпалі горкі ды параскідалі ўсюды па свеце велізарныя камяні, якія і цяпер трапляюцца дзе-нідзе на полі ці ў лесе. Яны, бывала, набяруць камянёў, ды пачнуць шыбаць угору так, што яно з вачэй хаваецца. А як пойдуць барукацца ці біцца ды пачнуць рваць дуб'ё, дык аж зямля стогне. Волаты павытоптвалі зямлю, пааралі яе карчамі так, што на тых месцах стаяць азёры і рэкі.

Не было на зямлі нікога, хто б мог з волатамі памерацца сілаю. От яны смела хадзілі сабе ды сваволілі. Ведама, калі хто нікога не баіцца, то ён заўжды пачне дурэць, пачне рабіць ліха. Так і тыя волаты пачалі губіць на Зямлі жывёлу і ўсялякую расліну, а ў неба шыбаць каменнем. Хацелі нават з Багамі дужацца.

За тое Бог і пакараў волатаў. У адных адняў розум, так што яны пачалі лбамі разбіваць каменныя горы. Разгоніцца той волат, бы баран, ды як рэзнецца лбом аб камень, дык мазгі і пацякуць, а ён сам зваліцца на зямлю, патрапеча трохі нагамі ды і дух вон.

Частку волатаў, якія пайшлі супраць Багоў, Белбог закляў: «Быць вам дужымі і стаяць вякамі, а плады вашы будуць свінні есці», — і ператварыў іх у дубы, другую частку — у вялікія горы, астатніх абярнуў у малых ды кволых людзей, якія цяпер жывуць.

Сын апошняга сляпога волата ўбачыў нашага чалавека, які араў зямлю, узяў яго на далонь разам з валамі і сахою, прынёс да бацькі і пытае:

— Што гэта за чарвяк такі зямлю точыць?

А бацька яму ў адказ:

— Наша пакаленне ўжо гіне, а гэта новыя людзі, што пасля нас застануцца.

Загінула пакаленне волатаў, толькі адзін яшчэ доўга валачыўся па свеце, але ён ужо быў сляпы, таму насіў у сябе на карку нашага чалавека, каб той яму дарогу паказваў. Аднаго разу зачапіўся гэты волат за прыгорак і як грымнуў, бы сасна, на зямлю, дык і сам разбіўся на кавалкі, і чалавек на шкуматы разляцеўся.

*Сержп.-1, № 2227.*
*ЛіП, № 26.*
*Fed.-1, s. 201.*
*ПАШ. Ф. 4, воп. 2, спр. ТФК – 35/02.*

### Асілкі

ДАЎНО-ДАЎНО, калі яшчэ людзі жылі па лясах дрымучых, прыйшлі на нашу зямлю асілкі і пачалі сяліцца па берагах рэк. У лясах вадзіліся звяры ўсялякія: мядзведзі, ваўкі, ласі, кабаны, лісіцы, рысі, — а па рэках і азёрах жылі выдры. Рыбы ў водах было такое мноства, хоць кашолкай чэрпай.

Асілкі былі людзі здаровыя, ростам цэлы сажань, у плячах аршыны з два. Голас мелі магутны. Бывала, калі крыкне на ўвесь голас ды свісне, дык якое б дрэва ні было вялікае, а зваліцца. І жонкі іхнія былі ў пару ім: рослыя, дужыя і раджалі кожны раз па двое, па трое дзяцей.

Гаспадарку асілкі ніколі не трымалі. Не было ў іх ніякай худобы, ні скацінкі дамашняй, ні прыпасу, ні запасу. Ні хлеба, ні лёну не сеялі. Карміліся яны тым, што лавілі па лясах звяроў ды па рэках рыбу. Адзежу сабе яны шылі са звярыных скур. Вось так і жылі.

Спадабалася асілкам наша зямля, бо тут ім усяго досыць было. Звера па лясах было не злічыць, рыбы ў рэках таксама, а ім больш нічога і не трэба было. Задумалі асілкі тут пасяліцца. І пачалі яны ўладкоўвацца.

Пачалі асілкі будаваць гарадзішчы. Інструменту ў іх амаль ніякага не было, толькі на ўсіх адна сякера, ды і тая не жалезная, а якаясь медная. Не маючы досыць інструменту, асілкі перакідвалі сякеру з гарадзішча на гарадзішча, бо не хацелі траціць час на хаджэнне. Зыкне асілак з аднаго гарадзішча ў другое: сякеру давай! На другім гарадзішчы нехта возьме сякеру ды і кіне яму. Калі была патрэбна на будоўлю драўніна, пойдзе асілак у лес, вырве дрэва з коранем ды так і прыцягне на гарадзішча. Спатрэбіцца камень, дык ён возьме яго ды і кіне за вярсту, а то наўпрост закіне на гарадзішча.

Асілкі, якія занялі месца, дзе стаіць вёска Обчын, пасяліліся так: адзін бліжэй да лесу, другі бліжэй да возера. Асілак, што жыў бліжэй да лесу, карміўся тым, што лавіў па лясах звяроў, а другі асілак карміўся рыбаю з возера. Адразу яны вельмі дружныя былі паміж сабой. Казалі, што ў іх была адна сякера, і перакідвалі яны яе адзін да аднаго, каб не хадзіць. І ўсё было б добра, каб не здарылася бяда.

Пачало возера высыхаць, і асілак, які жыў каля яго, пачаў галадаць. Пачаў ён хадзіць да другога ў лес, каб пракарміцца. Гэта не спадабалася другому асілку. Дзяды казалі, што асілкі пачалі ваяваць паміж сабою, кідаць адзін у аднаго камні.

Бойкі паміж асілкамі адбываліся часта. Вось аднойчы дзве сям'і асілкаў сутыкнуліся каля адной ракі і пачалі спрачацца, хто прыйшоў першы. Доўга спрачаліся, але нічога не вырашылі. Тады адзін асілак згадзіўся пайсці з сям'ёй на іншае месца. Пайшоў, а калі адышоў, як яму здавалася, далёка, узяў і абразіў першага асілка. А той пачуў гэта. Схапіў першы камень, які трапіў пад руку, і кінуў наўздагон, а другі ў адказ кінуў у яго. Так і пачалі яны перакідвацца. А былі ж гэта не простыя людзі, а вельмі дужыя, таму і камні кідалі вялікія.

Жылі на месцы, дзе зараз вёска Клешава, тры асілкі. Кожны валодаў сваёй вялікай гарой. Жылі яны пэўны час мірна, ніколі не спрачаліся і сябравалі адзін з адным, заўжды дапамагалі адзін аднаму.

Аднойчы Нядобры Дух убачыў іх сяброўства, і яго апанавала зайздрасць. Ён вырашыў пашкодзіць асілкам. І аднойчы ён кінуў у аднаго асілка вялікі валун.

Асілак падумаў, што гэты валун кінуў яго сусед, і кінуў камень суседу. Той падумаў, што гэта другі сусед, і кінуў другому. Так асілкі пасварыліся і пачалі перакідвацца адзін з другім камянямі, а потым усур'ёз пачалі бойку. Яны

кідаліся камянямі пакуль не пазабівалі адзін аднаго… Асілкі загінулі, а людзі і зараз знаходзяць гэтыя валуны і ўспамінаюць пра іх недарэчную варажнечу, на якую звёў іх Нядобры Дух.

Тыя месцы, дзе адбыліся бойкі паміж асілкамі, амаль усе ўсыпаны камянямі. Яны і звяроў забівалі камянямі, ад таго камяні ляжаць і па лясах.

Прайшло шмат часу. Потым асілкі сышлі адсюль, як толькі перавяліся ў лясах звяры і паменшала рыбы ў вадзе, бо ім не стала з чаго жыць. З той пары і гарадзішчы іхнія запусцелі, бо пасля іх не скора прыйшлі сюды нашы дзяды, якія былі больш здольнымі да земляробства і разводу скаціны.

*Бел. эпас, с. 145—146.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС – 115/05.*
*ПАШ, Ф. 5, воп. 2, спр. ТФК – 97/03.*

## Людзі

ДАЎНЫМ-ДАЎНО жылі сабе людзі, пажывалі, ніякага ліха не ведалі. Свет вялікі — усюды вольна. Як папрацаваў, так і пажывіўся. Людзі жылі-пажывалі ды Бога выхвалялі, а ні аб чым яны не клапаціліся. А Багі тады яшчэ жылі на Зямлі, прыходзілі да людзей, бы браты, вучылі іх, як на свеце жыць, ды дзетак пладзіць ды гадаваць, ды Зямлю напаўняць. І не было на Зямлі ні ліха, ні дабра.

Людзі, бы кветкі, цвілі. Жылі, нібы птушкі ў небе, ці рыба ў вадзе — ні шчасця, ні бяды не мелі. Але што такое жыццё? Так жыве і звер у лесе, так жыве і дрэва. Багі ўбачылі тое ды і пачалі вучыць людзей, як лепей дастаць ім жыўнасць, як зрабіць адзенне, як схавацца ў непагадзь, як лавіць рыбу ды звера, ды птушак.

Першы агонь людзі атрымалі ад Перуна. Ад яго стрэлы-маланкі аднойчы загарэлася жытло. Збегліся людзі, пахапалі галавешкі, ды разнеслі па сваіх жытлах і пачалі ў попеле захоўваць.

Аднойчы Бог аднаму старому калёсніку, які акрамя калодак тачыў і верацёны, паслаў шчаслівую думку, каб ён паспрабаваў кружкі на верацёнах вышмульваць ясяневым клінком, а не нажом вырэзваць, як дагэтуль.

— Чаму не, — кажа калёснік сам сабе, — ясень цвярдзей, дык павінен узяць мякчэйшую бярозу. Паспрабуем.

Застругаўшы ясянёвы клінок, прыставіў яго да верацяна, моцна прыціскаючы, і пачаў смычком шморгаць то сюды, то туды, штораз хутчэй. Глянуў — пайшоў дым з верацяна, ды так пахне, бы з вогнішча. Ён далей шморгаць ды яшчэ хутчэй, аж пакуль з верацяна іскры пасыпаліся. Вось так

чалавек знайшоў справядлівы агонь. З таго часу людзі ўсюды патушылі Перуновы цяпельцы ды завялі свойскі агонь. І з тае пары сталі лепей жыць.

Калі Бог стварыў чалавека, дык доўгі час хлеба не было: людзі елі рознае карэнне. Больш за ўсіх галадалі сабакі. Таму яны, узняўшы свае морды ўверх, страшна завылі, просячы ў Бога хлеба. Бог пачуў іх просьбу і кінуў ім з неба адзін жытні колас. Але сабак было многа, дык адзін колас не мог накарміць іх усіх. Сабакі пачалі адбіраць колас адзін у аднаго, рваць яго ў розныя бакі. Разарвалі той колас сабакі на шматкі; зерне рассыпалася, і яны затапталі яго лапамі ў зямлю.

На другі год ад аднаго коласа пайшоў такі багаты ўраджай, што людзі намалацілі цэлую бочку жыта. І з таго часу сталі разводзіць хлеб, а ўсё пачалося з сабак.

Напачатку ўсе хлебныя расліны: жыта, ячмень, пшаніца — мелі колас у даўжыню ўсяго сцябла, ад макушкі да зямлі, і такі цяжкі, што некалькі каласоў толькі і мог падняць чалавек адной рукой.

Выйшлі неяк жанчыны жаць ды сталі наракаць на Бога, што ён даў жыта з такімі каласамі, цяжкімі і нязручнымі.

Бог, пачуўшы такія нараканні, вырашыў атрэсці ўсе каласы і пакінуць адны сцябліны. У той час, калі ён гэта рабіў, у полі знаходзіўся сабака. Зразумеўшы, што калі Бог атрасе ўвесь колас, то хлеба зусім не будзе, ён жаласна завыў, просячы Бога пакінуць хоць нейкую частку коласа на іх сабачую долю. Бог пачуў гэта і злітаваўся, ачысціў не ўвесь колас, пакінуў зерня на версе сцябла столькі, як і цяпер расце. Таму людзі ядуць не сваю долю хлеба, а сабачую.

На пачатку свету людзі не ведалі, як хату ставіць. Нарэшце паставілі якуюсь хату, але не ведалі, што зрабіць, каб у ёй святло было. Так, адна жанчына ўсё носіць сонца рэшатам, а яе муж мяшком і пускаюць у хату. А тут ідзе нейкі чалавек. Падышоў, павітаўся і пытаецца:

— Што гэта вы, людзі, робіце?

Яны пачалі бедаваць:

— От паставілі хату ды ніяк у яе сонца не наносім, усё цёмна ды цёмна.

Тады чалавек пытаецца:

— Што вы мне дасцё за тое, што я вам упушчу сонца ў хату?

Жонка з мужам у адказ:

— Што хочаш, тое і дамо.

Не ведалі людзі, што гэта быў сам Бог. А ён ім кажа:

— Я нічога ад вас не хачу, адно дайце слова, што кожны тыдзень прымеце жабрака, накорміце і дазволіце пераначаваць.

Людзі пагадзіліся на тое.

Тады Бог ім вокны паўрэзваў, і відно стала ў хаце.

Многаму навучыў Бог людзей. І рашылі тады людзі, што калі ўклаў Бог ім розум, то можна рабіць, што хочаш.

— Гэ, мы і самі з вусамі, — пачалі гаварыць людзі, — што захочам, тое і зробім. Мы і самі, як Багі, толькі яны затым не далі нам сілы, улады, што баяцца, каб, Зямлёю завалодаўшы, мы не вырашылі і саміх Багоў сапхнуць з Неба.

І адступіліся тады Багі ад ганарлівых людзей, і пайшлі сабе на Неба. Узялі людзі ўладу над усім, што ёсць на Зямлі: над раслінамі; над усялякім зверам, што жыве ў лесе, на палях, балотах; над птушкамі, што лятаюць пад небам; над рыбамі, што вольна гуляюць ў вадзе.

*Сержп.-1, №№ 268, 775.*
*Сержп.-2, с. 123—127.*
*Шэйн-1, с. 270.*
*Шэйн -2, с. 358—359.*
*Pietkiewicz, s. 29—30.*
*Fed.-1, s.11—12.*

## Багі і Духі Багоні

**Белбог**

ГАЛОЎНЫМ БОГАМ, бацькам усіх Багоў з'яўляецца Белбог. Беларусы завуць яго яшчэ Белуном. Белбог зрабіў сабе Неба, а людзям — Зямлю і ўсё, што на ёй. Ён жа гаспадар Выраю. Белбог мае сына, які завецца Перуном.

Людзям Белбог з'яўляецца на Зямлі ў вобразе гожага сівога дзеда з доўгай белай барадою. Ён апрануты ў белае адзенне і заўсёды з кіем у руках. Белбог літасцівы і творыць адно дабро. Напачатку Бог сам прыходзіў да людзей на зямлю. Ён навучаў іх, як жыць на свеце, як працаваць ды здабываць кавалак хлеба.

Белбог справядлівы, але ліхому ніколі не спусціць, ніколі не даруе. Каб ён захацеў, то ўсіх Нядобрых Духаў звёў бы са свету. Але не робіць гэтага, каб на людзей быў страх, а то яны б і Бога забылі. Бывае і ліхое Бога перамагае, але гэта толькі на час, каб потым паказаць, што Белбог мацней за ўсіх.

Бог над чалавекам з пугаю не стаіць, кожны як хоча можа жыць. Калі хто Бога не баіцца, то ён горай сабакі. Што чалавек без Бога? Цьфу, ды і толькі! Сягоння — гад, а заўтра — падла, ад якой толькі нос верне.

Не таго Бог выслухае, хто ўмее добра яго прасіць, а таго, хто, можа, і не моліцца, а толькі шчыра ўздыхне ды падыме вочы да яго. Жыві па-Божаму, на Бога спадзявайся і нікога не бойся, бо мацней за Белбога нікога няма.

Часам Белбог сыходзіць на Зямлю. Ён паказваецца толькі ўдзень, пры сонечным святле. Ходзіць па лесе, па полі, ды і да чалавека не забывае зайсці пагасцяваць. Убачыць яго можа толькі добры чалавек, які спадабаецца Белбогу. Лічыцца, што чалавек, які ўбачыць старога дзядулю, да парога свайго скanання будзе пад яго аховай. Такому чалавеку, людзі гавораць, і смерць белая прыходзіць, значыць лёгкая.

Калі Бялун сустрэне ў дрымучым лесе вандроўніка, які заблукаў, то тады Белбог абавязкова прыйдзе яму на дапамогу. Дастане са сваёй торбы якога-небудзь птаха, каб той ляцеў наперад і вандроўніку паказваў дарогу. І чаго там толькі ў той торбе няма! І зоркі, — калі раптам чалавек заблудзіцца ўначы, — сыгіне Белбог іх на неба, і адразу чалавеку становіцца смялей; і розных пацешак-забаўлянак, — калі раптам дзіця засталося адно дома без родзічаў, каб яму не было ўжо так нудна дома сядзець; ды розных страхаў, — калі раптам малое ўзялі на ніву, каб не спужаў які воўк ці іншая брыдота.

У час жніва ён любіць паяўляцца на нівах і нават дапамагае жнеям. Любіць Бялун і пажартаваць, але заўсёды па-добраму, і робіць багатыя падарункі. Ён можа раптоўна з'явіцца ў жыце з вялікім мехам на носе. Высачыўшы добрага работніка ці работніцу, падзаве да сябе рукою і просіць уцерці яму нос. Як толькі чалавек дакранецца да носа, з меха раптам пасыплецца золата, і Бог знікне.

Колькасць грошаў бывае гледзячы па тым, чым бядняк вытра нос Белуну. Калі вытрэ рукой, то грошаў насыплется з торбы гэтулькі, колькі можна забраць рукой; калі ж хусткай, або шапкаю, або крысом світы, то грошаў насыплется з торбы Белуна гэтулькі, колькі можа змясціцца ў хустцы, у шапцы, або ў поле адзежы. Пра такога шчаслівуца беларусы кажуць, што ён пасябраваў з Белуном. Таму ў кожным такім разе трэба дзякаваць Белбогу за дапамогу і жадаць яму здароўя.

*Кіркор, с. 272.*
*Сержп.-1, №№ 331, 2107, 2108, 2109. 2115, 2116, 2122.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 163/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 104/06.*

## Пярун

ПЯРУН — сын Белбога, захавальнік нябеснага агню. Гэта велічны, статны, высокага росту мужчына з чорнымі валасамі і доўгай залатой барадою. Седзячы на грамавых жорнах, якія нясуць гарцукі, ён раз’язджае па небе. Пярун узброены молатам і лукам-вясёлкай са стрэламі-маланкамі. Стрэламі, пушчанымі з лука, ён забівае памагатых Чарнабога, якія нагрувашчваюць велізарныя хмары, каб закрыць сонца, сарваць месяц, сабраць у хмары пітво жыцця — ваду. Ударамі каменнага молата Пярун разбівае хмары, і апладняльная вада льецца на Зямлю. Памагатыя Чарнабога разбягаюцца і хаваюцца па ўсім Свеце, і тады Пярун пачынае на іх паляванне.

Як Пярун кідае стрэлы-маланкі, дык усё баіцца, дрыжыць, нават дождж палохаецца і пачынае бы з вядра ліць. Маланкі-стрэлы бліскаюць не роўна, а касіцамі, бо Нядобрыя Духі хочуць ухіліцца, таму страла за імі ляціць умітуські. Стрэлы забіваюць, а агонь спальвае. Свае ўдары Пярун скіроўвае часцей за ўсё на горы, дзе звычайна збіраецца плойма Нядобрых Духаў.

Калі на вуліцы пачыналіся навальнічныя грымоты, людзі абавязкова хавалі ўсе люстэркі ў хаце: бо Пярун можа пусціць маланку ў сваё адлюстраванне ў люстэрку.

Нядобрыя Духі ведаюць, што Пярун любіць чалавека і беражэ яго, таму яны кідаюцца ў жытло людзей, каб схавацца там. Тады Пярун знішчае і жытло чалавека. За страты ад пажару ён багата ўзнагароджвае. Калі здарыцца, што страла трапіць у чалавека, то Бог узнагародзіць яго за тое ў будучым жыцці. Душа чалавека, забітага Перуном, адразу ідзе ў Вырай.

Служаць Перуну Духі-памагатыя — гарцукі. У вольны час яны жывуць у вялікіх гарах. У час усходу і заходу сонца гуляюць па гарах. У поўдзень гарцукі стралою носяцца на конях па палях і лясах. Ноччу, калі наступае час Чарнабога і яго памагатых, гарцукі ў выглядзе розных драпежных птушак лятаюць у паветры, выконваючы даручэнні Перуна.

Памагатыя Перуна — магутныя Духі. Гарцукі здольныя ўтвараць вятры, буры, віхуры.

*Древлянский, № 13, 21.*
*Сержп.-1, № 41, 47.*
*Соболевский, с. 24.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС – 77/05.*

### Жаніцьба Перуна

Сустрэў неяк Пярун Цёцю: «Добры дзень, Цёця, мая першая каханка! Я цябе даўно шукаю, спакою не ведаю». Пакланілася Цёця магутнаму Богу, усміхнулася ды паляцела да Сонца.

Раззлаваўся Пярун, загрымеў гучна, пачаў бліскавіцамі, стрэламі біць.

Спужалася Цёця, павінілася Перуну, пакланілася да сырой зямлі, усміхнулася зарой яснай. Пагадзілася стаць жонкай яго.

Вось так Пярун і Цёця сталі мужам і жонкай, з таго часу ў іх згода ды каханне. Усміхнецца Цёця, як яснае сонейка, — раўнівы Пярун мацней грыміць громам ды кідае маланкі. Напалоханыя хмары даждждом праліваюцца.

Ад кахання Перуна і Цёці пачынаюць квітнець сады, лясы зеленеюць, лугі становяцца квяцістымі.

*Кацар, с. 84.*

## Цёця

АДНА З ЖОНАК Перуна — гаспадыня лета, якую завуць Цётка-Грамаўніца. Яна прыгожая, статная, мажная, сталая жанчына. З'яўляецца яна беларусам на полі апранутай у прыгожую залатую сукенку. У Грамаўніцы валасы доўгія, прыгожыя і абавязкова прыбраныя спелымі каласкамі жыта з кветкамі або травамі. У яе руках заўжды плады, якія паспяваюць і растуць улетку.

Амаль увесь год людзі чакаюць гэтай Багіні. Звычайна яна з'яўляецца ў маі і прыходзіць водгукамі грому. Людзі сапраўды вельмі рады першым грымотам, бо кажуць, што недалёка лета. Пасля першых грымот дазволена ўжо нават купацца ў рэках і азёрах.

Цёця сочыць за тым, як расце ўраджай на полі, садзе ці гародзе. Яна дапамагае людзям, ахоўвае іх палеткі ад граду, залевы ды шкоднікаў. Дзе яна ступіць, там будзе густа каласіцца збожжа.

Вельмі не любіць, калі што-небудзь гіне. Тады Цёця сярдуе, тупае нагамі, і ўсюды чуецца гром. К канцу лета Цётка спускаецца на зямлю сабраць ураджай: з кожнага поля па каласку. І пакіне сабранае на тым полі, дзе лепшыя гаспадары.

Перад пачаткам жніва трэба было падзякаваць Цётцы. Сярод жанчын вёскі выбіралі самую прыгожую, працавітую. Апраналі яе па-святочнаму, вілі з калосся вянок. Гэтая жанчына павінна была прайсці па вёсцы і з кожнага двара ўзяць ці яблык, ці грушу, ці сліву, прыгаворваючы пры гэтым:

Падзякуй Цётачку
Тым, што ўрадзіла.
Каб і ў наступным годзе
Гэтак жа гадзіла.

Усе дарункі выносілі на сярэдзіну поля, там жа пакідалі і вянок. Калі ў час жніва жнеі даходзілі да таго месца і бачылі, што дарункі ўжо не цэлыя, пакражаныя, то гэта азначала, што Цёце яны спадабаліся. Наступным годам яна вернецца.

*Древлянский, № 35.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 69/06.*

## Малання

МАЛАННЯ другая жонка Перуна. Чарнявая, прыгожая, але сварлівая жанчына, любіла нядобрыя жарты.

Аднойчы ў адной вёсцы чалавек назваў сваю дачку Маланняй, дык багіня ўдарыла ў дах, спаліла хату з гаспадаром, яго жонкай, а вось немаўля ўцалела. Дык Малання праследавала яе да таго, пакуль дзеўка не ўзяла другое імя.

Малання вельмі не любіць чараўнікоў. У адным сяле жыў чараўнік. А за сялом рос вялікі стары дуб, ніхто не ведаў колькі яму было вякоў, яму ўсе пакланяліся, гаварылі, што гэта Перуноў дуб, бо колькі разоў Малання паліла ўсё навокал, а гэты дуб не чапала — Пярун ёй забараніў.

Да таго дуба людзі часта прыходзілі, адпачывалі каля яго, вязалі на галіны чырвоныя стужкі і прасілі што-небудзь у Перуна. Вырашыў і чараўнік прынесці ахвяру дубу Перуна, пераапрануўся ў жабрака і пайшоў са стужкай да дуба. Малання спачатку не здагадалася, хто гэта, а калі прыгледзелася, то пазнала чараўніка. Вельмі раззлавалася яна. Сярод яснага неба бліснула маланка, ляснула па чараўніку, але іскры зачапілі і стары дуб, ён загарэўся, як сухое сена.

Малання спужалася, не ведала што ёй рабіць, бо муж яе пакарае за свой любімы дуб. Пачала ліць на дрэва ваду, але было позна — сярэдзіна ў дуба выгарэла, а на галінках матляліся толькі абгарэлыя стужкі чырвонага колеру.

Маланню ахапіў жах і яна вырашыла, каб муж не заўважыў прапажы вялікага дуба, паразвешвала на ўсіх дрэвах, што раслі вакол, чырвоныя

стужкі. Але ж Пярун, калі ішоў па небе, заўважыў свой абгарэлы дуб. Ды хітрасць жонкі яму спадабалася і ён загадаў жонцы: «Фарбуй кожны год лісце ў чырвоны колер ці я цябе пакараю».

З таго часу Маланне прыходзіць кожны год фарбаваць лісце дрэў у розныя колеры, быццам на дрэвах гарыць агонь.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 115/06.*

## Сварог і Дажбог

УЛАДАЛЬНІКАМ нябеснага агню з'яўляецца Бог Сварог. Ён выдатны каваль і гэтаму рамяству навучыў беларусаў.

У Сварога ёсць сын Дажбог — Бог Сонца. Гэта прыгожы, светлавалосы, моцны дзяцюк. Дажбог — апякун і настаўнік землябаў. Беларусы — яго ўнукі. Дажбог дае людзям фізічную сілу, здароўе, майстэрства.

Дажбог захоўвае зямныя ключы. Ён замыкае на зіму Зямлю, а потым аддае ключы птушкам, якія адносяць іх у Вырай. Вясной птушкі вяртаюць ключы, і Дажбог адмыкае імі Зямлю.

*Коваль, с. 53–54, 140*

### Дажбог даглядае Сонца

Раней Зямля не ведала сонечнага цяпла і святла. Сонца на небе сядзела ў залатым палацы ды праз акно свяціла толькі нябесным жыхарам. Ніхто яго адтуль не выпускаў. Таму Сонца запылілася, зацямнела.

Прыйшла пара яго пачысціць. Даручылі гэта зрабіць маладому, прыгожаму і моцнаму Богу Дажбогу. Той адчыніў палац, зрабіў дзела, а зачыніць забыў. Сонейка і выкацілася на неба. Асвяціла Зямлю, рассеяла холад, сагрэла ўсё вакол. Зямля ажыла, закрасавала. Калі на небе агледзелі прапажу, адправілі Дажбога вярнуць Сонца. Пралятаў Дажбог над Зямлёй, пабачыў, як на ёй прыгожа стала. Вырашыў тады дапамагаць Зямлі і людзям, што на ёй жывуць.

Дажбог даглядае Сонца, чысціць яго, клапоціцца, каб у патрэбны час выпусціць на неба. Кожны дзень выкочвае Сонца на неба і запускае яго, каб яно прайшло шлях з аднаго краю неба да другога.

Сам жа Дажбог тым часам не спачывае, рыхтуе сонцавы пакоі, каб вечарам стрэць Сонейка і на адпачынак забраць. Дажбог носіць на поясе залатыя ключы ад сонцавага палаца.

Па вясне Дажбог шле салаўя, каб ён замкнуў вясну і адамкнуў лета.

Але ж і Дажбог стамляецца часам і не заўсёды можа на ўсю моц запусціць Сонца. Таму восенню ды зімой Сонейка нізка ходзіць.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 73/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*

## Дзянніца

ДЗЯННІЦАЙ называюць багіню ранішняга святла і зорак. Яна — паведач Дажбога. Перад тым, як Дажбог запусціць Сонца, Дзянніца аблятае Зямлю, каб паведаміць усяму жывому пра пачатак дня і даць людзям сілы для працы.

Затым Дзянніца падлічвае колькасць зорак, якія за ноч упалі з неба, і на іх месцы ставіць другія, каб на небе ніколі не парушалася раўнавага. У яе ёсць муж Месяц, які дапамагае ёй у гэтым.

Дзянніца — маладая дзяўчына са светлымі і доўгімі валасамі, а на галаве — вянок з лекавых траў. Апранута яна ў белую кашулю. Дзянніца дапамагае лячыць хворых. Усе бабкі-шаптухі яе вельмі шануюць і заўсёды звяртаюцца да яе: «Зара-зараніца, Божая памочніца…» — ну і просяць дапамагчы хворым, якіх яны лечаць. Дзянніца ўсім дапамагае: і людзям, і скаціне. Трэба толькі на ваду шаптаць, калі сонца ўзыходзіць.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 111/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 46/06.*

## Стрыбог і вятры

СТРЫБОГ — гаспадар вятроў і вады. Паветра — гэта яго дыханне. Бог дыхае спакойна і роўна, але калі ўзлуецца — усчыняе жахлівую навальніцу.

Стрыбог — адзін з галоўных і непакорных нябесных Багоў. Сілы ў яго многа. Калі ён у добрым настроі — цяплом дыхае, а калі злуецца — сіверам. Жыве на хмарах, на іх і ездзіць. Ганяе іх па ўсяму небу. Калі ўзлуецца, уздымае такі вецер, то людзі ад жаху не ведаюць, што рабіць. Стрыбог наганяе страшны вецер, калі хто павесіцца. Так ён карае людзей. На Зямлі ён з'яўляецца ў выглядзе гусляра, з лукам за спіной, на поясе ў яго — стрэлы.

Стрыбог можа нагнаць хмар з градам ці дажджом і бяды нарабіць. Каб гэты дождж астанавіць, трэба выкінуць на двор ці курынае яйцо, ці хлебную лапату, ці перавернутую патэльню. Хутка дождж спыніцца.

27 жніўня яго свята. У гэты дзень людзі стараюцца ўлагодзіць Бога вятроў. Бо ў гэты дзень амаль заўсёды моцны вецер і халодна. Некалі прыйшоў да людзей мудрэц і сказаў, што, каб улагодзіць гэтага Бога трэба выйсці двум прыгожым жанчынам і двум мужчынам у чыстае поле на скрыжаванне дарог. Кожнаму стаць на адной з дарог і глядзець туды, куды гэта дарога вядзе. Патрэбна было, каб гэтыя людзі стаялі ад захаду да ўсходу.

Памагатыя Стрыбога — вятры. Яны ачышчаюць паветра, а то б людзі задыхнуліся ад смуроду.

Вятры — гэта пачварныя, пузатыя мужчыны з доўгімі, падобнымі да гусінае дзюбы, губамі. Дзюба гэтая, каб вылятаў цёплы вецер, шырока раскрываецца, а каб халодны — шчыльна сціскаецца, пакідаючы на канцы толькі малую адтуліну. Вятры стаяць з усіх чатырох канцоў Свету і дзьмухаюць адзін да другога, з чаго і ўтвараецца вецер.

Вятроў некалькі. Яны маюць імёны: Свістун, Ледавік, Снегавік, Хухуч. Ёсць у іх і іншыя імёны: Мяцеліца — восеньскі вецер, Круцеліца — снежаньскі, Вярцеліца — студзеньскі, Макраваты — лютаўскі, Крупкі — красавіцкі. Самы сярдзіты сярод іх — Сівер, які дзьме з поўначы. Ён халодны нават сярод лета.

Як круціць у паветры, то гэта сышліся два вятры ды дужаюцца, ды круцяцца, каб памерацца, хто з іх дужэйшы. Калі ў гэты час яны паварушаць хмары, то пойдзе дождж. Як хмары супакояцца, дык і дождж спыніцца.

*Добровол. Словарь, с. 110.*
*Сержп.-1, №№ 74,145, 150, 154.*
*Pietkiewicz, s. 18.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 87/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 25/06.*

**Посвіст**

ЗЛОСНЫ Бог буры і непагоды. Беларусы яго вельмі баяліся. З барады Посвіста ліліся праліўныя дажджы, з вуснаў — туманы. І калі трасяне ён раз-другі валасамі, дык адразу град валіцца, ды крупны такі.

Замест плашча ў Посвіста ветры валакліся, а знізу вопраткі ды снег валіўся. А як па небу ён пранясецца, дык людзі хаваліся па хатах: бо гэткі шум і гам стаіць, што ўсім неяк не па сабе робіцца.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 109/06.*

## Ярыла

ЯРЫЛА — Бог урадлівасці, плоцкага кахання і апякун дзікай жывёлы. Беларусы яго ўяўляюць маладым, прыгожым юнаком. Ён раз'язджае па зямлі на белым кані і ў белым плашчы. На галаве ў яго вянок з веснавых кветак, у руках каласы, ногі босыя. Адным з веснавых дзён Ярыла з дазволу Багоў адмыкае нябесную браму і на белым кані па сонечным промні з'язджае на Зямлю, каб адчыніць яе. Каля яго лётаюць розныя птушкі.

Ярыла едзе па засеяных нівах і яго сустракаюць усе жыхары паселішчаў. У людзей на галовах вянкі з кветак. Сустракаць Ярылу трэба прыгожа прыбраным. Дзяўчаты прыбіраліся ў белыя расшытыя сукенкі, заплятали прыгожа валасы.

Старыя кіруюць карагодам, які спявае песні ў гонар Бога.

Дзе Ярыла нагой ступіць —
Там жа жыта многа будзіць.
Куды гляне юначок —
Там і каласоў пучок,
А дзе праедзе на кані —
Там ураджайныя палі...

З Ярылавага дня пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты ж дзень упершыню выганяюць скаціну ў поле. Часам можна бачыць, што паблізу статка бегае воўк, але не чапае скаціны, хоць побач няма пастуха. Гэта нябачны Ярыла ездзіць на ваўку і ахоўвае статак.

Калі выганялі статак на маладую веснавую траўку, сталая паважаная жанчына запявала, а ўсе хорам падхоплівалі песню-просьбу да Ярылы-Юр'я (даць добры ўраджай, абараніць жывёлу ад хвароб, забяспечыць яе пладнасць):

Ярыла, устань рана,
Ярыла, умыйся бела,
Ярыла, прычашыся гладка,
Ярыла, глянь у ваконца,
Ярыла, паглядзі на сонца,
Ярыла, вазьмі ключы ў сонца,
Ярыла, адамкні Маці-зямліцу,
Ярыла, прагані злую зіміцу,
Ярыла, напаі зямлю вадзіцай,
Ярыла, пусці расіцу на зялёную травіцу,
Ярыла, выгані з хлява жывёлу,
Хай жывёла-гавяда пасецца.

Беларусы ўшаноўваюць Ярылу на працягу красавіка. Шанаванне суправаджаецца карагодамі, песнямі ў яго гонар, баляваннямі.

Ярыла — апякун плоцкага кахання. Ён валодае сілай, якая дае працяг роду, нараджэнню. Таму не лічылася заганным і саграшыць. Дзяўчаты спявалі:

Прыйдзі Ярыла, прыйдзі,
Нашых дзевак пакрадзі.

На свята Ярылы адбываюцца любоўныя гульні і хлопцы крадуць дзяўчат у жонкі. У час Ярылінай нядзелі асаблівую сілу маюць любоўныя загаворы: на прысуху, на каханне.

У самаго Ярылы і Жытняй Бабы былі свае дзеці — Жыцень, Спарыш, Рай і Багач. Яны глядзелі, каб былі поўныя асеці, каб сталы ламаліся ад хлеба-караваю.

Як Ярыла забіў Змея, то Белбог паклікаў яго да сябе і кажа:

— Калі ты такі волат, што перамог гэтую страшэнную пачвару, дык я цябе прызначаю гаспадаром над ваўкамі. Супакой іх, бо яны сталі дужа свавольныя і людзі на іх пачалі наракаць.

Ярыла як узяўся за справу, дык ураз угаманіў ваўкоў і паказаў ім іхняе стойла. Ваўкі вельмі баяцца Ярылы, слухаюць яго і душаць толькі таго звера, якога ён ім пакажа. Калі б ён не стрымліваў іх, то ўжо даўно б ніякай свойскай жывёлы не засталося.

Да Ярылавага дня нельга вадзіць коней на начлег, бо ў ваўкоў няма яшчэ гаспадара — Ярылы, і яны псуюць шмат коней. У адпаведную ноч Ярыла збірае звяроў у адно месца і размяркоўвае, куды катораму ісці на лета жыць. Ён замыкае пашчы ваўкам, і тыя перастаюць нападаць на скаціну ці значна змяншаюць колькасць сваіх знішчальных набегаў. Ярыла назірае, каб яны не чапалі скаціну, якая ім не прызначаная. Калі Ярыла хоча пакараць людзей ды папсаваць хатнюю жывёлу, ён сам насылае ваўкоў.

Позняй восенню Ярыла адмыкае пашчы ваўкам. З гэтага дня крыважэрныя ваўкі пачынаюць хадзіць зграямі і нападаць на скаціну.

Памагаюць Ярылу наглядаць за звярамі, што жывуць у лесе, Лесавікі са сваім Гаспадаром.

*Булгакоўскі, с. 179.*
*Никифор.-1, с. 179.*
*Кацар, с. 17—18, 54, 114.*
*Pietkiewicz, s. 144.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 73/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4., спр. МС — 156/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 75/06.*

### Гнеў Ярылы

Жыў некалі чалавек, і не любіў ён сонечнага святла. Удзень на двор нават і не выходзіў. Калі ў небе ззяла сонейка, яго вокны былі завешаныя чорнымі коўдрамі. У хаце заўсёды быў змрок і цяжкае паветра. Ва ўсім астатнім, здаецца, быў добры чалавек, не было яму іншай ганьбы.

Здарылася яму неяк вясною ў полі авечак пасціць, на Юр’я якраз. Скаціну ў поле ў першы раз выганялі, а выдаўся ж вельмі спякотны сонечны дзень. Не ведаў ён, куды яму, беднаму, ад сонца дзецца. Да таго ж яшчэ ў небе ні хмурынкі, і так пячэ сонца, што чалавек гэты месца сабе не знаходзіў, ажно вар’яцеў.

Упаў ён на зямельку і пачаў праклінаць сваё жыццё, той дзень, калі нарадзіўся на свет, гэты сонечны ясны дзянёк і само сонейка.

І трэба ж было так здарыцца, пачуў яго словы Ярыла, які праязджаў непадалёку. Разгневаўся ён.

— Уставай, чалавеча! — загадаў ён. Чалавек спужаўся, устаў. Сонца ён не бачыў, бачыў толькі постаць Ярылы, галава якога закрывала сонца.

— Я выканаю тваё жаданне. Яшчэ і людзей апавяшчу, няхай ведаюць, праз каго яны на некаторы час без сонца застануцца, — сказаў так Ярыла і паскакаў далей, а крыху ад’ехаўшы, пракрычаў. — І гэта не апошні раз!

Паскакаў далей, узняўшы пыл стаўбом. Калі пыл развеяўся, чалавек убачыў замест сонца чорны круг.

Калі вярнуўся чалавек вечарам у вёску, то ўсе людзі ўжо ведалі пра здарэнне і праз каго яны без сонейка засталіся. Каб не гэта, то падумаў бы чалавек, што здалося яму ўсё гэта. Але ж у памяці словы Бога засталіся назаўсёды: «Людзей апавяшчу».

Першае зацямненне цягнулася доўга, аж пакуль чалавек віны сваёй не прызнаў.

Пакуль жыў гэты чалавек, зацямненні былі даволі частыя. Пасля яго смерці Ярыла мабыць крыху супакоіўся, дараваў людзям грэх гэты, бо наступныя зацямненні сонца адбываліся даволі рэдка.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 2, спр. МС – 33/04.*

## Макаш

МАКАШ — Багіня часу і лёсу людзей, апякунка жанчын, сям’і і жаночых рамёстваў: ткацтва, прадзення, вышывання і гадання. Багіня і сама з’яўляецца выдатнай майстрыхай, дапамагае ім ніткі прасці.

Макаш — дачка Дажбога і Маці-Зямлі. Яна з’яўлялася людзям прыгожай маладой дзеўкай з доўгімі косамі.

Каб ушанаваць гэтую багіню, жанчыны кідалі ў студню рэчы, якія яны ткалі ўласнымі рукамі.

Макаш дапамагае толькі тым людзям, якія ў складаных умовах не апускаюць рукі, тады яна пасылае ім Срэчу — багіню шчасця, а калі людзі ў складаных абставінах падаюць духам, то Макаш пасылае ім велікана Ліха.

Макаш — Багіня летняга дажджу. Калі засуха, то гаварылі, што гэта Макаш сярдуе на людзей. І калі людзі даведваліся, хто прагнявіў Макаш, яго прымушалі ісці ў поле, станавіцца на калені і прасіць ад усяго сэрца прабачэння ў яе. Яна магла даравацть гэтаму чалавеку, а магла і не дараваць. Тады гэтага бедалагу ўсе абходзілі стараной, не размаўлялі з ім.

*Кацар, с. 53.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 105/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 115/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 57/06.*
*ПАШ. Ф. 10 воп. 3, спр. МС – 116/06.*

**Аўсень**

АЎСЕНЬ — Бог працы, апякун коней, пахаты. Ён адчыняе шлях новаму лету (новаму году).

Летам Аўсень жыве ў аўсе, дбае пра добры ўраджай, засцерагае авёс ад ветру, дажджу. Аўсень вельмі паважае дбайных і працавітых гаспадароў, клапоціцца пра іх авёс: на палетках у такога чалавека не было пустазелля, палеглага аўса. А ў аўсе дрэннага гаспадара Аўсень любіць хавацца і спаць, а на месцы яго схованак, звычайна, цэлыя палосы палеглага аўса. Зімой Аўсень жыве ў гумне, у засеках з аўсом.

Птушкі аўсянкі — яго дочкі. Ён ператварыў іх у птушак, таму што яны ўвесь час недзе бегалі, скакалі, весяліліся, а потым прыбеглі і пачалі патрабаваць, каб ён іх выдаў замуж. Аўсень пачаў гаварыць, наракаць, што яны такія нікому не патрэбныя: нічога не ўмеюць, не ведаюць, як весці гаспадарку, клапаціцца пра дзяцей і свайго чалавека. Дочкі толькі засмяяліся і адказалі, што за іх усё будуць рабіць іх мужыкі, а яны толькі будуць аддаваць загады. Аўсень пачаў растлумачваць дочкам, як трэба жыць, працаваць, не лянiцца, даглядаць гаспадарку. Дочкі толькі смяяліся ў адказ. Бацька не вытрымаў і ператварыў дочак у птушак, сказаўшы: «Вы дасюль скакалі, лёталі, як угарэлыя, весяліліся, дык і цяпер лётайце і весяліцеся, а я вас не хачу і ведаць».

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 105/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 115/06.*

### Лада

БОГАМ, які падтрымліваў на зямлі лад, парадак, быў Лада. Пад яго апекай усё ішло парадкам, ладам, кругам: пасля дня наступала ноч, пасля зімы — лета, і ўсё ў сваім парадку, усё ў ладзе.

Год складаў круг Лада, у ім было тры Ладавы святкі і адно дзедавае свята. Святы гэтыя прыпадалі якраз на пераломы года: вясну, лета, восень і зіму.

*Ластоўскі.*

### Ляля і Лель

ЛЯЛЯ — дачка Лады, Багіня вясны, пяшчоты, кветак. Вясна пачыналася з прыходам на зямлю Лялі. Яна ходзіць, абуджае зямлю ад зімовага сну. Дзе Ляля ступіць, там зелянее трава, распускаюцца кветкі. Гавораць, што дзіця будзе прыгожым, калі маці вынясе немаўля ў новенькай кашулі і пройдзецца з ім басанож па першай траве.

Багіню Лялю асабліва шанавалі дзяўчаты. З ранняга дзяцінства маткі прывучалі дзяўчат спяваць, смачна гатаваць, і ўсё гэта рабілася для таго, каб Багіня Ляля дапамагла знайсці добрага хлопца, каб ён быў маладым, статным, вясёлым, працавітым, умеў трымаць добрую гаспадарку, быў такім, як яе муж Лель. Сама Ляля была добрай гаспадыняй і вельмі прыгожай маладзіцай. Яе выгляд мог зачараваць любога: доўгая каса, блакітныя вочы, статная фігура. Апраналася ў белую сукенку, якая была сімвалам вяселля, а ў валасах у яе заўсёды быў вянок з палявых кветак.

Звычайна сустракаюць Лялю апоўдні на чыстым лузе. Дзяўчаты перавязваюць ёй шыю, рукі і стан рознай зелянінай. На галаву ўскладаюць вянок з веснавых кветак. Потым Лялю саджаюць на дзярновую лаву, на якой з аднаго боку стаіць гладыш з малаком, ляжаць сыр, масла, яйкі, смятана і тварог, а з другога — хлеб. Каля ног Лялі кладуць вянкі з зяляніны адпаведна колькасці дзяўчат. Затым, узяўшыся за рукі, дзяўчаты скачуць вакол Лялі ў карагодзе і спяваюць у гонар яе песню.

Скончыўшы танцаваць і спяваць песню, карагод сядае ля ног Лялі. Яна раздае ўсім дзяўчатам-карагодніцам малако, масла, сыр і іншыя пачастункі, пакуль, урэшце, нічога не застанецца.

А потым у суправаджэнні хлопцаў з’яўляўся каханак Лялі — Бог Лель. Ён ехаў на кані. Спачатку Ляля з Лелем танцавалі ў карагодзе з дзяўчатамі. Затым Лель садзіў Лялю на каня перад сабою. Яны аб’язджалі вакол усёй

вёскі, кланяліся ўсім, хто сустракаўся ім па дарозе, і зноў прыязджалі на поле.

Пасля гэтага дзяўчаты ўстаюць і зноў пачынаюць скокі вакол Лялі, прыпяваючы ранейшую песню. У гэты час Ляля бярэ вянкі і кідае па адным тым, хто танцуе, пакуль, урэшце, усе дзяўчаты не схопяць па вянку. Гэтыя вянкі яны берагуць як святое да наступнай вясны, а некаторыя і потым, пасля замужжа, іншы раз усё жыццё.

Па заканчэнні абраду Лель садзіў Лялю на белага каня, браў яго за повад і моладзь праваджала іх у далейшы шлях.

*Древлянский, № 30.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС – 121/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 105/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС – 74/05.*
*ПАШ. Ф. 10., воп. 4, спр. МС – 152/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 59/06.*

## Каляда і Шчадрэц. Пераплут

ЗІМОЮ на Каляды да беларусаў з'яўляецца сам Бог Каляда. Гэта Бог заможнасці, ураджаю і дабрабыту, якога беларусы ўшаноўвалі на святце ў яго гонар. Ён прыходзіў на свята прыгожа апрануты. Беларусы ў пашану яму напаўнялі яго кішэні збожжам, на галаву ўскладалі вянок з каласоў. Каляда абыходзіў хаты сялян у суправаджэнні песельнікаў.

На калядныя святы прыходзіў да беларусаў і Бог балявання і бяседы — Шчадрэц. З ім беларусы весяліліся некалькі дзён.

Шчадрэц з'яўляецца да людзей па вечарах. Гэта дзяцюк высокага росту. Ён апрануты ў шырокі плашч яркага колеру, які абвешаны рознымі званочкамі, каляровымі абрэзкамі і разнастайнымі доўгімі тасёмкамі. На галаве ў яго бліскучая карона. З-пад кароны спадаюць доугія распушчаныя валасы, як конскі хвост. На твары — пачварная маска з чырвонымі шчокамі і носам. У руках ён трымае тоўстае жазло, таксама аздобленае рознакаляровымі тасёмкамі.

Шчадраца сустракае вялікі карагод хлопцаў, апранутых у розныя строі. Яго саджаюць на спецыяльна зроблены дзеля гэтага вазок, абвешаны стракатымі шматкамі тканіны і званочкамі. Вазком кіруе абраны з хлопцаў — шчадраванец, астатнія хлопцы — шчадраванцы суправаджаюць іх.

Гэты стракаты гурт пад ігру музыкаў і спевы ходзіць па вуліцах і спыняецца ля кожнай хаты. Шчадраванцы разам са Шчадрацом наведваюць усіх вяскоўцаў, а потым застаюцца ў аднаго з іх і да раніцы весяляцца.

У іншыя поры года ў вольны час беларусы на поўную моц аддаваліся ўцехам з Богам весялосці, спеваў, гульняў і жартаў — Пераплутам.

*Древлянский, №№ 8, 36.*
*Коваль, с. 79.*

**Кляскун**

КЛЯСКУН — Бог Месяца, забаў і задавальненняў. Гэта малады, прыгожы, велічны юнак, з доўгімі светлымі валасамі і з месяцам у ілбе.

Кляскун перш жыў на Небе і апекаваўся Месяцам. Ён распараджаўся там як у сябе ў хаце, паварочваў месяц, паказваў яго людзям, у адпаведны час хаваў яго. Кляскун асвятляў Зямлю і Неба і раз’язджаў на месяцы па начах, але заўсёды павінен быў находзіцца пры ім і глядзець сваімі яснымі вачыма на яго. У выпадку ж адлучкі Кляскуна па загаду Перуна — месяц на нейкі час губляўся, таму што пры ім не было Кляскуна.

Аднойчы Кляскун адлучыўся без дазволу Перуна, і доўгі час не вяртаўся: ён недзе баляваў з іншымі Багамі. Пярун раззлаваўся і спіхнуў яго з Неба на Зямлю, але на памяць аб тым, што ён быў кіраўніком і ахоўнікам Месяца, зрабіў адбітак Месяца на ілбе Кляскуна. Ахоўнікам Месяца Пярун зрабіў іншага Бога.

Кляскун — вялікі жартаўнік. Ён любіць забаўляцца, палохаючы людзей, асабліва ўначы.

У таго, хто едзе ці ідзе ноччу, ёсць звычайна свае прыкметы, каб не заблукаць у цемры. Кляскун пацяшаецца тым, што перастаўляе гэтыя знакі з аднаго месца на другое. Дзе на перакрыжаванні дарог стаяў магутны дуб, там праезджы раптам бачыць невялікі куст. Вось тут была палянка, бач — а ўжо невялікае возера, і дарогі няма. Такімі жартамі ён збівае людзей з дарогі, прымушае блукаць, даводзіць да роспачы і тады рагоча, як шалёны.

Часам Кляскун прыкідваецца добрым знаёмым падарожніка, заводзіць з ім размову і просіць трошкі падвезці. Чалавек згаджаецца. Толькі праедуць яны крыху разам, раптам сані ці калёсы пераварочваюцца ў раўчук, а спадарожнік знікае і толькі дзесьці ўдалечыні чуваць яго свіст і рогат.

Здараецца і так, што праезджы чуе збоку енк, які разрывае душу, ці плач дзіцяці, ці бачыць перад сабою раку. Вопытны беларус ведае, што гэта азначае. Яго не разжаляць гэтыя стогны і плач, не спалохаецца ён і ракі: не

прыпыняючыся і не зварочваючы ўбок, працягвае чалавек свой шлях. Гора таму, хто паверыць і прыме за сапраўднае хітрыкі Кляскуна. Ён трапіць у такую багну, што толькі ўдзень, пры дапамозе людзей, вызваліцца з яе.

*Шпилевский-4, № 44.*

## Духі хаты

### Гаспадары хаты

**Хатнік**

ХАТНІКІ бліжэй за ўсіх стаяць да чалавека, удзельнічаюць у найбольш важных хатніх справах беларусаў. Калі Хатнік апякуецца над домам, усё ў ім ідзе спраўней. Немалаважную ролю пры гэтым адыгрывае месцазнаходжанне дома.

Каб пазбегнуць магчымага па гэтай прычыне непаразумення з Хатнікам, гаспадар павінен правільна вызначыць месца, дзе паставіць хату. Дзеля гэтага ў чатырох месцах, дзе прыблізна прыйдуцца вуглы хаты, насыпаецца жыта. Калі праз ноч жыта застанецца некранутым, то гэта верная прыкмета, што Хатніку падабаецца абранае месца. А калі жыта акажацца разгрэбеным, значыць, Хатнік супраць пабудовы дома на абраным месцы. Тады гаспадар павінен насыпаць чатыры кучкі жыта на іншым месцы і так рабіць да таго часу, пакуль пасля ночы жыта не застанецца некранутым. Калі ж гаспадар пабудуе дом на месцы, якое не падабаецца Хатніку, то ён будзе ўночы з трэскам і грукатам разгульваць па доме і псаваць у ім рэчы.

Улічваючы, што без Хатніка не абысціся і што ён не заўсёды выявіць свае знаходжанне ў доме, прадбачлівы гаспадар запрашае яго сам. Заклікаюць Хатніка ў Велікодную ноч такімі словамі: «Выбач, дзедка (ці браток), за трывогу, але толькі прыйдзі ка мне не зелен, як лісціна, не сінь, як хваля на вадзе, не панур, як воўк. Прыйдзі такі, як я сам!» З’явіцца двайнік гаспадара — чалавек таго ж росту, складу, у такой самай адзежы. Ён перш за ўсё патрабуе захаваць тайну спаткання: ні на яве, ні ў сне, ні бацьку, ні маці гаспадар не павінен выдаваць гэтай тайны пад страхам, што Хатнік не толькі перастане рабіць дабро, але і спаліць дом, якому перад гэтым спрыяў. Усе Хатнікі помсцяць гаспадару, які чамусьці адступіўся ад іх. За розныя абразы ад хатніх яны караюць не крыўдзіцеля, а гаспадара.

Не ў кожную хату ўвойдзе закліканы Хатнік, а толькі ў тую, якая прыйшлася яму даспадобы. Пры пераходзе гаспадароў у новае жыллё, якое чымсьці не спадабалася Хатніку, ён застаецца ў старой хаце, пакуль тая не разбурыцца. Тады Хатнік пераходзіць да новых гаспадароў, але ўвесь час злуецца на былых, якія кінулі яго, і помсціць ім.

Хатнік любіць, калі ў гаспадарцы ўсё падабрана ў адпаведнасці з яго асабістым густам, тады ён з асаблівай стараннасцю дапамагае гаспадару. Ён цярпець не можа шуму і сваркі, неахайнасці, бруду, абыякавасці і неакуратнасці ў рабоце. Хатнік любіць гаспадароў і гаспадынь працалюбівых, рахманых і цвярозых.

Месца жыхарства Хатніка ў доме рознае: на печы, пад печкаю. Спіць ён таксама на печы ці пад печчу, таму яго часам называюць Падпечнікам. Звычайным жа месцам знаходжання Хатніка лічыцца запечны кут, адкуль ён заходзіць у падпол, у падпечак, дзе бавіць час з мышамі і курамі. Любімае яго месца — у запечным куце. Адтуль ён назірае за сям'ёю ў час поўнага збору яе за сталом, пры прыёме гасцей, дзеля чаго ён высоўваецца над паверхняю печы па грудзі. Калі яго не запрашаюць, Хатнік спускаецца на самы ніз запечнага кута, дзе звычайна дрэмле. Устае Хатнік рана. Палохае пеўня, штурхаючы яго. Певень з перапуду лопае крыламі і крычыць — будзіць гаспадароў на працу.

Акрамя месцаў у хаце, Хатнік можа туліцца ў сенцах, на гарышчы і ў клеці, калі пераважна там летняю парою знаходзіцца сям'я. Звычайна ён садзіцца на жэрдачку, на палок, на жорны ці на ўбіты ў сцяну драўляны крук.

Хатнік даволі чула ставіцца да гаспадара. Ён прадбачлівы і часта папярэджвае яго пра розныя няшчасці. Перад вялікай бядой ён плача, стогне. Апоўначы сярод усеагульнага спакою і цішыні можна чуць такія стогны — гэта сумнае прадказанне. Хатнік часта прадказвае будучыню, паведамляючы стукам у дзверы ці ў сцяну хаты.

Часам Хатнік-прадказальнік папярэджвае сямейнікаў у час сну. Ён балюча сціскае горла ці кладзе на таго, хто спіць, сваю руку. Калі рука калматая і цёплая — гэта на шчасце, дакрананне голай і халоднай рукі прадказвае бяду. З'яўленне ж Хатніка ў сваім сапраўдным выглядзе азначае смерць гаспадара.

З Хатнікам трэба жыць у згодзе, трэба ўмець яму дагаджаць. Прагнявіш яго — і ён не толькі не будзе спрыяць, але нават можа пашкодзіць у гаспадарцы. Хатнік мае стасункі з гаспадаром і сямейнымі мужчынамі, і толькі найбольш прыгожыя сямейныя жанчыны карыстаюцца нязначнай яго ўвагаю.

Калі Хатнік сыходзіцца з гаспадаром, ён — дабрадзейны слуга дому. Дастаткова толькі без сведкаў выказаць уголас свае жаданні, як ён праяўляе незвычайную дзейнасць. Чысціць, мые сцены і мэблю, выконвае работы найбольш любімых ім асоб — шые, прадзе, мые, меле па начах; ён закручвае любімчыкам кучары, пляце косы, адганяе ад тых, хто спіць, насякомых. У той жа час Хатнік сцеражэ дом і дабро.

За ўсю бескарыслівую дапамогу Хатнік патрабуе ад людзей толькі пашаны, і каб яны не забывалі яго ва ўрачыстыя для сям'і дні. Удзячныя гаспадары шануюць Хатніка просьбаю з'явіцца за стол (у памінальныя дні), пасцілаючы дзеля яго чыстае палатно ад парога да стала. Падобнае, але маўклівае запрашэнне робяць яны і тады, калі збіраюць гасцей на іншыя святы. Са свайго звычайнага кутка Хатнік вылазіць толькі на Дзяды для ўдзелу у агульнай вячэры. Яму выказваюць асаблівую пашану: дарога да стала высцілаецца белым палатном, стравы прапануюцца самыя лепшыя, пераважна малако.

Часцей за ўсё Хатнік прымае чалавечы выгляд; тады ён — тоўсты, сярэдняга росту мужчына з напалову сівою лапацістаю барадою, з прыгожым, дабрадушным тварам, блакітнымі адкрытымі вачыма. Валасы на галаве раскудлачаны, спускаюцца на лоб, за выключэннем часткі твару вакол вачэй і носа. Усё цела, нават далоні і падэшвы пакрыты, нібы пушком, мяккаю поўсцю. Зусім чалавечыя пазногці яго даўгаватыя і нейкія асабліва халодныя, што адчуваецца, калі Хатнік гладзіць. Часам ён зусім старэнькі, а ростам з пяцігадовае дзіця, са зморшчаным тварам, белаю, як снег, барадою, сіважоўтымі валасамі на галаве, з фасфарычным бляскам вачэй, ад якіх ідуць у бакі палосы святла.

Ёсць рэдкія дамы і сем'і, дзе Хатнік часта і па-доўгу ўтрымлівае прыняты чалавечы выгляд. Тады, у залежнасці ад пары года і надвор'я, ён носіць то цёплую, то лёгкую адзежу. Але і летам, і зімою ён ходзіць босы, без шапкі, надзявае яе толькі перад смерцю гаспадара.

Калі па смерці гаспадара ў доме застаецца варты пераемнік, Хатнік не перастане спрыяць да таго часу, пакуль да яго будуць захоўвацца пачатыя адносіны. Калі ж у кіраванне домам уступіла жанчына і яно зацягваецца, Хатнік аслабляе сваю спрыяльную дзейнасць, а нярэдка і зусім спыняе яе, застаючыся толькі сведкам заняпаду былога дабрабыту.

У Хатніка толькі адна жонка. Пасля смерці яе ён можа ажаніцца да чатырох разоў, але не на сваячках — інакш ён абавязаны пакінуць хатнюю службу і стаць, напрыклад, Лесавіком, Вадзяніком, Балотнікам. Ад сваёй жонкі Хатнік мае сыноў і дачок. Дасягнуўшы ўзросту, сыны звычайна становяцца Хатнікамі новых пабудаваных дамоў; дочкі ж выдаюцца замуж за Хатнікаў,

хоць некаторыя з іх застаюцца ў дзеўках назаўсёды. Хатнікі спраўляюць вяселлі сваіх дзяцей у залежнасці ад дастатку ў доме, дзе жывуць, — то багата, то сціпла.

Хатнікі нас бачаць, а мы іх — не. Нябачна для людзей, у чалавечым жытле вядуць Хатнікі сваё існаванне, п’юць, ядуць, смуткуюць і радуюцца, нараджаюцца і паміраюць. Час харчавання, сну і работы Хатнікі размяркоўваюць у адпаведнасці з прынятым у доме распарадкам.

Паколькі Хатнік вельмі капрызны, то цяжка растлумачыць прычыну яго сімпатый і антыпатый. Калі хто з членаў сям’і не палюбіцца Хатніку, то Хатнік наганяе на яго сум, панурасць. Нелюбімец захворвае, сохне і, нарэшце, памірае, паколькі быў нежаданы.

У кожным доме, у кожным падпечку хаты можа жыць толькі адзін Хатнік. Хатнік-чужак часта паяўляецца ў дварах, гумнах, пунях і іншых сядзібных пабудовах у выглядзе кошкі ці іншай жывёліны. Ён шкодзіць гаспадару і гаспадарцы, вядзе барацьбу са свойскім Хатнікам. Часам пад уздзеяннем Хатніка-чужака здараюцца хваробы людзей і скаціны і розныя няшчасці.

Хатнікі, як і людзі, бывае, сварацца і б’юцца. Небяспечна ўмешвацца ў бойку Хатнікаў, асабліва калі гаспадар памылкова прыме бок чужака: гэта можа выклікаць гнеў свайго Хатніка. Барацьба Хатнікаў заканчваецца тым, што або пераможаны чужы Хатнік пакідае дом, або чужак, выжыўшы мясцовага Хатніка, пасяляецца на яго месцы.

Прыблудны Хатнік не надта клапоціцца пра двор, дзе часцей за ўсё ён пераварочвае ўсё дагары нагамі. А напалоханы непарадкамі ў хаце селянін звычайна не адважваецца аб’явіць адкрытую вайну прыблуднаму Хатніку, баючыся розных непрыемных выпадковасцей: хваробы ці нават смерці. Ён звяртаецца за парадаю і непасрэднаю дапамогаю да чараўніка, якому вядомыя тайны быцця Хатнікаў, Лесавікоў, Палевікоў і Вадзянікоў, які добра разумее іх узаемныя адносіны і адносіны гэтых Духаў з людзьмі.

*Ляцкі-1, с. 31—32.*
*Никифор.-2, с. 48—53.*

## Хатніца

ЧАМУ так пайшло, што гаспадаром хаты лічаць Хатніка, а не яго жонку Хатніцу — ніхто растлумачыць не можа. Сапраўднай жа гаспадыняй трэба лічыць яе, бо яна, як сапраўдная жанчына, вельмі пільна сочыць за парадкам у хаце: усюды чыста, утульна.

А ад Хатніка ніякай дапамогі не дачакаешся! Не сочыць ён ні за парадкам, ні за чысцінёй. А што яму? Як мужчыну, абы паесці ды паспаць. Не ўбяруць

гаспадары вячэру са стала на ноч, а Хатнік ужо тут як тут. Мала таго, што ўсё паесць, дык яшчэ і аб'едкі параскідае…

Таму і хаты такія розныя! Адны — люба глянуць, усё чыста і прыбрана. Другія — за парог не перашагнеш! Адно балота! Таму і пашчасціла тым гаспадарам, у якіх жыве Хатніца: заўсёды ў гэтай хаце ўсё добра. Але калі раптам яна пачуе ад гаспадароў, што хваляцца сваім суседзям, што гэта Хатнік ім ва ўсім дапамагае, пакрыўдзіцца ды і сыйдзе з гэтай хаты. І ніколі больш сюды не вернецца.

Выглядаюць Хатніцы яшчэ не зусім старымі жанчынамі. Маленькія ростам, паўнаватыя. Вельмі гаспадарлівыя і акуратныя. Перад людзьмі Хатніцы з'яўляюцца ў белым адзенні. На галаве ў іх — намітка.

Хатніцы знаходзяцца ў сваяцтве з Паляхамі.

У Хатніцы такія ж схільнасці і заняткі, як і ў дбайнай гаспадыні-сялянкі: яна прадзе, тчэ, вышывае і даглядае жывёлу. Яна працалюбівая і гаспадарлівая, любіць чысціню.

Калі гаспадыня добрая, то Хатніца ёй ва ўсім дапамагае, глядзіць за гаспадарскімі дзецьмі. Неакуратных гаспадынь страх як не любіць і ўсяляк ім шкодзіць. З-за гэтага часта мужык з жонкай сварацца. Хатніца часцей сутыкаецца з жанчынамі, чым з мужчынамі.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС – 33/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС – 163/06.*

## Шкадлівыя Духі хаты

### Пячурнік

ПЯЧУРНІК — Дух, які жыве дзе-небудзь у запечку, але часцей у коміне, і рэдка калі выходзіць адтуль. Ён падобны на Хатніка. Гэта маленькі дзядок, але вельмі мурзаты, з калматай барадой. Пячурнік з'яўляецца апекуном сям'і.

Пячурнік ходзіць па хаце босенькі, у кароценькай світцы і штоніках. Твар яго ў сажы. Любіць і на цёплай печы паляжаць. Катоў баіцца. Любіць малых дзетак пэцкаць сажай, але нікога не крыўдзіць, акрамя дрэннай гаспадыні.

Чалавеку Пячурнік стараецца не паказвацца. Вельмі любіць, калі гаспадыня шануе яго, частуе смачненькім. Ноччу Пячурнік з задавальненнем частуецца стравай, якую гаспадыня выстаўляе на прыпечку. Тады ён дапамагае ёй гатаваць ежу. А калі гаспадыня не робіць гэтага, дык ён чагуны ў печы выверне, сажы насыпле ў яешню, можа вілкі і чапелы сапсаваць.

Дух гэты бывае ахвочы пажартаваць — знесці якую патрэбную ў гаспадарцы рэч з таго месца, дзе яна звычайна знаходзіцца, і схаваць яе ў якоесь іншае месца. Але за гэта яго крыўдзіць нельга, бо ён будзе цэлую ноч выць у коміне.

Калі да Пячурніка ставяцца без належнай павагі, ён — ці то ад суму і крыўды, ці, можа, з помсты — некалькі начэй запар будзе выць і крычаць у коміне, грукаць юшкай.

Пячурнік прадчувае бяду і непрыемнасці, што могуць адбыцца з гаспадарамі. Калі раптам у коміне пачуецца, як хтосьці вые-галосіць, то людзі ведаюць, што гэта Пячурнік, прадчуваючы чыюсьці ў хаце смерць, пачынае яго адгалошваць. Таму і баяліся Пячурніка, каб ён раней часу не адгаласіў каго.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 104/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 111/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 51/06.*

## Кікімары

ПОБАЧ з Пячурнікам жывуць кікімары. Звычайнае месцазнаходжанне іх у хаце — пляцоўка на паверхні печы і падпечак, куды яны нябачна спускаюцца. Галоўным чынам кікімары збіраюцца ў тыя дамы, дзе адбылося забойства дзяцей.

Кікімары — гэта душы дзяцей, праклятых маткаю яшчэ ў чэраве. Выглядаюць як юныя істоты, выключна жаночага полу. Яны зусім бясшкодныя, хоць і засылаюцца ў дамы людзей з варожай мэтаю. З'явіўшыся ў хаце, кікімары зусім забываюцца пра мэты знаходжання ў доме, загульваюцца і перашкаджаюць жыхарам хіба адной валтузнёй, ад якой чуваць няпэўны шум уперамешку з рэдкім знямоглым піскам і віскам. Але сярод самай ажыўленай валтузні кікімары часам спыняюцца: гэта значыць, увага іх прыцягнута хатняй абстаноўкай, тою ці іншаю работаю, немаўлятамі, якіх песцяць іх мацяркі. Тады кікімары не па-зямному, неяк асабліва ўздыхаюць, чым выказваюць зайздрасць да чужой ласкі і недасягальнае жаданне мець яе самім.

У асобныя імгненні кікімары могуць прымаць цялесны воблік. Тады іх няцяжка злавіць і разгледзець. Калі здагадлівы чалавек хуценька выстрыжа ў кікімары валасы на цемені крыж-накрыж, яна назаўсёды застанецца чалавекам і працягвае расці як звычайнае дзіця. Але ранейшае жыццё Духаў вядзе да таго ці іншага недахопу: крывізны рук ці ног, касавокасці, нематы, заікання,

благой памяці і розуму — вось непазбежныя недахопы былой кікімары, якая з узростам зусім забывае пра сваё даўняе жыццё.

Не ведаючы ніякай работы, кікімары часцей за ўсё накідваюцца на адкладзенае некім шытво і пражу, каб дагадзіць ласкавай маці ці яе дачцэ, і працягваюць перапыненую работу. Але лепш бы яны не дапамагалі: атрымліваюцца крывыя і няўмелыя швы, няроўна выпрадзеныя ніткі. Раніцой жанчыны, разбіраючы начную працу кікімар, выказваюць у адрас «майстрых» дакоры, нават лаюцца. Усё гэта яшчэ больш засмучае бедных кікімар, выклікае больш цяжкія ўздыхі.

*Никифор.-2, с. 64–65.*

**Бай**

МАЛЕНЬКІ стары дзядок з вялікімі вачыма, кудлатаю галавою і доўгаю барадою. Бай звычайна жыве за печкай. Ногі ў Бая кароткія, а рукі доўгія, таму што ён калышыць дзяцей.

Ён з'яўляецца тады, калі бачыць, што плача, капрызуе, не слухаецца бацькоў дзіця. За плячыма ў яго вялікая торба. Ходзіць ён з кіем. Ён баіць малым дзецям байкі, дае ім усялякія прысмакі. Калі дзіця не супакойваецца, кідае яго ў мех і адносіць у цёмны страшны лес.

Ноччу, калі ўсе спяць, Бай вылазіць з запечку і ходзіць па хаце. Калі дзіця заплача, ён яго пакалыша. Дзеці спалі заўсёды ноччу накрытыя, хоць усе ведаюць, што яны любяць раскрывацца. Бай любіць іх, таму накрывае, і жанчыне ноччу да дзяцей уставаць не трэба было: іх калыхаў і супакойваў Бай. За гэта яго яшчэ называюць Байбай. Адкрые маці вочы, а калыска калыхаецца. Гэта Бай ціхенька ходзіць па хаце. Раніцай ён шмыгае за печ. Таму за печчу заўсёды трэба пакідаць месца для Бая. Чаму за печкай — невядома. Трэба ж яму недзе хавацца.

Дзеці заўсёды вядуць сябе ціха і паслухмяна, бо ведаюць, што ў хаце сядзіць Бай. Бай жыве толькі там, дзе ёсць малыя дзеці. Дарослым ён непатрэбны.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 144/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС — 18/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС — 128/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 47/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 138/06.*

## Валасень

НОЧЧУ трывожыць і пужае людзей у час сну Валасень. Ён мае выгляд невялікай істоты з цёмнай густой доўгай поўсцю, ходзіць выпрастаўшыся. У яго вялікія сяміпальцыя далоні з доўгімі пазногцямі. Мужчын Валасень драпае кіпцюрамі па твары, казыча ім нос. Жанчын і дзяўчат Валасень хапае за грудзі, а то і навальваецца на іх усім сваім калматым целам, кудлаціць ім валасы. Дзяцей Валасень таксама пужае, гудзе ім у вушы, казыча пяткі.

*Беларус. міфалог., с. 31–32.*

## Шэшкі

ДНЁМ мітусяцца па хаце шэшкі — вольныя Духі. Яны ўяўляюць нешта радаснае ў гурце Нядобрых Духаў. Беларусы ласкава завуць іх — шэшачкі. Гэтаму, зрэшты, адпавядае маленькі рост шэшкі — не больш, чым у рослай кошкі. Яны вёрткія, рухавыя і ў той жа час легкадумныя. Асабіста самі шэшкі не могуць ухапіць ахвяру, а тым больш — давесці яе да пагібелі. Сапраўдныя Духі глядзяць на шэшку як на блазнаватага. Чалавека ж ён падкупляе ласкавымі заляцаннямі, гуллівасцю, гарэзлівасцю. Шэшка раптоўна набліжаецца да чалавека, дражніць, адрывае ад важнай справы. Падчас пэўнай работы гаспадару даводзіцца шукаць інструмент, які хвіліну перад гэтым трымаў у руцэ. Шэшка хапае з-пад рук і выносіць прэч патрэбныя прадметы, цешачыся злосцю чалавека, які траціць час на пошукі згубленага прадмета.

Шэшкі вытвараюць толькі дробныя свавольствы, якія не прыносяць надта вялікай шкоды. Гэта з-за іх рвецца на кроснах у час работы прадзіва, цяжка прасоўваецца нітка ў вушка іголкі альбо блытаецца ў час шытва.

У доўгія вольныя вечары, калі чалавеку няма чым заняцца і яго ахопліваюць грэшныя думкі, шэшкі паяўляюцца гуртам, мітусяцца вакол яго, заляцаюцца, чапляюцца. Але такое прыставанне шэшак гуртам бывае адносна рэдка: яны жывуць па хатах і дзейнічаюць пераважна паасобку.

*Никифор.-2, с. 37–38.*

## Нядобрыя Духі хаты

### Злыдні

МАЛЫЯ, гарбатыя, скурчаныя стварэнні ў вялізных ботах і шапках. Час ад часу яны нападаюць на хату, і тады там ужо нічога не вядзецца.

Прабраўшыся ў хату, злыдні звычайна жывуць пад печчу. Адтуль яны робяць выправы па ўсёй гаспадарцы і шкодзяць. Заглядваюць у гаршкі з ядою, падсыпаюць у кашу пяску, у самае тлустае малаконаліваюць вады, псуюць у дзежцы хлеб, у курэй крадуць яйкі. Злыдні шкодзяць і перашкаджаюць усім, так што хата, у якой яны пасяліліся, бяднее і галее.

Злыдні пранікаюць у хату без прычыны. Але іх можна таксама наклікаць — непамерным жаданнем разбагацець ці празмернасцю ў працы. Калі, напрыклад, нехта ў час яды працуе, можна з упэўненасцю сказаць, што злыдні нападуць на яго.

Злыдні цяжка паддаюцца выгнанню. Нездарма ж беларусы кажуць пра іх: «Прасіліся злыдні на тры дні, а ў тры гады не выжывеш».

*Jeleśńka, s. 503.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС—96/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС—185/06.*

### Бадзюля

КАЛЯ дарог звычайна туляецца Бадзюля. Бліжэй да зімы яна пачынае выглядаць, дзе б і да каго ёй прыладзіцца. Выбраўшы ахвяру, ідзе за тым чалавекам следам, каб пасяліцца ў яго хаце.

Вось тады для небаракі-гаспадара і пачынаюцца ўсялякія прыкрасці. То гэта не так, то тое, і ўсё з рук валіцца. З гора і адчаю чалавек пачынае піць, спускаючы на вецер гадамі нажытае, мазалём напрацаванае. А Бадзюля толькі таго і чакае, калі чалавек усё растрасе ды сам па свеце пойдзе. І пачынае чалавек валацужнічаць, не прыжываецца на адным месцы.

Каб прагнаць Бадзюлю, трэба чыста вымесці і вымыць у хаце. Усё гэта лепей рабіць збытнымі днямі, а брудную ваду выліць на захад сонца. Тады, кажуць, можна ўвачавідкі ўбачыць Бадзюлю, як тая ўцякае: з перапуду яна забывае схаваць сваё аблічча. Тады можна разгледзець яе. Гэта немаладая жанчына з вялікімі, па бруха, грудзьмі. На ёй няма ніякага адзення, толькі брудная падраная посцілка, якая амаль не прыкрывае парэпанага струплівага цела. Твар Бадзюлі непрыгожы: пукатыя вочы, кароткі шырокі нос, тоўстыя адвіслыя губы. Валасы збітыя ў каўтун.

*Беларус. міфалог., с. 138.*

### Сербай

БЕЗ ДАЗВОЛУ гаспадароў пасяляецца ў хаце Сербай — Дух увасаблення голаду. Дзеля таго, каб прагнаць Сербая, трэба зажаць першы сноп і прынесці яго ў хату.

*Беларус. міфалог., с. 144.*

### Меша

У РАСКІДАНАЙ якой-небудзь хаціне жыве Меша — Дух, які мае выгляд нейкай калматай жывёліны невялікага росту, чорнага колеру. Гэта — Нядобры Дух, але пазбаўлены Кадуком сілы шкодзіць людзям, тым самым асуджаны на пакуты. Меша шкоды нікому не робіць, а толькі часам палохае прахожых.

Часам Меша прабіраецца ў жылы дом. Тут яго прытулкам бывае падпечак, дзе ён і харчуецца хоць чым. Уночы ён выпаўзае з-пад печкі і нярэдка, пасябраваўшы з хатнім сабакам, спіць з ім на падлозе пасярод пакоя. Удзень ён не паказваецца. Пасяленне Мешы ў якім-небудзь жылым доме лічыцца няшчасцем. Мешу ведаюць амаль па ўсёй Беларусі. Яго імем нянькі палохаюць дзяцей.

*Древлянский, № 32.*

## Духі гаспадарчых пабудоў

### Вісус

ВІСУСА лічаць конскім ахоўнікам. Гэта даволі малады юнак у белай кашулі, вышытай чырвонымі ніткамі, з вельмі доўгім чырвоным поясам. На галаве ў маладога дзецюка красуецца прыгожы вянок з аўса, з зоркай у цэнтры, пераплецены кветачкамі канюшынкі. Дух вандруе па свеце на сваім верным і прыгожым кані. Сам конь, як і гаспадар, увесь свеціцца незвычайным святлом. Гавораць, што дзе б Вісус не з’яўляўся, з ім абавязкова будзе яго памагаты, аддданы сябра — яго конь.

Людзі паважаюць Духа-апекуна коней за тое, што ён вельмі ж клапоціцца аб іх жывёле, любіць яе. Лічаць, што і ў цяжкі час ён дапамагае кабыле, калі тая не можа сама ажарабіцца. І калі раптоўна на свет з’яўляецца малое жарабятка з зоркай у ілбе, усім адразу зразумела, што гэта жарабятка нарадзілася толькі дзякуючы пільнаму воку Вісуса, які ўвесь час сачыў за ім, і ў знак

ахоўніцтва пакінуў зорку-напамін. А для астатніх коней ён гатуе смачную ежу нанач. Кажуць, што Вісус праносіць нейкую асаблівую траву і перамешвае яе з кормам для жывёлы, ад чаго тыя дужэюць і растуць, як на дражжах. Калі раптам якая з жывёлы захварэла, то Вісус прыкладае ўсе намаганні, каб яна хутчэй паправілася. Бо як на вёсцы, ды без свайго памагатага?! Вельмі абходжвае ў такую часіну папячыцель сваю скаціну: і падлечыць, і падкорміць, і на ногі паставіць, калі так ужо цяжка прыйшлося ёй. А калі жывёла дажывае свой век, то Вісус і тут не пройдзе міма: стараецца ёй даць палёгку напрыканцы.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 104/06.*

## Хлеўнік

КАЛІ пераязджаюць у новую хату, Хлеўніка, як і Хатніка, запрашаюць з сабой. Разам з Хлеўнікам у хляве жыве яго жонка — Хляўніца.

Хлеўнік пераважна звязаны з гаспадарскімі коньмі і каровамі, вельмі рэдка — з авечкамі. Коз і свіней Хлеўнік не любіць і іх прысутнасць у хляве ледзьве пераносіць.

Летам і зімою Хлеўнік пастаянна застаецца ў хляве. Займае ён задні кут хлява ці залазіць на бэльку, на курынае седала, адкуль назірае за скацінаю. Кожны раз, калі скаціна выпраўляецца ў поле ці вяртаецца ў хлеў, ён падыходзіць да парога. Здараецца, найбольш любімую з жывёл Хлеўнік суправаджае на пашу, нават застаецца пры ёй ледзь не да вяртання дадому. У руках ён увесь час носіць пугу і часта ёю ляскае. Калі пры пашкоджанні хлява скаціну заганяюць у іншую гаспадарчую пабудову ці ў палявую загарадку, і яна начуе там, Хлеўнік ідзе за жывёлай і займае сваё звыклае месца — кут, бэльку ці жэрдачку.

Калі Хлеўніку падабаюцца гаспадары, калі даспадобы прыйшлася яму масць жывёлы, — ён песціць і чысціць кожную жывёліну, а коням нават заплятае грывы і хвасты. Любімцам ён носіць ваду хатнімі вёдрамі, цішком падхопленымі ў сенцах ці пад паветкаю. Падкладвае ім паболей корму, не дапускае крыўды іншымі жывёламі.

З нелюбімай жывёлы Хлеўнік здзекуецца. Ён кудлаціць, нават выдзірае шэрсць, грывы і хвасты скручвае ў каўтуны, трывожыць уночы, гойсае да апошніх сіл жывёлы па хляве. Болей за ўсіх дастаецца нялюбай кабыле, на ёй Хлеўнік выязджае на двор, у гумно. Носіцца з канца ў канец па вёсцы, скача па дарозе ці па полі і за адну толькі ноч давядзе яе так, што кабыла спадзе з цела. Акрамя таго, ён адштурхоўвае нелюбімую жывёлу ад корму і пойла. Тая худнее, марнее, самкі скідваюць плод.

У час сваіх стасункаў з жывёламі Хлеўнік застаецца нябачным і толькі зрэдку ўзнікае ў вобразе скурчанага, зморшчанага, худога чалавека: здаецца, нібы шкілет хлопчыка памясцілі ў скуру дарослага. Ён можа дзейнічаць і ў цемры, аднак абыходзіць скаціну і дае распараджэнні пры свечцы з сінім полымем, якую запальвае крэсівам і трутам.

Пры згадванні Хлеўніка імя яго не называецца. Асцярога забараняе глядзець у кут, на бэлькі і шасты, дзе, мяркуецца, знаходзіцца Хлеўнік. Пры неабходнасці крануць бэльку, жэрдку трэба спачатку назваць гэтыя прадметы, каб папярэдзіць Хлеўніка, які са сну можа нарабіць нямала бяды.

Калі гаспадыня жадае падасланць карове, то каб не забіць Хлеўніка, які днём спіць у сене, яна абавязкова павінна сказаць: «Я іду браць сена, падсцілаць карове, уцякай». Лічылася, што пасля гэтых слоў Хлеўнік прачынаецца, і ён не трапіць на вілы гаспадыні і тым самым не загіне.

Калі пажадана пазбавіцца ад Хлеўніка, дык варта пасяліць у хляве казла ці ў стайні павесіць забітую сароку. Хлеўнік зусім не церпіць сарокі, таму што яна часта садзіцца на хлеў і стракоча, выдаючы гэтым яго знаходжанне. Казёл і забітая сарока даводзяць Хлеўніка да шаленства. Ён пачынае шкодзіць нават любімым жывёлам і, нарэшце, зусім сыходзіць з хлява.

Час жыцця і магчымая пагібель Хлеўніка такія самыя, як і Хатніка. Але Хлеўнік старэе і гніе ад знаходжання ў брудным хляве хутчэй за Хатніка. Калі хлеў утрымліваецца неахайна, Хлеўнік больш сядзіць у сваіх патаемных месцах і скацінаю мала займаецца, тады і найбольш любімыя ім жывёлы застаюцца без яго дагляду, робяцца бруднымі. Паморак скаціны — гэта альбо помста Хлеўніка, які заносіць заразу, альбо неабходная ахвяра пры яго пагібелі. Калі на сядзібе загінуў Хлеўнік, там ніколі не развядзецца скаціна. З'яўленне на сядзібе прыблуднага Хлеўніка — чужога, які асіліў мясцовага і выцесніў яго з месца пражывання, нясе вялікую шкоду гаспадарцы.

*Багдановіч, с. 70—72.*
*Никифор.-1, с. 143—144.*
*Никифор.-2, с. 53—57.*
*ПАШ. Ф. 10. воп. 4, спр. МС — 155/06.*

## Вазіла

У КОНЕЙ ёсць асабісты апякун — Вазіла. Беларусы ўяўляюць яго ў чалавечым абліччы з конскімі вушамі і капытамі. У адрозненне ад Кумельгана, які пакрыты конскаю поўсцю, Вазіла апрануты ў чалавечае адзенне.

Кожны гаспадар жадае мець свайго Вазілу, які клапоціцца пра размнажэнне коней і засцерагае ад хвароб і прыпадкаў. Вазіла пераважна жыве

ў стайні, але заўсёды прысутнічае на начлегах, калі коні пасуцца вялікімі табунамі. На гэтых начлегах асабліва неабходна прысутнасць Вазілы як для аховы коней ад нападу ваўкоў і іншых драпежных звяроў, так — галоўнае — для аховы іх ад хітрыкаў яго непрымірымага ворага Кумельгана.

Беларускія пастухі часта бесклапотна праводзяць начлег у гулянках або спяць, не вельмі клапоцячыся аб статку, які прыгналі ў начное, і давяраюць каней клопату і пільнасці Вазілы. Яны звычайна забіваюць на месцы начлегу вялізны шост і надзяваюць на яго конскі чэрап, спадзеючыся, што гэтая сімвалічная выява Вазілы выратуе табун ад усіх магчымых небяспек. У выпадку нападу якога-небудзь звера і нават Кумельгана на табун, коні збягаюцца на тое месца, дзе знаходзіцца жэрдка з галавой Вазілы, і тут знаходзяць сабе паратунак: ні звер, ні Кумельган не асмельваюцца падысці да гэтага месца.

Беларусы асабліва паважаюць Вазілу за тое, што ён ноччу прывозіць на сабе нейкую асаблівую траву і падмешвае яе ў корм коням, ад чаго коні мацнеюць і робяцца рослымі.

Калі Вазіла захопіць Кумельгана ў хляву, то бязлітасна яго выганяе, ад чаго чутны жудасны грукат і тупат, які адбываецца ад бойкі Вазілы з Кумельганам.

Вазіла ў вялікай пашане на Беларусі, але ён не ўсюды вядомы пад адным і тым жа імем: яго называюць дзе Канькачом, дзе — Хлеўнікам, дзе — Табуннікам, а дзе — Вісуснікам.

*Древлянский, № 20.*

**Ёўнік**

ЁЎНІК — сваяк Хатніка, ён жыве ў ёўні. Толькі Хатнік носіць белае адзенне, а Ёўнік любіць чорнае. А можа, ён закапцеў увесь, бо ў ёўні цяплілі печ без коміна, а дым ішоў праз дзверы. Ды і сажы там хапае. Можа, таму Ёўнік і чорны ўвесь, толькі вочы гараць, як вуглі. Калі Ёўнік прымае бачны вобраз, то ўяўляе чалавекападобную масу. Сажа, пыл, павуціна, наліплая мякіна з-за паўзмроку ў сушні не даюць магчымасці разгледзець асобныя формы. Але Ёўнік пераважна застаецца нябачным.

Ёўнік жыве ў ёўні, у печы ці на печы, або на сушыльнай жэрдцы і толькі зрэдку падыходзіць да акна, каб выхаркаць пыл і сажу. Яшчэ радзей перасту-

пае ён ганак сушні, каб агледзець ток, сцірты снапоў, накіраваць ці адхіліць вецер, неабходны ў час веяння збожжа.

У тых выпадках, калі ў ёўню заходзяць непатрэбныя тут асобы, Ёўнік узнікае ў розных месцах ёўні і палохае прышэльцаў. Калі ж у ёўню прыйшоў ненавіснік Ёўніка, то ён пільна сочыць за ім, каб, счакаўшы хвіліну, нагнаць дыму, удушыць чадам і нават спаліць разам з дабром, што тут захоўваецца.

Пры міралюбных адносінах Ёўнік клапоціцца, каб правільна палілася сушыльная печ і сушыліся снапы і зерне, пасылае патрэбны для веяння скразняк, дапамагае, спорыць работу.

Калі Ёўніка не крыўдзіць, дык ён можа памагчы і ў гумнах. Ноччу, калі нікога няма, ён замятае гумно, вее зерне, надае яму «спорню», а ў разумных гаспадароў нават малоціць ранкам.

Калі сушня служыць і для першапачатковай апрацоўкі пянькі і лёну, Ёўнік таксама дружалюбна служыць ля мялкі і трапалкі, хоць і не пераносіць смуроду адмочанай і адлежанай пянькі і лёну. Вельмі падабаецца Ёўніку, калі сушня замяняе лазню: тут у яго ёсць адзіная магчымасць змыць сажу і пыл.

Ёўнік не баіцца простага агню, і пажар у ёўні з-за людской неасцярожнасці мала трывожыць яго. Калі пачынаецца пажар, ён выходзіць са свайго жытла і спакойна назірае за тым, што адбываецца, а пасля пажару і адыходу людзей залазіць у печ, на абгарэлае бервяно, і тут жыве, пакуль не адбудуецца новая ёўня, куды адразу і пераходзіць.

Небяспечны для Ёўніка пажар ад маланкі: тут нярэдка Ёўнік гіне ад нечаканасці грамавога ўдару. Мякінны пыл лёгка ўспрымае полымя, і Ёўнік згарае, не пакідаючы пасля сябе ні пылінкі. Калі гэта здарылася з адным Ёўнікам, другі не пойдзе ў ёўню, адбудаваную на тым самым месцы, ёўня застаецца без Ёўніка.

Калі ў ёўню кладуць снапы для прасушкі, то кідаюць сноп у агонь для Ёўніка. Пасля заканчэння малацьбы таксама пакідаюць сноп жыта ў ёўні, каб Ёўніку было чым заняцца.

Ёўні часта гарэлі. Гэта Ёўнік, калі яму нечым не дагадзілі кідаў снапы ў агонь і паліў ёўню.

*Никифор.-2, с. 57—59.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 90/06.*

**Пуннік**

АБ ГАСПАДАРСКІМ сене клапоціцца Дух, які жыве ў пуні. Таму і завуць яго Пуннік.

Пуннік не такі брудны, як Ёўнік: на ім няма слоя сажы, але хапае пылу і смецця ад сена і трухі. Ён таксама пакрыты запыленымі ніткамі павуціны. Бачнае аблічча прымае, пакуль у пуні ёсць сена, а калі прымае, то толькі выглядае чалавекападобнай істотай; у ім хутчэй можна пазнаць ахапак дробнага забруджанага сена, чым жывое стварэнне. Звычайна Пуннік нябачна сядзіць на кроквах, бэльках, назіраючы за тымі, хто заходзіць у пуню, завозіць ці забірае сена.

Пуннік цешыцца сцэнамі гульняў і сутыкненняў моладзі, валтузнёй і віскам катоў, калі яны ловяць мышэй, і цярпець не можа, калі ў гнёздах выводзяцца птушкі. Дзетак і паасобных прахожых Пуннік звычайна палохае ненатуральным аханнем, хрыпам і свістам ці жаласным енкам праз шчыліны і шматлікія адтуліны пуні. Гэта прыносіць яму немалую асалоду.

Пуннік туліцца не толькі ў сядзібнай, але і ў лугавой, і лясной пуні, абы толькі яна мела страху і кроквы: любая макрэча, у тым ліку і ад дажджу праз страху, дзейнічае на Пунніка разбуральна. Ён паволі марнее, хоць і не даходзіць да пагібелі. Гіне Пуннік ад удару грому ці ў агні, калі пуня загараецца ад маланкі. Як і Ёўнік, ён ператвараецца тады ў пыл.

*Никифор.-2, с. 59.*

**Лазнік**

ЛАЗНЮ займае Дух — Лазнік, які выглядам нагадвае Вадзяніка. Ён жыве пад палком. Калі Лазнік жыве ў лазні, то там заўсёды будзе добра мыцца, гаспадары не будуць хварэць, а сама лазня будзе доўга стаяць. Каб прывабіць Лазнік у сваю лазню, гаспадар на гару клаў бярозавы венік, які ён сваімі рукамі сплёў.

Калі першы раз тапілі нядаўна пабудаваную лазню, гаспадары не ішлі ў гэты дзень мыцца. Яны астаўлялі ваду і ўсё патрэбнае для мыцця і слухалі — калі з бані данёсся які-небудзь гук, значыць Лазнік пасяліўся ў гэтай лазні, і ён мыецца.

Лазнік любіць парыцца і мыцца. Дзеля гэтага яму пакідаюць венік і ваду. Мыецца ён звычайна пасля поўначы і таму злуецца, калі хто-небудзь застаецца да гэтага часу ў лазні. Тады ён кідаецца смеццем, нават камянямі, а пры выпадку можа нават загубіць парушальніка спакою.

Лазнік больш злосны за іншых сядзібных Духаў і цярпець не можа гультаёў, а тым больш — несвоечасовых наведвальнікаў. Іх ён палохае ненатуральным храпам, шыпеннем, пайменнымі заклікамі, віскам, стукам у сцяну,

варочаннем камянёў у лазні на каменцы, рогатам. Зларадны рогат пужае запозненых у лазні жанчын, вымушаных уцякаць голымі. Не пазбегнуць пужання Лазніка і тым, хто задумаў бы мыцца ў лазні пасля поўначы.

Здаралася, што маладыя дзеўкі на Святкі збіраліся ў лазні, каб убачыць свайго «суджанага-ражанага» — пагадаць. А як вядома, гадаюць толькі пасля поўначы. Дык вельмі ж гэта не падабалася Лазніку. Ён злуецца, нервуецца і толькі думае, як гэта дзевак спужаць і хутчэй выперці з лазні. Пачынае час ад часу штурхаць дзяўчат, пужаць, і дзеўкі не вытрымліваюць — уцякаюць хто куды.

Памыўшыся ў лазні і ўлагоджваючы Лазніка, гаспадары пакідаюць Духу вядро вады і венік і кажуць: «Табе лазня на стаянне, а нам на здароўе». Дзверы, якія вядуць з лазні ў прыбаннік, ніколі не закрываюцца, каб Лазнік мог выйсці і пахаладацца.

Нямала непакою прыносіць Лазніку першапачатковая апрацоўка пянькі і лёну, калі іх мнуць і трэплюць, а таксама папярэдняя сушка ў самой лазні. Тады Лазніку даводзіцца пераносіць смурод і пыл ад падгнілай кастрыцы. Калі гэта зацягваецца надоўга, Лазнік яшчэ больш злуецца на наведвальнікаў, якім, бывае, помсціць пажарам у лазні.

Але без Лазніка лазня — не лазня. Калі раптам Лазнік сыходзіць са свайго месца жыхарства, то і здараюцца розныя непрыемнасці: то згарыць пабудова ні з таго ні з сяго, то страха паваліцца, то грубка парушыцца, то сцяна пакосіцца…

Але нават калі гаспадар і падправіць пабудову, Лазнік сюды больш зноў ніколі не зойдзе.

*Багдановіч, с. 70.*
*Никифор.-2, с. 60.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 53/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС – 163/06.*

## Багі і Духі палёў і агародаў

**Жыцень**

БОГ ВОСЕНІ — Жыцень — апякуецца сялянскімі палямі. Ён з’яўляецца перад беларусам у выглядзе мужчыны сталага веку, нізкага росту, худога, нават кашчавага, з ускудлачанымі валасамі. Мае тры вокі: два як у звычайнага чалавека і трэцяе на патыліцы. Жыцень выглядае грозным, нібыта вечна нечым незадаволеным.

Ходзіць Жыцень вельмі ціха, сагнуўшыся. Расхаджвае па палях і агародах, каб агледзець, ці ўсё добра прыбрана, як павінна быць у добрай гаспадарцы. Калі Жыцень знойдзе на жніўніку шмат каласоў, пакінутых жнеямі, ён збярэ іх і, звязаўшы ў адзін сноп, перанясе на тое поле, дзе сабрана ўсё чыста, з ашчаднасцю. Вынікам гэтага здараецца неўраджай у наступным годзе на тым месцы, дзе Жыцень знайшоў шмат пакінутых каласоў, і, наадварот, вялікі ўраджай на той ніве, дзе пакінуў ён сноп.

Тое ж бывае і з агародамі, якія наведвае Жыцень і ў якіх знаходзіць нядбайнасць, гаспадарскія непарадкі. Убачыўшы каго-небудзь з гаспадароў агарода, Жыцень падыходзіць да яго і грозіць яму пальцам, гэта значыць, што ў наступным годзе ў тым агародзе трэба чакаць неўраджаю.

Жыцень прыходзіць да беларуса часам у выглядзе жабрака. Ён, як звычайна, з суровым тварам, пагражае пальцам кожнаму стрэчнаму. Гэта прадвесце ўсеагульнага голаду ці вялікага неўраджаю на наступны год. Зрэшты, у такім выглядзе Жыцень з'яўляецца беражлівым і старанным гаспадаром, каб папярэдзіць іх пра надыход небяспекі і такім чынам даць ім магчымасць назапасіць хлеба на галодны год.

Жыцень прысутнічае ў полі і пры восеньскай сяўбе. Пахаджвае з грозным выглядам па пасеяным жыце і нібыта ўсё прыглядаецца да чагосьці ўнізе, утоптвае зерне, каб лепш увайшло ў зямлю і хутчэй апладнілася зямельнымі сокамі.

*Древлянский, № 24.*

**Талака**

БАГІНЯ ТАЛАКА — апякунка жніва і ўрадлівасці. Яна ў вялікай пашане ва ўсіх беларусаў і вядомая пад адным гэтым імем. Свята ў яе гонар адбываецца ў розны час: у адных мясцінах раней, у іншых пазней, гледзячы дзе і калі бывае ўборка ўсіх пасеваў ці толькі хлеба.

Калі змяркаецца і дажынаюць апошні загон, кожная са жней адкладае па каласку для аднаго агульнага снапа, які прызначаецца ў гонар Талакі. Сабраўшы такім чынам значную колькасць каласкоў, жнеі звязваюць усе разам у адзін агульны дажыначны сноп. Між тым на ніве застаецца невялікі кавалак; з яго талачанкі робяць вянок, уплятаючы ў яго розныя кветкі і пахучыя травы. У гэты час з'яўляецца на полі багіня Талака, якую жанчыны ўпрыгожваюць рознымі кветкамі, даюць у рукі дажыначны сноп, а на галаву яе ўскладаюць талаковы вянок з доўгім белым пакрывалам. Карагод жанчынталачанак акружае Талаку і, пераплятаючыся вакол яе вянком, спявае песню.

Пасля гэтай песні карагод талачанак, стаўшы папарна за Талакою, ідзе ў дом гаспадара поля. Талачанкі спяваюць:

Выйдзі, выйдзі, гаспадарыку,
Спатыкаць з усякім збожжам Талаку;
Раскрый жа хатачку
Да перад такім жа госцем.
Пакланіся ж спадарыні Талацэ,
Пакланіся ёй найніжай;
Пасадзі яе да на куце...

Гаспадар падносіць Талацэ хлеб-соль, кланяецца ёй у пояс. Талака аддае ўзамен дажынкавы сноп. Гаспадар і гаспадыня бяруць Талаку пад рукі і саджаюць яе на кут.

Пасля заканчэння вячэры карагод з Талакой падыходзіць да гаспадароў і дзякуе за пачастунак пацалункамі. Талака здымае з галавы вянок і аддае яго гаспадару, пакрывала ж застаецца ў яе. Карагод талачанак праводзіць Талаку.

*Древлянский, № 34.*

**Русалкі-палявіцы (жытніцы)**

РУСАЛКІ-жытніцы з’яўляюцца тады, калі жыта красуе ў полі. Бог іх пасылае пільнаваць жыта, каб ніхто не тоўкся да не трусіў каласкоў, бо не нальюцца. Русалкі-палявіцы ніякіх пасеваў не любяць у полі, акрамя жыта, дзе яны качаюць яйкі ў Наўскі дзень.

Русалкі-палявіцы вельмі падобныя на русалак, якія жывуць у вадзе. Гэта прыгожыя дзяўчынкі з распушчанымі доўгімі залатымі валасамі, а на галаве ў іх вяночкі, у абедзьвюх руках валошкі. Жытніца можа быць голай ці апранутай у белае ці русае адзенне. Жытніцы бегаюць па жыце, глядзяць, каб яго не таптадлі. І калі хто з’явіцца ў жыце, яны хапаюць яго і шчакочуць. Пакуль зусім не зашчакочуць.

Таму і не дзіва, што як нехта ўпрэцца ў жытняе поле, то яго заласкочуць. Хлопца заласкочуць, бо разявака, а дзеўку — каб было больш Русалак. Русалкі-палявіцы без віны нікому не робяць зла.

Калі будзеш жадаць жытніцам кепскага, то яны пакараюць цябе, а калі штонебудзь зробіш для іх добрае, то будзе табе спор у рукі і ногі: ніхто не зраўняецца ў працы з такім чалавекам.

Русалкі-палявіцы не могуць перайсці цераз мяжу, ад таго і церпяць, і пераводзяцца: цяпер зямлю ўвесь час перамерваюць і дзеляць межамі. А раней, калі зямля была нямераная, іх было шмат. А ў жыце ноччу толькі і чутны быў іх смех!

*Романов-4, с. 139.*
*Fed.-1, s. 75—76.*

**Палявік**

У ПОЛІ водзіцца Дух, нечым падобны да Лесавіка. Гэта Палявік. У яго ёсць жонка — Паляха. Палевікі — радня Хатнікам. Беларусы звяртаюцца да Палевіка з просьбамі пра ўраджай.

Тэрыторыя існавання Палевіка — палі і лугі (з усімі пагоркамі, нізінамі і ярамі, што мяжуюць з палямі) адной або некалькіх сумежных вёсак, не раздзеленых адна ад аднае ні лесам, ні вадою. Палявік можа жыць на горцы, у доле, у канаве. Таксама можа туліцца ля каменя ці ля палявога дрэва, куста, межавага слупа. У час разводдзя ці пры моцных дажджах ён уцякае ад вады на вышэйшыя мясціны, таму што цярпець не можа макрэчы.

Найгорш жывецца Палевікам вясною і восенню, калі слата і макрэча: які́м бы вялікім ні было іх жаданне шкодзіць чалавеку і яго дабру, яны не могуць расстацца з утульным сухім месцам, не могуць мясіць нагамі бруд і гразь. Але тут нярэдка сам чалавек даецца ім у рукі, калі прыходзіць адпачыць на сухадоліну. Каб утрымаць чалавека, Палевікі лашчаць і закалыхваюць яго зацішкам, сонечным цяплом, пакуль у яго не пачнуцца дрыжыкі, якія нярэдка пераходзяць у хваравітую ліхаманку.

Палевікі гасцююць адзін у аднаго, дапамагаюць мучыць знойдзеную ахвяру, па-сяброўску пераклікаюцца, асабліва начною парою, калі стаіць добрае надвор’е. Зімою Палевікі сыходзяцца на забавы. Любімая з іх — знішчэнне дарожных вешак, зацярушванне дарогі, занос снегам канаваў і калдобін, каб туды трапіў прахожы ці праезджы, які збіўся з дарогі. Палевікі доўга водзяць яго ўзад і ўперад, пакуль той не замерзне.

Палявік разбурае загародкі, вешкі, заваблівае скаціну ў поле выглядам хлебных і лугавых раслін. Тое ж робіць Палявік, калі заманьвае дзяцей і моладзь у кветкі для гульняў і зборышчаў. Учыняе ён і прамую шкоду: прыгінае да зямлі збожжа і траву, скручвае расліны, адхіляе дождж, насылае шкодных насякомых, водзіць да знямогі дзяцей, што заблудзіліся. Мучыць жывёлу на пашы, як і людзей за работаю, аваднямі, сляпнямі, камарамі.

Не пашкадуе Палявік і сталага чалавека, калі той засне на кучы камянёў ці палявых каранёў, якія збіраюць пасля баранавання, у бруднай канаве ці мокрай лагчыне. Усіх наведвальнікаў палёў і лугоў Палявік насцярожвае перадражніваннем, свістам. Ён прымае выгляд пачварнага ценю, то гоніцца за чалавекам, то аддаляецца ад яго, заманьваючы ахвяру. Варта толькі паддацца на прынаду Палевіка, і чалавек пацерпіць за сваю даверлівасць. Палявік раптам можа забіць чалавека на месцы.

Але часам Палявік клапоціцца пра ўраджайнасць палёў, пра ўкосныя сенажаці, выганяе адсюль шкоднікаў, раўняе сцяблiны і лісты раслін, але гэта робіцца дзеля таго, каб прывабіць сюды як мага болей людзей, між якіх ён, несумненна, знойдзе ахвяру. Здараецца, што ён гоніць непажаданых, тых, хто зайшоў у яго ўладанні, дзеля ўласнага спакою.

Палявік вартуе палявыя скарбы, якія не выдае чалавеку ні пры якіх умовах. Ён неміласэрна помсціць таму, хто выпадкова знаходзіць скарб. Ведаючы гэта, шукальнікі скарбаў не звяртаюцца да Палевіка, а калі зробяцца ўладальнікамі палявога скарбу, стараюцца не трапляць у мясціны, дзе жыве Палявік.

Як гінуць Палевікі і ці гінуць наогул — беларусы не ведаюць. Вядома, што гэтыя асцярожныя Духі хутчэй за іншых адчуваюць набліжэнне навальніцы і ўмеюць хавацца ад Перуновых стрэлаў. Да таго ж і сама тэрыторыя Палевікоў, калі там няма высокіх дрэў, якія растуць паасобку, рэдка прымае ўдары грому.

Беларусы ж пакуль не прыдумалі надзейных сродкаў на пагібель Палевікоў. Ад іх церпяць параўнальна менш, чым ад астатніх Духаў, і таму часам нават шануюць іх. Калі на полі, як жнуць, застаецца вада або квас, то іх выліваюць на мяжу або на дарогу — на гасцінец Палевіку, каб ён не псаваў збожжа.

*Никифор.-2, с. 66–68.*

**Жалезная Баба**

У ПАЛЯХ і агародах жыве яшчэ і Жалезная Баба. Гэта злая нізкарослая старая з вялікімі жалезнымі грудзямі. Яна хапае жалезным крукам тых дзяцей, якія асмельваюцца заходзіць адны ў палі і агароды, каб паласавацца бобам, гарохам, макам, гароднінай. Жалезная Баба кідае іх у сваю жалезную ступку, таўчэ жалезным таўкачом і есць.

*Романов-4, с. 290.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 121/06.*

## Багі і Духі Ляснога гаспадарства

**Купальскі Дзядок**

НЕДЗЕ ў лесе жыве Купальскі Дзядок. Гэта добры лясны Бог. Толькі ён можа бесперашкодна збіраць купальскія кветкі. Дзядок ходзіць па лесе з кошыкам і напаўняе яго кветкамі, таму кошык гарыць, як жар. Калі сустрэцца з ім і разаслаць перад ім белы абрус, то ён кіне на яго адну кветку. Хапай тады хутчэй яе і, разрэзаўшы далонь правай рукі, кладзі пад скуру: адтуль Нядобры Дух не дастане. Шчаслівы ўладальнік цудоўнай кветкі атрымлівае дар ведаць пра ўсё на свеце і асабліва ведае, дзе якія скарбы ляжаць і як да іх прыступіцца, ведае, якія закляцці на іх накладзены і як іх адчараваць.

*Багдановіч, с. 30—31.*

**Гаспадар лесу**

ВАЛАДАРАМІ асобных частак лесу з’яўляюцца Лесуны, якімі кіруе Гаспадар лесу. Гаспадар лесу росту велізарнага, на цэлую галаву вышэй за лес, у якім валадарыць. На руках і нагах у яго закручаныя кіпцюры, падобна як у сабакі. Барада ў яго доўгая, сівая; носіць ён яе ў руках. Ён магутны і страшны. Волю яго слепа выконваюць Лесуны.

Гаспадару лесу кладуць на Ярылаў дзень прынашэнні, каб ён скаціну зберагаў ад ваўкоў. Падарунак — хлеб, соль і што-небудзь з харчоў — кладуць на скрыжаваннях дарог у лесе і замаўляюць: «Гаспадар лесу, міласцівы, выратуй маіх коней у полі і за палямі, у лесе і за лясамі, дзе яны ходзяць, гуляюць, расу выпіваюць, тым сыты бываюць. Вось табе соль-хлеб і нізкі паклон».

Некаторыя бачылі ляснога Гаспадара, як сядзіць ён у лесе і моцна свішча. Іншы раз пры месячным святле ён пляце лапці. І Гаспадар лесу, і яго памагатыя Лесуны, аднак, не маюць улады за межамі свайго лесу.

І Гаспадар лесу, і Лесуны падначалены Ярылу — апекуну звяроў і птушак. Яны выконваюць у яго абавязкі пастухоў. Таму нярэдка іх сустракаюць з пугаю ў руках. Тады яны і крычаць, як звычайныя пастухі.

*Добровол. Словарь, с. 387, 983.*
*Романов-4, с. 7.*

## Лесуны

ЛЕСУНЫ — гэта Духі, што рассяліліся ў лясных гушчарах. У кожнага ёсць свой участак. Абсяг дзейнасці Лесуна — уся лясная плошча ад узлеску да ўзлеску, з усімі ўзгоркамі, нізінамі, ярамі і палянамі, за выключэннем вадаёмаў, дзе гаспадарыць Вадзянік. Кожны Лясун пільнуе, аглядае свой участак, і не абыходзіцца без таго, каб не адбывалася спрэчак і боек між уладальнікамі суседніх участкаў.

Жыве Лясун у матачніку — сярэдзіне пушчы, недаступнай для звычайнага смяротнага. Матачнік акружаны непраходным лесам, завалены ламаччам, акрамя таго, вакол яго багністыя балоты, якія не замярзаюць і ў самыя суровыя зімы. Там і жыве Лясун са сваімі звярамі і птушкамі. Усе буйныя звяры туды ідуць паміраць. Толькі яны ведаюць патаемныя сцежкі, па якіх можна дабрацца да матачніка.

У глыбіні тэрыторыі, што падуладная Лесуну, знаходзіцца яго дом, дзе жывуць яго жонкі і дзеці. Сам жа ён дома не сядзіць — больш вандруе. Адпачывае і начуе ў выпадковых мясцінах: на вершалінах высокіх дрэў, у дуплах, густых зарасніках, у ламаччы, бураломах.

Хоць Лясун здольны прымаць розныя аблічча, ператварацца ў любыя прадметы свайго абсягу, але часцей за ўсё ён паўстае ў вобразе старога. У яго белы, як бяроста ці як воск, ніколі не загарэлы твар з вялізнымі цьмянымі вачыма свінцова-сіняга колеру, якія не рухаюцца і ніколі не закрываюцца. Галава яго ўся ў доўгіх кучарах і нагадвае вершаліну хвоі; на вялізным тулаве звярыныя скуры — воўчыя і мядзведжыя — поўсцю наверх. Рукі і ногі ў яго тоўстыя і моцныя, як ствалы дубоў. Вочы гараць, як у ваўка ці савы.

У час абыходу сваіх уладанняў Лясун «ржэць», рагоча, калі вясёлы; ваўком вые, калі сумны; рыкае, як мядзведзь, калі злосны, а часам дзіка вішчыць. Ён пляскае ў далоні, і ад гэтага трэск ідзе па лесе. Гэтыя дзікія гукі, смех, свіст, плясканне, шалёныя крыкі чутны далёка і наводзяць на людзей жах.

Лясун — звярыны пастух, таму ў руках у яго доўгая пуга. Жыхары лясных мясцовасцей бачаць яго даволі часта, але яшчэ часцей чуваць, як ляскае яго пуга і як ён крычыць на звяроў: «го-го-го-го-го!»

Калі Лясун разгульвае па сваіх уладаннях, яго суправаджаюць зграі звяроў і чароды птушак, асабліва совы, пугачы, вароны і сарокі. Наперадзе яго бягуць вавёркі, зайцы, сарны і іншыя звяры; у паветры ляцяць цецерукі, курапаткі і іншыя птушкі. Але як толькі Лясун выходзіць з лесу, ён меншае да памераў карліка, і адразу з палёў і лугоў падымаюцца матылі цёмнай хмарай. На лузе ці на полі — ён роўны з травой і былінкай.

Лясун — пярэварацень, ён мяняецца ў росце, прымае разнастайныя абліччы. Ён можа з’яўляцца людзям у выглядзе звычайнага сівенькага дзядка ў белым адзенні; яго можна пазнаць па тым, як ён хутка расце, аддаляючыся ад чалавека, і робіцца веліканам. З’яўляецца Лясун і дзядулем, і красой-дзяўчынай, прыгожым мужчынам, і зверам, і птушкаю. Заманьвае падарожнікаў за сабою ў непралазны гушчар лесу, адкуль цяжка выбрацца.

Лясун здольны перадаваць галасы ўсіх жыхароў свайго краю — ад мядзведжага рыку да піску камара. Калі ж ён падае свой уласны голас, голас нябачнай істоты, то ці глушыць чалавека, ці лашчыць пяшчотым шэптам. Але якім бы ні быў гэты голас, вопытны слых пачуе ў ім дзікія пералівы, злоснае павіскванне Духа.

Лесуна можна падмануць, калі назавеш пры ўваходзе ў лес няправільны кірунак мяркуемага шляху ці апранеш на ўзлеску адзенне навыварат. Калі гэта не зроблена, Лясун адразу падступаецца да ахвяры зласліва цешыцца з яе пакут, збіўшы з належнага кірунку. Ён прымушае чалавека кружыць па лесе, праходзіць па адным і тым жа месцы некалькі разоў. Калі ж ахвяра страчвае ўсялякую развагу і даходзіць да адчаю, Лясун злосна рагоча, і яго рогат чуваць за вёрст сорак па акрузе.

Часам па дамоўленасці з Вадзяніком ці Балотнікам ён прыводзіць сваю ахвяру да іх, у іх уладанні, нягледзячы, што іншым разам Лесуны і Вадзянікі — непрымірымыя ворагі, прычым Вадзянік заўсёды першы напаскудзіць Лесуну.

Дзеля нейкай мэты Лясун можа быць прыцягнуты чалавекам на службу. Робіцца гэта асаблівым заклікам у Купальскую ноч. Той, хто выклікае, становіцца на асінавы пень, тварам на поўнач і кліча так: «Акажыся не ваўком-зверам, не воранам-птушкаю, не дрэвам іглістым, а такім, як я сам!» Лясун адразу паўстане ў чалавечай постаці і, згаджаючыся на здзелку, патрабуе за будучую працу адну толькі душу таго, хто выклікае.

Лясун надзейна і аддана служыць таму, хто яго паклікаў: гоніць яму дзічыну, дапамагае знаходзіць борці, ягадныя і грыбныя мясціны, падказвае месцазнаходжанне скарбаў і ўсяляк адводзіць шкоду сапернікаў, якіх прымушае блукаць падманнымі шляхамі, пужае лютымі звярамі.

Лясун помсціць чалавеку, калі той часта і без патрэбы згадвае яго імя ці выпадкова перайшоў яго любімую сцяжынку. Калі Лесуну не ўдаецца помста ў адносінах да чалавека асабіста, ён адпомсціць яму пагібеллю той ці іншай свойскай жывёлы, якая трапіць у лес.

Лесуны зводзяць дзяцей, якія зняважылі маці і праклятыя ёю апоўдні. Лесуны зносяць пераважна хлопчыкаў, Лесавіхі — дзяўчынак. Зведзеныя

Лесунамі дзеці пасля вяртання дадому з цяжкасцю прывыкаюць гаварыць і дзічацца людзей. Лесуны самі выносяць іх і кідаюць на тое месца, адкуль узялі. Жанчын Лесуны зводзяць больш свавольных, якія кепска жывуць са сваімі гаспадарамі.

Вяртанню ўкрадзеных Лесунамі людзей садзейнічаюць ахвяраванні. Іх кладуць на скрыжаваннях дарог, дзе збіраюцца Лесуны. Ахвяраю можа служыць кавалак сала, гаршчок з кашай, хлеб з соллю, а то жанчыны напякуць бліноў ці пірагоў, загорнуць з соллю ў чыстую анучку, перавяжуць чырвонай нітачкай, занясуць усё гэта ў лес і пакладуць на скрыжаванні лясных дарог.

Лесуна часта просяць вярнуць жывёлу, што заблудзілася ў лесе. Гаспадар згубленай жывёлы кладзе на лясным раздарожжы дзесятак яек, кавалак сала, бохан хлеба і становіцца да ахвяраванага спінай. Чарадзей абыходзіць яго і заклінае Духаў living рознымі галасамі, пасля чаго гаспадар, не паварочваючы галавы, вяртаецца назад дадому.

Да свойскай жывёлы Лясун не мае варожасці, ён добра ставіцца да сабак, якім ахвотна дазваляе бегаць па лесе ў любы час. Калі ж ён заманьвае ў лес і губіць там якую-небудзь свойскую жывёліну, то робіць гэта толькі таму, што шукае выпадку, каб адпомсціць якому-небудзь гаспадару ці даць узбагаціцца свайму апекуну.

Што трэба рабіць, калі заблудзішся, калі абыдзе цябе Лясун або сам патрапіш на яго жытло ці наогул адурманіць нейкі лясны Дух? Пераапрані што-небудзь з адзення навыварат, разуй левую нагу і абуй правую, выверні шапку ці павярні яе брылём назад. Ці прыгадай, што напярэдадні Новага года вараць свіную галаву. Усімі гэтымі сродкамі ты не дасі Лесуну паздзекавацца з сябе.

Лясун часам прымае самы жывы і непасрэдны ўдзел у справах чалавека — ён закалыхвае хворае дзіця, каб супакоіць схіленую над ім маці і даць ёй адпачыць. Лясун прадбачыць будучыню, і яму наперад вядомы лёс чалавека; іншы раз ён з’яўляецца ў ролі прадказальніка.

Ёсць у Лесуноў і дзеці, а некаторыя нават бачылі іх: ляжаць яны, голыя, у люльках, падвешаных да галін ёлкі ці хвоі. Звышнатуральныя веды і багацце атрымліваюць ад Лесуна тыя, хто зробіць якую-небудзь паслугу яго дзецям, накрые іх, калі знойдзе ў лесе голых.

Хто ўбачыць Лесавіху ў час родаў, той павінен што-небудзь накінуць на ёю народжанае дзіця і адразу ж пайсці. Лесавіха пойдзе за гэтым чалавекам і ўсё будзе пытацца, што яму трэба: золата ці добрага жыцця. Хто папросіць у яе золата, то яна адразу ж насыпле яму цэлы прыпол. Але пры выхадзе

з лесу золота ператворыцца ў вуголле. А хто будзе гаварыць, што яму нічога не трэба, і не возьме таго золата, той усё жыццё будзе мець поспех ва ўсіх сваіх справах. Таму народ кажа пра таго, хто жыве ў багацці, што, напэўна, ён бачыў Лесавіху ў час родаў. Толькі шчаслівы чалавек можа бачыць Лесуна і Лесавіху апранутымі ў добрае адзенне. Хто ўбачыць Лесуна ў дрэнным адзенні, таму не будзе шчасця. Мужчыны, убачыўшы Лесавіху і пачуўшы яе голас, пачынаюць сумаваць і худнеюць.

Ад Лесуна і Лесавіхі нараджаецца пачварная істота, вельмі мала падобная да сваіх бацькоў і вельмі ненажэрная. Для іх такое дзіця з'яўляецца цяжарам, і яны імкнуцца падмяніць яго чалавечым дзіцем, якога адразу ператвараюць у Лешага. Сапраўднае Лешаня застаецца ва ўяўных бацькоў гадоў да адзінаццаці і потым хаваецца ў лесе, адкуль нябачна для выхавацеляў плаціць ім рэчыўнай падзякаю. Дакрананне грамавой стралы да такога паўлешука ператварае яго, як і кожнага Лешага, у раз'юшанага лютага драпежніка — мядзведзя, ваўка, рысь, арла, якія да канца свайго жыцця шукаюць магчымасці загубіць чалавека.

Часам Лясун уступае ў сумеснае жыццё з жанчынаю, якую ён трымае ў лясных сховішчах, не паказваючы сваім суседзям-Лесунам. Вынікам такога сумеснага жыцця з'яўляецца дабрадзейнае Лешаня, бескарыслівы слуга людзей, чаго, аднак, сам бацька і іншыя Лесуны не дапускаюць, а пры яўнай упартасці Лешаняці губяць яго.

Лясун вечна варагуе з паляўнічымі, усяляк адводзіць іх убок ад дзічыны і наогул збівае з дарогі. Але да выпадковых наведвальнікаў лесу ён ставіцца лагодна, выводзіць іх на дарогу і нават дзеліцца хлебам.

Лесуны не баяцца маразоў і застаюцца ў лесе на ўсю зіму. Наадварот, у моцную сцюжу яны больш чым калі палохаюць і наводзяць жах на людзей. Некаторыя нават ператвараюцца ў Духаў зімовых завірух.

*Киркор, с. 271.*
*Никифор.-2, с. 68–72.*

### Русалка і Лесавік

Убачыў Лесавік Русалачку і пакахаў яе. Пабудаваў ёй палац з пярлін, пашыў ёй кашулю з рачных хваляў, надзеў на галаву вянок з лілей, пашыў туфелькі з ракавінак, зрабіў карону з водарасцей. І пачалі яны жыць, адзін аднаго любіць, карагод вадзіць, дзяцей гадаваць. Лесавік пасвіў у лесе звяроў і птушак, а Русалачка стала зязюляю, кукавала, маладых дзяўчат перасцерагала.

*Кацар, с. 140.*

**Русалкі-лесавіцы**

ВЫГЛЯДАЮЦЬ Русалкі-лесавіцы як звычайныя жанчыны з доўгімі распушчанымі валасамі, у якія ўплецены зялёныя галіны. Заўсёды іх бачаць голымі. У Русалак-лесавіц вочы чорнага колеру. Гэта — душы загубленых Лесуном дзяўчат, якія былі праклятыя бацькамі. Русалкі-лесавіцы — палюбоўніцы Лесуноў.

Па начах яны гойдаюцца на галінах і каго толькі заўважаць, клічуць такімі словамі: «Га! Га! Хадзіце к нам на арэлі калыхацца». Няшчасны, хто да іх наблізіцца. На дзень разам з Лесавіхамі Русалкі-лесавіцы ідуць пад зямлю, дзе жывуць у палацы.

Небяспека падсцерагае таго, хто пойдзе ў лес у Русальную суботу. У той дзень Русалкі збіраюцца гуртам і гойдаюцца на дрэвах. Бяда, калі яны першыя заўважаць чалавека: зараз жа аблытаюць яго сваімі доўгімі валасамі і заказычуць да смерці.

Калі пачуе беларус у лесе сваё імя, ён ні за што не адгукнецца, думаючы, што яго кліча Русалка і заманьвае да сябе, прастадушнага, каб заказытаць яго да смерці. Русалка-прыгажуня, з зялёнымі валасамі, наўмысна пералічвае вядомыя мужчынскія імёны для таго, каб натрапіць на імя прыведзенага ў лес якой-небудзь патрэбай чалавека. Пакуль чалавек, названы па імені, не адгукнецца, Русалка з ім нічога не зробіць.

Але іншая справа, калі чалавек сам заўважыць Русалак і скажа: «Чур мая!» Тады Русалкі для яго бясшкодныя, а адна з іх нават пойдзе за ім у яго дом і будзе выконваць усе хатнія работы, як самая старанная работніца; піць і есці не будзе, а будзе харчавацца толькі параю, што выходзіць з гаршкоў. Гэтак Русалка пражыве год, да наступнай Русальнай суботы, а тады абавязкова ўцячэ ў лес.

*Эремич, с. 47.*
*Романов-4, с. 139, 216.*

**Пушчавік**

ПУШЧАВІК — Нядобры Дух лесу і робіць людзям толькі зло. Ён падобны на чалавека калматы, зарослы доўгім мохам па ўсім целе, не выключаючы носа і вачэй. Пушчавік вялізарнага росту, галава яго заўсёды вышэй за самае высокае дрэва, таму ён бачыць навакольныя прадметы на далёкай адлегласці. Ёсць, аднак, Пушчавікі, якім такія дрэвы толькі да пляча.

Пушчавік не можа даравацъ людзям, што з-за іх яму давялося сысці ў векавыя дубровы. Пушчавік не шкадуе ні старых, ні дзяцей, ні жанчын, ні знямоглых, ні памочнікаў чалавека — свойскіх жывёл. Калі ахвяра зайшла ў пушчу — яе пагібель непазбежная. Пушчавік здольны забіць ахвяру адным сваім выглядам. Калі дасягнута мэта, ён не рагоча, як Лясун, не здзекуецца з ахвяры, а спакойна ідзе далей, нібы зрабіў звычайную справу, выканаў свой абавязак.

Пушчавікі жывуць на абмежаванай, цеснай тэрыторыі — некрануты лес ці лес незвычайнай вышыні — пушча-дрымушча. На шчасце чалавека, Пушчавікі даволі рэдкія, і сустракаецца нямала пушчаў, дзе гаспадарацъ адны толькі Лесуны. Пушчавік непаваротлівы, лядашчы, кепска бачыць, што робіцца ў яго пад нагамі. Усё гэга дапамагае чалавеку ўцякаць ад Пушчавіка. Пры непазбежнай сустрэчы з ім трэба рабіць крутыя павароты туды і сюды, ды паспешліва пакідаць тэрыторыю пушчы, далей якой Пушчавік не адважыцца ступіць сваім старэчым крокам.

*Никифор.-2, 72–73.*

**Ягіня**

ЯГІНЯ (Баба Яга) — злая чараўніца, Гаспадыня ўсіх ведзьмаў. Яна страшная, чорная, старая, з доўгімі кудлатымі валасамі і доўгім носам, замест ног у яе жалезныя таўкачы. У роце шмат гнілых зубоў, а адзін моцна даўся ўбок, таму ў яе яшчэ і морда крывая, але яна лічыць сябе прыгажуняй. У яе вялікі горб на спіне. Як ідзе яна лесам, то лес ломіць і дарогу сабе цярэбіць тымі таўкачамі.

Яна апранае заўсёды падраную чорную сукню, валасы яе ў каўтунах, таму хусткі яна не здымае ніколі. У Бабы Ягі дзве рукі, як і ў людзей, але ж яны доўгія і кастлявыя. Бабу Ягу называюць яшчэ Баба Яга-Касцяная Нага. За тое, што яна такая схуднелая, чорная, раскудлачаная, як лахудра.

Жыве ў лясным гаспадарстве. Днём яна баіцца вылазіць у белы свет, сядзіць увесь час у лесе, гатуе там сабе розную атруту і варожыць. Усе яе баяцца.

Ягіня робіць уночы розныя паскудствы. Нават можа з хлява ўсю скаціну выгнаць, каб яна ўцякла і не прыйшла потым назад. Яна многа і іншай бяды са скацінай робіць.

Лётае Ягіня па свеце ў жалезнай ступе і паганяе вогненным дзеркачом. Яна гоніць вятры і хмары вогненнай мятлой. Яна і на Лысую гару лётае ў жалезнай ступе.

Калі яна ляціць, земля енчыць, вятры свішчуць, звяры выюць, хатняя жывёла хаваецца ў хлявы. Духі, якія нясуць па паветры яе ступу, жахліва і моцна равуць, што яшчэ не бачна ні Ягіні, ні яе ступы, але людзі разумеюць, што нешта нядобрае ляціць над зямлёю.

Ягіня і падначаленыя ёй Духі харчуюцца душамі людзей, таму і робяцца паветранымі, лёгкімі, як душы. Беларусы лічаць, што Баба Яга з'яўляецца тады, калі ў яе няма чалавечага мяса, якім яна сілкуецца. Прыняўшы вобраз старой, яна прыходзіць у хату якога-небудзь селяніна і, скарыстаўшы свае дэманічныя хітрыкі, крадзе дзіцяў.

*Разамара* — Нядобры Дух, адзін з тых, якія носяць па паветры агністую ступу Бабы Ягі і карыстаюцца яе вялікай літасцю. Разамара жыве ў аблоках у выглядзе нейкай шасцікрылай жывёліны. У выпадку ж патрэбы з'явіцца на зямлю з Ягою або нават самому, Разамара прымае выгляд маладога чалавека, калматага з галавы да ног, з шасцю крыламі, агністага. У такім выглядзе ён з'яўляецца ў глухую поўнач і асабліва падчас бур, навальніцы і праліўнога дажджу і выкрадае дзяцей.

*Шатывіла* таксама службовы Дух Бабы Ягі. Сказанае аб Разамары адносіцца і да Шатывілы. Шатывіла выконвае асаблівыя даручэнні Ягіні: ён — пасрэднік у зносінах паміж Ягою і Паляндрай. Таму ён увесь час у руху і пералётах.

Шатывіла вядомы ў Беларусі ў такой жа ступені, як і Разамара.

*Древлянский, № 17.*
*Шпилевский-4, №№ 50, 51.*
*Fed.-1, s. 80.*
*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 04/04.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 135/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 98/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС — 29/06.*

## Дабрахочы

ДАБРАХОЧЫ — лясны Бог. Рост яго залежыць ад вышыні дрэў, вакол якіх ён ходзіць, таму яго бачаць заўсёды роўным з дрэвам, пры якім ён стаіць. Гэта не Нядобры Дух, як Русалкі, а хутчэй справядлівы суддзя. Ён — апякун людзей прыстойных, але сурова карае непачцівых да яго. Кара яго распаўсюджваецца толькі на саму асобу вінаватага і не датычыцца яго скарбу. Дабрахочы пасылае цяжкія хваробы на вінаватага, які памірае ў пакутах, калі не папросіць паратунку ў шчасліўцаў, што ўмеюць задобрыць гэтага Бога ахвярамі. Уся ахвяра складаецца з акрайца хлеба і шчопця солі, загорнутых у чысты шматок. Гэты шчаслівы ідзе ў лес

з пакутнікам і, памаліўшыся над кавалкам хлеба і шчопцем солі, пакідае ўсё гэта ў лесе разам з хваробаю, бо хворы вяртаецца ўжо здаровым.

Аднак ёсць у Дабрахочага адна загана. Калі хто-небудзь першым ступіць у яго след, адразу ж заблукае ў лесе і ледзьве вечарам можа вярнуцца дадому.

Калі беларус на некалькі дзён прападзе, то, вярнуўшыся, запэўнівае ўсіх, што Дабрахочы трымаў яго ў лесе, і расказвае ўсялякія дзіўныя гісторыі.

*Czarnowska, s. 407—408.*

**Гаёвы Дзед**

ГАЁВЫ ДЗЕД, альбо Гаюн, — лясны Дух. Ён клапоціцца пра свой лес, сочыць за парадкам у ім. Усе звяры і птушкі падпарадкоўваюцца і служаць яму.

Гаюн — стары дзед, парослы замест валасоў сівым мохам. У астатнім ён чыста мядзведзь, толькі ходзіць прама. Ёсць у лесе такія мясціны, да якіх Гаюн ставіцца з асаблівай пяшчотай, пільна ахоўваючы, каб ніхто не парушыў іх некранутага хараства. Калі раптам хто паспрабуе нарыхтаваць там драўніны, Гаюн паўстане перад дрывасекам у сапраўдным сваім выглядзе. Вядома, пасля такога здарэння доўгі час туды не ступіць нага чалавека. Але здараюцца выпадкі сапраўды трагічныя — тады, калі Гаюн, не паспеўшы папярэдне спудзіць чалавека, у гневе завальвае таго дрэвам.

Дрэва на будоўлю хаты не нарыхтоўвалі без дазводу Гаёвага Дзеда. Калі ж атрымаць такі дазвол і зрубіць хату, то яна будзе трывалая і даўгавечная. Дзеля гэтага гаспадар увечар ішоў у выбранае ім загадзя месца з гасцінцамі і прамаўляў: «Прынёс снеданне Гаёваму Дзеду. Ці сам з’ясі, ці ўнучкам дасі». Гаёвы Дзед дае згоду, прыняўшы гасцінец. Не знайсці пачастунку раніцай наступнага дня азначала, што месца гэтае выбрана правільна. А калі пачастунак так і заставаўся ляжаць, то трэба было шукаць іншае месца. Бывала і такое, што драўніну ўсё ж такі забіралі без ведама Гаюна і пачыналі рабіць зруб. Гаюн, згледзеўшы непарадкі, пасылаў у такі зруб зайца, папярэджваючы тым самым, што хата гэтая доўга не прастаіць.

У Гаюна ёсць унучкі — гаёўкі.

*Беларус. міфалог., с. 61–62.*

**Гаёўкі**

ГЭТА маладыя гарэзлівыя дзяўчаты-духі. Яны жывуць у бярэзніку, асінніку, у той частцы лесу, куды трапляюць прамяні сонца. Гаёўкі любяць усё

жывое. І лось, і маленькая птушачка, калі захварэюць ці параняцца, звяртаюцца да гаёвак па дапамогу, бо ведаюць: тыя залечаць ім раны, адходзяць іх.

Гаёўкі падобныя на звычайных маладых дзяўчат.

На зіму гаёўка пакрываецца густой поўсцю снежна-белага колеру, чыстым застаецца толькі прыгожы твар ды косы, як і былі, русымі. Па вясне поўсць спадае, і гаёўка становіцца звычайнай дзяўчынай, толькі, бадай, прыгажэйшай.

Летам яны апрануты ў лёгкія зялёныя сукенкі. Гаёўкі любяць жыць у бярэзніках, багатых лісцем. Ім вельмі добра там хавацца. Гаёўкі любяць гуляць з веткамі дрэў. Калі вы чуеце, як шумяць асіны ці бярозы, ведайце, што гэта гаёўкі забаўляюцца.

Злавіць і прыручыць гаёўку немагчыма. У час небяспекі яны могуць рабіцца нябачнымі.

Гаёвы Дзед не дазваляе ўнучкам выходзіць за межы лесу. Але што неразумным дзяўчатам тыя забароны старога дзеда! І як толькі ў бліжэйшай вёсцы надарыцца гулянне, яны паціху ад Гаюна выбіраюцца туды. Там, затаіўшыся, падглядаюць, як гуляе і весяліцца моладзь, якія строі і ўпрыгожанні на вясковых дзяўчатах. А ўжо як спадабаецца ім на каторай дзяўчыне сукенка ці яшчэ што, цікуюць тады, каб тая куды адасобілася, і здымаюць з яе тое, што спадабалася. Бывала нават, адпускалі дзяўчыну ў адным споднім альбо і зусім без нічога.

Гаёўкі няблага ставяцца да людзей. Яны дапамагаюць чалавеку, які заблудзіўся, выйсці з лесу.

У Купальскую ноч гаёўкі таксама выходзяць з лесу паглядзець на вогнішча, якое распальваюць людзі, падурэць у росным жыце, сабраць зёлак. Апоўначы яны ідуць назад у лес, каб паспець палюбавацца цвіценнем папараць-кветкі. Гаёўкам вядома, дзе і калі расцвіце цуда-кветка. Таму, калі раптам якому чалавеку пашанцуе высачыць гаёвак і не прыкмечаным імі пайсці следам, то яны прывядуць яго да жаданай кветкі шчасця.

*Беларус. міфалог., с. 62–63.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 30/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 87/06.*

## Зазоўка

НЕДАЛЁКА ад вёскі Губы на Вілейшчыне ў лесе жыў жаночы Дух — Зазоўка. Яна мела выгляд невыказна прыгожай дзяўчыны з доўгімі русымі валасамі, такімі доўгімі і густымі, што ёй непатрэбна было нават адзенне. Жыла Зазоўка ў лесе немаведама з якіх даўніх часоў, бо шмат маладых мужчын і хлопцаў паддаліся на яе чары.

Калі Зазоўка паказвалася якому мужчыну, то ён, як заварожаны, ішоў за ёю. А яна то паказвалася, то зноў знікала. Пералівіста смяялася, клікала яго па імені прыгожым мілагучным голасам. Заманьвала глыбей у лес прывабнымі рухамі свайго стройнага цела, адхіляючы час ад часу валасы з самых патаемных на ім мясцін. І так зазывала датуль, пакуль не заводзіла глыбока ў лес. Там, як сцвярджаюць старыя людзі, яна любіла і лашчыла свайго абранніка так, як не магла любіць ніводная жанчына.

Рэдкія мужчыны вярталіся дадому ад Зазоўкі. Некаторыя гінулі ад яе прагнага кахання, а які ўсё ж вяртаўся да сваёй жонкі ці каханкі, праз некаторы час сыходзіў назад у лес, каб ужо ніколі адтуль не вярнуцца. Часта такіх мужчын знаходзілі павешанымі дзе-небудзь у лесе. Не кожнага мужчыну прымала Зазоўка двойчы, і тады яны, не бачачы выйсця, самі губілі свае жыцці.

Зазоўка вельмі хораша спявала. Голас у яе быў незвычайна чысты і меладычны, а песні нейкія адмысловыя. Таму яна магла заманіць да сябе, нават не паказваючы сваёй вабнасці. Чалавек, заслухаўшыся, ішоў на яе спеў, а Зазоўка заводзіла яго ўсё глыбей і глыбей у лес.

На зіму Зазоўка некуды знікала. Некаторыя гаварылі, што яна ўпадала ў зімовую спячку. Іншыя сцвярджалі, што абарочвалася лябёдкаю і разам з сапраўднымі лебедзямі ляцела ў Вырай. А хто дык казаў, што яна на маразы пераходзіць у Той Свет.

*Беларус. міфалог., с. 66–67.*

**Лоймы**

ЛОЙМЫ — лясныя Духі ў жаночым абліччы. Яны пужаюць жанчын, хоць часам і да мужчын прывязваюцца. Праўда, з'яўляюцца яны толькі тым мужчынам, што ў лясных нетрах вугаль выпальваюць, асабліва маладым, ладным і дужым. Даволі такому стомленаму пры вырубе дрэва і ладкаванні яго ў капец для выпальвання прылегчы дзе-небудзь на мяккім моху, як зараз жа з лясной гушчэчы прыходзіла гэтая незвычайнай красы і прывабы дзяўчына. Ахінала юнака вэлюмам сваіх шаўкавістых валасоў, абсыпала гарачымі пацалункамі, песціла пруткімі, бы лясныя яблычкі, грудзьмі і, распаліўшы мужчыну да кахання, выслізгвала з абдымкаў і знікала ў чашчобе.

Лоймы могуць выкрадаць у жанчын дзяцей, падкідаць на іх месца сваіх няўклюдаў. Калі ў сям'і адбылася такая падмена, то трэба ўзяць дубцоў, палажыць дзіця Лоймы на захад сонца на парозе і біць, пакуль Лойма не прыйдзе па яго і не верне чалавечага. Кажуць, што Лойма, вяртаючы чалавечае дзіця, крыўдуе: «Я тваё так пелянала, а ты маё б'еш».

## Апраметная — Той Свет

**Падземнае гаспадарства**

У ПАДЗЕМНЫМ гаспадарстве ёсць рэкі, азёры і так шмат вады, што каб яна выступіла на зямлю, то быў бы патоп, які затапіў бы ўвесь Свет.

У Падземным гаспадарстве таксама жывуць людзі, толькі яны малыя, нядужыя, бо ў іх там не свеціць сонейка.

Пад зямлёю існуе вялікая колькасць лёхаў, якія злучаюць паміж сабою азёры, рэкі, крыніцы Гэтага Свету. З бяздонных крыніц падземныя лёхі вядуць да бяздонных віроў вялікіх рэк, да дзікіх азёр і да гэткіх самых бяздонных крыніц-вокнаў на паплавах. Таму ў невялікія, але глыбокія ямы, якія сустракаюцца на лузе, беларусы баяцца кідаць што-небудзь ці мераць іх глыбіню, каб не дражніць Духаў падземнага гаспадарства ці Наўя.

*Сержп.-1, №№ 230, 231.*

**Падземныя Выраі**

ПАДЗЕМНЫЯ ВЫРАІ — месцы, куды на зіму ідуць паўзуны — змеі, вужы, гадзюкі. Ёсць Вырай змяіны, ёсць гадзючы, ёсць вужыны. Гэта вялікія схованкі пад зямлёй, дарогу да якіх ведаюць толькі гаспадары змей, вужоў, гадзюк, і толькі яны вядуць туды сваіх падданых на зіму. Калі на Узвіжанне чалавек пойдзе ў лес, ён можа праваліцца ў Падземны Вырай.

*Добровол.-1, с. 94—96.*

**Наўе**

НАЎЕ — месца ў Падземным гаспадарстве, дзе пануюць смяротныя для чалавека Багі і Духі. Яны нясуць людзям хваробы, забіваюць іх і імкнуцца скрасці душы памерлых з мэтаю прыпыніць вечнае жыццё чалавека.

**Падводнае гаспадарства**

ВОДНАЯ паверхня рэк і азёраў — мяжа паміж Гэтым і Тым Светам. Беларус добра гэта ўсведамляе, таму кажа, што калі ён плыве ў чоўне, то на смерць паглядае. Перад першым купаннем беларус кідае ў ваду кавалачак верхняй скарынкі хлеба, каб не ўтапіцца. Калі скарынка

патанула раней, чым выкупаўся чалавек, ці калі яе праглынула рыба, то лепш у тое лета не купацца.

*Сержп.-1, №№ 230, 231.*
*ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС – 27/03.*

## Багі і Духі Падземнага гаспадарства

**Чарнабог**

НЕДЗЕ глыбока пад Зямлёю жыве валадар усяго Таго Свету — Чарнабог. Беларусы ўяўляюць яго так: стары, апрануты ва ўсё чорнае і з доўгай чорнай барадой. Шматлікія Багі і Духі холаду, цемры, хвароб і смерці падначалены Чарнабогу.

Калісьці Чарнабог разам са сваім братам Белбогам стварыў Сусвет, Зямлю, расліны, жывёл. Але, пасварыўшыся з Белбогам, Чарнабог пачаў варагаваць і супрацьстаяць яму ў Сусвеце, змагацца за Гэты Свет і чалавека.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 105/06.*

**Вялес**

БОГ Падземнага гаспадарства Вялес — апякун багацця і хатняй жывёлы. Вялес — вартаўнік Наўя, ён пераносіць душы памерлых у нябыт. Гэта магутны дзяцюк з доўгімі валасамі і барадой. І вопратку ён носіць незвычайна: кажух апранае навыварат. На зямлі ён з’яўляецца ў выглядзе мядзведзя.

Аберагаючы хатнюю жывёлу, Вялес можа перакідвацца ў карову ці быка. На першым выгане кароў не трэба на іх крычаць ці моцна біць пугаю, бо можна зняважыць Вялеса, які перакінуўся ў карову ці быка і ідзе разам са статкам.

Калі гаспадар ці гаспадыня вялі карову з паствы і лупцавалі па ёй дубцом, то вечарам у час дойкі Вялес перакідваўся ў карову і мог перавярнуць падойнік з малаком ці моцна лупцануць хвастом гаспадыню. І таму, каб залагодзіць Вялеса, гаспадыня несла з сабой кусок хлеба і аддавала карове перад тым, як яе даіць.

Вялеса асабліва шанавалі простыя людзі, таму што ён заступаўся за бедных. Асабліва шанавалі яго на Масленіцу. Бліны пяклі круглыя і пышныя, каб кароўкі былі гладкія і абявязкова елі тыя бліны з кароўскім маслам. Калі

карова хварэла, то па дапамогу звярталіся да Вялеса. А каб ён бярог кароўку, на шыю ёй вешалі чырвоную стужку, падразалі кончык хваста і гэтыя валасы ад хваста затыкалі над парогам у хляве.

Вялес бласлаўляе вандроўнікаў і дапамагае ім у дарозе. Ён надзяляе людзей талентам, высокім ростам, добрым голасам, тонкім слыхам. Вялес парадніў чалавека з жывёламі, навучыў выкарыстоўваць іх у гаспадарцы, навучыў людзей рамяству і лекарскай справе. Земляробы, шануючы Вялеса, заўсёды пакідаюць яму ў падарунак у полі «бараду» — кавалак нязрэзаных каласоў. Ён — апякун вешчуноў і спевакоў.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 99/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 57/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 115/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 109/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 105/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 111/06.*

## Жыжаль

ЖЫЖАЛЬ — Бог агню, апякун рамяства, найперш кавальскага. Таму яго лічаць Богам, які дапамагае кавалям. Ён жыве пад зямлёй. Толькі Жыжаль распараджаецца падземным агнём. Замест языка ў яго агонь, а ў руках маланкі. Сам увесь рыжы, апрануты ў чырвоную світу. Бывае, Жыжаль плюецца полымем.

Жыжаля і Богі, і людзі паважалі за мужнасць. Толькі ён мог паспрачацца з Перуном. Для сваіх боек з Перуном ён у вогненнай кузні пад зямлёй куе зброю.

Калі Жыжаль доўга працаваў у кузні, перагравалася зямля і пачыналася засуха, гарэлі тарфяныя балоты, лясы. Калі выходзіў з-пад зямлі, Пярун у гневе кідаў у Жыжаля вогненыя стрэлы-маланкі. Ад боек Жыжаля з Перуном і людзям перападае. Калі маланка пападае не ў Жыжаля, а ў зямлю, то пачынаюцца пажары, ад чаго выпальваюцца сенакосы, сушацца агароды, палі робяцца бясплоднымі. Тады і людзі пакутуюць.

Калі Жыжаль у добрым настроі, ён ходзіць у сябе пад зямлёй пацíху, і на зямлі цёпла, ён абагравае яе. А калі Жыжаль раз’юшаны, ён пачынае хуткахутка хадзіць, і тады ён не грэе, а паліць зямлю. Згараюць палі, лясы, балоты, лугі.

Быў такі выпадак. Адным летам, калі было спякотнае надвор’е, гулялі на полі дзеці. Яны мялі жыта, строілі ў ім сабе домікі. Да вечара яны настроілі шмат такіх домікаў па ўсім полі. Увечары стала холадна, і дзеці вырашылі ў сваіх доміках запаліць агонь, каб сагрэцца. На полі пачалі з’яўляцца аганькі. Узлаваўся Жыжаль, што дзеці яго агнём раскідаюцца, і злучыў усе аганькі на

полі. Гаварылі, што Жыжаль не любіць, калі агонь ноччу паляць, таму часта і лясныя пажары бываюць.

Людзі пакланяліся яму перад тым, як ісці распрацоўваць, раскарчоўваць, зямлю, спальваць карэнне ды і шчэпкі. А замольвалі яго, каб не рабіў буйны пажар, каб увесь лес не пайшоў гарэць. Жыжаль — добры Бог. Ён усіх адорыць: жанчын — сярпамі, мужыкоў — лямяхамі, дзетак цяплом сагрэе.

*Кацар, с. 122.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 104/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 117/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС – 121/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС – 74/05.*

## Ох

БАЖОК Ох — маленькі барадаты дзядок, які жыве недзе пад зямлёю. Ох літасцівы і заўсёды шкадуе людзей. Калі чалавек, бядуючы, уздыхае і кажа: «Ох! Ох!» — Бог выходзіць з-пад зямлі і пытае: «Чаго патрабуеш?» Калі чалавек не спалохаецца і скажа Оху, чаго хоча, то ён яму тое дасць.

А калі спалохаешся, то ён цябе пакарае за тое, што турбуеш яго без патрэбы. Тых, хто палохаўся і кідаўся ўцякаць, больш ніхто ніколі не бачыў.

*Fed.-1, s. 236.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС – 121/05.*

## Кладнік

ГАСПАДАРАМІ над схаванымі ў зямлі скарбамі з’яўляюцца Кладнікі. Яны выглядаюць як худыя сталыя мужчыны. Апранаюцца Кладнікі ў срэбраныя світкі, абуваюцца ў гэткія ж лапці, зрэдку — у боты з залатымі насамі. Канічныя шапкі Кладнікаў зробленыя з літага золата, паясы — залатыя ланцугі з вялізным замком. Дарожныя кіі — з чыстага срэбра з залатымі булдавешкамі і наканечнікамі.

Хата і ўсё хатняе начынне Кладнікаў блішчыць золатам, срэбрам, каштоўнымі камянямі. Каштоўныя камяні выкарыстоўваюць яны для асвятлення дома і ў дарозе.

Пры сваіх незлічоных багаццях Кладнікі — беднякі, таму што са свайго велізарнага дабра яны не выкарыстоўваюць на харчовыя патрэбы нічога. Ідзе Кладнік, заліты золатам ды срэбрам, — і ад знямогі ледзьве перастаўляе ногі. У срэбнай кайстры яго валяецца хлебная скарынка, недаедзеная некім ці

ўкрадзеная, ці выпрашаная як міласціна, паколькі Кладнікі не грэбуюць самымі бессаромнымі сродкамі здабычы харчавання.

Незвычайная сквапнасць спалучаецца ў Кладнікаў са злосцю не толькі на людзей, але і на сваіх братоў. З людзьмі яны не ўступаюць ні ў якія здзелкі, а ў братах-Кладніках бачаць пасягальнікаў на дабро, якое ахоўваюць. Кладнікі павінны нарошчваць дабро за кошт ахвяры, а яшчэ лепш — пагібелі душы гэтай ахвяры. Яны загубілі шмат людзей, таму што тыя звычайна самі навыперадкі ідуць да іх. Так будзе і надалей, пакуль людзі не перастануць цягнуцца да скарбаў, як матылі да агню.

Кладнікі сочаць за ўладальнікам дабра, які жадае схаваць яго ў зямлю. Як толькі той прыкрые скарб першым слоем зямлі, Кладнік падхоплівае скарб і нясе яго ў глыбіню. Пасля гэтага чалавек, што паклаў скарб, ужо не гаспадар схаванага дабра. Ён можа зноў убачыць свой скарб толькі тады, калі захоча нешта дакласці.

Раз-пораз Кладнік падымае на паверхню зямлі то адзін, то другі скарб для праветрывання. Гэты момант самы зручны для захопу клада без страты для таго, хто яго знайшоў, толькі б на гэтую пару каля клада не было яго страшнага гаспадара. Але гэта здараецца вельмі рэдка і ўдаецца толькі нязначнай колькасці шчаслівцаў.

*Никифор.-2, с. 73—75.*

### Зюзя

ЗІМОЙ на зямлі Беларусі пануе Зюзя — Бог зімы. Гэта лысы стары, але з доўгай белай барадой, у белым кажусе, які ўвесь час ходзіць босы і з непакрытай галавой. Зюзя заўсёды носіць з сабой жалезную булаву. Памагатыя Зюзі — Завіруха, Завея, Мяцеліца, Сцюжа і Мароз.

Большую частку зімы Зюзя праводзіць у лесе. Часам ён заходзіць да людзей у вёскі. Прычыны для гэтага розныя: папярэдзіць сялян, што будзе жорсткая, суровая зіма; дапамагчы нечым беднай сялянскай сям'і, а то проста дзеля таго, каб паесці куцці, якую яму накладваюць у міску і пакідаюць нанач. Беларусы гавораць пра Зюзю з асаблівай павагай: «Зюзя на дварэ — куцця на стале». Каб задобрыць Зюзю, беларусы напярэдадні Новага года, гатуючы, як звычайна, куццю, адкладваюць частку яе ў асобную талерку ці міску і пакідаюць на ноч на асобным стале, каб ён пачаставаўся.

Але бывала і такое, што ён паказваў людзям, які ён суровы. Людзі, каб задобрыць яго, пералічвалі ўсіх лысых дзядоў у вёсцы, тады лічылася, што і мароз памякчэе.

Раззлаваўшыся на людзей, Зюзя звычайна стукае сваёй булавой у які-небудзь пень. Ад гэтага магутнага ўдару трасецца Зямля, а часам і дамы трэскаюцца. Калі некаму з людзей здаралася быць у лесе ў гэты час і запытаць: «Хто гэта там стукае?», то ён чуў у адказ: «Сам Зюзя стукае, людзей ушчувае». А калі ў лесе трашчалі дрэвы, то казалі, што гэта Зюзя сваёй булавой па іх б’е.

Калі ідзе снег, гэта значыць, Бог загадаў свайму памагатаму Марозу паслаць пярыну на полі, каб жыта не памерзла. Сцеле Мароз і дарожку, каб людзям добра было вазіць сена з балота. Калі б Бог не даваў снегу, то на Зямлі вымерзлі б усе расліны, ды і сама Зямля так прамерзла бы, што не растала б і за лета.

Калі да Зюзі падыходзіць па-добраму, то ён можа і дапамагчы чым-небудзь: снегу на поле болей насыпаць, дасць і ў лесе парабіць — дроў насекчы.

Дарослыя гаварылі дзецям, каб тыя надзявалі шапкі, калі бягуць на вуліцу, бо раззлуюць Зюзю, і тады можа здарыцца бяда. Пра гэта ёсць легенда. Зюзя не любіць, калі ходзяць без шапкі. У адзін зімовы вечар хлопец з дзяўчынай гулялі, а дзяўчына была з неапранутай галавой. Пачалася завея — Зюзя пачаў сердаваць. Хлопец з дзяўчынай забеглі ў хату. Зюзя пачаў сваёй булавой біць у пень так моцна, што дамы пачалі трашчаць. Людзі пыталіся: «Хто там», бо думалі, што ў дзверы ломяцца.

Людзі вельмі баяліся зімой выходзіць куды-небудзь у лес ці поле. Казалі, калі пойдзеш у лес па дровы, то Зюзя замарозіць. Таму людзі былі насцярожаныя і шанавалі гэтага Бога. А каб задобрыць, у гонар яго рабілі свята. На Зюзіна свята гатавалі шмат страў. Калі на раніцу свяціла сонца, блішчэў і іскрыўся снег, гэта азначала, што Бог лагодны і добры. Калі ж раніца пачыналася з мяцеліцы, то гэта нічога добрага не прадвяшчала.

Нават дзеці ведалі, хто такі Зюзя. І калі выходзілі на двор, то прасілі: «Зюзя, Зюзя, не марозь, дай нам пагуляць».

*Древлянский, № 25.*
*Сержп.-1, № 98.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 119/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 51/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС – 163/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС – 192/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС – 121/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 87/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 52/06.*

## Мароз

ГАЛОЎНЫ памагаты Зюзі — Мароз.

Мароз з’яўляецца на зямлю тады, калі сонейка адыходзіць далёка ад яе. Гэты Дух выглядае як стары, сівы, велізарны дзед. Ён увесь белы, бо апрануты ў снег, лёд ды іней. Толькі губы ды нос у яго чырвоныя. Замест вусоў і барады ўніз спускаюцца ледзяшы аж да долу.

У Мароза ёсць любімая сястра — Завіруха, белая дзеўка, якая дапамагае марозіць зямлю, намятае сумёты, замятае дарогі так, каб блукалі людзі, якія едуць па сваіх справах некуды.

Мароз вельмі любіць дужацца з сонцам, але не можа яго пабароць. Сонейка шуткуе з Марозам, а ён злуе і кліча сабе на дапамогу Вецер. Калі Мароз у хаўрусе з паўночным ці ўсходнім ветрам, то ён доўга пратрымаецца, а калі гэтыя вятры не схочуць памагаць Марозу, то ён хутка здасца.

Зюзя пасылае Мароз на карысць людзям, каб ён усюды паслаў маеты цераз рэкі, азёры, балоты або якую-небудзь тхлань ці нетру. Людзі дзякуюць Богу, як ён дае «здаравенныя» маразы, бо тады добрая дарога і здаровае паветра.

Пра моцны мароз беларусы кажуць: «Мароз сёння пякун: стары нясецца, ажно барада трасецца». Калі Мароз ляціць па паветры, то з яго сыплецца пыл. Гэта — іней. Як Мароз дыхне холадам, то адразу замярзае тая пара, якой дыхае зямля. І так утвараецца іней. Людзі не ведаюць, навошта іней, а ён, мабыць, патрэбен, бо так сабе нічога не бывае на свеце, а кожная рэч мае сваё прызначэнне.

Начное стуканне і трэск у кутках хаты — жарты Мароза, які мае звычай садзіцца адпачываць на хаце. Вось ад гэтага і трашчаць бярвёны. Нават тоўсты лёд і то стогне, калі па ім ідзе Мароз. Менавіта таму, каб задобрыць гэтага страшнага дзеда, беларусы запрашаюць яго на калядную вячэру паесці куцці. Гаспадар адчыняе акно і, высунуўшыся з яго, кліча: «Мароз! Мароз! Ідзі куццю есці. Летам не бывай, па межах не хадзі, яравых не губі, пад калодаю ляжы, а то будзем жалезным кнутом секчы».

Адзін гаспадар па звычаю запрасіў да сябе Мароза паесці куцці. Мароз яму ў адказ: «Я ўжо куцці паеў ды на каня сеў. Ідзі толькі патрымай жарабятка». Гаспадар не звярнуў увагі на гэтыя словы і пасля вячэры спакойна лёг спаць. На другі дзень пайшоў паглядзець сваю жывёлу і бачыць, што яго конь некуды знік. Тут ён успомніў учарашнюю размову і здагадаўся, у чым справа. Пасля такога здарэння не ўсе гаспадары запрашаюць Мароза да сябе на вячэру.

Як наступае час вясны, на дапамогу Марозу і Зіме з’яўляюцца Пужайла і Пужаніца. Яны ўзыходзяць на ўзгоркі, клічуць Мароза, Завіруху-сястрыцу словамі: «Го-о, Мароз, го-о, Завіруха!» ды палохаюць людзей.

Вясну можна прытрымаць, але нельга спыніць: час панавання Зюзі, Мароза, Завірухі і Зімы скончыўся.

З надыходам лета Мароз хаваецца пад калодаю. Калі ён з’яўляецца позняй вясной ці ранняй восенню, а тым больш летам, гэта азначае, што Мароза паслалі па загаду Чарнабога.

*Добровол. Словарь, с. 400, 678.*
*Сержп.-1, №№ 106, 122, 124, 125, 126—127.*
*Крачков., с. 164.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 59/06.*

## Духі Падводнага гаспадарства

### Гаспадар рыб

ЯК І ІНШЫЯ жывёлы, рыбы маюць свайго Гаспадара, які кіруе і распараджаецца імі. Кожная рака, вялікае возера маюць свайго Гаспадара. Слухаючыся яго загаду, рыба пераплывае вялікімі чародамі з аднаго возера ў другое, з адной ракі ў другую. У выніку адны месцы пусцеюць, а другія перапаўняюцца рыбай. Гэта Гаспадар пераганяе рыбу.

Аднойчы ў вёсцы, недалёка ад берага Дзвіны, святкавалі нейкае свята. Усе былі вясёлыя, спявалі і скакалі. Сярод вяскоўцаў быў рыбак-чараўнік, які ўбачыў, што разам з усімі скача нейкі вясёлы дзяцюк з рыбіным хвастом. Але хвост бачыць толькі ён, чараўнік, іншыя не бачаць. Рыбак сцяміў, што гэта Гаспадар рыб. Пайшоў і папярэдзіў сваіх сяброў-рыбакоў. Тыя хуценька пайшлі да Дзвіны і пачалі лавіць рыбу. Да раніцы нацягалі яе цэлыя горы. Калі ж згасла зарніца, вярнуўся Гаспадар рыб да сябе ў Дзвіну і ўбачыў, колькі без яго загінула яго падданых. З вялікага жалю цэлы тыдзень ён так плакаў, што ўся Дзвіна жаласна хвалявалася і стагнала. З таго часу Гаспадара рыб ужо ніколі не бачылі сярод людзей.

Уладарыў Гаспадар рыб і ў Стронскім возеры. Аднойчы рыбакі ў гэтым возеры за дзень-ноч, прыклаўшы вялікія намаганні, злавілі толькі аднаго маленькага ёршыка. З роспачы і злосці кінулі яго на вогнішча каля берага. Раптоўна з возера пачуўся голас, які чулі і рыбакі:

— Усе дома?!

Нейкі рыбак тоненькім галаском са здзекам гукнуў:

— Няма толькі дохлага ёршыка!

Ёршык скочыў з вуголля — і ў возера. Рыбакі толькі рукамі развялі на гэтае дзіва.

*Никифор.-2, с. 196.*
*ЛіП, с. 83.*

## Жэўжык

ЖЭЎЖЫК — вадзяны Бог, ахоўнік рэк. Беларусы ўяўляюць яго дзядком худым, невялікага росту, з рудой барадой, доўгай шыяй, маленькай галавой, з доўгімі, але маленькімі ручкамі з доўгімі пальцамі і тонкімі нагамі. Але пры ўсім гэтым Жэўжык незвычайна моцны і рухавы. Ён жыве заўсёды ў вадзе, у самай глыбіні — у віры — і незвычайна спрытна плавае пад вадой і па паверхні, разганяючы наперадзе сябе хвалі жутлом — велізарным кіем з двума зубцамі на канцы.

Пад вадой Жэўжык плавае днём, назіраючы за яе плынню; а ўначы — па паверхні вады, але яго ніхто не можа бачыць, таму што ён плавае ў чоўне-невідзімцы, і да таго ж закрываецца жутлом ад вачэй людскіх.

Калі Жэўжык бачыць нейкую небяспеку, якая мае быць з чалавекам, напрыклад, калі ўбачыць тапельца, альбо човен, які тоне, то ён адным узмахам свайго жутла ратуе іх. Жэўжык утаймоўвае буры і вятры. Жэўжыку падпарадкаваныя ўсе вадзяныя духі, у тым ліку Вадзянік і Лазавік.

*Шпилевский-4, № 39.*

## Вадзянік

ГАЛОЎНЫМ Духам Падводнага гаспадарства з’яўляецца Вадзянік. У кожным вадаёме: возеры, ставе, рацэ, лужыне, якая не высыхае, калодзежы — існуе гэты водны Дух.

Але больш за ўсё Вадзянік любіць жыць у «жывой» вадзе, той, якая толькі што прабілася з-пад зямлі. Кожны вір мае свайго Вадзяніка. Жывуць яны і ў бяздонных крыніцах, у глыбіні рэк і азёр. Там, дзе жыве Вадзянік, зімою застаецца незамерзлае месца: тут лёд растае ад яго дыхання. На азёрах любяць Вадзянікі глыбокія і «закалoжаныя» месцы. Каля такіх мясцін людзі плаваюць з вялікім страхам, асабліва ўночы, — як на зямлі са страхам праходзяць паўз балоты.

Сярод Вадзянікоў бываюць Вірнікі і Ціхоні: першыя жывуць у рухомай вадзе, а другія — у стаячай: у азёрах і ставах. Але адзін і той жа Вадзянік можа жыць як у бягучай, так і ў стаячай вадзе, абы вадаёмы злучаліся адзін з адным.

Па знешнім выглядзе Вадзянік — глыбокі стары. Ён сярэдняга росту, з доўгай лапацістай барадою, з такімі ж доўгімі валасамі на галаве ў форме кліна. У яго гладкая бліскучая скура, азызлы твар, вялізнае пуза і тонкія доўгія ногі з перапонкамі між пальцамі. Акрамя таго, усё цела Вадзяніка накрыта доўгімі валасамі, якія пры бліжэйшым разглядзе аказваюцца ці

тонкімі струменьчыкамі вады, ці нечым накшталт водарасцяў, што прыліплі да яго скуры. Вадзянік здольны ператварыцца ў любую рыбіну.

Днём Вадзянік звычайна ляжыць на дне і пачынае сваю дзейнасць толькі пасля захаду сонца. Але за тыдзень перад Перуновым днём Вадзянікі дзейнічаюць і ўдзень. У гэты час яны асабліва небяспечныя. Нярэдка апоўдні Вадзянік выскоквае з вады да пояса і крычыць: «Рот ёсць, ды няма каго есці!» Так ён патрабуе чалавечай ахвяры.

Тапельцы не па сваёй волі — ахвяры драпежнасці Вадзяніка. Ратаваць тапельца — гэта значыць адбіраць у яго здабычу. У Беларусі шмат мясцін, дзе былі некалі азёры, і ў іх жылі вельмі прагныя Вадзянікі. Яны даволі часта цягалі людзей у вір. Тады навакольныя жыхары звярталіся да якой-небудзь чараўніцы, і яна, адшукаўшы вір, смела ныряла на дно, затыкала галоўны выток возера «гарохвінамі» і закладвала зверху каменнем. Вада ў возеры мала-памалу знікала, і Вадзянік перасяляўся куды-небудзь у іншае месца.

Вадзянікі не сыходзяцца адзін з адным і варагуюць паміж сабою. Два Вадзянікі — рачны і калодзежны, якія жывуць амаль побач, ведаюць адзін аднаго па голасе і плёскаце вады, перамаўляюцца, але ніколі не бачацца. Людзі карыстаюцца гэтым для знішчэння вадзяных Духаў і, злучыўшы канавою ці каналам два вадаёмы, зводзяць двух Вадзянікоў, а тыя ў бойцы забіваюць адзін аднаго. Акрамя гэтага, Вадзянікоў можна выжываць свістам, якога яны, як і Лесуны, не пераносяць. Не пераносяць яны і попелу, які людзі сыплюць раніцай у ваду: Вадзянік атручваецца ад попелу, шалее ад свісту і разбіваецца аб падводныя завалы. Шаленства Вадзяніка вельмі небяспечнае для таго, хто праходзіць па беразе: Вадзянік хапае чалавека за крысо, і цягне на глыбіню. Калі такі чалавек здолее ўцячы ад Вадзяніка, ён не пазбегне няшчасця на зямлі: сухапутны Нядобры Дух адпомсціць за Вадзяніка, асабліва калі пры свісце і высыпанні ў ваду попелу было згадана імя Вадзяніка.

Пад вадою ў Вадзяніка стаіць цудоўны палац, з якога ён у пэўны час дня і ночы выходзіць на дно рэк і азёраў. Затаіўшыся ў якім-небудзь віры альбо завадзі, чакае здабычы. Абавязкова ўтопяцца тыя, хто купаецца ў свята, калі вада павінна адпачываць, ці пасля захаду сонца. Асабліва небяспечна купацца і лавіць рыбу апоўдні і апоўначы.

Вадзянік далёка ад вады не адыходзіць. Калі ж ён, затрымаўшыся на сушы на час, за які з яго сцячэ вада і прасохнуць ціна і водарасці, не вернецца ў ваду, то загіне. Тонкі пласт засохлай ціны і водарасцяў, абцягнуты ледзь прыкметнаю плеўкаю, які ляжыць на беразе — гэта тое, што засталося ад Вадзяніка. Але калі такі пласт, нікім не крануты, будзе падхоплены вадою ці ўкінуты ў ваду чалавекам, Вадзянік ажыве. У такім выпадку ён застаецца

ўдзячны чалавеку, які скінуў яго ў ваду, за выратаванне. Калі выратавальнік будзе тануць, Вадзянік не толькі не прыме яго як ахвяру, але нават выштурхне на неглыбокае месца, падсуне бервяно, куст ці нешта яшчэ. Вадзянік будзе выказваць такому чалавеку ўдзячнасць да канца яго жыцця.

Удзячнасць Вадзяніка адчуваецца і ў наступным: ён прымае чалавека, над якім апякуецца, спаць на сваю пасцель, што знаходзіцца на дне вадаёма, прычым на соннага не ўпадзе нават ні кроплі вады. Ложак Вадзяніка вельмі мяккі, прыгожа ўбраны. Над тым, хто спіць, тонкая, як павуцінне, засень, скрозь якую ён бачыць жыццё раслін і водных жывёл, пераліванне вады, гульні русалак. Калі ж чалавек ткне пальцам у гэтае покрыва — вада адразу прасочыцца ў дзірку і залье неасцярожнага.

Вадзянік можа жартам ці са злосці пужаць рыбу каля сетак рыбакоў, раз’язджаючы вярхом на сваёй любімай рыбіне — соме. Пільна сочыць за тымі, хто купаецца, падхопліваючы ахвяры — рыбакоў і іншых людзей, якія ўпалі ў ваду па неасцярожнасці. Губіць і скаціну: сеўшы на жывёліну, якая плыве ці валтузіцца ў вадзе, Вадзянік едзе на ёй і сваім цяжарам прыціскае яе да дна.

Якім бы чынам ні замучыў Вадзянік сваю ахвяру, ён доўга цешыцца з яе адчайных парыванняў вызваліцца з вады: то падыме на паверхню, дасць удыхнуць паветра, то яшчэ глыбей апусціць уніз, і так да таго часу, пакуль канчаткова знясіленая ахвяра не ўпадзе на дно. Але і тут Вадзянік працягвае мучыць ахвяру спадзяваннямі магчымага выратавання. Канчаткова забіўшы сваю ахвяру, Вадзянік зганяе да трупа піявак, ракаў, жукоў, каб тыя здзекаваліся з цела, якое ён кідае, калі дастане душу. Душа тапельніцы ідзе на службу да Вадзяніка. Мужчынскія душы становяцца Вадзянікамі.

Калі ў яго ўладаннях ужо ёсць некалькі тапельніц, Вадзянік прытрымлівае толькі самазабойцаў, адпускаючы астатніх выпадковых тапельніц. Русалкі трапляюць пад уладу Вадзяніка і вымушаны трываць сувязь з ім. Вынікам гэтай сувязі бываюць шматлікія Духі, якія, аднак, больш за свайго бацьку шукаюць сувязей з жывымі жанчынамі: ім і ўсяму іх роду яны дапамагаюць у рыбалоўстве. Вадзяняты пакідаюць род і знікаюць, як толькі дасягнуць паўналецця.

Ёсць Вадзянікі, якім не суджана было сумесна жыць разам з Русалкамі таму, што ў іх уладаннях дагэтуль не было ніводнай самагубцы. Такія Вадзянікі надзвычай злосныя і не прапускаюць ніводнай ахвяры, спадзеючыся сустрэць жанчыну.

Калі Вадзянік толькі жартуе, дурэе і забаўляецца, то відаць, як у тым ці іншым месцы возера ці ракі нечакана заклубіцца вада, усплывуць на паверхню

бурбалкі, пачнуць разыходзіцца кругі. Уночы, пры ціхім надвор'і, ён пляскае далонямі па паверхні вады ці раве, нібы карова, кракае, быццам качка ці вадзяныя птушкі. Раптоўны разліў невялікай рэчкі ці ручая, каламучанне чыстых дагэтуль водаў — гэта жарты Вадзяніка.

*Багдановіч, с. 76—77.*
*Никифор.-2, с. 75—79.*
*Сержп.-1, № 2225.*

**Русалкі-вадзяніцы** РУСАЛКІ-вадзяніцы — дзеці, душы якіх па віне бацькоў ці праз самагубства сталі здабычай Нядобрых Духаў і апынуліся ў Падводным гаспадарстве.

Русалкі-вадзяніцы выглядаюць як маладыя прыгожыя жанчыны з доўгімі, да пят валасамі. Па далікатным, амаль празрыстым іх целе рассыпаюцца хвалістыя валасы русага колеру да каленяў. У асобных Русалак валасы падобныя да пасмачкаў зялёнай тонкай асакі. У Русалак ласкавыя блакітныя вочы, якімі яны так удала заманьваюць ахвяру. Але калі яны зловяць ахвяру, то іх вочы робяцца шклянымі і нерухомымі, як у нябожчыка.

Русалкі-вадзяніцы — вечна вясёлыя, гуллівыя рагатушкі, якія не пакідаюць сваіх вадаёмаў і жывуць тут у крышталёвых дамах пад доглядам Гаспадарыні-русалкі, якую прыводзіць мясцовы Вадзянік.

Русалкі могуць заставацца без вады столькі часу, колькі патрэбна для таго, каб іх цела і валасы высахлі ад макрэчы, пасля чаго яны могуць адразу ж пакутліва загінуць. Русалкі толькі зрэдку на кароткі час выплываюць на паверхню вады, прысаджваюцца на падводны камень ці на бераг, каб заманіць ахвяру ці атрэсці валасы ад вады. Расчэсваючы свае мокрыя валасы, Русалка можа вычасаць столькі вады, што яе дастаткова будзе, каб затапіць цэлую вёску.

Русалкі жывуць у вадзе толькі з восені да Русальнага тыдня. Пакуль яны не выйдуць з вады, людзям небяспечна купацца, таму што ці хвароба якая-небудзь здарыцца, ці Русалкі да сябе зацягнуць у глыбіню ракі і ўтопяць.

У Русальны тыдзень Русалак-вадзяніц выпускаюць на сушу на больш працяглы час, таму што знікае небяспека загінуць на сушы. Яны выходзяць на бераг, заплятаюць валасы, што свецяцца ў цемры, плятуць вянкі і ўпрыгожваюць імі галовы. Русалкі смела разгульваюць па беразе вадаёмаў, нават адыходзяць у бліжэйшыя гаі, на палі, залазяць на дрэвы, каб пагушкацца на галінах і вершалінах. Гэтым Русалкі аднаўляюць успаміны пра пакінутую зямлю і пра людзей, сярод якіх яны абавязкова стараюцца злавіць ахвяру.

Робяць яны гэта так: гуляюць, бегаюць навыперадкі, водзяць карагоды, скачуць, рагочуць, пяюць песні і заманлівымі рухамі клічуць да сябе выпадковага гледача. Калі ён паддасца спакусе і падыдзе да Русалак ці спыніцца, здранцвелы, яны гуртам абступаюць ахвяру, ціскаюць яе ў абдымках і заказытваюць да смерці. Пры гэтым, пачуўшы вясёлы рогат і песні, ніхто не ідзе на дапамогу, бо не падазрае небяспекі там, дзе весяліцца моладзь. Выратавацца ад Русалак можна толькі адзіным спосабам: укалоць хаця б адну з іх іголкаю ці шпількаю, якія неабходна мець пры сабе напагатове. Тады ўвесь гурт Русалак з віскам кідаецца ў ваду, дзе яшчэ доўга чуюцца іх галасы. Але лепш за ўсё пазбягаць у Русальны тыдзень мясцін каля вады, не мыцца, не праць бялізну і не лавіць рыбу.

Згубнае ўздзеянне Русалак на чалавека мацней за ўсё праяўляецца на працягу Русальнага тыдня. У гэты час небяспечна з'яўляцца аднаму на беразе ракі ці возера, асабліва калі бачны рухомыя агеньчыкі і чутна журботная песня. Завабяць яны смельчака гульнёю незлічоных агнёў, зацягнуць чароўнай сілаю тужлівай песні, — і ён беззваротна загіне ў глыбіні цёмных водаў. На перадсмяротныя крыкі ахвяры жорсткія жыхаркі Падводнага гаспадарства адкажуць злосным рогатам.

Ва ўсе дні Русальнага тыдня дзяўчаты збіраюцца па вечарах і як засцерагальны сродак ад злых хітрыкаў Русалак пяюць своеасаблівыя песні, якія называюцца русальнымі. А ў апошні вечар тыдня дзяўчаты ходзяць у лес і вешаюць на дрэвы вянкі з кветак, упэўненыя, што Русалкі іх выкарыстаюць і будуць бегаць па палях і лясах у гэтых вянках. Такім прынашэннем яны думаюць іх задобрыць.

Калі Русалкі завалодаюць ахвяраю, яны заносяць яе ў сваё жытло і тут акружаюць самым пяшчотным клопатам: у ахвяры-жанчыне яны бачаць магчымую жонку свайго ўладара — Вадзяніка, новую сяброўку сабе, а ў мужчыне, асабліва калі той малады і прыгожы, — магчымага палюбоўніка аднае з іх. Зразумела, больш за іншых даглядае тапельца тая Русалка, якой ён прыйшоўся даспадобы. Русалка расчэсвае яго валасы, расцірае цела, адганяе вадзяных жывёл, прыбірае ложа лепшымі водарасцямі, а ў Русальны тыдзень выводзіць яго разам са сваім гуртам на сушу, нават дазваляе зазірнуць у родны дом і пабачыць людзей, каб хоць як паслабіць тугу па зямным жыцці. Астатнія ахвяры застаюцца без увагі: Русалкі дазваляюць ракам і насякомым нявечыць целы, а калі ахвяра аказалася чамусьці несімпатычнай, яны выштурхваюць труп на паверхню вады, да берага.

Акрамя варожых нападаў, калі бязлітасна праследуюцца людзі ўсіх узростаў — ад немаўлят да старых, — вядомы таксама заляцанні Русалак,

пераважна тых, хто ў зямным жыцці не ведаў людзей, як, напрыклад, немаўляты. Гэтыя заляцанні менш варожыя і не такія небяспечныя; больш за ўсё яны прыходзяцца на маладых мужчын, асабліва хлопцаў, зносіны з якімі новыя і заманлівыя для Русалак. Русалка падхоплівае які-небудзь яго прадмет — адзежу, абутак, рыбалоўную прыладу і, збіраючыся затапіць яго, тым самым прымушае ўладальніка кідацца без разбору лавіць прадмет, сама ж нябачна падштурхоўвае прадмет усё далей і далей, у небяспечнае месца, куды, зразумела, заманьвае і чалавека. Калі той пасняхова пазбегнуў небяспекі, вылавіў украдзены Русалкаю прадмет, гэтаму прадмету не пашанцуе: чалавек абавязкова згубіць яго ў будучым, ці яго ўкрадуць, ці ён сапсуецца.

Той, хто выратаваўся ад Русалак ці, нават, хто бачыў іх або чуў здалёк, не заўсёды застаецца без пакарання. Так, адзін набывае звычку без прычыны нястрымна рагатаць, другі крывіць паходку, твар, некаторыя трацяць слых. Характэрна, што чым мацней натура ахвяры, тым большыя ў яе пашкоджанні, з якімі чалавек не можа справіцца ўсё жыццё.

Якім бы прыгожым ні падавалася жыццё Русалак, у ім больш смутку, які яны не могуць заглушыць забавамі. Перш за ўсё, яны з зайздрасцю глядзяць на сваіх зямных сяброўак-жанчын,назіраюць матчыны ласкі, якіх многія з іх не мелі. Але больш за ўсё Русалак-вадзяніц прыгнятае паднявольная сувязь з Вадзянікам, ва ўладаннях якога яны жывуць і якому падпарадкаваны з той хвіліны, як трапілі сюды. Не толькі жальба, а найвышэйшая ступень бяссільнай злосці ахоплівае Русалку, калі ёй даводзіцца бачыць маладую шчаслівую пару, што гуляе па беразе ці плавае на лодцы.

Затое, які радасны крык чуецца ў Падводным гаспадарстве парою, калі становіцца вядома пра пагібель ненавіснага Вадзяніка! Гэта, аднак, апошні радасны крык, таму што разам з пагібеллю Вадзяніка наступае і іх уласная, калі толькі Русалкі не паспелі сысці з асушанага жытла і перабрацца ў новае. Але тут лёгка можа здарыцца, што з аднае няволі яны трапляюць у новую, магчыма, больш цяжкую.

*Никифор.-2, с. 85—89.*
*Ляцкі-2, с. 38.*
*Шейн-2, с. 196—198.*

**Баламуцень**

У ПАДВОДНЫМ гаспадарстве жыве сам па сабе вадзяны чалавек, якога завуць Баламуцень. Гэта вельмі непрыгожы мужчынскі Дух. Галава яго нагадвае збан, твар азызлы, так што вачэй амаль не відаць, скура гусіная. У яго кароценькія, тоненькія і крывенькія ножкі, вялізны жывот.

Баламуцень — халасцяк, але вельмі любіць жанчын. І калі ў Баламуценя падыходзіць пара кахання, то ён праводзіць шмат часу ў тых месцах ракі ці возера, дзе звычайна часта бываюць жанчыны: ці купаюцца, ці мыюць бялізну.

Баламуцень спачатку толькі жартуе з імі: муціць ваду, скідвае з кладак, шчыпае за лыткі. Гэтак адначасова ён выглядае сабе жанчыну. Бялізну той, якую ён найбольш упадабаў, Баламуцень заганяе да другога берага і, зачапіўшы яе за карчы, чакае. Калі жанчына прыходзіць, ён з’яўляецца перад ёю ў поўны рост. Спачатку жанчына вельмі палохаецца, але Баламуцень напускае нейкія чары, і яна паслухмяна ідзе за ім у Падводнае гаспадарства.

Баламуцень ніколі не бярэ жанчын да сябе назаўсёды. Ён адпускае іх дадому, і такія жанчыны не могуць патануць нават тады, калі яны гэтага жадаюць.

*Беларус. міфалог., с. 93–94.*

**Азярніцы**

У ВОЗЕРЫ, што каля вёскі Брусы на Мядзельшчыне, жылі азярніцы — істоты, падобныя на маладых жанчын. У азярніц ўсё цела зялёнае і валасы надта доўгія, ступні ў выглядзе плаўнікоў. Валасамі яны душаць тых, хто ноччу купаецца. Знешне гэтыя істоты нагадваюць людзей, але замест крыві ў іх нібыта вада і на дотык яны вельмі халодныя.

Размаўляюць азярніцы на незразумелай мове, што нагадвае птушыную. Адзенне носяць сплеценае з багавіння. Ядуць толькі траву, якая ў вадзе расце, а рыбу ці жаб ім нельга есці, а то іх бацька Вадзянік павыкідае іх з вады, і яны будуць доўга ў муках паміраць.

Па начах, калі свеціць месяц, азярніцы выходзяць на бераг і спяваюць салоўкамі. Бывае, спяваюць яны і глыбока пад вадой. Тады іх спевы нагадваюць жабінае крактанне.

Калі раптам які чалавек убачыць азярніц, ён не павінен сябе выдаваць, бо яны зацягнуць яго ў самую багну, да сябе, і ўжо не адпусцяць. Гэта ж чакае і таго, хто асмеліцца выкупацца ў возеры.

*Беларус. міфалог. с. 93.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 111/06.*

**Расамахі**

У РАСАМАХ — Духаў, што пераважна жывуць у вадзе, ператвараюцца жанчыны, якія загубілі сваіх дзяцей ды і самі ўтапіліся. З’яўляюцца расамахі перад людзьмі ў постаці жанчыны з распушчанымі валасамі.

Аднойчы дзецюкі касілі сена па берагах ракі. Выбралі яны грудок, палажылі там свае кайстры з абедам і пайшлі касіць. Шмат выкасілі, пакуль сонца паднялося ўгору. Пайшоў адзін з іх на грудок узяць біклагу з квасам, аж бачыць, што хтосьці пачапаў торбы, а біклагу павесіў на алешыну. Каб гэта быў сабака, то ён не чапаў бы біклагі. Пачаў дзяцюк слухаць, ці не зашалясціць дзе, і чуе — плача дзіця зусім блізка ў лазе. Ён туды — плач далей. Ён далей — а плач чутны каля самай ракі.

Зрабіў дзяцюк выгляд, што вяртаецца, а тым часам ціхенька давай падкрадвацца праз лазу да ракі. А каля ракі бабравіна і бабровая хата стаіць. Зірнуў ён, аж на бабровай хаце сядзіць голая жанчына з распушчанаю касою, а на руках трымае маленькае дзіцятка. Гэта яно і плакала.

Тым часам жанчына паклала дзіця на калені ды давай шчупаковым грабянцом расчэсваць валасы. Стаіць дзяцюк і дзівіцца: хто яна такая і чаго сядзіць тут на бабровай хаце? Дзіця зноў пачало плакаць. Жанчына давай яго калыхаць.

Тым часам астатнія дзецюкі з другога боку пачулі, што плача дзіця, ды і падышлі туды. Толькі тая расамаха пачула, што праз лазу ідуць людзі, як ускочыла, схапіла аберуч дзіця і кінулася ў бабравіну. Падбеглі дзецюкі, сустрэлі сябра ды і пытаюць яго, ці не бачыў ён якога дзіцяці. А таму няма чаго і казаць, бо калі на свае вочы не бачылі, то і не павераць.

Вярнуліся дзецюкі ўсе разам на сенажаць і пайшлі палуднаваць. Прыходзяць на грудок, аж там зноў хтось пачапаў торбы. Здагадаўся дзяцюк, што гэта справы расамахі, але змаўчаў.

*Сержп.-1, № 2225.*

## Багі і Духі Балотнага гаспадарства

### Лазавік

У ЛАЗЕ, што расце каля балотаў, жыве лясны Бог — Лазавік. Гэта старэнькі карлік, не большы за пазногаць. Ён аднавокі, з аршыннаю барадою і заўсёды носіць з сабою доўгую пугу. Што робіць Лазавік сваёй пугай і навошта носіць з сабою, беларусы не ведаюць.

Лазавік звычайна жыве ў лазе, акружанай балотам, у маленькай хатцы без дзвярэй і вокнаў, толькі з адтулінай на страсе, куды звычайна залазіць сам гаспадар. Дамок гэты недаступны для людзей: як толькі хто-небудзь задумае падысці да яго — дома як і не было на тым месцы. Пойдзе далей чалавек за ім — дамок зноў далей ад яго.

Лазавік часта расхаджвае па балотах. Тут яго адразу пазнаеш: вочка яго бліскае, як агеньчык.

З асушэннем балотаў пераводзіцца лаза, і Лазавік вымушаны шукаць іншае балота.

*Древлянский, № 28.*

## Кадук

САМЫ старэйшы Нядобры Дух балотаў — Кадук. Жыве ён у самым цёмным лесе, да таго ж, у самым багністым балоце. Гэта страшэнная пачвара: ні чалавек, ні звер, нагадвае здалёк капу сена ці кучу моху, якая можа напалохаць чалавека хіба сваім нязвыклым для людзей рухам. Кадук больш нагадвае звера з вялізазнай калматай галавою і з шырокай пашчаю аж да самых вушэй. Як разявіць ён сваю пашчу, у якой блішчаць белыя зубы ды чырванее, бы агонь, язык, дык здаецца, што ён гатоў пракаўтнуць чалавека цалкам. Беларусы вераць, што Кадук есць жывых маленькіх дзяцей, якіх носяць яму яго падначаленыя Духі.

Многія нядобрыя духі знаходзяцца на службе ў Кадука ці падпарадкоўваюцца яму. Тут у сваім балоце Кадук чыніць расправу над Духамі, адсюль ён пасылае іх да людзей рабіць розную шкоду. Бяда, калі чалавеку выпадзе няшчасце трапіць у гэтае балота: пагібель непазбежная.

Кадук рэдка сам выходзіць са свайго балота: ён вечна заняты шматлікімі распараджэннямі, расправамі і выдумваннем шкод супраць людзей. Ён тады толькі выходзіць з балота і выпраўляецца да людзей, калі нейкі падначалены яму Дух не здолее выканаць яго даручэнне.

Часам беларусы, раззлаваўшыся, кажуць: «Каб яго ўзяў Кадук» ці «Вазьмі яго, Кадук». Але Кадук рэдка бярэ, бо ён з’яўляецца толькі ў ліхую часіну, а часіна гэтая бывае толькі пры ўзыходзе сонейка, у самы поўдзень і ў самую поўнач. Гэтая пачвара пахапала б усіх людзей, каб ёй было вольна аб’яўляцца заўжды. Але Бог так даў, што Кадук сам не мае ўлады над чалавекам, а чакае, пакуль ён не вымавіць яго імя ў той ліхі момант, у які што чалавек ні скажа, то ўсё станецца.

*Сержп.-1, № 2157.*

## Тры балотныя браты

БАЛОТА апанавалі тры балотныя браты: Балотнік, Багнік, Аржавеннік — вечна самотныя халасцякі.

Балотнікі, Багнікі, Аржавеннікі не паражаюцца стрэламі Перуна, якія губляюць забойную сілу пры першым судакрананні

з паверхняю балота, і Духі бясстрашна, са здзеклівай насмешкаю падхопліваюць гэтыя стрэлы. Але для ўсіх гэтых Духаў найвялікшая небяспека — асушэнне іх жытла правядзеннем каналаў. Калі сыходзіць вада, асядае, згушчаецца зямля, Балотнік, Багнік, Аржавеннік гінуць, бо не могуць выбрацца з жытла, якое цяпер робіцца ім магілаю. З цягам часу астанкі Духаў зліваюцца з зямлёю і служаць угнаеннем — і адным Нядобрым Духам робіцца меней.

*Никифор.-2, с. 73—79, 80—82.*

### Балотнік

Мала каму з беларусаў даводзілася бачыць Балотніка. Аднак вядома, што ён страшэнны таўстун, зусім без вачэй, на ім тоўсты слой гразі, да якой наліплі водарасці, мохавыя валокны, смаўжы, жукі і іншыя вадзяныя насякомыя.

Балотнік цешыцца, калі на паверхні яго жытла ідзе расліннае і жывёльнае жыццё. Прырода расквечвае паверхню жытла Балотніка цудоўнымі кветкамі, ягаднікам — брусніцы, журавіны, а таксама грыбамі. Сам Дух патаемна вырошчвае паміж іх кусты багуну, які сваім пахам задурманьвае галаву чалавеку. Ён жа пах гэты любіць і звычайна жыве ў той частцы балота, дзе многа багуну расце. Бавячы свой бясконцы вольны час, Балотнік там і тут прабівае балотныя акенцы і то акружае іх здрадніцкай раслiннасцю, то падганяе туды рыбу. Гэта — пастка, якая загубіла не адну ахвяру.

Па вечарах і раніцамі Балотнік мычыць, як карова, кракае па-качынаму, булькае, нібы цецярук, каб завабіць сюды паляўнічага. А то стогне і тут жа раптоўна выбухвае маладым чалавечым рогатам ці гудзе прыманлівым гудам.

Якім бы чынам ні прыцягвалася ахвяра — чалавек ці жывёла, — Балотнік можа загубіць яе толькі тады, калі багна дастаткова глыбокая. У іншым выпадку яму застаецца мучыцца бяссільнаю злосцю, калі ахвяра абыходзіць яго. Надта злуе Балотнік, што людзі прыстасаваліся хадзіць па багне з дапамогаю балотных лыжаў: трасецца зямля, прагінаецца, а чалавек смела ідзе наперад. А асабліва злуе яго спякотнае лета, калі не толькі сам чалавек смела топча паверхню багны, але нярэдка праводзіць па ёй каня з возам.

У зімовы час мярзляк-Балотнік курчыцца і трасецца на дне свайго жытла і вымушаны думаць пра ўласную бяспеку: вымерзне балота — загіне і Балотнік. З яго жытла час ад часу падымаецца цёплае дыханне, якое ўтварае балотную палонку. Але прыцісне мароз — Балотнік зноў у трывозе за сваё існаванне, зноў бяссільна злуецца на конскі тупат, што рэхам аддаецца ў яго бярлозе.

*Никифор.-2, с. 80—82.*

### Багнік

Брат Балотніка — Багнік туліцца ў тарфяным балоце, якое ніколі не пакрываецца расліннасцю і мае выгляд чорнай бруднай лужыны. Ён ніколі не паяўляецца над паверхняю багны і прысутнасць сваю ў ёй паказвае толькі бурбалкамі на паверхні ды зрэдку — дробненькімі агеньчыкамі: і тое, і другое суправаджаецца асаблівым «пуктаннем» — нязначным уздрыгваннем паверхні. Гэта дыхае і пыхкае вечна бяздзейны Багнік, які не падымаецца з мяккага ложа і тады, калі ахвяра трапіла ў багну і гіне ў гразі. Ён упэўнены, што ахвяры не выбрацца адсюль і што яна сама падыдзе да яго.

Не толькі людзі, але і шматлікія жывёлы асцерагаюцца багны, якая парою забівае атрутнымі газамі, што выпускае час ад часу Багнік.

З выгляду Багнік яшчэ бруднейшы, чым Балотнік. Ён таксама баіцца асушэння, але яго не палохаюць маразы, якім даволі рэдка ўдаецца зацягнуць багну лёдам: яна абаграваецца цёплым пыхканнем Багніка. Найбольшы страх для яго — калі прадпрымальныя людзі вычэрпваюць багністую гразь для вырабу з яе паліва, угнаення для палёў і агародаў, і гэтым вельмі палохаюць Духа, які баіцца застацца без багны. У сухое ж лета, калі багна не толькі падсыхае, але дзе-нідзе гарыць, паўмёртвы Багнік пакутуе на дне свайго жытла і ледзьве перажывае гэты час.

*Никифор.-2, с. 80—82.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 90/06.*

### Аржавеннік

Трэці брат — Аржавеннік — брудна-руды, з надзвычай тоўстым жыватом і тонкімі, як сцябліна хвашчу, нагамі, з наліплай іржой. Ён увесь час рыгае і не можа прыцягнуць да сябе ўвагу нават неразборлівых нячысцікаў — усе жывыя істоты абыходзяць яго жытло. З-за гэтага Аржавенніку вельмі рэдка даводзіцца мець ахвяру: жывёла забягае ў аржавенне паспешліва, ратуючыся ад драпежнікаў, а чалавек зойдзе хіба што ў ненармальным стане. Балотнік і Багнік могуць зімою, напрыклад, падмануць прахожага і праезджага. Аржавеннік не можа прыхаваць месца свайго жытла: аржавенне абавязкова выдасць знаходжанне Аржавенніка сваёй бура-жоўтаю афарбоўкаю.

Аржавеннік больш спакойны, чым яго браты, Багнік і Балотнік, таму што спякотнае лета не высушвае аржавенне, а людзям непатрэбная гэтая неўрадлівая зямля. Духу застаецца валяцца на дне свайго жытла, абрастаць ліпкай граззю і падтрымліваць каламуць у аржавенні.

*Никифор.-2, с. 83—84.*

## Русалкі-балотніцы

У РЭДКІХ мясцінах жыхарства Балотнікаў, Багнікаў і Аржавеннікаў ёсць асобныя русалкі, якім гэтае імя даецца хіба што смехам і якія, акрамя аблічча, падобнага да жаночага, не маюць нічога агульнага з прыгожымі ласкавымі русалкамі-вадзяніцамі ці русалкамі-лесавіцамі. Русалкі-балотніцы — старыя,

з кульбамі ў руках, пачварныя, брудныя, як і месца іх жыхарства. Яны злыя і панурыя не менш за балотных братоў, з якімі, аднак, не маюць зусім ніякіх зносін, а часта і не ведаюць адно аднаго.

У іх ноччу свецяцца вочы. І гэтым балотніцы заманьваюць таго, хто цёмначы ходзіць па балоце, у гіблыя месцы. І шчэ ўмеюць яны плакаць тоненькім дзіцячым галаском. Пачуе яго чалавек, кінецца на дапамогу, саб'ецца са сцежкі, і пацягнуць яго балотніцы за сабой у багну. Часцей за ўсё заманьваюць гэтыя Нядобрыя Духі маладых дзяўчат і жанчын, бо зайздросцяць іх прыгажосці.

*Никифор.-2, с. 85—98.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5. спр. МС — 185/06*

## Хапун

ХАПУН — дзядок, невялікага росту, гарбаты, з доўгай сівой барадой, але вельмі спрытны і хуткі. У дзядка ў руках заўсёды торба памерам большая, чым ён сам.

Хапун лётае па паветры, прыглядаючыся, дзе якое дзіця не слухаецца старэйшых, капрызіць. Тады ён падпільнуе, каб дзіця гэтае адышло далей ад дому, хапае яго і саджае ў сваю торбу. Як толькі пасадзіць дзіця ў торбу і завяжа яе, то тут ужо крычы не крычы — ніхто не пачуе. А каб раптам хто і пачуў, то Хапуна ўжо і след прастыне, бо носіцца ён вельмі хутка. Убачыць Хапуна першым, каб схавацца ці ўцячы ад яго, таксама немагчыма, бо ён нябачны і паказваецца толькі тады, як развяжа торбу. А торбу ён развязвае толькі ў сябе дома.

Жыве Хапун за цёмным лесам, пасярод балота, дзе пад старым карчом яго нара. Ён носіць у нару непаслухмяных дзяцей, усяляк здзекуецца, нават б'е іх крапівою. І ніхто ўжо гэтых дзяцей не знойдзе: ні маці, ні бацька, бо ніводзін чалавек яшчэ ніколі не даходзіў да жытла Хапуна. І ніводнае дзіця не ўцячэ ад Хапуна. А як ужо гэтыя дзеці вырастаюць, то робяцца Хапунамі. І дзяўчаткі таксама робяцца, і ў іх вырастае доўгая сівая барада па калені.

*Беларус. міфалог., с. 102.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 5. спр. МС — 192/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС — 41/06.*

## Лознікі

ЛОЗНІКІ ўтвараюць асобны гурт хутчэй надводных, чым падводных Духаў. Жытлом ім служаць густыя кусты пераплеценага лазняку, у залежнасці ад колеру якога афарбавана іх цела. Самі па сабе лознікі — драбнюткія, гуллівыя Духі. Яны не маюць намеру загубіць ахвяру, якую заблытваюць

у куст ці карэнне лазы або прымушаюць правальвацца ў прыхаванае вадзяное акенца ў багне. Усе гэта робіцца як гульня, жарт, пасля чаго яны самі дапамагаюць ахвяры, падсоўваючы ёй куст лазы, трыснёг, аер ці нешта яшчэ. Калі і пры такой дапамозе ахвяра не выратавалася, значыць, яе падхапіў буйны Дух, які жыве тут, — Вадзянік, Балотнік ці Багнік.

Паколькі лознікі зусім бясшкодныя і малыя з выгляду, Перуновы стрэлы забіваюць іх не спецыяльна, а выпадкова. У лознікаў застаецца адна небяспека, пра якую яны, аднак, зусім не дбаюць. Гэта — асушэнне месца пад іх жытлом і як вынік — знішчэнне лазняку, у якім яны жывуць. Тады яны гінуць усе разам назаўсёды і бясследна.

*Никифор.-2, с. 84—85.*

### Паветрыкі

ПАВЕТРЫКІ — гэта Духі, якія лятаюць над багнаю і забаўляюцца сваімі гульнямі. Часам вецер падхоплівае паветрыкаў і нясе іх, пакуль яны выпадкова не сутыкаюцца з ахвярай. Злосныя з-за перапыненай забавы, паветрыкі накідваюцца на ахвяру і пачынаюць здзекавацца з яе. Нацешыўшыся, паветрыкі зноў носяцца ў паветры, пакуль вецер не перанясе іх да новай ахвяры.

Паветрыкі заўсёды дзейнічаюць гуртам, таму што паасобку яны не могуць справіцца з чалавекам.

Вельмі часта здараецца, што іншы чалавек, знаходзячыся паблізу ад паветрыкаў у час іх расправы з ахвяраю, не толькі не церпіць ад іх, але нават застаецца па-за іх увагаю. Тут усё залежыць ад напрамку ветру і затрымкі яго ў тым ці іншым месцы.

*Никифор.-2, с. 42—43.*

## Духі ночы

### Паўночнікі

ПА НАЧАХ на вуліцах вёсак валэндаюцца і гаспадараць Паўночнікі. Дзе жыве чалавек, там ёсць і яны. Паўночнікі пачынаюць сваю свавольніцкую дзейнасць ноччу, у час агульнага людскога спакою.

Паўночнікі — Духі Чарнабогава гаспадарства. Яны падобны на людзей, толькі ростам невялікія, ды спіны ў іх гарбатыя. Але гэта не горб, а складзеныя крылы. Па зямлі яны не ходзяць, лётаюць.

З’яўляюцца Паўночнікі на зямлю позна ноччу, калі ўсе людзі спяць. Пралазяць на сядзібы, нягледзячы на прысутнасць сядзібных Духаў, якія не ладзяць з гэтымі Духамі. Выбіраюць звычайна сялянскі двор, дзе ёсць маладыя дзеўкі ці хлопцы. І пачынаюць крычаць, скрыпець, гукаць, а то і жаласна плакаць. Усё гэта робіцца звонку памяшкання, у якім знаходзіцца чалавек, калі ён сніць першы сон, і доўжыцца да раніцы. Гэтым яны хочуць разбудзіць каго-небудзь з маладых. Каб той глянуў у акно і сустрэўся позіркам з імі. Калі гэта адбудзецца, то ў чалавека адбіраюць маладосць, якая пераходзіць гэтым паўночнікам. Самі ж па сабе яны хутка старэюць, вось і палююць на моладзь.

Ёсць сярод іх і мужчыны, і жанчыны. Адрозніць можна толькі па галасах. Але самае страшнае ў гэтых Нядобрых Духаў — вочы. Вялікія, круглыя і свецяцца.

Паўночнікі збіраюцца цэлай гурбой. Сярод іх ёсць адзін галоўны, якому ўсе падпарадкоўваюцца. Галоўны сам вызначае, куды ляцець і што рабіць. Ён адзін можа прымаць розныя аблічча. Прыкінуўшыся, напрыклад, маладым хлопцам, ён ноччу кліча дзеўку. Калі та выйдзе на двор, астатнія Паўночнікі ўзнімаюць гвалт, пужаюць. Як спужаешся, то здані дагоняць і ўкрадуць сон. Чалавек пасля не помніць, што з ім было, і пакутуе ад бяссонніцы. Вярнуць жа сон можна толькі так: у такую ж ноч не збаяцца і схапіць аднаго Паўночніка, зацягнуць у хату. Яны баяцца святла і закрытых пакояў.

Вельмі баяцца Паўночнікі кукарэкання пеўніка. Таму яны хаваюцца ў Падземным гаспадарстве. Паўночнікаў асабліва шмат у тых вёсках, дзе багата моладзі.

*Никифор.-2, с. 61.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 39/06.*

**Кумяльган**

КУМЯЛЬГАН — Нядобры Дух у абліччы чалавека і каня. Беларусы ўяўляюць яго з чалавечым тулавам, рукамі і нагамі, пакрытымі конскай поўсцю, з конскай галавой, з капытамі на руках і нагах. Ён ходзіць часам, як конь, а часам, нібы чалавек, на задніх нагах. Прызначэнне яго — мучыць, псаваць, калечыць коней. Ён таксама падмешвае ў іх корм якую-небудзь атрутную расліну. Добра, што Кумяльган слабы, а то б ён перадушыў усіх коней. Затое Кумяльган шмат выйграе сваёй выкрутлівасцю. Забраўшыся ў хлеў уночы, ён звычайна ўскоквае па чарзе на кожнага каня і ўсяляк яго душыць, ціснe і курчыць да той пары, пакуль, нарэшце, конь не выб’ецца з сіл і ўпадзе як мёртвы. Затым залазіць на другога, трэцяга і такім чынам на працягу ночы паспявае замучыць усіх коней.

Каб адвучыць Кумяльгана ездзіць на жывёле, трэба гальнік (галень — спрацаваны венік) выпэцкаць у самы горшы бруд, ды біць тым гальнікам па хрыбце тую жывёліну, і прамаўляць: «Які госць, такая і чэсць».

Не менш шкодны Кумяльган і ў час начлегаў. Ён адводзіць коней з табуна па адным у бок лесу і там здзекуецца, як і ў хляве. Кумяльган адводзіць таксама жарабят ад кабыл, але не мучыць іх, а пакідае на здабычу драпежным звярам.

Прычына, чаму Кумяльгану часта ўдаецца прабірацца ў табун незаўважаным, у тым, што ён вельмі падобны да каня, да таго ж ён можа прымаць любую масць і такім чынам падманвае гаспадароў. Прыняўшы масць якога-небудзь гаспадарскага каня, ён спакойна ўваходзіць у хлеў, не сустракаючы з боку гаспадара ніякай перашкоды. Часам нават гаспадар сам адмыкае яму хлеў, прымаючы яго за свайго каня.

*Древлянский, № 27.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС — 119/05.*

## Стрыга

СТРЫГА — Нядобры Дух, які непакоіць цяжарных жанчын і нават можа падмяніць дзіця. Замест добрага і тоўстага падкінуць плаксівае, беднае і худое. Цяжарныя жанчыны бачаць Стрыгу. Выглядае яна як жанчына высокага росту, худая, бледная, з распушчанымі валасамі, праваленымі шчокамі і зялёнымі кашэчымі вачыма.

Стрыга не мае сталага месца жыхарства. Яна ходзіць па вёсках, і яе з'яўленне наводзіць жах на цяжарных жанчын. Па вечарах яна з аднаго двара пераходзіць на другі. Схапіўшы дзіця, Стрыга шматае яго так, каб маці чула крыкі. Можна, аднак, задобрыць Стрыгу. Цяжарная кабета, сустрэўшыся з ёю, запрашае яе да сябе ў хату на час родаў. Стрыга з'яўляецца, ёй усе дагаджаюць, выказваюць асаблівую павагу і часам справа наладжваецца: дзіця цэлае.

Для захавання дзіцяці ад Стрыгі яго купаюць штодзённа да заходу сонца, пасля чаго ваду адразу выліваюць. Але ні ў якім выпадку не трэба выліваць ваду пасля заходу сонца. У пятніцу дзяцей купаць не варта.

*Бобровский, с. 823.*

## Мара

МАРА — Дух, які па начах непрыкметна прабіраецца ў хату або гаспадарчыя пабудовы. Даволі часта з'яўляецца ў стадоле, асабліва калі там нехта спіць. Таму старанна, нават цёплай летняй ноччу, закрывалі перад сном у хаце ўсе вокны і нават комін.

Мара здзекуецца з сонных людзей, не перапыняючы іх сну. Звычайна яна садзіцца на грудзі ці горла соннага чалавека і пачынае душыць, перашкаджаючы чалавеку дыхаць. Час ад часу адпускае яго, каб нацешыцца яшчэ большымі пакутамі ахвяры пасля передыху. Ахвяра, імкнучыся выратавацца, падымае руку, каб адагнаць Мару, але вёрткая Мара прытрымлівае занесеную руку, прычым ад дакранання Мары рука млее, што дадае новыя пакуты.

Адзіным сродкам выратавання ад Мары з’яўляецца згадка, што ўсё гэта адбываецца ў сне, а не на яве. Пакутнік прачынаецца — і Мара знікае. Але дадумацца да гэтага могуць толькі пажылыя людзі, да якіх Мара чапляецца наогул рэдка. Маладыя людзі, да якіх Мара любіць прыставаць, звычайна не дадумваюцца да гэтага сродку і вымушаны доўга цярпець пакуты. Як Мара на чалавека наляжа, то трэба варушыць мезеным пальцам на правай руцэ — і яна адляціць.

Мара чапляецца ў сне пераважна да таго чалавека, які шумна правёў час перад сном і, значыць, з цяжкасцю можа разабрацца ва ўражаннях. Яна мяняе свой воблік, калі паслядоўна прыстае да адной і той жа асобы. Часцей за ўсё Мара нагадвае чалавека, ростам з тыднёвае дзіця, з голай скураю ці пакрытая рэдкім кароткім раскудлачаным пер’ем, часам поўсцю, мяккая пры дакрананні. Мара — нахабная і прычэплівая, падае на ахвяру неадчувальна і не адразу, а цішком, прычым першае яе дакрананне нават прыемнае. Адступаецца ж Мара ад ахвяры імкліва, пакінуўшы соннага са знямелымі рукамі ці нагамі ды вялікім потам на твары і целе.

Каб адвадзіць Мару ад хаты, пазбавіцца ад яе, гаспадар, запрасіўшы яе на снеданне, кладзе на парозе накрыж мятлу і сякеру.

Ад Мары пакутуе і свойская жывёла. Конь, на якім ездзіла Мара ўночы, мае на сваіх баках знакі, зробленыя кароткімі нагамі гэтага страшыдлы. Але Мара не пойдзе да скаціны, калі ў хляве вывешана забітая сарока.

Мара здольная ператварацца ў розных звяроў або птушак. У ваколіцы адной вёскі Мару бачылі на кані. Калі яе злавілі, пачала яна змяняцца, прымаць розныя постаці, найчасцей звяроў. Нарэшце, змянілася ў каня. Каваль, доўга не думаючы, узяў і падкаваў яго. Вярнуўшыся дамоў, убачыў, што ў яго хаце сядзіць жанчына, у якой з рук цячэ кроў. Прыгледзеўся, а на іх падковы.

*Древлянский, № 31.*
*Бобровский, с. 823.*
*Никифор.-2, с. 63–64.*
*Романов-8, с. 285.*
*Шаховіч, с. 182.*

## Начніцы

НАЧНІЦА — Нядобры начны Дух, які ўвесь час не дае малым дзецям спаць, будзіць іх, часам шчыпле за нос. З'яўляецца яна найчасцей за ўсё глыбокай ноччу, калі малыя ўжо спяць. Гэта вельмі страшная жанчына: уся чорная, на пальцах — даўжэзныя пазногці.

Кажуць, што начніца надта не любіць дзяцей, таму і сваіх ніколі не мела праз свае шальмоўства. А яшчэ кажуць, што было ў яе сваё малое, ды задушыла яна яго. Чаму? Ніхто не ведае. За гэты ўчынак людзі выгналі яе з вёскі і наслалі праклён. Праз некаторы час яна ператварылася ў Нядобрага Духа і пачала помсціць такім чынам людзям.

Начніцы часцей за ўсё з'яўляюцца, калі поўня. Таму трэба вокны завешваць, каб месяц на дзіця не свяціў.

Яны па начах лятаюць і палохаюць малых дзяцей. Начніцы лятаюць у споднiх рубашках, з распушчанымі валасамі. І вочы ў іх страшна свецяцца такім святлом, як месяц свеціць. Яны лятаюць і крычаць так жаласна. Начніца дае ссаць з сваіх грудзей, але ў яе не малако, а атрута. Дзіця праз тое хварэе, мучыцца, а як не здагадаюцца бацькі, ад чаго і чым лячыць, то можа нават памерці.

Выганяючы начніцу, дзіця кладуць у прыпол, разгойдваюць перад полымем у печы і шэпчуць:

Цёмна ночка
Начніц нарадзіла.
Маломy дзіцяці
Мукі нарабіла.
Яснае сонейка
Дзень пачынае,
Начніц праганяе,
Дзянніц насылае.
Шух у печ, шух у печ.

Дзяцей ад начніц беларускія жанчыны засцерагалі і такімі спосабамі. На змярканні, па захадзе сонца, адчыняюць акно, што насупраць печы. Маці ці якая іншая жанчына бярэ хворае дзіця на рукі і падносіць да акна, а ў той час пад акном знадворку стаіць якая-небудзь жанчына. Яна нахіляецца да акна, тры разы дзьмухне на галоўку дзіцяці ды кажа: «Ідзіце, начніцы, на сухі лес ды на ніцыя лозы». Потым дзіця купаюць, а ваду выліваюць у такім месцы, дзе ніхто не ходзіць.

Часам бацькі заблытваюць начніц. Усе, што знаходзіцца каля дзіцяці, трэба перавярнуць і зрабіць не так, як было. Напрыклад: дзіцячую сарочку

вывернуць і надзець рукаўцамі на ножкі, дзіця ў калысцы палажыць ножкамі ў галовы, удзень вокны ў хаце завесіць, а ўначы не тушыць лучыну.

Каб начніца не мела магчымасці пралезці ў хату, дзе ёсць малое дзіця, маці з брудных хустаў робіць лялек, ставіць іх на кожным акне па дзве-тры ды замаўляе: «Глядзіце, лялечкі, каб мой маленькі спаў!» — і начніцы мінуцца.

Начніцы больш за ўсё валочацца па зямлі летам, як лес добра ўбярэцца ў лісце, як на паплавах зацвітуць кветкі, на палях выкаласіцца жыта. Яны робяць шкоду не толькі людзям, але і птушкам. Ноччу лазяць па гнёздах, выпіваюць яйкі і ядуць птушанят. З-за іх пасля заходу сонца няможна шчупаць курэй, бо начніца яйка ўкрадзе.

Жывуць начніцы ў лесе каля вады. Збіраюцца ў кустоўі. Пішчаць, рагочуць, мітусяцца, скачуць ды спраўляюць свае ігрышчы. Пры гэтым яны вельмі страшна гіргочуць. У гэты час іх можна і ўбачыць. Але толькі дзе які шум, то голыя начніцы пабягуць да вады і схаваюцца ў ёй.

Супакойваюцца начніцы толькі з першымі промнямі святла.

*Сержп.-1, № 2159.*
*Fed.-1, с. 76—77, 217, 270.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 104/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 111/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 134/06.*

## Касны

НЯДОБРЫЯ Духі касны дзейнічаюць абавязкова гуртам, па адным яны амаль бясшкодныя. Калі ж нападаюць двое-трое каснаў, то пакуль адзін назірае за ахвярай, астатнія спяшаюцца склікаць хаўруснікаў.

Напаўшы на ахвяру, яны прысмоктваюцца да яе, нібы п’яўкі, і не пакідаюць да таго часу, пакуль не давядуць да смерці. Касны тым з большай сілаю і злосцю прыстаюць да ахвяры, чым больш тая супраціўляецца. Ад злосці касны шалеюць.

*Никифор.-2, с. 38—39.*

## Шатаны

ШАТАНЫ назойлівыя і неадчэпныя, як і касны, але жывуць і дзейнічаюць паасобку, не дзелячыся намерамі з іншымі шатанамі. Яны вандруюць ад вёскі да вёскі. Панурыя, маўклівыя, гэтыя Духі не церпяць адзін аднаго, не прыйдуць на дапамогу, нават пры пільнай патрэбе не папросяць дапамогі.

На шчасце, гэтыя Духі ў сваёй большасці гінуць. Яны мала размнажаюцца, таму што пануры шатан рэдка мае стасункі са сваёю шатаніхаю. Яны цярпець не могуць чараўнікоў, якія беспакарана дражняць шатаноў і прымушаюць іх да ўцёкаў.

У вольны час шатаны плятуць лапці або майструюць дарожныя кіі: і лапці, і кіі ў іх хутка зношваюцца.

*Никифор.-2, с. 39—40.*

**Прахі**

ПРАХІ — гэта ці Духі-пачаткоўцы, ці маладольныя, ці гультаяватыя, ці тыя, што служаць у іншых Духаў на пабягушках. Самі па сабе яны не ўяўляюць небяспекі — па ўласнай волі не чапляюцца да ахвяры і пры выкананні даручэнняў перакручваюць чужыя намеры, за што часцей за іншых Духаў церпяць здзекі.

Якімі б праставатымі ні здаваліся прахі, яны ўсе ж злосныя на людзей, жадаюць шкодзіць ім.

*Никифор.-2, с. 43—44.*

**Ератнікі**

ЕРАТНІКІ — Нядобрыя Духі, якія кожную ноч паяўляюцца на дарогах, чакаюць тут і здзекуюцца з запозненых падарожнікаў, здзекуюцца з людзей і на іх уласных падворках, і ў будынках.

Ератнікі пачынаюць згубную дзейнасць пасля вячэрніх прыцемкаў і працягваюць яе да першых праблiскаў ранішняй зары. Дзёрзкі ератнік раптоўна прыстае да ахвяры і абхоплівае яе аберуч ці проста хапае за горла. У тым і другім выпадку ахвяра траціць прытомнасць ці супраціўляецца, пакуль не развітаецца з жыццём. Тады ератнік, нацешыўшыся са страху і пакут ахвяры, п’е цёплую кроў, а цела нявечыць. Нават калі ахвяра пры першым подступе ератніка і не разгубілася, то далей не можа ад яго адбіцца.

На шчасце, ератнікаў адносна няшмат, ды і нішчаць яны адзін другога. У поўнай начной цішыні два ератнікі неміласэрна грызуцца, драпаюцца, душаць адзін аднаго, і не было яшчэ выпадку, каб адзін з іх застаўся цэлы. Акрамя таго, і людзі навучыліся зжываць ератнікаў са свету. Параненыя вострымі металічнымі прадметамі, яны хутка гінуць. Кожны раз пры гібелі ератніка матэрыяльнае рэчыва яго ператвараецца ў смярдзючы прах, які разбуральна дзейнічае на здароўе людзей і нават жывёл, калі праз ежу і пітво трапляе ў цела.

*Никифор.-2, с. 61—62.*

**Клікун** КЛІКУН — Дух, які вандруе па дарогах. Ён не злы, хоць выглядае грозна. Гэта худы волат, у абарваным балахоне, з доўгімі рукамі і доўгімі валасамі на галаве. У адной руцэ ён трымае вялікую пугу з конскага воласа, а ў другой — залаты рог. З гэтымі рогам і пугай, Клікун раз'язджае па дарогах днём і ўначы пры святле месяца і дзіўна, дзіка вішчаць. Ездзіць ён на падуладным яму Духу ў выглядзе вялікага змея.

Клікун, як і ўсякі Дух, нябачны, але яго можна заўважыць днём па тым, што калі ён праязджае, то пыл уецца віхрам і кружыцца вельмі высока. Чалавек павінен сцерагчыся, каб не прайсці праз гэтую віхуру, каб не разлаваць Клікуна. Калі ж нехта паспрабуе праехаць, Клікун махне сваёй пугай, бліснe рогам, свісне жахліва, і якое-небудзь няшчасце адбудзецца з чалавекам. Уначы аб тым, што праехаў Клікун, можна даведацца па паху серы, якую выдае Дух-памагаты, што вязе яго.

Беларус, а асабліва беларуска, адпраўляючыся ў дарогу, просіць у Клікуна аберагчы яго, не збіваць з дарогі.

*Шпилевский-4, № 42.*

**Чорная Баба** МЯТЛА, якая з'яўляецца над зямлёю, перакідаецца ў Чорную Бабу. Па начах яна ходзіць па сёлах ды крэсліць вугалем на дзвярах хат крыжы. Дзе паставіць чорны крыж, у той хаце ўсе памруць. Калі стаіць на небе Мятла, трэба самому накрэсліць вугалем крыж на сваіх дзвярах. Калі прыйдзе Чорная Баба, дык, пабачыўшы, што ўжо пазначана, пойдзе сабе, думаючы, што гэта яна сама зрабіла ды не помніць.

*Pietkiewicz, s. 12.*

## Духі хвароб

**Паветрые** ЭПІДЭМІІ прыносіць толькі з ветрам, таму народ так і называе іх — Паветрые. Гэта — Паморак, Чума, Халера, Воспа. Яны з'яўляюцца ў вёску пад выглядам жанчын, якіх, аднак, рэдка каму выпадае бачыць. Прыкінуўшыся прыгажуняй, такая хвароба звычайна спы-

няецца за сялом на могілках і адтуль упрыцемку і перад узыходам сонца памахвае на сяло чырвонай ці чорнай хусцінай. Ад гэтага махання людзі паміраюць як мухі. Па начах хваробы ў тым ці іншым абліччы ходзяць і па хатах. Але ім даводзіцца часта ўцякаць ад сабак, якія іх бачаць і пужаюць.

Калі мясцовасці пагражае заразная хвароба, жыхары адной ці некалькіх суседніх вёсак карыстаюцца такім сродкам. Двух валоў-блізнят запрагаюць у саху, зробленую, калі магчыма, майстрам з блізнят. Кіраваць сахою і валамі выбіраюць таксама братоў-блізнят. Адзін кіруе жывёлаю наперадзе, а другі правіць сахою. У суправаджэнні ўсіх жыхароў вёскі, не выключаючы немаўлят і ляжачых хворых, якіх нясуць на руках, праводзяць баразну (часам тры) вакол вёскі, улетку па зямлі, а зімою па снезе. Гэтая баразна мае такую сілу, што праз яе цэлы год не пяройдзе не толькі заразная хвароба, але і звер.

*Янчук, с. 41.*
*Никифор.-1, 258.*

## Падвей

ПАДВЕЙ — Нядобры Дух ветру, што круціцца віхрам у полі. Ён можа з сабой бяду прынесці, але ж і яго трэба сцерагчыся. Калі во круціць дзе якое смецце, то туды і глядзець не трэба, каб Падвей большы не стаў і на цябе не паляцеў.

Ён насылае на людзей асаблівую хваробу, якая таксама называецца Падвеем: наляціць віхор на чалавека і скруціць яму галаву набок, адніме мову, а то скруціць руку ці нагу. Падвей — благі вецер, зыходзіць ад Нядобрага Духа ці ад чараўніка.

Часцей за ўсё ён хаваецца ў віхрах ці скразняках. І летам бывае: ціха-ціха, а раптам закруціць на дарозе пыл слупом у цябе пад носам, а трапіш у гэты віхор — дабром не скончыцца: ці галаву скасабочыць, зверне набок, ці руку скруціць, ці нагу, а не дык і мову адыме.

Заўсёды трэба ратавацца ад віхру. Калі ён круціцца, трэба паказаць яму кукіш: гэтага Падвей не любіць і праімчыцца бокам, не закрануўшы чалавека. Каб надзейней засцерагчыся ад яго, лепш заўсёды мець пры сабе якую-небудзь жалезную рэч, напрыклад, сякеру, нож. Калі Падвей шкодзіць гаспадарцы і кукіш не дапамагае, кіньце ў яго нажом ці сякераю.

Ён толькі піскне, а віхор невядома куды і дзенецца. Неба адразу ачысціцца, на ім не будзе ніводнай хмаркі.

Раззлаваныя людзі кажуць: «Каб цябе Падвей насіў!», але так нельга клясці, бо бяду наклікаць нядоўга.

*Багдановіч, с. 79.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 01/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 99/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 90/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС – 52/06.*

## Воспа

ВОСПА — гэта Дух у выглядзе злоснай, агіднай старой з бліскучымі вачыма і з адным моцным зубам, які тырчыць вонкі. Цётка-Воспіца пырскае сваёю атрутнай слінаю ў выбранную ёю ахвяру, і тая хварэе на воспу. Пра чалавека, твар якога захаваў сляды гэтай хваробы, кажуць у насмешку, што на яго твары Духі гарох малацілі ці ячменныя крупы дралі. У розных мясцовасцях Беларусі Воспу завуць: Рабая, Рабуха, Шчарбачка.

*Ляцкі -2, с. 33–34.*

## Паралікі

ПАРАЛІКІ не ідуць, як іншыя Духі, на заклік чалавека ў тую ж хвіліну, а значна пазней, нават праз гады. Любімымі ахвярамі іх бываюць людзі сталага ўзросту: мужчыны і жанчыны — усё роўна. Паралікі падступаюцца да чалавека спадцішка, быццам крадучыся: падступіцца і адступіцца, але з кожным разам усё бліжэй. Яны незаўважна авалодваюць ахвяраю, якая адчуе іх уздзеянне толькі тады, калі яны канчаткова зжыліся з ёю.

Слабыя паралікі да ахвяры падступаюцца заўсёды па двое-трое: тут яны працуюць паперамення і толькі пры асаблівым супраціўленні ахвяры — разам. Паралікі не кранаюць душу сваёй ахвяры, не нападаюць на яе непасрэдна, яны галоўным чынам даймаюць цела. Як паволі падступаюць паралікі да ахвяры, гэтак жа няспешна, з неаднаразовымі вяртаннямі яны і пакідаюць яе.

*Никифор.-2, с. 37–38.*

## Лядашчык

ЛЯДАШЧЫК — дух, які псуе людзей. Гэта адзначаецца ў тым, што Дух робіць людзей хворымі, паўвар'ятамі, пазбаўляе іх прытомнасці, ператварае іх у розных жывёл. Лядашчык ненавідзіць жанчын за тое, што яны нараджаюць дзяцей, таму больш за ўсё шкодзіць ім. Усё, што адбываецца з жанчынамі — хваробы, прыпадкі — беларусы прыпісваюць Лядашчыку.

Беларусам ён з'яўляецца ў выглядзе пачварнага вырадка, які весь у рудых валасах, з адным вокам у ілбе і крыллямі. Лядашчык вядомы ў шмат якіх месцах Беларусі, але можа мець іншая імя: Шаўрэдзь, Псуцень.

*Шпилевский-4, № 46.*

## Чума

СТРАШЭННАЙ бядой для людзей была Чорная немач ці Чума. Яна з'яўляецца перад людзьмі ў вобразе жанчыны, паветранай істоты. Лётала яна заўсёды толькі ноччу, выбірала сабе ахвяру. Складкі белага адзення Чумы шырока распасціраюцца і закрываюць ззянне месяца. Яна не церпіць ні крыку пеўня, ні сабачага брэху, таму ўсюды, дзе яна пануе, сабакі перастаюць брахаць, а спеў пеўня робіцца хрыплы.

Калі Чума набліжаецца да выбранай мясцовасці, то ператвараецца ў цёмную птушку, часцей за ўсё пугача ці саву з вогненнымі стрэламі, намячае сабе ахвяры. Пераследуючы якога-небудзь чалавека, вые, стогне так страшэнна і абавязкова кліча па імені гэтага бедалагу, каб ён азірнуўся на яе. Але той павінен быў не азіраючыся ісці наперад, інакш смертаносная птушка кідала ў яго свае вогненныя стрэлы і пратыкала імі. У той жа момант атрута пападала ў кроў. І нічога ўжо не магло дапамагчы — і Смерць з'явіцца перад чалавекам.

Таму кожны беларус ведаў, што калі раптам пачуеш нешта падобнае, то трэба, не абарочваючыся ні на якія стогны, хутка ісці наперад і шаптаць пра сябе малітву ці замову.

Адной надзеяй і выратаваннем ад Чорнай немачы была замова: «Чума-чумішча, ведзьма-ведзьмішча, пайдзі ты на мхі, на балоты, на сухі лес, на чортаву люльку, адкасніся ад (імя), ад яго жоўтай касці і краснай крыві. Хух, Добры дух!» (Аднак гэта замова дапамагала, калі прайшло яшчэ не шмат часу, пакуль хвароба не атруціла ўсё цела.)

Чума рагатай жывёлы ўяўляецца беларусам агіднаю старою, узброенай моцным вострым шылам. Сама яна звычайна не ходзіць, а яе цягае на сваёй

спіне чорная карова. Часам гэтая хвароба з’яўляецца сярод статка ў выглядзе чорнай каровы і заражае яго.

*Ляцкі-2, с. 35.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 163/05.*

**Халера**

ХАЛЕРУ беларусы ўяўляюць у вобразе жахлівай жанчыны з доўгімі светлымі валасамі і бліскучымі вачыма. Яна раскідвае па зямлі зерне хваробы, якое вымае з невычэрпнага кошыка. Робіць яна гэта часцей за ўсё вясною, і зерне яе прымешваецца да агароднага насення і заражае яго. Калі яна ідзе па вадзе, то заражае і яе.

Халера прыходзіць у вёску пад выглядам старой жанчыны, ці каровы, ці якой-небудзь іншай жывёліны. Ходзіць уночы па хатах і атручвае квас і іншае пітво, пакінутае непакрытым. Таму ў халерны час трэба як мага старанней прыкрываць ваду, квас, бярозавы сок, сываратку і малако.

Як толькі дзе блізка аб’явіцца Халера, то трэба асцерагацца, каб яна як-небудзь не прабралася на вёску. Для гэтага лепш за ўсё нікога і нічога не пускаць, раскладваць на дарозе жывы агонь. Гэты агонь павінен гарэць дзень і ноч.

Можна скарыстаць і іншыя спосабы барацьбы з Халераю.

Трэба, каб маладыя дзяўчаты, паскідаўшы з сябе сарочкі, запрагліся ў саху і абаралі вёску кругам.

Каб Халера не прабралася на вёску, можна ўзяць абпалены з двух канцоў ожаг[1] паміж ног ды і «аб’ехаць» вакол вёскі так, каб акрэсліць на зямлі замкнуты круг. Такі круг засцерагае не толькі ад Халеры, але і ад усялякае пошасці і ад паморку ці ўпадку гавяды.

У час халернай пошасці стараліся знайсці валоў белай масці, на якіх яшчэ не пачыналі араць; такіх валоў запрагалі ў саху і абворвалі імі вакол сяла ці вёскі. Ратаі абавязкова павінны быць блізнятамі, з якіх адзін кіраваў сахою, а другі — валамі. Пасля такога абворвання пошасць спыняецца.

Як хто першы захварэе на Халеру, то лепш за ўсё таго чалавека пахаваць жыўцом: тады разам з хворым пахаваецца і Халера.

Часамі Халера прыкідваецца якою-небудзь беднаю жанчынаю, якая просіцца, каб яе падвезлі да вёскі.

*Ляцкі-2, с. 34—35.*
*Сержп.-1.*
*Fed.-1, с. 7.*

[1] Ожаг — абпалены на агні канец кія.

**Моравая Дзева** ПЕРАД надыходам паморку часам з’яўляецца Моравая Дзева, якая, носячыся ў паветры, размахвае чорнай хусткаю. І над якой вёскаю яна памахае сваёй смяротнай хусткай, у той вёсцы і пачнецца Паморак. Здараецца, што яна махае хусткай, прасунуўшы руку ў вакно якой-небудзь хаты. Тады ў гэтай хаце пачнуць паміраць людзі.

*Багдановіч, с. 267.*

**Пошасць** ЧЫМ ТОЛЬКІ Пошасць ні скідаецца — то худою страшэннаю жанчынаю, то якой-небудзь жывёлінай, якая ходзіць па зямлі. Толькі ёй нельга скідацца птахам, бо тады б яна ўвесь Свет загубіла, пераляатаючы па паветры з вёскі да вёскі. Таму ходзіць Пошасць пешкі ды стараецца, каб якім-небудзь ашуканствам уехаць у вёску. А тут людзі то абаруць вёску ці акрэсляць яе смаляным з двух канцоў ожагам, а то па канцах вуліцы дзень і ноч кладуць агонь. Ды яшчэ не просты агонь, а жывы.

Ніяк не можа паганая Пошасць пераскочыць і цераз баразну ці цераз абчэрчаную мяжу. Сунецца яна пралезці па вуліцы, ды куды там — святы агонь пячэ, бы ў горне.

Пошасць, як уваб’ецца, дык датуль не пакіне, пакуль усіх не перабярэ ды не ўложыць шмат людзей або жывёлы. Кожная Пошасць мае сваю любімую постаць, у якую яна скідаецца, калі ёй трэба падмануць людзей ды прабрацца на вёску.

*Сержп.-1, № 2243.*

**Паморак** ЯК ТОЛЬКІ пойдзе чутка, што дзе-небудзь блізка аб’яўляўся Паморак, то людзі хутчэй зганяюць статак куды-небудзь далей ад вёскі ў лес ці на астраўкі за балота. Там у кашарах трымаюць яго да самае зімы, а часамі і зімой.

Каб пазбавіцца ад Паморку, практыкавалі і такі спосаб. Як бывае Пошасць на людзей ці Паморак на жывёлу, то здабываюць агонь, тручы два брускі моцнага сухога дрэва. Паляць той святы агонь ва ўсім сяле ці вёсцы, а па канцах вуліцы дзень і ноч, каб замкнуць хваробе дарогу ў вёску.

Рабілі і так. Маладыя дзяўчаты запрагаліся ў саху, а старыя бабы бралі ў рукі патэльні, косы і іншыя брынклівыя прадметы і, распрануўшыся дагала, з гучным крыкам, віскам, шумам, трэскам абворвалі баразну вакол вёскі, праз

якую мор не можа перайсці. Усім загадзя паведамлялася пра гэта. Мужчыны не павінны ўдзельнічаць у гэтым дзеянні, а калі нехта з іх трапляўся на дарозе, яго збівалі да паўсмерці.

*Богданович, 167—168.*
*Сержп.-1, № 2244.*
*Сержп.-1, № 2254.*

## Багі і Духі Наўя

### Паляндра

У НАЎІ, дзе жывуць самыя Нядобрыя Духі, усім кіруе Багіня смерці — Паляндра. Яна, сцвярджаюць беларусы, варожа ставіцца да людзей і таму бывае рада, калі людзі часцей паміраюць. У выглядзе пачварнай жанчыны Паляндра з’яўляецца ў хатах паміраючых людзей і забірае іх душы. Душы гэтыя яна перадае Бабе Язе, з якой моцна сябруе і часта разам раз’язджае ў адной жалезнай ступе. Калі беларусы гавораць пра смерць якога-небудзь дарагога чалавека, то звычайна адплёўваюцца, кажучы: «А кыш, Паляндра, не табе б, а кыш!»

*Древлянский, № 33.*

### Марэна

УСЮ ЗІМУ над зямлёй і людзьмі разам з Марозам пануе смяротны Дух Марэна. Гэта старая пачварная баба. Але калі прыходзіць час вясны, Марэна вымушана хавацца ў Наўі да наступнай зімы. У Наўскі Вялікдзень беларусы, здзекуючыся з Духа, топяць куль саломы, прыбраны за Марэну, у першай за вёскай лужыне. Беларусы радуюцца, што па гэтым часе заканчваецца панаванне Марэны.

*Ластоўскі.*

### Смерць

СТВАРЫЎ Чарнабог Смерць. І кажа:

— А ты, Смерць, будзеш людзей у магілу забіраць, будзеш зводзіць іх з Гэтага Свету.

— Не, — кажа Смерць, — не буду я смерцю, бо людзі будуць баяцца мяне, будуць ганіць, праклінаць.

— Не бойся, — кажа Бог, — ніхто цябе не будзе клясці, бо на гэта будзе прычына.

З той пары і павялося, што ніхто не кляне, не ганіць Смерць. Смерць не вінавата, бо ёсць прычына, якую ведае толькі Бог.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС – 40/06.*

## Копша

КОПША — Багіня нябожчыкаў. Копша — старая самага жахлівага выгляду. Яна жыве ў дамавінах, і асабліва ў тых, дзе толькі-толькі пачынаюць цела руйнавацца, і трывожыць тых памерлых, родныя якіх не задобрылі яе, не паклалі ў дамавіну грошаў або посуд з якім-небудзь трункам.[1] Тыя родзічы, якія чаму-небудзь не дагадзілі ёй, стараюцца задобрыць Копшу ў дзень трызны,[2] якая адбываецца на Беларусі на Радуніцу.

У гэты дзень збіраюцца жанчыны, пераважна старыя, на могілкі сваіх родных і блізкіх з запасам розных аладак, бліноў, пірагоў і іншай ежы і раскладваюць іх на могілках. Частка гэтых прыпасаў спажываецца самімі роднымі, астатняе ж прысвячаецца Копшы, каб улагодзіць яе.

Звычайна прарываюць у ізгалоўі магілы яму і туды закопваюць прынашэнні Копшы, на месцы ж ног прарываюць глыбока жалабок і кідаюць у яго некалькі манет, большаю часткай медных, па ліку ўдзельнікаў сям'і. Усе гэтыя дзеянні суправаджаюцца рознымі замовамі.

*Шпилевский-4, № 45.*

## Белая Баба

ПАВЯДАЧКАЙ заканчэння зямнога жыцця чалавека з'яўляецца Белая Баба, прадвесніца з'яўлення Смерці. Дух Белай Бабы з'яўляецца ў постаці маладой жанчыны, але з тварам мерцвяка.

Яна ўзнікае перад чалавекам раптоўна, слупом вырастаючы з-пад зямлі. Высокая, стройная, пад белым покрывам, набліжаецца, працягваючы да яго рукі і, не даходзячы ўсяго толькі некалькі крокаў, адкідвае назад густы вэлюм, адкрываючы напаўсатлелы твар старой нябожчыцы. Так стаіць яна перад чалавекам некалькі хвілін. Потым, паступова рассейваючыся белым туманам, знікае.

---

[1] Алкагольны напітак.

[2] Памінальны абрад.

Чалавеку такая сустрэча прадказвае хуткую смерць. Калі ж Белая Баба з'яўляецца, але хавае свой твар пад пакрывалам, — чакаць трэба цяжкай хваробы альбо смерці блізкага чалавека.

*Беларус. міфалог., с. 189.*

**Дзева смерці**

ДЗЕВА СМЕРЦІ таксама жыве ў Наўі. Адтуль яе пасылае па людскія душы Чарнабог. Дзева смерці — гэта велізарная жанчына. Галава яе вышэй за хваіны. Яна ходзіць па зямлі з вогненным вянком на галаве і з акрываўленай хусткай у руцэ. Дзе ступіць смертаносная Дзева — там пакрываюць зямлю свежыя магілы. Куды махне яна хусткаю — там пусцеюць паселішчы і сёлы. У тым доме, куды яна прасуне ў адчыненае акно руку са сваёй крывавай хусткаю, не застаецца ніводнае жывой душы.

*Еремич, с. 45—46.*

**Ліхаманкі (трасцы)**

ДУХАЎ ХВАРОБЫ ліхаманак у многіх месцах Беларусі называюць яшчэ трасцамі.

Ліхаманкі выходзяць з-пад зямлі восенню і вясною і бадзяюцца па ўсім свеце. Месца знаходжання ліхаманак у гэтыя часы — вада і балотныя мясціны. Таму лячыць ад ліхаманкі трэба менавіта зямнымі, а не вадзянымі ці балотнымі рэчамі.

Усяго ліхаманак — дванаццаць сясцёр. Колькасць, недастатковая на ўвесь свет, таму яны толькі перыядычна наведваюць сваіх ахвяр; адсюль іх зменлівы характар. Ліхаманкі паасобку выбіраюць сабе на пэўны час жытло ў чалавечым арганізме, пераходзячы па чарзе ад чалавека да чалавека, і жывуць яго сокамі.

Ліхаманкі ходзяць па свеце, клічуць людзей, і хто адгукнецца, у тым адна з іх адразу паселіцца. Ліхаманкі падпільноўваюць сваіх ахвяр і пры набліжэнні чалавека ператвараюцца ў пару, стараючыся залезці пад кажух ці світку. Пасля вяртання чалавека дахаты яны пачынаюць дзейнічаць.

Часам ліхаманкі проста прыходзяць да людзей уночы ў выглядзе прыгожых жанчын. Калі той, да каго яны набліжаліся, не ўставаў ці не гразіў ім, то і ў яго ўваходзіла ліхаманка.

Любяць ліхаманкі сядзець на асіне, і асіна ўвесь час дрыжыць кожным сваім лісточкам, бо гэтая погань яе калоціць. Увесну і ўвосень нельга спаць на захадзе сонца: тады найхутчэй у безабароннага чалавека ўваходзіць ліхаманка ці прыстае іншая ўнутраная хвароба. Часта здараецца, што, не

паспеўшы па нейкай прычыне ўвайсці ў соннага, ліхаманка спяшаецца зрабіць гэта адразу пасля яго сну. Прачнуўшыся, чалавек выразна чуе, што яго называюць па імені, хоць ён і не бачыць таго, хто кліча, а гэта кліча ліхаманка. Як толькі чалавек адгукнуўся, ліхаманка завалодвае ім. Таму прадбачлівы чалавек не павінен адгукацца, не пераканаўшыся, што яго кліча не прывід, а сапраўдны чалавек.

Часам трасцы з’яўляюцца ў сне, прадказваючы хваробу ці зыход яе або засцерагаючы чалавека ад пагрозы хваробы. Трасца смяротная гаворыць звычайна: «Ляшчына, не ляшчына, а я цябе насмерць затрасу!» Калі чалавек засне выпадкова ў тым месцы, што запэцкана скацінаю, то іншыя трасцы з’яўляюцца чалавеку ў сне і будзяць яго, каб неадкладна ўстаў. Калі чалавек не паслухае, трасца плюе на соннага і той адразу ж захварэе на трасцу.

Час ад часу трасцы збіраюцца разам, звычайна на якой-небудзь лясной палянцы. Там яны расказваюць пра свае справы, складаюць планы на будучае, дзеляць між сабою нагледжаныя ахвяры.

Беларусы вызначаюць 12 постацей трасцаў.

Трасца смяротная выклікае смерць заўсёды, без выключэнняў.

Трасца ўнутраная паражае вантробы, у прыватнасці «каля сэрца нудзіць».

Трасца павярхоўная выяўляецца тады, калі «скура выбіваецца наверх».

Трасцу касцявую суправаджае ламата ў касцях.

Трасца пудавая ўзнікае з перапуду. Спыняе гэтую ліхаманку любы нечаканы моцны перапалох. Дзеля гэтага можна знянацку абліць хворага вядром холоднай вады, разбіць над галавою ў яго гліняны гаршчок. Ва ўсіх гэтых выпадках трэба мець на ўвазе, што тут пужаецца не чалавек, а ліхаманка, што залезла ў яго.

Трасца веснавая пануе ўвесну. Трасца лістападная, ці восеньская, — адна з найбольш упартых постацей.

Трасца гарохавая пануе, калі цвіце гарох. Супраць яе найлепшым сродкам лічыцца сон у гаросе, калі той цвіце.

Ад асінавай трасцы можна пазбавіцца, сагнуўшы маладое асінавае дрэва і расшчапіўшы яго. Хворы на ліхаманку тры разы голы пралазіць праз расшчэплены не да канца ствол, а потым зноў надзявае кашулю, але толькі навыварат.

Трасца ядленцавая — супраць яе дапамагае адвар з ядлоўцавых ягад, сабраных на веташку.[1]

---

[1] Ветах — месяц у апошняй квадры, на зыходзе.

Трасца агнявая — супраць яе дапамагае любое цяпло: пацець, парыцца ў лазні, грэцца на печы і г. д.

Трасца ледавая патрабуе халодных лекаў. Напрыклад, глытаць кавалкамі лёд, купацца ў часе прыпадку ў халоднай вадзе. Холад таксама дапамагае ад трасцы пудавой і ад пярэпалахаў.

Ад трасцаў шмат усялякіх лекаў, але не ўсе і не кожнаму дапамагаюць: аднаму памогуць, а другому не. Ды яшчэ шмат залежыць ад таго, на якую трасцу нападзеш. Каб не падхапіць ліхаманку, трэба як мага часцей знаходзіцца пры конях.

Калі трасца толькі гняце ды ломіць косці, то трэба напіцца свежага бярозавага соку ці кіслага малака, тады яна пачне трэсці, а як трасе, то хутчэй можна ад яе адчапіцца.

Трасцу нельга лаяць. Пра яе ўспамінаюць з прыгаворкаю: «Няхай яна здаровенькая і вясёленькая ходзіць», і нават на Дзяды клічуць на вячэру трасцухну-матухну.

*Никифор.-1, с. 274.*
*Сержп.-1.*
*Янчук-1, с. 35.*

# ЗЯМНОЕ ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА

**Палешукі і палевікі**

Было ў бацькі дванаццаць сыноў. Былі яны ўдалыя хлопцы. Жылі ў лесе, дзе вадзілася многа ўсялякага звяр’я, пасвілі сваю жывёлу ды лавілі звяроў. Жылі яны разам і слухалі старога бацьку, а ён ужо сівенькі, бы лунь, нават летам сядзеў у кажушку ды камандаваў. І быў у іх лад, і ўсім было добра.

Хлопцы ўсе пажаніліся. Было ў іх многа дзяцей, але ўсе слухалі старога бацьку і кожны рабіў сваю справу. Прыйшоў час, памёр стары бацька, і пачалі жанчыны сварыцца паміж сабою, ды падбухторваць сваіх гаспадароў. І такая ў іх пайшла калатня, што і жыцця не стала. Пачалі жанчыны ў адзін голас крычаць: дзяліцца ды дзяліцца. Пачалі браты дзяліцца. Калаціліся, калаціліся яны, пакуль дзялілі жывёлу ды ўсё дабро, а як пайшлі дзяліць зямлю, дык так пачалі біцца, што ледзь не пазабіваліся. Калоцяцца браты паміж сабою за зямлю, захопліваюць чужыя дзялянкі, і няма ў іх спакою.

Толькі два малодшыя браты жылі паміж сабою вельмі згодна: куды адзін, туды і другі. Не захацелі яны калаціцца з братамі. Кінулі сваю бацькаўшчыну ды і пайшлі ў свет шукаць сабе зямлі. Зрабілі з двух дубоў з каранямі вялізныя сані, запраглі дванаццаць пар валоў, наклалі ўсялякага дабра, пасадзілі жонак з дзецьмі ды і паехалі па пяску. Працягнулі трохі валы і сталі, не хапае сіл цягнуць сані па пяску. Тады адзін брат давай падкладваць упоперак пад палазы круглыя калодкі. Коцяцца калодкі, і сані паўзуць уперад. Абрыдла братам падкладваць калодкі пад палазы, дык адзін і кажа другому:

— Давай, братка, зробім такую прыладу, каб калодкі заўсёды круціліся пад палазамі.

Зрабілі яны колы. Лёгка пацягнулі валы, так што яшчэ і браты самі селі на воз. Едуць яны ды едуць і пад’язджаюць да вялікай ракі. Шукалі яны доўга мелкага месца, каб пераехаць уброд, ды нідзе не знайшлі. А тут пачалася вялікая бура. Лес раве, як звер. Вецер ломіць дрэвы, як жанчыны кастрыцу, ды і кідае на зямлю і ў раку. Плывуць па вадзе дрэвы, быццам плыты. Зірнулі на тое браты ды і сцямілі, як перабрацца цераз раку. Давай лавіць на рацэ дрэвы і звязваць іх разам. Так зрабілі яны плыт.

Калі сунялася бура, падагналі браты той плыт шчыльна да берага ракі, запраглі валоў і ўзвезлі воз на плыт. Стаяць яны на плыце ды кіруюць доўгімі жэрдкамі, а плыт і сам плыве з вадою. Аднесла плыт вадою далёка, але вось ён прыстаў да другога берага. Пабачыла свойская жывёла, што валы паплылі па рацэ ды і выйшлі на другі бок, кінулася ў ваду і пераплыла цераз раку.

Паехалі браты далей і забраліся ў такі лес, што і канца яму няма. Не могуць далей ехаць — лес перашкаджае. Пачалі яны церабіць дарогу ды масціць грэблі. Але дзе там: чым далей, тым лес усё гусцее, а ў ім стаіць такая тхлань ды нетра, што і выбрацца нельга. От і кажа адзін брат:

— Застануся я тут, бо не магу выбрацца з лесу.

І застаўся ён сярод таго лесу жыць. І назвалі яго і дзяцей яго — палешукамі.

Другі ж брат працярэбліваў дарогу, масціў грэблі ды клаў кладкі і ехаў усё далей. Мабыць, з тых часоў на Палессі яшчэ ёсць тыя прасекі ды грэблі, што нарабіў той чалавек.

Нядоўга яны ехалі. Бачаць — лес пачаў радзець, пачалі трапляцца прагаліны, палянкі ды палі. Тады ён спыніўся там і пачаў разрабляць поле. За тое і назваліся яны палевікамі. Потым размножыліся як палешукі, так і палевікі, занялі пусты лес ды і пачалі жыць.

*Сержп.-2, с. 69—73.*

### Князь Бой і яго сабакі

Над ракой Дрысай жыў князь Бой, праслаўлены на ўсю Беларусь як дужы волат. Ён кіраваў усім народам, які жыў па берагах Дрысы. Звычайнай пацехай яго было тое, што ён аб'язджаў бары і лясы з лукам і стрэламі і паляваў на ласёў і іншых дзікіх звяроў. Для гэтага ён меў двух верных сабак: адзін зваўся Стаўры, *а* другі — Гаўры. Абодва яны былі вельмі дужыя і разумныя. Самы магутны мядзведзь не ў стане быў вытрымаць сутычку з імі: у той жа момант ён быў бы імі разадраны, нібы той заяц ганчакамі.

Калі на паляванні, аддзяліўшыся як-небудзь ад сваіх таварышаў, Бой аказваўся ў акружэнні зладзеяў, ён іх разганяў і разбіваў, нацкоўваючы на іх сваіх сабак. Не раз здаралася, калі ён блудзіў у далёкіх лясах, яны яго выводзілі на дарогу, пад самы яго дом.

Гэтыя сабакі часта выратоўвалі свайго гаспадара ад вялікіх небяспечнасцей, і таму яны былі для яго самай прыемнай забавай у жыцці. Ён загадаў сваім падданым аддаваць ім такую ж пашану, як найважнейшым асобам, якія служылі пры ім. А калі ад старасці гэтыя сабакі адзін за адным паўміралі, дык ён, улічваючы іх заслугі, прызначыў асобныя дні ў годзе для ўрачыстага ўшанавання іх памяці.

У гэтыя дні народ збіраўся на тыя мясціны, дзе былі закапаны іх косці, прыносіў з сабой стравы і пітво і банкетаваў там да позняй ночы; аб'едкі і косці кідалі ў агонь, называючы пры гэтым імёны сабак — Стаўры і Гаўры, — выклікаючы іх цені з Таго Свету.

*Шейн-2, с. 629—630.*

### Бой і яго сыны

Па некаторым часе чалавек стаў у Гэтым Свеце заводзіць свае парадкі. Ці шмат часу прайшло, ці мала, але меў ужо чалавек сваю сялібу, меў многа жонак, а яшчэ больш дзяцей. Было ў яго прозвішча —

Бой. А як прыйшла пара паміраць, дык ён склікаў сваіх сыноў і падзяліў усю сваю маёмасць. Толькі пра аднаго сына забыўся. Сын у гэты час быў на паляванні, і з ім былі любімыя бацькавы сабакі Стаўры і Гаўры. Прозвішча гэтаму сыну было Белаполь. Неўзабаве пасля смерці бацькі вярнуўся Белаполь з палявання, а браты яму кажуць:

— Бацька падзяліў нам усю сваю маёмасць, а табе ён пакінуў сваіх сабак. Ды яшчэ наказаў, каб ты іх пусціў па волі: аднаго ў правы бок, а другога — у левы; колькі яны зямлі аббягуць у дзень, дык гэта ўся зямля твая будзе.

Пайшоў Белаполь і злавіў дзвюх птушак, што прыляцелі адна з паўднёвага мора, другая — з заходняга. Пусціў паўднёвую птушку на поўдзень, ды і кажа аднаму сабаку:

— Бяры!

Пусціў другую на захад і кажа другому сабаку:

— Хапай!

Паляцелі тыя птушкі; адна ў адзін бок, другая ў другі. Пабеглі сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася. Як пабеглі тыя сабакі, дык і да гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а у другі бок — Дняпро.

Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца. У гэтага Белаполя ад розных жонак яго развяліся розныя плямёны. Яны і да гэтага часу там ходзяць, зямельку скародзяць ды жыта сеюць.

*ЛіП, № 94.*

### Тры Долі

Яшчэ на раду чалавеку даецца доля. Каму якая трапіцца доля, такое ў яго і будзе шчасце. Шчасце чалавека залежыць ад хвіліны, у якую ён нарадзіўся. Калі ў шчаслівую хвіліну, то будзе яму шанцаваць, калі ў нешчаслівую — будзе нешчаслівы. І што ты ні рабі, як ты ні старайся, а нічога не зробіш, калі доля лядашчая. Калі ж доля спрыяе, то хоць ты ляжы на печы ды грэй чэрава, а табе ўсё так і сыплецца, быццам у млыне збожжа з каша.

Жылі ў адной вёсцы мужчына з жанчынаю. Пабраліся яны яшчэ маладымі, а тут ужо хутка і старасць, а дзяцей усе няма ды няма. Мужчыну яшчэ нічога сабе, пойдзе лавіць рыбу або ў лес на паляванне, лазіць там увесь дзень. Вечарам прыцягнецца дамоў, падсілкуецца чым Бог даў ды і ляжа спаць.

А жанчына, вядома, заўжды каля дому таўчэцца. Дагледзіць яна гаспадарку, пакорміць свіней, сядзе на лаву каля акна, падапрэ рукою галаву ды і сядзіць засмучоная, быццам каго пахавала. Вядома, якая жанчыне жытка, калі ў яе няма дзяцей.

Раз сядзела яна так каля акна, як падыходзіць старэнькі дзядок і просіць піць. Падала яна яму конаўку бярозавага квасу. Напіўся той дзядок, выцер свае сівыя вусы і бараду, а потым і пытае тую жанчыну, чаму яна такая засмучоная.

— А чаго ж мне радавацца, — адказвае яна, — калі мне Бог не даў уцехі, не даў дзяцей.

— Дык на от выпі гэтага квасу, — кажа старэнькі, — то будуць і дзеці.

Не паспела яна і здзівіцца таму, што сказаў старэнькі дзядок, як ён знік. Здагадалася жанчына, што гэта быў не просты дзядок, а сам Бог. Паслухала яго і дапіла той квас.

Праходзіць некалькі тыдняў, як адчула яна, што сапраўды зацяжарыла. Рада жанчына, бы зноў на свет нарадзілася. Падыходзіць час раджаць. Нарыхтавала яна пялёнак, сарочачак і ўсяго, што трэба, ды чакае, калі ўжо тое будзе. Ёй вельмі хацелася напярод ведаць, хто ў яе будзе, хлопчык ці дзяўчынка. Давай яна раіцца з жанчынамі. Тыя навучылі, што зрабіць, каб прыснілася, якое будзе дзіця. Зрабіла яна, як ёй параілі, і лягла спаць.

Толькі заснула жанчына, як пакінула яе душа цела і зрабілася такая лёгкая, бы матыль. Выйшла яна перш у садок. Аж ён увесь цвіце, бы мак, ды такі ад яго ідзе пах, што няможна і сказаць. Панюхала яна, і зрабілася ёй так весела, што яна давай пляскаць у ладкі.

Толькі яна пляснула ў ладкі, як ногі аддзяліліся ад зямлі, і яна паляцела над агародчыкам, далей цераз садок паміж вецця, ды так, што толькі яно хвошча па твары. Зірнула яна, аж унізе блішчыць рака, а па берагах высокі лес зелянее, быццам мурава. Кругом так гожа, так радасна пасміхаецца сонейка.

Ляцела жанчына, ляцела і спынілася на высокай гары. Агледзелася яна і бачыць: на поплаве сярод кветак скачуць ды качаюцца тры маладыя і вельмі прыгожыя дзяўчыны. Пакупаюцца яны ў рацэ, вылезуць на бераг ды і качаюцца па траве голыя, як маці нарадзіла.

Доўга яны так гулялі, нарэшце, пачалі плесці вянкі. Адна спляла вянок з асоту і з чартапалоху ды кажа:

— Вось такая жытка будзе таго чалавека, якога я буду Доля.

Другая спляла вянок з калінак і з вецця.

— А я, — кажа, — буду Доляй рыбака і паляўнічага.

Трэцяя ж, самая гожая, спляла сабе вянок з каласоў жыта і пшаніцы, убрала яго markaзнымі кветкамі.

— Я ж, — кажа,— Доля гаспадара.

«От калі б гэтая Доля майму дзіцяці», — думае тая жанчына. А тры Долі надзелі на галовы вянкі, пабраліся за рукі да давай гойсаць па поплаве. Гойсалі яны, гойсалі ды ўсё бліжэй, бліжэй падбягаюць да той жанчыны, нарэшце, спыніліся зусім блізка каля яе ды і кажуць:

— Вось тут жанчына, яна хутка родзіць хлапчука.

— Хто з нас пойдзе да яго і будзе яго доляю?

Доўга яны спрачаліся: адна кажа — я, другая — я, а трэцяя сабе крычыць — я. Ніяк не могуць пагадзіцца паміж сабою. Нарэшце адна з іх прапанавала:

— Давайце я падкіну ўгору кветку, і хто з нас першы зловіць яе, такую долю Бог дасць таму хлапчуку.

Згадзіліся Долі на тым.

Самая прыгожая Доля вырвала са свайго вянка кветку і кінула яе ўгору так моцна, што яна аж схавалася ў небе, а праз нейкі час ляціць уніз. Выцягнулі Долі рукі ўгору, каб злавіць тую кветку, а тут падхапіўся такі віхор, што круціць не то што тую кветку і доўгія косы тых Доляў, але аж іх саміх падымае ўверх. Лавілі яны, лавілі, нарэшце, самая прыгожая Доля схапіла тую кветку ды і ўваткнула яе сабе ў валасы.

Потым усе неяк пачало мяняцца. Долі неведома куды дзеліся, а душа той жанчыны паляцела назад да свайго цела. Толькі яна вярнулася, як схапілі жанчыну болі, і яна нарадзіла гожага хлопчыка. Кажуць, што ён быў такі шчаслівы, што, можа, такога другога і не было на свеце.

*Сержп.-1, № 2224.*

## Чаму нованароджанае дзіця хадзіць не ўмее

Распачалі аднойчы жанчыны гутарку, чаму гэта малое цяля, жарабя адразу хадзіць пачынаюць, а чалавек — толькі праз год. Выбралі яны самую смелую жанчыну і адправілі да Бога на неба: папрасіць яго зрабіць так, каб нованароджаныя дзеці адразу хадзіць пачыналі.

Дайшла тая жанчына да Бога і папыталася:

— Скажы нам Божачка, чаму гэта ў каровы, кабылы дзеці адразу пачынаюць хадзіць, а нашы — людскія — не.

Бог ёй і адказвае:

— Ведаю пра вашу жаночую спрэчку. Перадай жанчынкам мае словы. Карова патрабуе быка адзін раз у год, кабыла таксама. Калі ж вы, жанчыны, пагадзіцеся рабіць так, як і жывёла, то і дзеці ў вас адразу пойдуць.

Вярнулася жанчына на зямлю і ўсё дакладна пераказала жанчынам, што Бог сказаў.

Параіліся жанчыны ды не пагадзіліся з умовай Бога.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 5, МС — 200/05.*

## Лёс чалавечы вырашаюць Багі

Застала падарожнага ноч у нейкай вёсцы. Пастукаў ён у адну хату, папрасіўся паначаваць. Гаспадар адмовіў яму, бо жонка яго была цяжарнай. Падарожны так прасіўся, што гаспадар змілаваўся і палажыў яго спаць на лаве каля акна.

У гэту ноч жонка гаспадара нарадзіла сына.

Пасярод ночы падарожны прачнуўся ад таго, што пачуў гутарку жанчын за вакном:

— Гэтаму немаўляці пажыць на свеце столькі гадоў, — сказала адна.

— Не, яму трэба пражыць столькі гадоў, — запярэчыла другая.

— Тады, няхай ён утопіцца ў калодзежы ў дзень свайго вяселля, — прапанавала трэццяя. На гэтым яны пагадзіліся і разышліся.

Раніцай падарожны ўстаў і папрасіў, каб гаспадар узяў яго за кума. Гаспадар і жонка пагадзіліся і ўзялі падарожнага за кума.

Прайшло многа гадоў. У вёсцы сабраліся гуляць вяселле гэтага хлопца. Прыйшоў на вяселле і падарожны, якога ўзялі за кума. Ён загадаў, каб пазабівалі дошкамі ўсе калодзежы на вёсцы. Так і зрабілі.

Надвор'е было добрае. Вяселле гулялі на двары сядзібы. Раптам пайшоў вялікі дождж. У дзірачку ад сучка на бярвеннях калодзежа налілася дажджавая вада. Хлопец чагосці пабег да калодзежа. Паслізнуўся на вільготнай траве, упаў на калодзеж носам у дзірачку з вадой і памёр.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 59/06.*

### Чаму мы не ведаем калі памром

Даўней людзі ведалі, калі смерць па іх прыйдзе, а цяпер, акрамя Бога, ніхто не ведае. А сталася так вось праз якую прыгоду.

Наспеў час паміраць аднаму чалавеку. Выйшаў ён апошні раз на вуліцу, глядзіць, а каля хаты плот паваліўся, суседскія куры ў агарод лезуць.

Узяў чалавек салому і давай саламяны плот гарадзіць. А тут Бог ідзе па дарозе і бачыць: гародзіць чалавек саломай плот.

— Чаму ты саламяны плот гародзіш? Хіба ён стаяць будзе?

— Ат, на мой век хопіць. Усё роўна хутка памру. Навошта мне мацнейшы плот? Гэтага даволі будзе на мой век, — адказаў чалавек.

Зразумеў Бог, што нядобра тое, калі чалавек ведае час сваёй смерці. Кожны толькі сабе робіць, толькі на свой век, а надалей і не хоча. Раззлаваўся Бог і з таго часу зрабіў так, каб людзі не ведалі, калі па іх смерць прыйдзе. Цяпер ведаюць пра гэта толькі вельмі праўдзівыя людзі, ды і то не больш як за тры дні да канца.

А чалавек, з якім Бог гаманіў, яшчэ шмат гадоў жыў — і саламяны, і новы драўляны плот пераражыў.

*Романов-4, с. 178.*
*Шейн-2, с. 399.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС — 81/05.*

## Багі і людзі

### Спрэчка Багоў

Адбылося гэта вельмі даўно. Тры гады запар сонца не з'яўлялася на небе, а калі і з'явілася, то ў атачэнні такіх чорных хмар, што здавалася, быццам над зямлёю стаіць ноч.

І людзі, і звяры пачалі мерці ад холаду і голаду. Нехта рабіў спробы выратавацца ўцёкамі ў іншыя краі, але і там панавала тое ж гора.

Невялікая колькасць людзей, што яшчэ жылі на Гэтым Свеце, пачалі наракаць на Багоў, гаворачы: «Мы не зрабілі ніякіх злачынстваў ні супраць Багоў, ні супраць лясоў і рэк, ні супраць людзей ці жывёл. За што Богі выраклі нас на такія пакуты?»

І пачулі Багі плач і стогны людзей, і адзін з іх, самы добры, сышоў з неба, каб паразумецца з людзьмі і растлумачыць, што адбываецца.

— Усе вашы беды ад таго, што паміж намі, Багамі, зацягнулася спрэчка аб тым, хто павінен быць галоўным у вырашэнні клопату ўсяго, што існуе на Небе, на Зямлі і ў Падземным гаспадарстве.

— Але ж колькі бяды і гора прынеслі Багі людзям сваімі спрэчкамі! — сказалі людзі. — Перастаньце спрачацца. Няхай кожны з Багоў валодае тым гаспадарствам, якім валодаў да гэтага, займаецца той справай, якой займаўся дагэтуль. Багі не павінны спрачацца, як простыя людзі, таму што спрэчкі людзей вядуць да кровапраліцця і жорсткасці, а спрэчкі Багоў — спыняюць плынь з'яў, якія заўсёды адбываліся з пачатку тварэння Сусвету.

І накіраваны на Зямлю Бог пагадзіўся з людзьмі і калі вярнуўся на Неба, перадаў словы людзей астатнім Багам.

І хутка ачысцілася неба і з'явілася сонца, а ў палях зазелянела трава.

І з тых часоў жыве Боскі запавет: як было, так няхай будзе заўсёды, а хто пажадае іншага, наробіць бяды…

*ПАШ. Ф. 10 спр. 5, спр. МС — 196/06.*

### Вёска Пад'яменцы

Стаяла каля лесу вёска. Жылі ў гэтай вёсцы добрыя, працавітыя людзі.

Загадаў ім Бог Неба пасадзіць жыта. Калі яны гэта зробяць, ён пусціць дождж на зямлю, каб намачыў пасаджаныя людзьмі зярняткі. Але было нейкае свята, уся вёска балявала і перапіла медавухі. Таму людзі не выканалі прыказанне, якое даў ім Бог Неба. І дождж паліўся на пустую зямлю.

Бог Неба раззлаваўся і вырашыў пазбавіць жыхароў вёскі сонечнага святла. Ён папрасіў свайго брата Чарнабога — Бога Падземнага гаспадарства — прыняць гэтых правініўшыхся людзей да сябе і пакараць іх. Вёска правалілася скрозь зямлю, а на яе месцы засталася вялікая яміна.

Праз некаторы час на гэтае месца прыйшлі новыя людзі, якія пачалі сяліцца ў гэтай яміне. Яны лічылі, што, пасяліўшыся ў яме, абароняць сябе ад вятроў і ворагаў. Казалі гэтыя людзі ўсім, хто да іх прыходзіў, што жывуць яны пад ямай. Таму людзей і празвалі пад'яменцамі. А потым, калі тут утварылася сапраўдная вёска, то і вёску пачалі называць так, як яе жыхароў — Пад'яменцы.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС — 54/05.*

## Цётка дапамагае ўдаве

Жыла адна ўдава. Мужык яе памёр. Родзічаў у яе ў гэтай вёсцы не было. Цяжка ёй з малымі дзеткамі жылося. А тут час жніва падышоў.

Усе людзі пазжыналі свае надзелы, а ва ўдавы яшчэ шмат не сжата. Жне ўдавіца, стараецца, потам абліваецца. Дзень выдаўся цёплы, сонейка так і прыпякае. Вельмі маладзіцы піць захацелася, а вадзіца скончылася. Не заўважыла жнея, як да яе жанчына падышла, адкуль яна ўзялася.

Жанчына прыгожая была, спрытная, мажная, кроў з малаком, як у народзе кажуць. На галаве ў яе вянок з каласоў красаваўся. Павіталася жанчына. А ўдавіца тая ад знямогі ды ад жары з апошніх сіл выбіваецца. Працягнула ёй жанчына вадзіцы сцюдзёнай, ды ўсё падлівае ды падлівае. Напілася ўдава вады і хуценька працаваць стала, ажно за траіх. Да вечара надзел свой увесь зжала, і жыта ўсё ў бабках стаяла.

Здагадалася ўдава, што сама Цётка ёй дапамагла. З тае пары і ўзнікла прыгаворка: «Хай Цётка табе падалье!», ды яшчэ такая: «Толькі б Грамаўніца памагла».

*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 136/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 136/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 163/05.*

## Макаш і жанчына

Макаш апякуецца над жанчынамі, але і жорстка іх карае за непавагу да сябе.

Неяк у пятніцу сядзела вечарам жанчына каля акна і прала. Чуе — нехта пад акном стукае. Глянула — баба старэнькая стаіць, зморшчаная, як сучок. Паглядзела тая баба на жанчыну сурова і пытаецца ў яе:

— Чаму ты, маладзіца, так позна прадзеш ды ў гэты дзень?

— Як жа мне не прасці, калі ў мяне дзеткі малыя, не пасобяць — самой трэба паспець.

— Ну, калі ты такая пільная, на табе сто верацён. Каб ты мне іх да раніцы ўсе напрала.

Як сказала тое баба, так і падзелася невядома куды, як скрозь зямлю праваліласся.

Спужалася жанчына, зразумела, што нешта тут няладна. Думала-думала, што ёй рабіць, і прыдумала. Не стала руцнёў прасці, а ўзяла ды па адной нітачцы на кожнае верацяно наматала. Так усе сто верацён да раніцы і заматала.

На золку зноў старая прыходзіць і пытаецца:

— А што, маладзіца, ці пазапрала мне мае верацёны?

Маладзіца паказала ёй верацёны. Тады і кажа ёй старая:

— Разумная ты, маладзіца, што так зрабіць здагадалася. Не зрабі ты гэтага, ды вярні мне голыя верацёны, я б цябе саму, як голае вера-

цяно, скруціла і ссушыла б. Я Макаш. Сёння мой дзень. Глядзі, не прадзі ў пятніцу больш.

*Шейн, Бел. песні, с. 425—426.*

### Кляскун жартуе з мужыком

Пайшоў неяк мужык ноччу чужы лес красці. Ідзе, страшна яму, страх ногі абдзірае. Здаецца, што хтосьці за ім назірае.

Толькі нагледзеў дрэўца, замахнуўся — нечая рука за плячо — лясь! Ды як загаргоча нехта, закрычыць: «Га! Папаўся!» Мужык аж прытомнасць страціў ад нечаканкі.

Расплюшчыў вочы, глядзь: юнак — не юнак, бо дзе ж столь сілы ўзяць, каб лётаць у паветры. І ўсё смяецца, аж заходіцца, верціцца, кружыць.

Мужык трасецца, што ліст асінавы, такі гул ад ляскату зубоў ад самаго ідзе, што шчэ страшней становіцца. А той, што ў паветры лётае, кажа: «Спужаўся? Ха! Іншы б пакараў цябе, а я ж ведаю, што табе патрэбна, зверху ўсё бачу. Добра, дапамагу табе». Так то і было.

А калі на наступны дзень у вёсцы расказаў людзям пра здарэнне, дык адна бабуля патлумачыла, што то Бог начны, які любіць пажартаваць, папужаць чалавека, але ён добры, можа і дапамагчы. Бога таго завуць — Кляскун.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 98/06.*

### Кляскун ратуе мужыка

Ішоў Ярамір зімняй ноччу з гасцей з суседняй вёсцы, дзе яго добра пачаставалі медавухай.

Ішоў праз поле, а тут страх за пазуху пачаў дзёрам лезці. Далёка шчэ было да хаты. Задумаўся па дарозе Ярамір аб тым-сім, ды не туды звярнуў. Думае: «Лепш прысяду ды тут перасну, а як відно будзе, то і пайду».

Толькі прыладкаваўся, чуе тупат ды ўсё бліжэй, бліжэй. Глянуў — конь скача. На ім юнак: валасы развяваюцца, рукой над галавой размахвае. Пуга то над ім, то пад канём так іскры выдае, нібы зоркі абсыпаюцца. А крыку, а рогату!

У Яраміра валасы дыбарам усталі, рукі-ногі анямелі, падкасіліся, ён на снег белы паціху асядае. А дзяцюк скача вакол яго, сам увесь свеціцца ды смяецца, як шалёны. Думаў — усё, канец! Падохну на месцы, заб’е гэты Дух. Тут конь з дзецюком скача прама ўверх на неба пад самыя вершаліны дрэваў. А потым як рынецца з дзікім рогатам на яго.

Мужык на ўсё забыўся ды як кінецца бегчы па снегу праз кусты! І бег, і поўз, і каціўся. Праз колькі часу зваліўся з ног: сілы больш няма. Ды ціха стала, нікога не бачна.

А тут зноў гэты тупат, а самога вершніка не відаць. Хацеў Ярамір далей напралом валіцца, аж бач — агні, свет у вокнах хат! Вой,

радасць! Якраз на гары быў ды кульнуўся, як пакаціцца! Як шыю не звярнуў, сам не ведае. Дакавыляў да хаты і зноў смех! Але ж прыглушаны, ціхі і аднекуль зверху. Глядзь — на небе цень чорны ды ззянне яркае. Думаў — прымроілася.

Пагрукаў у дзверы хаты, жонка адчыніла, ды рот адкрыла: думала, пабілі Яраміра злыдні. Крычаць пачала. А ён, як вар'ят, пра нейкага дзецюка на кані вярзе.

Спачатку не слухала мужыка, а потым дайшло да яе, што нешта падобнае некалі чула. То Добры Дух быў — Кляскун — толькі ён такога страху навядзе, што зубы тарарайку граюць, але і дапаможа. Вось як яе Яраміру. П'яны мо і заснуў бы ў снезе, а Кляскун прыгнаў яго дадому.

*ПАШ. Ф. 10. воп. 3, спр. МС — 113/06.*

### Зюзя адзначае любімага гаспадара

Зюзя выбірае сабе любімчыка сярод гаспадароў і загадвае Марозу намясці ў яго двор больш снегу. Гэтым ён паказвае на тое, што ў гаспадара будзе найбольшы і найлепшы ўраджай жыта.

Быў гэты выпадак у вёсцы Пясчанка. У той год зіма была вельмі ж цёплая, снегу амаль не было. Як толькі снег пойдзе, дык назаўтра і растане. Раніцой вяскоўцы выходзяць на двор, а ў Сцяпана ўся хата ў снезе. На іншых дварах снегу толькі крыху прыпарушыла, а ў таго дык да крышы снег дастае. Сцяпан з-за гэтага снега з хаты выбіраўся з цяжкасцю. Раскапаў ён трохі свой двор, снег павыкідваў праз плот на вуліцу ды агарод.

Прайшоў дзень. На наступную раніцу бачыць у яго двары зноў снегу намяло, а ў астатніх ледзве прыпарушыла. Ён зноў дзень снег са двара выкідваў.

На трэцюю ноч вырашылі людзі паглядзець, адкуль жа бярэцца снег на двары ў Сцяпана. Яны паляглі за забор, прытаіліся.

І вось у поўнач убачылі вяскоўцы, як ідзе нейкі стары чалавек, увесь у белым, з белымі доўгіміваласамі. Ён стаў пасярод двара, раскруціўся, закружыўся. У яго з карманаў, з рукавоў паляцеў снег. Намяло яго аж па самую крышу, а ў суседнія двары даляталі толькі мелкія сняжынкі. Людзі адразу зразумелі, што гэта Зюзя ўпадабаў гаспадара і паслаў Мароза адзначыць любімчыка.

А Сцяпан з таго часу больш не выкідваў снег за плот, каб тым самым не выкінуць ураджай са свайго двара і не адвесці ўдачу ад сям'і і свайго гаспадарства.

*ПАШ. Ф. 10. воп. 4, спр. МС — 152/06.*

### Ох выводзіць мужыка з лесу

Аднойчы пайшоў чалавек у лес па справах, доўга хадзіў, вельмі стаміўся. Дзень ужо ішоў да скону, трэба дамоў вяртацца. Сабраўся ісці да вёскі ды заблукаў, не ведае, у які бок лесу падацца. Доўга

блукаў ён па лесе, але выйсця з яго ніяк не мог знайсці. Стомлены, выйшаў ён на паляну, прысеў на пянёчак. Хутка ноч, павыходзяць воўкі і нядобрыя лясныя здані. Цяжка ўздыхнуў і кажа:

— Ох, што мне рабіць?

Амаль праз некалькі хвілінак з-пад зямлі з'явіўся маленькі дзядочак, сівенькі, з барадой і кажа яму:

— Не адчайвайся, я дапамагу табе, ідзі за мной.

Затым ён знік. Потым раптам з'явіўся за суседняй елкай і гукнуў. Калі чалавек падбег да яе, ён зноў знік і зноў з'явіўся, але яшчэ далей, і такім чынам ужо праз нейкі час чалавек апынуўся на выхадзе з лесу. Ён вельмі ўзрадаваўся, а калі гукнуў дзядка, каб аддзячыць яму, той не адазваўся.

Так дзядок Ох дапамог чалавеку выйсці з лесу.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 56/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 50/06.*

## Любмел выратоўвае маладых

Стаяла маленькая вёсачка каля лесу, жылі ў ёй простыя сяляне, бедныя ўсе былі. Жылі тут дзве сям'і, і адна на адну ўвесь час нагаварвалі, праклінaлі, а ўсё з-за таго, што калісьці дзве жанчыны-гаспадыні хлопцаў не падзялілі ў маладосці і праклялі адна адну. «Хай будуць твае дзеці няшчасныя ў каханні», — сказала адна, а другая ў адказ ёй тое ж самае паўтарыла.

Прашлі гады, а былыя сяброўкі ўсё сварацца і сем'і іх варагуюць. Нарадзілі абедзве жанчыны дзяцей, дзеці выраслі, ды так атрымалася, мабыць, па волі Бога, што закахаліся адзін у аднаго. Дзеці ведаюць пра даўнюю варажнечу матак, баяцца бацькам казаць, цішком збягаюць з хаты і сустракаюцца. А бацькі і хлопца, і дзяўчыны кожны дзень галовы сваім дзецям дураць, каб тыя выходзілі толькі за багатага ці багатую.

Бацька дзяўчыны неяк зацікавіўся, куды гэта яго дачка бегае. Прасачыў і даведаўся, што да яго ворагаў, раззлаваўся вельмі, закрыў дачку ў хаце. Бацька хлопца таксама пра ўсё выведаў і са злосці пайшоў да бацькі дзяўчыны ды пачаў крычаць, быццам яго дачка заляцаецца да сына. Бацькі сварацца, дзеці плачуць. Тады бацька, у якога была дачка, зрабіў так, каб хлопца — каханага дачкі — забралі ў войска.

Закаханыя ў роспачы, дзяўчына плача, і вырашылі яны, калі так, дык лепей утапіцца. Ноччу ўцяклі яны ад бацькоў, прыбеглі на бераг ракі, стаяць, плачуць. Толькі хацелі скокнуць у хвалі, як з'яўляецца нейкі хлопец з кветкамі на галаве і пачынае іх угаворваць, каб не скакалі ў ваду. Дзяўчына спытала, як завуць незнаёмца, той у адказ — Любмел. Угаварыў Бог кахання хлопца з дзяўчынай не канчаць жыццё самагубствам, потым упэўніў, што ўсё будзе добра і хутка ў іх будуць заручыны.

Так і адбылося. І невядома куды дзелася бацькоўская варожасць. Калі дзяўчына расказала пра Любмела сваёй бабцы, тая растлумачыла, што Любмел ахоўвае закаханых.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4. спр. МС — 157/06.*

## Гаспадары і Духі сядзібы

### Калі Бог стварыў Сусвет

Калі Бог стварыў Сусвет, а потым Зямлю, людзей, то ён ужо не мог адзін спраўляцца з усёй гэтай гаспадаркай. Тады ён стварыў сабе памагатых: Вадзянікоў, Лесуноў, Хатнікаў.

Хатнікаў Бог паслаў жыць у хаты да людзей. Хатнікі жывуць у самых далёкіх кутках хаты, каб людзі не ведалі, не здагадваліся нават, што ён там ёсць. А сам Хатнік павінен быў сачыць за сваімі гаспадарамі. Калі яны былі добрымі, верылі ў Бога, дык Хатнік дапамагаў ім па гаспадарцы, аберагаў яе. Калі ж наадварот, гаспадары былі дрэннымі людзьмі, не верылі ў Бога, дык Хатнік чыніў бяду ў хаце, біў посуд, не абараняў яе ад няшчасцяў.

Але ж хутка людзі здагадаліся, што ў хаце жыве нейкі Дух. Некаторыя нават бажыліся, што бачылі яго. Людзі пачалі задобрываць Хатніка: пакідалі нанач яму ежы, прыбіралі ўсе цёмныя далёкія куткі хаты, дзе Хатнік мог жыць, рабілі яму ложак.

Каб Хатнік ахоўваў свойскую жывёлу і гаспадарку ад напасцяў трэба звяртацца да яго з такой замовай:

«Гаспадар-хатнік, прымі хлеб-соль, прымі куццю і яешню. Зберажы скацінку ад пошасці, хату захавай ад злога чалавека, ад агню».

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 16/05.*

### Маладуха і Хатніца

Прызвычаілася маладуха з адной сям'і хадзіць у лазню начаваць: там цёпла, так добра спіцца. Мужчыны папярэджвалі яе, каб не рабіла гэтага. А яна дзяцей паўкладвае і пойдзе.

Прыйшла аднойчы ў лазню, легла на палку, заснула. Ці доўга спала, ці не, адкрыла вочы: лучына гарыць. Сядзіць Гаспадыня спінай да маладухі і тчэ на кроснах, толькі цэўка вішчыць у чаўнаку, як яна пракідвае яго, бярдо грыміць, якім яна прыбівае тканіну.

Хатніца ведае, што маладуха не спіць, але на яе не глядзіць. Маладуха ціхенька адкрыла акенца, глянула, ці гарыць агонь на вёсцы.

— Куды б мне збегчы? — думае маладуха. — Поўнач, самая глуш, усе спяць, агні патухлі.

А Хатніца ўсё ведае, што малудуха думае. Прапаў у маладухі сон: не да сну ёй. Раптам Хатніца, не паварочваючыся да жанчыны, загаварыла:

— Маладуха, што ты ўсё ў акенца глядзіш?

— Ах, Божа мой, чаго я гляджу ў акно? Дуброва шуміць, і дзеці крычаць нечыя.

— Ці не мае гэта дзеці?! — захвалявалася Хатніца. Згарнула яна кросны і хутка выскачыла з лазні. А за ёю і маладуха вопрамеццю дахаты.

З таго часу зараклася яна ў лазню хадзіць начаваць.

*Добровол.-1, с. 90—91.*

## Хатніца і Паляха

Пайшлі неяк жанчыны цялят шукаць. Хадзілі, хадзілі, ужо вечарэе і маладзік свеціць. Не знайшлі цялят, трэба ісці дамоў.

Тут выходзщь жанчына з кустоў, проставалосая, беленькая, гукае іх:

— Маладухі, маладухі, вярніцеся: там вашы цяляты, ідзіце па сцежцы направа.

Жанчыны глянулі на яе — спужаліся.

— Не палохайцеся, жанчынкі, не бойцеся! Вунь вашы цяляткі, ганіце іх дамоў. А як прыгоніце іх, жанчынкі, дахаты, то скажыце Хатніцы, што памерла Паляха.

Прыгналі жанчыны цялят у двор і селі вячэраць. Пытаюцца мужчыны:

— Ці знайшлі цялят?

— Хадзілі, хадзілі, хацелі ўжо дамоў ісці. А тут выходзіць жанчына з кустоў, белая такая, стогне, і кажа: «Жанчынкі перадайце Хатніцы, што памерла Паляха».

Як толькі яны гэта прамовілі, нешта стукнула, як у далоні, штосьці завыла — голас такі прыемны, як у той зязюлі, ляснулі дзверы, нехта пакрочыў па агародзе ў поле.

Жанчыны і дзеўкі спужаліся, а стары кажа:

— Не палохайцеся, не палохайцеся: гэта — Хатніца. Бог з ёю, няхай ідзе сабе.

*Добровол. Словарь, с. 157.*

## Хатнік і чараўнік

Жыў у хаце Стомы Хатнік. З яго падтрымкі ўсё ў сям’і было добра: прыйдзе баба з поля, а міскі памытыя, падлога падмецена. Яна нават размаўляла з Хатнікам, імя яму дала — Стасюк. Прачнецца, і адразу: «Ну, здарова, Стасюк».

Аднойчы ехаў з суседняй вёскі мужык — Ігнат. Папрасіўся переначаваць у іх. Гаспадары дык нутром адчувалі, што не трэба было б яго ў хату пускаць, бо пагаварвалі людзі, што ён чаруе. Але ж не выганіш, калі папрасіўся: мусілі пусціць.

Пакармілі госця, пасцялілі яму на лаве і ўсе ляглі спаць. А ноччу ўсе ў хаце прачнуліся ад таго, што Ігнат роў на ўсю хату як быццам яго

рэзалі. Запалілі хуценька лучыны і бачаць, што ў яго ўсе грудзі раздзёртыя, і, во жах, як быццам яны самі па сабе далей раздзіраюцца.

Бабы давай галасіць на ўсю хату, а гаспадар скеміў, што дзеецца. Загадаў ён сямейнікам, каб хутчэй вынеслі чараўніка з хаты і дварышча, і только тады яму палягчала. Гэта ж Хатнік адчуў благога чалавека ў сваёй хаце і пачаў яе абараняць.

Пасля гэтага людзі баяліся заходзіць да Стомы ў хату.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС — 105/05.*

### Кікімара і няверная жонка

У аднаго мужыка, звалі яго Няміра, была вельмі дрэнная жонка. Ні яна табе есці нармальна не зробіць, ні мужыка свайго не прыгалубіць, у хаце парадак не трымае. А калі гэта няшчасная падыйдзе да печы, то нічога акрамя дыму ды гарэлага цеста не ўбачыш. А ёй — хоць бы што.

А якая ж скандальная баба была. Вельмі раўнавала Няміру да другіх баб, і як яго хваліла: «У хаце і гаспадарцы Няміра мой — галава». Але ж што яна думала на самой справе, ніхто цяпер не скажа. Ну, да, можа яна думала адно, а рабіла зусім іншае. А як здраджвала яму...

Ну, вось, пойдзе яе Няміра ў лес, а яна — хутчэй з Яраславам на сенавал. Напачатку яна хавалася яшчэ, а пазней, як разбэсцілася, дык ужо і ў хату палюбоўнікаў пачала прыводзіць. Вельмі была яна ласая да мужыкоў.

І колькі разоў бывала: прывядзе яна нейкага мужыка, а тут муж у дзверы бах, а яна — хутчэй гэтага мужыка за печ. І так яна хавала сваіх палюбоўнікаў. Пэўна за гэтай печчу паўвёскі мужыкоў пабывала.

Ну, усе ж ведалі, што вытварае гэтая баба, толькі ніхто нічога не гаварыў Няміры, бо ён вельмі кахаў сваю жонку. Але ж доўга такое цягнуцца не магло.

І вот аднаго разу зноў застаў Няміра сваю жонку з палюбоўнікам, ну а яна таго за печ, і давай да мужа лашчыцца, абы яго з хаты выправадзіць: і смоллю яму ў вочы лезе, і па галоўцы гладзіць, і так, і сяк. А Няміра кажа: «Збегай у падпол і прынясі мне варэння малінавага, я паем і пайду ў лес па дровы». Узрадавалася жонка, думае, усё зраблю, толькі выбярыся з хаты, бо ў мяне ж чужы мужык за печчу.

А Няміра сядзіць за сталом, чакае. Тут пачуў ён: нешта зашапацела за печчу, вырашыў ён паглядзець. Падымае посцілку — а там яго жонка ды сусед мілуюцца. У Няміры аж мову адняло. Стаіць і глядзіць. Аж тут у хату заходзіць яшчэ адна яго жонка, толькі з малінавым варэннем у руках. Зразумеў тут усё Няміра, якім прысмакам яго жонка прамышляе, і выгнаў яе з хаты.

А дапамагла яму ў гэтым кікімара, якая перакінулася ў вобраз Няміравай жонкі і дапамагла беднаму, адкрыла яму вочы, бо і ёй таксама надакучыла гэта някчэмная гаспадыня. Ды каму было б прыемна,

каб у тваё логава, пад печ ці ў запечак, увесь час нейкіх мужыкоў хавалі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 122/06.*

### Хлеўнік абараняе каня

Аднаго разу ў наша сяло цыганы прыйшлі, ды як прычапіліся да майго Міцькі — прадай каня ды прадай. А для яго гэты конь любімы быў: на ім яшчэ яго дзед ездзіў. Ой, была бы мая воля, я б яго і так аддала, бо той здыхля толькі сена пераводзіў. Ну, я ўзяла ды сказала гэтаму майму дурному, а ён жа любіць мне ўсё ўпоперак зрабіць. Ну так і зараз. Калі б маўчала, то і прадаў бы тым цыганам гэту клячу. А тут раз ужо сказала, значыцца ўсё зробіць мне назло. Ну і ладна, думаю, яшчэ хай каняга пастаіць, бо сена яшчэ паўпуні. А цыганы народ упарты, ніколі не адступаюць ад мэты. І пацэліліся яны на гэту клячу сур'ёзна. Навошта яна ім здалася, не ведаю. Стогадовая худоба, ды і толькі!

Ну, дык вось падцікавалі цыганы, дзе Міцька каня ставіць, і адной ноччу вырашылі скрасці яго. Сабраліся тры цыганы, палічылі на пальцах, хто пойдзе ў хлеў дзверы ламаць.

Узламаў той вароты хлява. Паварочваецца да астатніх ды заве за сабой — ходзь сюды — яны і ўвайшлі. Тут адзін як паслізнецца, як зачэпіцца за другога, а той — за нейкае вядро! Ды як загрукаціць! Кінуліся гэтыя цыганы хутчэй да дрэва (яно вялізнае, разгалістае), сядзяць, прытаіліся. Страшна ім стала: мо, хто пачуў.

Але ім пашанцавала. Ніхто не выйшаў. Ды яны і самі не ўбачылі ў гэтым ніякага дрэннага знаку: ну, падумаеш, паслізнуліся, пабаліліся, зіма ж на двары, слізка. Падняліся, пераступілі парог хлява. Толькі цягнуць рукі, каб узяць канягу за повад, аж — раз! — адчуваюць нешта мяккае, валасатае. Ды тут нешта як зарагоча нейкім дурнотным смехам, як схопіць гэтых цыган за рукі, што ў іх ледзь сэрцы не парваліся. Як драпанулі адтуль! Адзін наляцеў на сабаку, але нават пакусаў не адчуў, рад быў, што жывы застаўся.

Во як Хлеўнік нашу канягу абараняў.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС — 171/06.*

### Вазіла і вядзьмарка

Жыла ў адным сяле вядзьмарка. Гадкая была баба. Хай бы ж і вядзьмарыла ў сваёй хаце, дык не, любіла людзям розную шкоду рабіць. Быў у гэтай бабы сусед, добры мужык, працавіты, усё ў яго дагледжана, засекі поўныя, кароўка тоўсценькая ходзіць, конік статненькі, курэй цэлая куча. Не любіў мужык вядзьмарку, бо ведаў, што яна робіць людзям паскудствы.

А вядзьмарку зайздрасць ела, бо ў яе гаспадаркі добрай не было: штук колькі курэй, ды і тыя нейкія абскубленыя, парсюк-недарэка шастае па двары. Вырашыла ведзьма адхапіць кусок ад гаспадаркі

суседа. А тут якраз кабылка яго хутка павінна ажарабіцца. Вядзьмарка пільнавалася гэтай кабылкі, наваражыла там нешта і ноччу, ведаючы, што кабыла ажарабілася ціхенька прабралася ў хлеў, забрала жарабё, ды занесла да сваёй хаты. Мужык раніцай заходзіць у хлеў, а жарабяці няма. Пайшоў да ведзьмы, глядзіць: за печчу жарабё ў анучах і ведзьма з нейкімі кроснамі ля печы возіцца. Убачыла мужыка сварыцца пачала, а ён яе не стаў слухаць, жарабя пад паху, ды пайшоў, тая пачала крычаць, клясці мужыка, а яму нічога. Прыйшоў, палажыў у хлеў ля кабылы.

Ведзьма не супакоілася, вырашыла адпомсціць. Праз тры дні наварыла атруты і пайшла труціць суседскіх коней.

Зайшла ў хлеў, але бачыць стаіць ці то чалавек, ці то конь у шапцы, а з-пад яе конскія вушы тарчаць. Глянула на рукі — ажна капыты, на ногі глянула — і тут капыты, ускрыкнула, а той ёй у лоб капытам, яна і асела. Апамяталася, шмыгнула за дзверы і дзёру. Мужык учуў, што сабака брэша, прачнуўся, бачыць: вароты адчэплены. Хуценька апрануўся, ды ў хлеў. Зайшоў і бачыць: нейкая ці жывёліна, ці чалавек сядзіць каля кабылы з жарабём, успомніў мужык, што яго нябожчыца баба казала, і прызнаў у гэтым цудзе Вазілу, таго, хто коней беражэ.

Падзякаваў мужык за дапамогу. Запытаўся, чым яму яшчэ аддзячыць. А Вазіла нічога не ўзяў, толькі ў шапку аўса папрасіў.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4. спр. МС — 157/06.*

### Два агні

Пабудаваўшы новае жытло, беларус абавязкова пераносіць агонь са старой печы: без гэтага не будзе ранейшага дабрабыту. Беларусы паважаюць агонь, яго не пакідаюць без ежы: яму кладуць палена, да яго прыстаўляюць гаршчок з вадою. У агонь не плююць, не кідаюць нічога нячыстага. У таго, хто на агонь плюе, на языку садзяцца болькі. Агонь святы, яго Бог даў на пажытак людзям, але з ім трэба абыходзіцца прыстойна, бо калі ён раззлуецца, то наробіць шмат ліха.

У аднаго чалавека заўжды агонь не пераводзіўся ў хаце; яго жонка берагла агонь у ямцы, як зрэнку вока. Таму ў хаце было поўна дабра, у хляве вялося шмат жывёлы, а клець заўсёды была поўная. Шанцавала таму чалавеку і на статак, і на хлеб.

Аднойчы пайшла жонка таго чалавека дзесь далёка ў госці і доўга не вярталася. Тым часам надышла ноч, хутка сцямнела. Прыбегла да таго чалавека суседка чагосьці пазычыць. Было цёмна, дык яна засвяціла пук лучыны ды так з ёю і ўвайшла ў хату, а каб дарэмна лучына не гарэла, дык яна паклала яе на прыпечку, каля самай ямкі.

Тут сышліся разам два агні ды і разгаварыліся. Прынесены агонь кажа:

— Давай спалім гэтага гаспадара за тое, што ён мне не робіць пашаны.

— Не, — адказвае агонь з ямкі, — мой гаспадар добры чалавек, а яго жонка, бадай, яшчэ лепшая. Яна мяне вельмі шануе, вельмі паважае. Не можна майму гаспадару рабіць ліха.

Тут гаспадар падышоў да печы, каб узяць з яе сухое лучыны, ды і пачуў тую гаворку. Схапіў з прыпечка лучыну з чужым агнём, сунуў яго ў дзежку з вадой так хутка, што той і апомніцца не паспеў ды толькі зашыпеў, бы гадзюка.

Раззлаваўся чужы агонь на сваю гаспадыню, што прынесла яго ў такую ліхую хату, дзе яго так дрэнна прынялі, ды і разам ахапіў хату свайго гаспадара. Убачыла жанчына праз акно, што гарыць яе хата, ды толькі рукамі пляснула.

— Божа! Гарым! — крыкнула яна і кінулася з чужой хаты да сваёй.

Падыходзіць гаспадар зноў да печы і чуе, як яго агонь кажа:

— Укінь мяне у пажар, то ён патухне.

Насыпаў гаспадар на чарапок жменю жару, вынес на двор ды і сыпануў яго ў пажар. Выбухнула полымя вышэй лесу і патухла. Зразумеў тады той гаспадар, што трэба агонь шанаваць, то і ён будзе добры. А добры агонь мацней за ліхі.

*Сержп.-1, № 270.*

### Палявік палохае злодзея

Жыў у нашай мясцовасці Палявік. Як і ўсялякі гаспадар, клапаціўся аб добрым ураджаі. Дапамагаў сялянам. Але вельмі не любіў прагных і нядобрых людзей.

Жыў у сяле дрэнны чалавек. Усяго яму было мала, людское дабро краў, хоць і сваё меў, сквапны быў, зайздросны. Як парасце ў суседа на полі лепшае збожжа, ён брахаў, як сабака, зямлю праклінаючы. Чуў усё гэта Палявік і бачыў, і не вытрымаў.

Паехаў аднойчы гэты чалавек чужое сена ноччу красці. А сенакос вялікі быў, з аднаго боку яго лес падпіраў, з другога — рэчка цякла. Усё ціхутка было. Палявік убачыў злодзея ды як свісне, як рыкне. Вецер падняўся страшэнны, конь спужаўся і паляцеў на злом галавы, не разбіраючы шляху, а чалавек такога пуду зведаў, калі ўбачыў Палевіка, што да хаты прыбег ні жывы, ні мёртвы.

*ПАШ. Ф. 9. воп.3, спр. МС — 107/05.*

## Чалавек у Лясным гаспадарстве

### Дар Русалкі-лесавіцы

Пайшла жанчына ў лес па грыбы. Бачыць, на дрэве вісіць вялікі кавалак бярозавай кары. Падышла яна, зазірнула ў сярэдзіну, аж там ляжыць голае дзіця і спіць. Жанчыне шкада стала дзіцяці, адвязала

свой фартух, прыкрыла ім дзіця і адышлася, усё думаючы: чыё гэта можа быць дзіця, і як яно сюды трапіла? Але не паспела яна адысці ад дзіцяці на якіх крокаў дваццаць, як пачула:

— Пачакай, жанчынка!

Яна азірнулася, бачыць: бяжыць да яе голая жанчына з распушчанымі валасамі. Гэта была Русалка-лесавіца. Жанчына спужалася і хацела ўцячы, але Русалка закрычала:

— Пачакай, жанчынка, спор табе ў рукі!

Дакранулася да рук жанчыны і знікла. Калі жанчына трохі ачулася ад пуду, то вярнулася дадому, але нікому нічога не сказала. З тае пары яна пачала так працаваць, што аднавяскоўцы толькі дзівіліся, адкуль у яе бяруцца сілы.

*Шейн-3, с. 317—318.*

### Лукаш і Русалка-лесавіца

Гэта гісторыя здарылася ў вёсачцы Байлюкі.

Аднойчы мужчына па імені Лукаш пайшоў ва ўрочышча Сельнае, каб надраць лазы. Месца гэтае было вельмі глухое. Надраў ён лазы і вяртаецца дамоў.

Ідзе ён сцяжынкай і раптам бачыць, што на дрэве сядзіць прыгожая дзяўчына з доўгімі-доўгімі валасамі. Сядзіць яна і перабірае рукамі гэтыя валасы. Загледзеўся Лукаш на яе, а яна ў яго пытаецца:

— Куды ідзеш?

— Дамоў, — адказвае Лукаш.

— Пойдзем са мной, — гаворыць дзяўчына.

Пастаяў Лукаш, падумаў ды пайшоў далей сваім шляхам. Прайшоў некалькі крокаў, а дзяўчына зноў у яго на шляху. Стаіць на сцяжынцы і не збіраецца яго прапускаць.

Зноў яна пытаецца куды ён ідзе і заве яго з сабою. Спыніўся Лукаш і не ведае, што яму рабіць. Нeяк страшна зрабілася, валасы дыбарам. Зразумеў, што гэта нейкі Нядобры Дух і нешта рабіць трэба. Добра, што прыпомніў словы старых: многія Духі жалеза баяцца. А ў яго з сабой нож. Рушыў ён да дзяўчыны, прыхаваўшы нож у руцэ. Яна яго абдымаць, а ён лёганька чыркнуў нажом яе па руце. Яна віскнула злосна і знікла.

Кінуў мужык лыка, ды бягом да вёскі. Апрытомнеў толькі, калі да хаты прыйшоў. Расказаў пра сваё здарэнне сям'і, і ўсе разам рашылі, што сустрэўся іх гаспадар з Русалкай-лесавіцай.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС – 65/05.*

### Лясун і мужыкі

Хадзілі неяк у лес ноччу мужчыны секчы смалу пры маладзіку. Толькі пачалі работу, як нешта свісне над імі, аж вушы заклала. Спужаліся яны, сталі ўцякаць. Як свісне зноў, яны бягом, а лес над

імі быццамваліцца. Бягуць яны, а Лясун зноўку над імі пугаю ляскае.

З лесу выбеглі мужыкі, а Лясун і тут над імі пугаю ляскае. І нікога не бачна. Ледзь збеглі мужыкі.

Так Лясун пугаю ганяе і птушак, і звяроў: ваўкоў, мядзведзяў, лісіц. Над усімі ён Гаспадар, усе ў лесе яму падуладныя.

*Добровол.-1, с. 89.*

## Прасі дазволу ў Гаёвага Дзеда

Ранняй восенню паехаў гаспадар з сынам у лес па дровы. Доўга хадзілі яны па лесе, шукалі, дзе лепшае якое дрэва зваліць, каб добрыя дровы былі. Убачыў сын прыгожую, тоўстую бярозу, ды паказаў бацьку. Ну, той давай яе заўзята секчы. Хлопец глядзеў на бярозу і нібыта ўбачыў нейкі вобраз, але бацьку нічога не сказаў. Ссяклі яны яшчэ некалькі дрэў, пагрузілі на колы, сабраліся ехаць да хаты.

А тут у лесе пачалося нешта незвычайнае. Падуў моцны вецер, дождж, пачаліся грымоты. Конь з перапуду панёсся як ашалелы, ажно людзей скінуў з воза. Засталіся яны стаяць на дарозе. Прыйшлі да хаты, конь змучаны стаіць у двары. Ні воза, ні дроў.

Старыя, мудрыя людзі адразу ж сказалі ім, што нельга без дазволу Гаёвага Дзеда лепшыя яго дрэвы секчы. Вось і засталіся ні з чым.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 133/06.*

## Лесавіха

Пайшла жанчына-ўдава ў лес па ягады і чуе — дзеці маленькія плачуць. Бачыць, пад вялікай бярозай сядзяць двое голенькіх дзетак. Жанчына намітку з галавы далоў, разадрала яе на дзве часткі ды загарнула і адно, і другое. Сама пайшла дамоў.

Не паспела яна да двара прыйсці, наганяе яе Лесавіха:

— Ах ты, мая жанчыначка, пратапі ты мне лазню.

— Галубка мая, я б рада пратапіць, ды ўдовінае мае жыццё: няма мне чым тапіць.

— Ды не, жанчынка, мне тваіх дроў не трэба: ідзі трэсак назбірай, аганьку вазьмі ды запалі. Толькі дзяцей не хадзі будзіць.

Трэскі прагарэлі, а Лесавіха сядзіць, чакае. Гаспадыня венік намачыла, вадзіцы паставіла, духу цэлая баня. Вымыліся жанчыны. Гаспадыня Лесавіху папарыла.

— Дзякуй табе, мая жанчынка. Я табе за ўсё аддзячу і за сваіх дзетак, што яны голенькія не сядзяць. На табе ручнік. На што патрэба табе будзе, на ўсё рэж, будзе і табе, і тваім дзецям на век. Калі хто папросіць, можна даць. Толькі не раскатвай, рэж ды рэж...

Трубачка была невялікая, а ўсё спор быў. Але ж аднойчы не сцярпела жанчына, раскатала: хочацца ёй паглядзець, што ж гэта такое.

Як раскатала, так усё і скончылася.

*Добровол.-1, с. 88—89.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 33/05.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 95/06.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС — 45/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС — 121/05.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС — 74/05.*

### Лясун і жанчына

Нашла жанчына з вёскі Яленцы ў лесе двaіх дзетак. Пашкадавала, забрала да сябе і ўзгадавала іх. Лясун прыйшоў да яе і пытае:

— Чым цябе ўзнагародзіць за тое, што ты маіх дзяцей узгадавала?

А гады тады былі цяжкія. Дык жанчына ў адказ:

— Дай ты мне палатна!

Даў ёй Лясун сувой палатна і кажа:

— Бяры, рэж колькі табе трэба, толькі не разварочвай да канца.

Жанчына доўга карысталася гэтым сувоем. Усім рэзала, шыла — дзецям, і гаспадару, і сабе — а ён усё цэлы. Разабрала яе цікаўнасць — адкуль гэта ўсё. Узяла ды і раскатала сувой. Як раскатала, дык ён і закончыўся: хутка зрэзала ўсё.

*Романов.-4, с. 95.*

### Лясун і Міхалка

Пагасціўшы ў сваяка, Міхалка запрог коніка і адправіўся назад дамоў.

Дарога ад Ліпава да Празорак была няблізкая — ішла ў асноўным праз густы лес, толькі месцамі трапляўся пералесак. Збочыць з дарогі практычна не было куды. Яшчэ была добрая бачнасць, хоць і восень, і хмарна. Уехаўшы ў лес і праехаўшы некаторую адлегласць, Міхалка на хвіліну закрыў вочы, калі ж адкрыў іх, то ўбачыў, што дарога ўпёрлася ў вялізны дуб і конік прыпыніўся.

— Ну, не павінна ж быць аніякага дуба, не першы раз і не першы год езджу да сваяка — прамармытаў Міхалка, павярнуў коніка назад.

Праехаўшы вярсты са тры, а то і чатыры, ён убачыў невялікі ручэй, які перасякаў дарогу. А ўжо пачынала шарэць. І бачыць вознік чалавека ў гадах і, што адметна, доўгая сівая барада і нага правая, а то левая (не запомніў, якая) як бы пяткай наперад.

— Гэй, чалавеча, я зблудзіў, дапамажы: у якім кірунку мне ехаць, каб трапіць дадому ў Празарокі — звярнуўся да чалавека Міхалка.

Але незнаёмец як праз зямлю праваліўся, толькі ў гушчары хтосці засвістаў, потым пачуўся рогат і як бы гучна запляскалі ў далоні. Міхалку стала не па сабе. Ён заламіў ветку на дрэве (зрабіў адмеціну) і зноў павярнуў каня назад.

Праехаўшы колькі часу, не ўбачыў аніякага дуба, а дарога ўпёрлася ў возера. Міхал зноў жа павярнуў коніка назад. І праехаўшы тую ж, як яму здавалася адлегласць, нічога падобнага да зробленай адмеціны не заўважыў.

Тады мужчына зняў верхнюю і ніжнюю вопратку з сябе, вывернуў бялізну, рубашку, світку і надзеў на сябе. Колькі разоў перахрысціўся. І зноў у гушчары хтосці замычэў, запішчэў, забрахаў, бы сабака. Міхалка жа, праехаўшы зусім трохі, зразумеў, што рухаецца ў належным кірунку.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 136/06.*

### Івашынавіцкая Зазоўка

Жыў у вялікім лесе, што знаходзіўся каля вёскі Івашынавічы, Дух, які меў выгляд жанчыны. Яго называлі Зазоўка. Гэтага Духа трэба было асцерагацца хлопцам, бо Зазоўка вельмі любіла забаўляцца з імі. Пасля гэтых гульняў Зазоўка не вяртала іх назад ужо ніколі.

А лес, які знаходзіўся каля вёскі, быў вялікі-вялікі. Каб пайсці ў лес, трэба было перайсці праз поле. У сярэдзіне поля працякала рака. А праз раку была перакінута кладка. Пойдзе жанчына ў лес па ягады ці грыбы, а кладкі праз раку як і не было. Пойдзе мужчына — кладка на месцы, што за дзіва.

Аказваецца, што гэта рабіла Зазоўка, каб хлопцаў усіх перацягнуць да сябе. Усе ведалі, што нельга мужыкам у лес хадзіць. Але выйдзе толькі мужчына ў поле, чуецца спеў маладой дзяўчыны, ды такі прыгожы, што, як у сне ідзе хлопец па полі, пераскоквае нават гэтую кладку і ляціць у чароўны лес. А там яго сустракае прыгажуня. Светлая, доўгавалосая. Валасы такія доўгія, што адзенне ёй не трэба было.

Хлопец бяжыць за ёй, а яна хаваецца. Зноў з’явіцца, потым зноў схаваецца. Але як толькі Зазоўка прывядзе яго на паляну пасярэдзіне леса, прымае валасы свае бялюткія і ўстае перад хлопцам поўнасцю голая.

Хлопец падае на паляну, і яна яго кахае да самай смерці. Так усе хлопцы блукалі па лесе, знікалі і больш ніколі не вярталіся. А калі хто і вяртаўся, то, казалі, што ён не мог заставацца ў вёсцы з дзяўчатамі з вёскі. Усё адно бег у лес і потым таксама не вяртаўся. Так у вялікім сяле толькі некалькі хлопцаў засталося. Жывуць у гэтых хатах адно бабулі. Усіх мужыкоў, кажуць, Зазоўка забрала.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 153/06.*

## Чалавек і Духі Падводнага гаспадарства

### Ігуменскія Русалкі

Працякае на Беларусі прыгожая рэчка Ігуменка. Людзі, якія жылі паблізу рэчкі, заўсёды чулі смех і дзявочы гоман.

Жыў у вёсцы, што стаяла каля ракі Ігуменкі, малады хлопец Васіль — смелы і цікаўны. Вырашыў ён пайсці да рэчкі, каб

даведацца, што там адбываецца. Пайшоў і не вярнуўся. Прайшло шмат дзён, усе ўжо рашылі, што хлопец загінуў, але аднойчы з'явіўся Васіль зноў. Яго ледзь прызналі вяскоўцы. Ён зусім не быў падобны на былога Васіля.

Падышла аднойчы да яго старая бабка Марыля, адшаптала яго, калі ён трохі ачуняў, расказаў ёй Васіль, што з ім здарылася, і дзе ён быў столькі часу.

Калі Васіль прыйшоў на рэчку, каб даведацца, у чым там справа, то ўбачыў вельмі прыгожых дзяўчын. Яны былі зусім голыя, з доўгімі хвалістымі русага колеру валасамі і з блакітнымі вачыма. Гэта былі Русалкі-вадзяніцы. Яны гушкаліся на галінах дрэў, што раслі каля ракі і спявалі цудоўныя песні. Як толькі яны заўважылі Васіля, адразу прыціхлі. І пачалі яго клікаць: «Га! Га! Хадзі да нас на арэлях гушкацца!»

Тут адна з Русалак падхапілася, падбегла да яго, зняла з яго капялюш і пабегла. Васіль кінуўся за ёю каб адняць капялюш, а Русалка пабегла ў воду. Васіль за ёй, не паспеў агледзецца, як было ўжо вельмі глыбока, а тая Русалка ўчапілася за яго і пацягнула пад ваду.

Апынуўся Васіль у нейкім крышталёвым палацы. У ім знаходзілася шмат дзяўчын з блакітнымі вачыма. Кожная займалася сваёй справай. Усе яны былі пад уладай Русальскай князёўны. Русалкі жадалі зрабіць Васіля Вадзяным Дзедам, каб дапамагаў ім людзей тапіць.

Але здарылася яму магчымасць ад іх збегчы. Прыйшоў дзень Сёмухі. А ў гэты дзень усе Русалкі выходзяць з вады і гушкаюцца на галінах дрэў, спяваюць песні. Васіль скарыстаўся гэтым і ўцёк.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 17/04.*

### Жадаў Баламуцень ажаніцца

Аднаго разу пашлі жанчыны з вёскі Празарокі бялізну мыць на раку. Адна з іх — маладая дзеўка Міласлава — стала на кладку, паслізнулася і бултыхнулася ў ваду ды так, што з галавой знікла пад вадою. Жанчыны яшчэ і залямантаваць не паспелі, як дзяўчына на тым жа самым месце вынырнула і стаіць у вадзе па пояс. А ўсе ведалі, што яна плаваць ніколі не ўмела, а тут іх Міласлава такога нырца дала, што нават іх мужыкі так рабіць не могуць. А далей яшчэ больш. Нейкая сіла выштурхнула дзяўчыну з вады, і яна ўжо стаіць, як слуп, на кладцы. Бабы так і замёрлі ўсе, хто дзе быў, і не кратаюцца. А Міласлава і сама не ведае, што ёй рабіць: ці то плакаць, ці то смяяцца.

Аж тут з вады паказваецца нейкая касматая пачвара: рукі ўсе валасатыя, кіпцюры як у курыцы, валоссе на галаве доўгае, па плячах боўтаецца, зубы жоўтыя, ды і то праз адзін. І кажа гэта пачвара шапялявым голасам:

— Бабанькі, дарагія, не пужайцеся мяне, гэта ж я вашу Мілаславу спас, бо яна такая прыгожая, ды і вы такія прыгажуні. Бабанькі, куды ж вы ўцякаеце?! Вы павінны мне аддзякаваць за выратаванне сяброўкі

вашай. Аддайце гэту ягадку, гэту малінку за мяне замуж. Я ж яе так ўпадабаў.

І ўжо гэтая пачвара вадзяная — Баламуцень — касмылі-рукі працягвае свае і пачынае цягнуць Мілаславу да сябе ў ваду. Схамянуліся тут бабы і давай дзяўчыну ратаваць. Пахапалі хто што: хто камень рачны, а хто пранік, нехта нават дубец паспеў выламаць, і накінуліся на Баламутня.

— Ох ты брыдота! Твае б слоўцы майму мужыку ў вусны! — крычыць адна.

— Не аддамо дзеўку, погань рачная! — лямантуе другая. І ўсе разам лупяць Баламутня.

— Бабанькі, не біце, не біце мяне, я вас усіх так люблю, зорачкі вы мае ясныя. Але на сёння аддайце мне толькі Мілаславу, — лямантуе Баламуцень.

Тут жанчынкі зусім пашалелі. Затаўклі яны Баламутня назад у Падводнае гаспадарства, так і не даўшы яму ў жонкі Мілаславу.

Уся вёска смяялася і віншавала жанчын з перамогаю над Баламутнем. Але пасля гэтага выпадку жанчыны ўсё ж пабойваліся хадзіць на раку па адной. А дзяцей сваіх навучалі, каб далёка не заплывалі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 106/06.*

## Чалавек у Балотным гаспадарстве

### Лешніцкая Балотніца

Каля вёскі Лешніца было вялікае балота, у якім жыла Балотніца. Не аднойчы людзі заўважалі, што кусты шавеляцца і нехта там хаваецца.

Калі аднойчы людзі, што працавалі недалёка ад балота, рызыкнулі і падыйшлі бліжэй, то ўбачылі нейкую старую жанчыну з доўгімі сівымі валасамі. Твар яе ў нейкіх буграх, як у жабы. Апранута яна была ў даўгую чорную кашулю, якая знізу парваная. Вочы яе вельмі страшныя, удзень яны звычайнага чорнага колеру, а ноччу свецяцца. Днём яна сядзіць у кустах і нікога не чапае, а ноччу палохае людзей і зацягвае ў самае топкае месца. Месцазнаходжанне Балотніцы можна вызначыць па гуках, якія ад яе даносяцца.

Але былі сярод вяскоўцаў такія, што не верылі ў яе існаванне, рашаліся застацца на ноч, каб яе ўбачыць. Гэтыя смельчакі ўжо не вярталіся дадому.

Быў толькі адзіны дзяцюк, што выратаваўся. Ён нейкім чынам змог зачапіцца за дрэва, калі Балотніца цягнула яго ў балота, потым выслізнуць з яе рук і ўцячы. Дык пасля выратавання ён пачаў моцна заікацца і ні адна бабка-шаптуха не змагла яго вылечыць.

*ПАШ. Ф. 10. воп. 4, спр. МС — 155/06.*

### Вёска Грыбы

Калісьці на гэтым месцы нічога, акрамя балота і лесу, не было. З суседняй вёскі маці неяк раз адправіла дачок у лес па грыбы, але наказала ім на балота не хадзіць, бо ў балоце розныя пачвары жывуць.

Ходзяць дзяўчаты па лесе, збіраюць грыбы, перагукваюцца адна з адной, Авуку дражняць. А Русалкі-балотніцы нядобрую справу задумалі. Вырашылі яны дзяўчынак у балота заманіць у ахвяру Балотніку.

Выслалі балотніцы грыбамі шлях да балота. Дзяўчынкі і самі не заўважылі, як апынуліся каля балота. Не паслухалі яны маці, падышлі зусім блізка да яго, тут Балотніцы схапілі іх і пацягнулі ў багну. Пачалі прасіцца дзяўчынкі, каб адпусцілі іх.

Зжаліўся над імі Балотнік, замест таго, каб утапіць дзяўчынак, пераўтварыў іх у грыбы. Закляцце Балотніка зможа зняць толькі той, хто пашкадуе дзяўчынак і прадасць яму сваю душу.

Шмат часу прайшло з таго здарэння. Недалёка ад балота з’явілася вёска, якую назвалі Грыбы, бо ў лесе па-ранейшаму вельмі шмат грыбоў.

А дзяўчынак так ніхто і не выратаваў.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 39/05.*

## Чалавек і Духі хваробы

### Мужык і Халера

Ехаў познім вечарам адзін чалавек да сваей вёскі, ажно на дарогу з-пад моста вылазіць нейкая худая баба і просіцца ў яго:

— Чалавек, падвязі мяне.

У чалавека ад жаху валасы дыбам усталі: думае, што гэта Дух. А баба яму кажа:

— Не бойся, я табе нічога не буду рабіць. Падвязі, то нешта скажу.

Ён — няма рады:

— Сядай.

Яна села і стала гаварыць:

— Цяпер у вас скаціна хварэе.

Чалавек пацвярджае:

— Але ж, хварэе.

Яна зноў:

— А на весну людзі будуць хварэць. Будзе ўраджай, але не будзе каму есці.

Прамовіла так і знікла. А была гэта не простая баба, а Халера.

*Fed.-1, s. 7.*

### Пошасць і селянін

Ва ўсёй акрузе была вельмі вялікая Пошасць, людзі мёрлі, як мухі, толькі пакуль што трымалася вёска Выгары. Знаходзілася яна далёка ад Бога і ад людзей, схавалася за брадамі ды за балотамі. Па ўсёй акрузе смерць косіць старых і малых, быццам атаву з расою, а на гэтую вёску і забылася.

Пад самую восень адзін селянін з вёскі Выгары на палянцы сярод лесу сеяў жыта. Пасеяў, колькі Бог даў, пабаранаваў, палажыў барану на воз ды збіраўся ўжо ехаць дахаты. А тут выходзіць з лесу якаясь худая ды страшэнная жанчына і просіцца, каб ён падвёз яе на вёску.

Перш чалавек не згаджаўся, кажучы, што на драбінах барана і няма на чым сядзець. А жанчына кажа, што нічога не трэба, што яна паедзе і на баране, абы толькі трохі ногі адпачылі.

Наламаў мужык галля, наклаў на воз, падсадзіў тую жанчыну ды патарахцеў дахаты. Пад’ехаў ён да сваёй хаты, а тая жанчына хуценька саскочыла з воза ды кажа:

— Дзякуй табе, чалавек, што ты мяне сюды прывёз.

Сказала так і тут жа знікла. А гэта была Пошасць. Пайшла ж яна касіць людзей, пайшла класці, што не ўпраўляліся хаваць. А хату чалавека, які яе прывёз у вёску, мінула. Вось тады і здагадаўся ён, што сам прывёз тую Пошасць.

### Пошасць і Паморак

Некалі даўно быў вельмі добры адзін год: добрая восень, роўная зіма, а вясна цёплая, пагодная. Рады людзі, што даў Бог ураджай: усё зрадзіла.

Ідзе адзін чалавек па лесе, бачыць, сядзіць на пні якаясь вельмі гожая маладзіца і трымае ў прыполе сноп жыта, ды такога буйнога, якога той чалавек яшчэ ніколі не бачыў. Падышоў ён бліжэй — аж маладзіца плача ды сваімі доўгімі валасамі ясныя вочкі ўцірае. Адгарнула маладзіца валасы і адкрыла грудзі. Бачыць чалавек: вуж упіўся ў самую цыцку і ссе маладзіцу. Хацеў чалавек забіць таго вужа, але маладзіца толька прамовіла:

— Вялікі ўраджай, ды не будзе каму спажываць.

І знікла.

Прыйшоў чалавек у сяло і расказвае, які бачыў цуд. Спужаліся людзі. Чакаюць Пошасці ці Паморку.

І вось аднойчы вечарам лавілі дзяцюкі рыбу і заначавалі каля ракі на грудку. Сядзяць яны каля агню ды пякуць рыбу.

Узышоў месяц. Бачаць яны, аж за ракою падышлі да берага нейкія дзве вельмі страшныя бабы. Косы ў іх расплеценыя, твары цёмныя, як зямля, толькі вочы блішчаць. Падыйшлі яны да ракі і просяць дзяцюкоў, каб перавезлі іх на другі бераг.

Здагадаліся дзяцюкі, што гэта не бабы, а Пошасць на людзей і Паморак на жывёлу. Спалохаліся дзяцюкі і давай кідаць у іх

галавешкамі. Хацелі тыя бабы перш па кладцы перайсці цераз раку, але як убачылі агонь, спалохаліся і пайшлі назад.

Праз нейкі час даведаліся людзі, што за ракой пайшла Пошасць ламаць людзей, а Паморак — касіць свойскую жывёлу. Пачалі яны дзень і ноч класці з усіх канцоў сяла агонь, каб не падпусціць пагані блізка. Толькі так і ўратавалі сваё сяло.

От з тае пары і сталі людзі класці агонь ды рабіць курадым, як пачуюць, што Пошасць падыходзіць.

*Сержп.-2, с. 39—40.*

### Паморак і мужык

Але ж бывае, што і людзі памыляцца ды самі ўвязуць у вёску Паморак. Вось як тое бывае.

Ехаў вясковец дахаты. Пад'язджае ён ужо да вёскі, як сустракае яго нейкі ўбога. Зірнуў чалавек і хацеў яго мінуць, але той пачаў прасіцца, каб той яго падвёз. Падвезці дык падвезці, на тым свет стаіць. Паправіў чалавек на драбінках салому ды і павёз таго ўбогага. А быў то не ўбогі, а Паморак на жывёлу. Чалавек загаворвае з убогім, а той бы пень сядзіць ды толькі сапе, як кавальскі мех, і маўчыць.

Пад'ехалі яны да самай вёскі і едуць паўз агонь. Скрывіўся Паморак, косіцца на агонь, бы наравістая кабыла, але сядзіць. Прыехалі яны ў вёску, а тут ужо і сцямнела. Павярнуў чалавек да сваёй сядзібы, як азірнецца, аж той убогі знік, бы ў зямлю праваліўся. Здагадаўся ён, якое ліха прывёз, але няма чаго рабіць — ашукаўся. Назаўтра як пойдзе Паморак касіць жывёлу, ды так і кладзе ўпокат. Глянуць людзі ў загарадку ці ў хлеў, а там скаціна ляжыць покатам.

Кругом жывёла прападае, а ў таго чалавека, што прывёз Паморак, хоць бы што. Здагадаліся людзі, што нешта тут не так, ды і пытаюць, чаму гэта Паморак абыходзіць яго хату. Круціўся той, круціўся, але як яго прыпёрлі, мусіў прызнацца, што гэта ён завёз у вёску Паморак, але, кажа, я не ведаў, што то Паморак, а думаў, што так сабе ўбогі. Вось, мабыць, за тое ён і абыходзіць яго хату.

Хацелі людзі перш знішчыць таго чалавека, але потым даравалі, бо бачаць, што ён і сам не ведаў, каго падвёз.

*Сержп.-1, № 2246.*

### Сяляне і Паморак

Настала лета. Бог крыў ад граду палі, і яны далі вялікі ўраджай. Пайшла чутка, што хоць Бог даў вялікі ўраджай, але будзе Паморак і некаму будзе спажываць. Спалохаліся людзі ўраджаю горай, чым самой бяды. Ходзяць яны засмучоныя, бы ў ваду апушчаныя.

Толькі па восені пачаў Паморак касіць перш хатнюю жывёлу, а потым і людзей. Засталося толькі адно сяло Падбалоцце, куды яшчэ не дабраўся Паморак. Жывуць там людзі ў страху і кожную часіну чакаюць бяды. Але ж, каб хвароба не забралася ў іх сяло, пачалі берагчыся.

Дзецюкі ўзялі два брускі ясеню, і пачалі іх церці, каб здабыць жывы агонь. Церлі яны, церлі датуль, пакуль брускі не загарэліся. Разнеслі людзі той агонь па хатах, і ніколі ён не пераводзіўся. А на тым месцы, дзе здабылі агонь і на канцах вуліцы пачалі дзень і ноч паліць вогнішчы, каб Паморак не мог увайсці ў сяло. Жывёлу ж яны загналі далёка ад сяла ў цёмныя лясы, на астраўкі за балота, парабілі там кашары і пасвілі статак там да самае зімы.

Раніцой і вечарам кожнага дня гаспадары абкурвалі жывёлу тхарынаю: паложаць на вутолле кавалкі сушанае тхарыны і падкурваюць скаціну. Навокал разыходзіцца такі смурод, што аж нос зрывае. Тут ніякая хвароба, ніякая Пошасць не вытрымае.

Неяк паехаў з Падбалоцця адзін чалавек на грудок па сена. Разварушыў ён стажок і давай класці на воз сена. Аж вось высунуўся з хмызняку нейкісь страшны дзед з доўгай, калматай барадой, з адным вокам, ды і падыходзіць да воза, абапіраючыся на кіёчак. Зірнуў той чалавек і спалохаўся. Яшчэ ніколі ён не бачыў такога страшнага дзеда і падумаў, што, мабыць, гэта Паморак. Тым часам палыпаў дзед адным вокам ды і просіць падвезці яго да сяла. Падумаў чалавек ды і кажа:

— Давезці я давязу, толькі, можа, нашы людзі не ўпусцяць цябе ў сяло, бо, бачыш, яны вартуюць, каб у сяло з кім і Паморак не прайшоў.

— Э, мой лябедзіку, — кажа дзед, — я ўбогі, але нясу людзям шчасце, якога яны не маюць, пакуль жывуць.

— Якое ж ты нясеш шчасце?

— Такое шчасце, якое будуць мець і самыя багатыя, і самыя здаровыя, і самыя слаўныя людзі, і апошні ўбогі.

Як прамовіў ён астатняе слова, дык чалавек і здагадаўся, што дзед нясе смерць. Бо, ведама, яна ўсіх бярэ, яна ўсім дае роўнае шчасце. Але змоўчаў чалавек і кажа:

— Ну, дзеду, лезь на воз, а я прыкідаю цябе сенам, хіба такім спосабам увязу ў сяло.

Узлез дзед на воз, а чалавек прыкрыў яго сенам, прыціснуў рублём і павёз у сваё сяло. Пад'язджае чалавек да выгану, дзе стаяла варта ды гарэла вогнішча, шапнуў дзецюкам, што вязе Паморак. Дык тыя і пытаюць:

— Мужык, што ты вязеш?

— Дровы.

— Якія дровы? Гэта ж сена.

— Нашто ж пытаеш, калі знаеш.

— А ў сене што?

— Што? Мо шышкі ды шыпулькі.

— Гэ, ты яшчэ ўздумаў з нас кпіць! Хлопцы, бярыцеся за воз.

Падхапіліся хлопцы, ды скінулі сена на касцёр. Выбухнуў агонь, ледзь не роўны з лесам. А тут хлопцы яшчэ пруццем пашавельваюць сухое сена, ды падкідваюць на агонь дроў. Круціўся, круціўся Паморак, ды людзі спалілі яго так, што і костачак не засталося. Але ж, ведама, нечысць і ў агні не гарыць: перш згарэла, а потым ажыла.

З таго часу перасталі людзі паміраць і жывёла дохнуць. Мабыць, добра такі спалохаўся Паморак, як далі яму такую лазню, спалохаўся і ўцёк за сіняе мора, за высокія горы ў далёкі край ды там і застаўся. Часам ён наведваецца ў тую вёску, парэжа трохі скаціну, накосіць людзей і хуценька ўцякае, каб яго зноў не злавілі ды не падпалілі.

*Сержп.-2, с. 139—142.*

## Жывёлы

### Мядзведзі

МЯДЗВЕДЗЬ быў чалавекам, як яшчэ Бог хадзіў па Зямлі. Надумаў адзін чалавек з жонкай спужаць Бога: яны прыбяднелі і злавалі на Бога.

— А што ён ходзіць, нас нічым не надзяляе, — спужаем жа мы яго.

І сталі думаць, як яго спужаць. Рашылі: падлезем пад мост і замычым, і Бог спудзіцца нас. Як задумалі, так і зрабілі. А Бог сказаў:

— Калі ж вы так замычалі, то будзеце ўвесь век мычаць.

І абярнуў іх мядзведзямі. З таго і мядзведзі пайшлі.

Выкупляючы сваю правіну перад Богам, мядзведзь заходзіць у вёскі: ён ведае, у якога гаспадара павінна здарыцца няшчасце, і забірае тыя няшчасці з сабою.

*Шейн.-2, с. 343.*
*Романов-8, с. 317.*

#### Праклён мядзведзіцы

Працякала раней за вёскаю рака. І вось адзін раз пераплывала тую раку мядзведзіца з малым на спіне. Падняўся вецер, рака зашумела і малое мядзведзяня ўпала ў раку і ўтапілася.

Мядзведзіца на беразе доўга раўла, а пасля некуды пайшла. А гэта рака з таго часу пачала мялець, сохнуць і высахла ўся, змялела. Гэта мядзведзіца яе пракляла. Ракі зараз няма, а тое месца завуць Медзвяжанка.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 42/06.*

#### Мядзведзь і дзеўка

Жыла ў адным сяле дзеўка, якую ніхто не хацеў браць замуж. З адчаю пайшла яна ў лес. Доўга-доўга хадзіла па лесе і заблукала.

Нечакана ўбачыла бярлогу мядзведзя і самаго гаспадара.

Мядзведзь прыняў яе, і жылі яны як мужык з жонкай. Праз нейкі час нарадзіла гэтая жанчына мядзведзяня. І жылі яны ўжо ўтраіх. Мядзведзь прыносіў ім ежу і адзенне. Калі ён звыкся і перастаў за жанчынай сачыць, тая вырашыла ўцячы дадому.

Аднойчы пачула жанчына ў лесе гаворку людзей. Яна ціхенька забрала сваё дзіця і пайшла на галасы. Ды мядзведзь заўважыў, што жанчыны няма, і пагнаўся за ёю. Калі дагнаў яе, жанчына кінула дзіця і пабегла. Мядзведзь разарваў тое дзіця і жанчыну разарваў бы, але яна дабегла ўжо да людзей, і тыя абаранілі яе і забралі з сабой.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС – 25/04.*

## Ваўкі

У АДНОЙ вёсцы засталіся сіроты без бацькі і маці. Некаму было карміць іх, даглядаць. Няма куды сіротам было падзецца. Тады Бог злітаваўся і, каб дапамагчы ім, стварыў ваўкоў. Да гэтага скаціна была без пастухоў, самапасам хадзіла. Ну, ваўкі як сталі скаціну есці, шкоду рабіць, людзі і давай наймаць пастухоў. І гэтых сірот нанялі. Сталі яны і сытыя, і адзетыя. А ваўкі так і пайшлі з таго часу.

Пашкадаваў Бог адных, ды нарабіў клопату іншым. Пачалі ваўкі моцна сваволіць, што нават і пастухі не заўсёды маглі даць рады. Тады прызначыў Бог над усімі ваўкамі гаспадаром Ярылу. Яны яго слухаюць, бо так Бог загадаў.

Звычайна воўк цягне са статка тую жывёліну, на якую атрымаў дазвол ад Ярылы. Таму не зусім бязгрэшным будзе адбіраць у ваўка яго здабычу. Але ж усялякае бывае.

Жыла адна ўдава. Была ў яе чорная з лысінаю карова. Прызначыў Ярыла ваўку з'есці гэтую карову. Дачулася пра гэта ўдава. Суседзі ёй параілі замазаць лысіну ў каровы чым-небудзь чорным. Удава гэтак і зрабіла. Прыйшоў у статак воўк, шукаў-шукаў чорнае каровы з лысінкаю і не знайшоў.

Пайшоў ён да Ярылы і стаў жаліцца яму, што не знайшоў тае каровы, што трэба. Ярыла ведаў, што за штуку зрабілі ваўку, і сказаў яму з'есці чорную карову. Прыйшоў воўк зноў у статак шукаць ужо чорнае каровы. А ўдава тым часам дачулася і абмыла ў каровы лысінку. І гэты раз воўк не знайшоў свае каровы. Доўга хадзіў воўк, шукаў усё каровы то з лысінкаю, то чорнае, а ўдава ўсё падманвала яго — і воўк здох з голаду.

Воўк — паведач Ярылы. Таму беларусы вельмі шанавалі гэтага драпежніка, прыносілі яму ахвяры. Звычайна ў снежні бралі казу, вялі яе ў лес ды прывязвалі на перакрыжаванні шляхоў. Раніцой ішлі глядзець, ці не адмовіліся ад падарунка ваўкі.

Ваўкі знаходзяцца таксама ў распараджэнні Лешага. Ён заве іх сабачкамі і заступаецца за іх. Але Гаспадаром ваўкоў з'яўляецца воўк белага колеру, якому падпарадкуюцца ўсе астатнія ваўкі.

Пры сустрэчы з ваўком у лесе беларус вітаў яго: «Здарова, браток!» Лічылі, што калі павітаць яго першым, то ён ніколі не нападзе, а калі перабяжыць дарогу — то гэта на добрае: будзе поспех у справах. Калі чалавеку сустрэнецца воўк, то абавязкова той чалавек знойдзе што-небудзь. Калі воўк прабяжыць паўз вёску ці праз яе перад захадам сонца, то наступная ноч будзе добрая для ўсіх вяскоўцаў.

Ёсць сярод ваўкоў і пярэваратні. Такі воўк набывае аблічча хлопца. Воўк-пярэварацень з'яўляецца да дзяўчат на вячорках, у крывыя вечары. Ён вельмі небяспечны, але пазнаць яго можна па воўчым хвасце, які ў яго застаецца.

*Дземідовіч, с. 96.*
*Добровол. Словарь, с. 74, 79, 970.*
*Багдановіч, с. 177—178.*
*Никифор.-1, с. 185, 160.*
*Fed.-1, s. 129.*

## Ліса

У АДНЫМ сяле жыла жанчына па імені Ліса, якая ўсё жыццё падманвала людзей. Яна не мела свайго кута, таму жыла там, дзе прыйдзецца. Вось прыйдзе яна да гаспадароў і пачне жаліцца і хлусіць: «Я вельмі бедная і гаротная. Няма ў мяне сваёй хаты. Усе мае дзеці памёрлі ад голаду. Пусціце мяне да сябе на адну ночку пагрэцца».

Гаспадары шкадавалі яе, кармілі, пускалі на начлег. А калі раніцою прачыналіся, то жанчыны і след прастыў, а разам з ёю знікалі ўсе харчовыя прыпасы. Доўга яна так бадзялася па хатах, добрых людзей абірала.

Аднойчы даведаўся пра гэта Бог, разгневаўся моцна і пакараў гэту жанчыну.

— За твой падман і крадзеж будзеш ты хітрым зверам, — сказаў Бог.

І ператварыў яе ў рыжую лісу.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 2, спр. МС – 82/05.*

## Заяц

КАЛІ заяц перабяжыць дарогу, то гэта ліхі знак. Лепш вяртайся назад: не будзе поспеху, а то здарыцца па дарозе няшчасце.

Калі заяц забягаў у вёску, то праз нейкі час там адбываўся пажар. Калі ж заяц заскокваў у хату, якая будавалася, то будаўніцтва спынялі і бярвенне выкарыстоўвалі толькі на дровы.

У аднаго селяніна конь стаў наравісты і злы. Вывеў гаспадар каня ноччу ў поле, зламаў асінавы дубец і пачаў біць яго дубцом. Праз некаторы час конь пакрыўся пенай, потым з яго зваліўся корч, ператварыўся ў чорнага зайца, які хутка знік у лесе.

*Сержп.-1, № 1272.*
*Романов-8, с. 317.*
*Булгаковский, с. 187.*
*Коваль, с. 68.*

## Чаму змеі сталі ворагамі людзей

### Змеі

РАНЕЙ людзі жылі ў згодзе са змеямі. Яны жылі ў людзей у хатах, каморах, у хляве. Людзі кармілі іх. За гэта змеі лавілі мышэй. У тыя часы ў змей не было яда. Чалавек лічыў змяю самай мудрай жывёлай.

Але аднойчы здарылася няшчасце. Нейкі чалавек ішоў з лесу дамоў, не заўважыў кладку змяіных яек і наступіў на яе. З усёй кладкі засталося толькі адно яйка. Недалёка была старая змяя, якая паўзла да сваёй кладкі. Яна бачыла, як чалавек наступіў на яйкі. Змяя абвіла апошняе яйка і цэлую ноч праляжала з ім, думаючы, як адпомсціць чалавеку.

З яйка, якое ўсю ноч аберагала старая змяя, вылупіўся незвычайны Змей. Ён быў вялізнага памеру, мог лятаць, меў яд, і з пашчы ў яго ішоў агонь. І гэты Змей пачаў помсціць чалавеку.

З таго часу людзі і змеі больш не жывуць у згодзе.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 46/06.*

### Гаспадар-змей

На пачатку восені Гаспадар-змей вядзе сваіх падданых у змяіны Вырай. Ідуць змеі ў Вырай не асобна адна ад адной, а ўсе разам. Сам Гаспадар-змей ідзе наперадзе, а за ім у незлічонай колькасці яго падданыя. Ён большы за ўсіх іх, луска ў яго адлівае срэбрам і золатам, а на галаве — маленькія залатыя рожкі.

Цяжка сустрэць змеяў у час такога іх пераходу, бо яны выбіраюць непраходныя для чалавека мясціны. А калі ўдасца сустрэць, трэба разаслаць перад змяіным Гаспадаром абрус, пакласці туды хлеб-соль і пакланіцца яму да зямлі, то ён, прапаўзаючы па абрусе, на знак падзякі скіне з галавы залатыя рожкі. Хто мае такія рожкі, той надзелены надзвычайнай мудрасцю і праніклівасцю: можа ўгадваць чужыя думкі, знаходзіць выйсце з самага цяжкага становішча. На ўладальніка змяіных рожкаў не дзейнічае ніякі яд. Калі ўзяць гэтыя рожкі ў забітай ці іншым шляхам злоўленай змяі, то яны не будуць мець ніякай сілы.

Акрамя таго, рожкі здольныя тварыць: адзін — дабро, а другі — благое. Каб вызначыць, які ражок добры, а які благі, трэба закапаць іх пад два аднолькавыя дрэвы. Праз ноч адно дрэва стане прыгажэйшым, а другое засохне. Калі падкласці пад вугал дома добры ражок, то ў доме пачнецца няспынная чарада ўдач, ад благога ражка — наадварот. Рожкі у руках чалавека, які здабыў іх, захоўваюць сваю сілу на ўсё далейшае жыццё і трацяць гэтую сілу пасля смерці ўладальніка. Пры гэтым трэба заўважыць, што рожкі захоўваюць і выяўляюць сваю сілу толькі ў руках таго чалавека, які сам непасрэдна іх здабыў.

*Багдановіч, с. 33.*
*Никифор. 1, с. 198—199.*

## Вужы

ВУЖЫ маюць свайго Гаспадара. Гэта самы вялікі вуж. Няма яму роўнага між вужоў: на галаве ў яго карона бліскучая і залатыя завушніцы ў вушах. Уецца ён смаўжом і ходзіць на хвасце стойма, нібы чалавек. А свішча Гаспадар вужоў такім волатавым посвістам, што чуваць па ўсёй Беларусі. Іншыя вужы — яго дзеці і падданыя.

Як вужы ідуць у свой Вырай, то кожную травінку, пянёк, дрэва — усё нюхаюць, а каб чалавек адразу за імі панюхаў, то перакінуўся б у вужа і з імі разам пайшоў бы.

Каля брамы ў Вырай не пускаюць тых вужоў, якія за лета ўкусілі чалавека, адганяюць іх. Яны будуць самотна цягацца па свеце. Тады вужы паўзуць на дарогі, каб іх забілі, ці каб трапіць пад калёсы воза. Таму ў гэты дзень нельга ісці ў лес, бо ўся зямля ўслана гадамі, што няма куды нагі паставіць.

*Fed.-1, s.177—178.*
*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 136/05.*

### Гаспадар-вуж

У лясах водзіцца вуж з залатымі рагамі. Калі хто-небудзь, убачыўшы гэтага вужа, зможа паслаць перад ім світку так, каб ён прапоўз па ёй, і скажа: «Вуж малады, скінь рог залаты!» — то вуж скіне адзін са сваіх рагоў. Вужа з залатымі рагамі можна стрэць вясною. У гэты час ён ахвотней за ўсё скідвае свае рогі. У іншую пару, калі нават і сустрэць такога вужа, ён рог не скіне. Нават калі падаслаць світку, то ён, прапаўзаючы, разрэжа яе на дзве часткі.

Адзін хлопец ішоў сабе каля ракі, ажно бачыць: вужы ў Вырай ідуць. Са страху зашыўся пад куст і сядзіць. Бачыць хлопец, паўзе наперадзе Гаспадар вужоў, а на ім карона золатам ззяе! Прыпоўз вуж да вады, скінуў карону — і ў ваду, а за ім усе вужы, ды пачалі купацца. Хлопец падбег, цап за карону і ўцякаць. Тут усе вужы за ім у пагоню.

Гналі, гналі, дык хлопец, няма рады, карону кінуў, а сам ледзь дахаты прыбег. А каб не кінуў, то, пэўна, не хадзіў бы ўжо па свеце.

*Шейн-3, 343.*
*Fed.-1, s. 177.*

### Вужалкі

Вужалкі — дочкі Гаспадара вужоў. Да паловы яны прыгожыя маладыя дзяўчаты, з доўгімі распушчанымі валасамі, а замест ног у іх як бы змяіны хвост.

Вужалкі звычайна жывуць у лесе, паблізу вадаёмаў, хоць і неабавязкова. Яны вельмі любяць сядзець на старых раскідзістых дрэвах і часаць залатымі грабеньчыкамі свае цудоўныя валасы.

Вужалкі не маюць ніякага адзення, нягледзячы на тое, што іхні бацька — Гаспадар вужоў — вельмі багаты. Пад яго аховай знаходзіцца шмат скарбаў, таму дочкі яго не маюць ні ў чым адмовы. І якіх толькі дарагіх упрыгожанняў няма на Вужалках! Калі хто ўбачыць іх у сонечны дзень, можа падацца, што само сонца скацілася ў лес, — так зіхацяць на Вужалках розныя каралі і бранзалеты. Часам каторая з іх можа згубіць што-небудзь з упрыгожанняў. Лічыцца добрым знакам знайсці такую рэч, звычайна яна прыносіць шчасце і чалавек гэты не баіцца змяінага ўкусу.

Самі Вужалкі не робяць чалавеку ніякай шкоды, але вакол таго месца, дзе яны сядзяць, кішма кішаць розныя гады. Такім чынам Гаспадар вужоў ахоўвае сваіх дачок. А калі ўсё ж хтосьці пакрыўдзіць Вужалку, на чалавека таго абрынуцца ўсялякія няшчасці, што загубяць яго самога і ўвесь ягоны род.

*Беларус. міфалаг., с. 65—66.*

## Гаспадар гадзюк

ГАДЗЮКІ таксама маюць свайго Гаспадара. Яго можна пазнаць па залатых рожках, што ў яго на галаве. От калі збіць тыя залатыя рожкі ды насіць іх пры сабе, то можна ісці куды хочаш, бо не ўтрымаюць цябе ніякія замкі і запоры. Спрытныя злодзеі маюць такія рожкі, таму іх ніхто не можа злавіць.

Вось як дастаюць рожкі Гаспадара гадзюк. Восенню гадзюкі збіраюцца ў адно месца, каб паўзці на зіму ў падземны Вырай. Паперадзе паўзе Гаспадар. Трэба ў той час на золку пайсці ў лес, дзе каля палянкі ёсць шмат лому, ды і цікаваць. Як толькі ўзыйдзе сонейка ды добра прыгрэе, усялякія гадзюкі пачнуць вылазіць з лому ды з нор і паўзці на сонейка грэцца. Перш гадзюкі поўзаюць туды-сюды ўмітуські. А потым, як пакажацца сам Гаспадар, дык яны пачнуць яго абвіваць, як пчолы сваю матку. От тады трэба па

тым клубку ўдарыць паплiскаю — толькi адзiн раз, не больш. Тады Гаспадар гадзюк i скiне свае рожкi. Бяры хутчэй iх i ўцякай не аглядаючыся, а то гады загрызуць.

*Сержп.-1, № 2217.*

## Чароўныя жывёлы

### Кот

Каб вывесцi Ката, трэба ўзяць якога-небудзь пеўня i на працягу сямi год даглядаць яго добра. Ён знясе яйка. Гэтае яйка трэба некаторы час насiць пад пахай, пакуль з яго не выйдзе чорны Кот.

Кот гэты на працягу амаль усяго дня застаецца нябачны. Ён з'яўляецца толькi вечарам, калi ўсе ў хаце засынаюць моцным сном. Тады гаспадыня смажыць яешню i ставiць у талерцы на падлогу. Праз некалькi хвiлiн з'яўляецца Кот, з'ядае прыгатаваную для яго ежу i зноў знiкае да наступнага вечара. Калi ж па нейкай прычыне не прыгатаваць яму яешню, то ён можа спалiць хату.

За добры догляд Кот добра ўзнагароджвае. Ён можа ноччу забрацца ў чыё-небудзь гумно, дзе ёсць жыта, пшанiца. Наядаецца зерня i, вярнуўшыся да свайго гаспадара, адрыгвае зярняты ў аблюбаваным iм месцы. Кот прыносiць не толькi збожжа, але i скарбы. Калi нясе скарбы, то яго ахутвае вогненнае святло, калi збожжа — святла няма. Калi ён iдзе, то чуваць невялiкi шум i гудзенне.

*Шейн-3, с. 303.*

### Змей

Змей падобны да звычайнага вужа, толькi значна большы за яго, увесь залаты, гарыць, як жар, i мае крылы.

Змей дапамагае ўсiм людзям, якiя з iм знаюцца. Ён лёгка пераляртае з месца на месца. Лётае надзвычай хутка. Убачыць яго можна толькi на золку. Ён заўсёды ахутаны цёмнай хмарай. Пры палёце Змея бачны вогненны след.

Выводзяць беларусы Змея наступным чынам. Калi чорны певень пражыве сем гадоў, то пад канец сёмага года знясе асаблiвае з выгляду яйка, якое па форме нiбыта ракавiна звычайнага смаўжа. Гэтае яйка трэба насiць пад пахаю тры гады. Тады вылупiцца з яго маленькае Змеяня. Яго трэба беставаць, трымаць у цяпле, кармiць яешняй (гэта яго выключная ежа) i нiчым не раздражняць. Тады ён будзе служыць больш верна, чым сябра. Стаўшы дарослым, Змей пачне лятаць i прыносiць снапы з чужых палёў у гумно, золата з невядомых скарбаў. Увечары яго можна часам бачыць на небе. Як ляцiць вогненны, чырвоны — золата нясе, як цёмны, чорны — збожжа, снапы. Убачыўшы, што Змей пераносiць скарбы, з яго не трэба смяяцца, бо

ён спаліць насмешніка з хатнім скарбам. Хто прагне авалодаць дабром, якое нясе Змей, павінен тры разы сказаць: «чур-чур-чур» і разаслаць белую хусту на зямлі — усё дабро пасыплецца на хусту.

Жыве Змей у клеці, нікому не паказваецца. Туды яму гаспадар ці гаспадыня штодзённа носяць свежую яешню. Але яе чамусьці нельга саліць: нічым так не ўгнявіш Змея, як пасаліўшы яму яешню. За гэта ён спальвае ўсё гаспадарова дабро і сам адлятае. Наогул, ён, раззлаваўшыся, помсціць пажарам.

Сусед, жадаючы зрабіць гаспадару Змея зло, можа з’есці прыгатаваную для Змея яешню і замест яе на патэльні пакінуць нешта гідкае. Змей пакарае за гэта свайго гаспадара, як за замах на жыццё.

Быў такі выпадак. Парабак, падгледзеўшы, як гаспадыня носіць Змею есці яешню, аднойчы з’еў тую яешню сам. Змей вельмі разгневаўся, думаў, што гаспадыня кпіны састроіла, і спаліў увесь двор і гумно, і дом. Гасілі людзі, гасілі і не далі рады. Стаяць, глядзяць на галавешкі, а тут кола старое ляжыць (а гэта быў Змей, ён перакінуўся у кола, жыць яму ўжо не было дзе). Дык сусед кажа:

— А што ж яно тут будзе гарэць, — дый перакінуў у свой двор.

Дык адкуль толькі што ўзялося ў яго! Усе яму пайшло: і ўраджай, і ўсялякае дабро.

Зрэдку Змей лётае па начах у які-небудзь дом і ўступае ў любоўную сувязь з жанчынай. Такога завуць Змей-любан.

Гаспадар можа пазбавіцца ад Змея толькі тады, калі даведаецца, дзе Змей начуе. Даведаўшыся пра месца начлегу, трэба ўзяць канец атосы, вымазаць у дзёгці, і, знайшоўшы соннага Змея, ударыць яго з усяго маху адзін толькі раз — інакш ён ажыве. Пасля першага ўдару Змей выпускае з сябе полымя, потым смуродны дым, потым перакідваецца чым толькі можа і ўгаворвае чалавека ўдарыць яго другі раз і нарэшце з ровам здыхае. Калі ўдарыць яго другі раз, тады ён сам заб’е чалавека, усю маёмасць спаліць і попел з ветрам развее.

*Багдановіч, с. 73—74.*
*Добровол. Словарь, с. 272.*
*Дембовецкий, с. 498—500.*

## Змей і чараўнік

Даўно-даўно адна жанчына пасадзіла на яйкі куру.

Праз колькі дзён зайшла пакарміць тую і бачыць: побач з кублом ляжыць адно яйка. Кабета падумала, што выкацілася неяк, і паклала яго пад куру. Толькі з таго часу як ні прыйдзе паглядзець куру, то на доле бачыць адно ці два яйкі пабітыя. Грашыла гаспадыня на квахтуху, што няўдалая трапілася. І было гэтак да таго часу, пакуль не засталося адно яйка пад курай. Доўга сядзела на кубле квахтуха, а з яйка нічога не выводзілася. Вырашыла тады жанчына, што гэта баўтун, і выкінула

за гарод. Але тое яйка ўпала і не разбілася, што вельмі здзівіла гаспадыню. Пайшла жанчына дахаты і расказала пра ўсё свайму мужыку. Вырашыў ён глянуць на тое яйка, але ўжо не знайшоў яго на ранейшым месцы. А там, дзе яно ляжала, засталася пляма выпаленай травы.

Пасля гэтага распытвала тая жанчына ў розных людзей, што гэта магло быць. Адна бабулька-шаптуха ёй і сказала, што ў яйку было не кураня, а Змей. І знікла яно не проста так, а падняў яго нядобры чалавек. І пад квахтухай яно не вылупілася б, бо яму трэба чалавечае цяпло.

А праз нейкі час у суседняй вёсцы пасяліўся чужы чалавек. Жыў ён адзін. Адкуль прыйшоў і хто ён такі — ніхто не ведаў. Пасля яго з'яўлення ў вёсцы скаціна пачала хварэць і падаць. А вечарамі ў людскія хлявы бегаў чорны кот. Бачылі гэтага ж ката і ля хаты новага жыхара вёскі.

Сваёй гаспадаркі чалавек не трымаў, зямлю не апрацоўваў, але хутка стаў багатым. Бо быў чарнабожцам, і багацце яго ад Нядобрага Духу. Заўважылі сяляне, што амаль кожную ноч у комін ведзьмаковай хаты апускаецца нейкая вогненная ці то птушка, ці то жывёла. Дык то быў Змей, які насіў золата чарнабожцу.

Мясцовыя людзі хату чарнабожца абыходзілі. І гады праз тры вядзьмак сам некуды з'ехаў, знік гэтак жа нечакана, як і з'явіўся. У тую ж ноч хата яго згарэла ад маланкі.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 5, МС — 200/05.*

# Птушкі

### Гаспадар птушак

Раней усе птушкі не баяліся пакідаць свае гнёзды. Яны без страху лёталі за ежай ды па іншых справах, а дзетак пакідалі адных. Жыццё іх было такім бесклапотным, бо ў птушак быў свой гаспадар — Кук. Лятаў ён па лесе, разганяў ваўкоў і лісіц, змей — усіх, хто нападаў на Птушынае гаспадарства. Але аднойчы Кук не вярнуўся ў свае гняздо. Зажурыліся ўсе лясныя птушкі:

— Хто ж нас цяпер абароніць?

Сталі раіцца. Што рабіць? Трэба ісці шукаць свайго заступніка. Але хто пойдзе? У кожнага справа: той гняздо ўе, той яечкі наседжвае, той дзяцей гадуе; адзін — стары, другі — малы. Рашылі яны адправіць зязюлю — у яе гнязда няма і дзяцей няма. Спалохалася зязюля, што трэба ісці ў вялікую дарогу, і знесла яечка.

— Куды ж я яго дзену? — гаворыць зязюля.

— Пакладзі свае яечка ў любое гняздо! — адказалі ёй птушкі.

— А хто яго будзе выседжваць?

— Каму пакладзеш, той і глядзець будзе.

— А хто ж маё птушанятка гадаваць будзе?

— Хто будзе сваіх гадаваць, той і тваё дагледзіць.

І паляцела зязюля шукаць Кука. Праляціць трохі, сядзе на галінку і кліча:

— Ку-ку!

Праляціць і зноў кліча.

— Ку-ку!

З той пары лётае зязюля па лесе, гукае: «Куй, Куй!», і раскідвае сваіх дзетак па гнёздах іншых птушак.

*ЛіП, № 60.*
*ПАШ. Ф. 8, воп. 2, спр. МС — 43/04.*

### Бусел

Было гэта вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што не стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёле. І вырашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, патапіць у якой-небудзь бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мех, завязаў, узваліў на плечы аднаму чалавеку і загадаў укінуць у прадонне. Як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, засіпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць: што ён такое нясе?

Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распаўзліся зноў па зямлі.

Раззлаваны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і загадаў збіраць гадаў-уцекачоў усё жыццё аж да самай смерці.

І ходзіць гэты ператвораны ў бусла чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтай пары ніяк сабраць не можа. Нават нягледзячы на тое, што чараўнік для дапамогі паслаў яму жонку і дзяцей. З прычыны сваёй крэўнасці да чалавека гэты пярэварацень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.

Тую хату і нават сядзібу, дзе бусел уладкуе сваё гняздо, можна лічыць шчаслівай, а Пярун ніколі не ўдарыць нават паблізу гнязда.

Беларусы шануюць бусла як карыснае стварэнне, якое нішчыць жаб, змей і вужоў. Але і баяцца іх. Калі чалавек разбурыць буслянку, яны адпомсцяць. Пралятаючы паблізу вясковых сядзібаў, яны могуць распаліць пажар, кінуўшы на дах стадолы ці хаты запаленую галавешку, або нават уторкнуць яе пад страху.

*Никифор.-1, с. 189.*
*Бяздон. багацце, с. 100.*

### Чорны бусел

Некалі буслы жылі побач з людзьмі — майстравалі сваё жытло на страсе хаты або хлява і кожную раніцу вясёлым клёкатам будзілі

вяскоўцаў. Радаваліся такому суседству і дзеці, і старыя. Людзі кожную вясну сустракалі іх з далёкага Выраю як самых дарагіх і блізкіх.

Але аднойчы ў вёсцы пасяліўся злы, нядобры чалавек. Яму было ўсё не так, усё не гэтак. Не мог цярпець ён і буслінага клёкату. Каб не чуць яго, палез на страху, паскідаў буслянят, а гняздо разбурыў. Доўга кружылі ў той дзень птушкі над непрыветнай хатай. Потым паляцелі ў лясныя нетры, дзе не было ні вёскі, ні людзей, і заначавалі на дубе.

Калі ўзышло сонца, птушак было не пазнаць. Ад крыўды і несправядлівасці яны ажно пачарнелі. Потым на тым дубе яны пабудавалі сабе новае гняздо. Апазней у іх з'явіліся і бусляняты. Надзвычай даверлівыя і бялюткія. Але калі падраслі і даведаліся ад бацькоў пра тую вялікую крыўду, таксама апранулі жалобнае адзенне. Так і паляцелі яны, чорнымі, у далёкі Вырай. Вясною вярнуліся. Толькі не ў вёску, а ў пушчу.

І хоць таго нядобрага чалавека даўно няма на свеце, птушкі ніяк не могуць забыцца пра сваю крыўду і кожны год старанай аблятаюць людскія паселішчы. Праўда, іншы раз чорны бусел світанкам прылятае на нёманскі плёс, заходзіць па калені ў цёплую ваду і з тугою паглядае на стрэхі хат.

*Родная прырода, № 3, с. 21*

## Дзяцел

Аднойчы ў свята бортнік пайшоў у лес, каб зрабіць борць для пчол. Залез на хвою і пачаў дзяўбці яе. Бог убачыў гэта і кажа:

— Дзяўбі ўвесь час.

І перавярнуў таго чалавека ў птушку — дзятла.

*Шейн. 2, с. 352—353.*

## Верабей

Калі птушкі выбіралі сабе Гаспадара, верабей зрабіў нешта брыдкае, за што яго павінны былі пакараць. Шукаючы паратунку, верабей схаваўся ў дупло, адкуль яго нельга было дастаць. Тады птушкі прыставілі на варту саву і заплацілі ёй па перайку з уласных хвастоў, таму што да гэтага часу сава была без пер'я. Удзень сава заснула, а верабей перабраўся ў іншае дупло. Пасля доўгіх пошукаў зязюля злавіла вераб'я і выдала яго птушкам. Вераб'я жорстка пакаралі і звязалі яму ногі. Таму і да гэтага часу ён не ступае, як іншыя птушкі, а падскоквае, як спутаны.

З-за таго, што сава дрэнна стаяла варту, птушкі і дагэтуль вышчыпваюць у яе сваё дарэмна аддадзенае некалі пер'е. Зязюлі, на знак узнагароды за тое, што яна злавіла вераб'я, птушкі дазволілі класці яйкі ў іх гнёзды.

*Никифор.-1, с. 195—196.*

### Жаўранкі і ластаўкі

У полі жыве маленькая непрыкметная птушка, паведач Багіні вясны Лялі — жаўранак. Выконваючы свой абавязак перад Багамі і людзьмі, ён ніколі не адлятае ў Вырай. Зімуе жаўранак у полі пад каменем. На восьмы-дзевяты тыдзень пасля Каляд пачынае спяваць, каб першым паведаміць людзям пра надыход вясны.

Ластаўкі таксама не адлятаюць на зіму, а зімуюць па азёрах, па рэчках, пад купінамі ў балоце ці заміраюць на дне ракі, ля берагоў, з’яднаныя ў доўгія чароды. У Вырай яны адлятаюць толькі адтуль, дзе няма вады.

Вясною яны зноў аджываюць і вылятаюць з азёраў, рэк. Ластаўку грэх забіваць, бо яе першую вясной Бог пасылае людзям, каб сказаць, што вясна настае.

*Пщелко, с. 2.*
*Fed.-1, s. 246.*

### Зязюля

У тыя часы, як яшчэ Бог хадзіў па свеце, адна дзяўчына захацела яго напалохаць. Аднаго разу ідзе Бог, а дзяўчына схавалася пад мост і ўсё:

— Ку-ку! Ку-ку!

Бог і кажа:

— Будзеш ты да канца свету кукаць!

І перакінуў тую дзяўчыну ў зязюльку.

*Fed.-1, s. 182.*

## Расліны

### Бяроза і асіна

Аднаго разу пайшлі бацька з маці і з дачкою ў поле на работу. Бацькі працавалі, а дачка ленавалася, усё пастойвала. Дык маці пачала яе клясці і кажа: «Каб ты стала асінаю! Чаго ты стаіш?» А то была такая гадзіна, калі праклён спраўджваецца. Дачка спалохалася і стала асінаю, а на ёй лісткі трэсліся, як трэслася са страху цела, калі маці яе кляла.

Ад такога няшчасця маці сумелася і стаіць, рукі заламаўшы, ды плача. А бацька раззлаваўся ды з гора кажа: «Ах, каб ты сама стала бярозаю! Што ты найлепшага зрабіла?» І маці ў той жа момант стала бярозаю, апусціўшы галлё так, як былі ў яе рукі апушчаны і заломлены. З таго развяліся на нашай зямлі бярозы і асіны.

*Fed.-1, s. 173.*

## Вярба, арэхавае дрэва, Божае дрэўка

Нахіленыя над вадой вербы — гэта праклятыя Богам тыя мацеры, што страцілі сваіх дзяцей.

На Купалле адначасова з Папараццю ў поўнач цвіце арэхавае дрэва. Калі арэхавую кветку адарваць і ісці туды, куды яна будзе нахіляцца, то можна знайсці скарб.

Божае дрэўка, таксама як і Папараць, цвіце раз на год, у Купальскую ноч. Хто гэтую кветку здабудзе, усё будзе мець, чаго толькі яго душа пажадае. Аднак гэтую кветку пільнуюць Нядобрыя Духі, і трэба быць надзвычай смелым, каб дачакацца поўначы і сарваць кветку шчасця.

*Сержп.-1, № 311.*
*Fed.-1, s. 173.*

## Іва

Жылі хлопец і дзяўчына. Яны вельмі кахалі адзін аднаго. Аднойчы яны гулялі на высокім беразе ракі, і дзяўчына, якую звалі Іва, вырашыла праверыць, ці моцна кахае яе хлопец. Яна прапанавала хлопцу даказаць ёй сілу свайго кахання. Доўга не думаючы, хлопец кінуўся з абрыва ў ваду.

Дзяўчына спусцілася да вады і чакала свайго каханага, але ён не прыплываў. Валасы, якія растрапаў вецер, ператварыліся ў вецце, а ногі, якія стаялі ў вадзе доўгі час, ператварыліся ў ствол. Так і цяпер стаіць іва каля вады, нізка апусціўшы галаву, чакаючы свайго любага.

*ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС — 01/03.*

## Дуб, бяроза і асіна

У адной вёсцы жыла прыгожая дзяўчына. Аднойчы яна пайшла на рэчку купацца, скінула вопратку і зайшла ў рачную ваду. У гэты час у яе спадніцу запоўз вуж. Выйшла дзяўчына на бераг, пачала апранацца і заўважыла вужа. Ён загаварыў чалавечым голасам: «Калі ты станеш маёй жонкай, ці хоць паабяцаеш гэта, то я спаўзу з тваёй вопраткі». Дзяўчына падумала, што ён з яе смяецца, і дала згоду. Вуж зпоўз. Яна апранулася і пайшла дадому. Прыйшоўшы, усё расказала бацькам.

Праз некалькі дзён вуж прыпоўз у двор дзяўчыны. Усе спалохаліся. Вуж сказаў бацькам, што прыпоўз за сваёй нявестай. Бацькі не хацелі аддаваць сваю адзіную дачку і вырашылі абхітрыць вужа. Узялі ды прыбралі па-святочнаму карову і прывялі да вужа. Але той убачыў падман.

Прыйшлося бацькам аддаць дачку. Дзяўчына за вужам пайшла на рэчку. Увайшлі яны ў ваду, і вуж ператварыўся ў прыгожага хлопца. Хлопец расказаў ёй пра тое, як варажбітка ператварыла яго ў вужа за тое, што ён не захацеў ажаніцца з яе непрыгожай дачкой. Расказаў, што ў вадзе ён робіцца хлопцам, а на беразе — вужам.

Доўга яны жылі ў Падводным гаспадарстве разам. Нарадзіліся ў іх сын і дачка. Захацела дзяўчына дадому, пабачыць бацькоў і братоў. Хлопец-вуж адпусціў яе з дзецьмі, але загадаў, каб нікому не расказвалі пра іх жыццё і пра яго самога. Яна згадзілася і пайшла.

Дома іх сустрэлі з вялікай радасцю. Пачалі іх распытваць пра жыццё. Маці з сынам нічога ім не гаварылі, пераводзілі размову на другую тэму. А дачка была малая і ўсё расказала. Браты дзяўчыны пайшлі і падманам забілі яе мужа.

Калі дзяўчына з дзецьмі прыйшла на бераг рэчкі, каб вярнуцца да мужа, то ўбачыла там кроў. Яна здагадалася, што адбылося і пачала плакаць. Раптам узнялася моцная бура, і яны ўсе разам увайшлі ў раку.

А ў хуткім часе на тым месцы выраслі тры дрэвы: дуб, бяроза і асіна. Бярозай стала маці, дубам — сын, а асінай — дачка. З тых часоў бяроза ўвесь час плача, асіна — шапаціць, а дуб — вельмі моцны і ўстойлівы.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС – 29/04.*

### Змеявік-трава

У ранейшыя часы вельмі шмат добрых людзей памірала ад змяіных укусаў. Пачалі людзі скардзіцца Богу на гэтую навалу. Думаў Бог, думаў і вырашыў дапамагчы чалавеку, стварыў і рассеяў па зямлі траву пад назвай змеявік. Трава гэта была цудадзейная, абярэг ад укусаў змей.

Даведаліся змеі аб гэтай выдумцы Божай і сабралі свой змяіны сход і пачалі думаць: «Што рабіць?» Нарэшце наймудрэйшая змяя знайшла выйсце: «Нас, змеяў, на гэтай зямлі шмат. І калі захочам, мы з любой навалай справімся. А таму прапаную: хай кожны з нас перакусіць хаця б па аднаму карэньчыку гэтай расліны. Глядзіш, і прападзе наша трава-вораг».

Распаўзліся змеі па ўсіх барах ды пушчах, трапілі ў самыя глухія куточкі. І кожная знайшла хаця б адну-дзве травінкі і перакусіла яе корань.

Толькі дзе-нідзе расце зараз цудадзейная трава-змеявік і толькі самым шчаслівым шанцуе знайсці яе на карысць сабе і людзям. Дрэнныя людзі знаходзяць толькі падманку. А сапраўдную траву-змеявік, якая прынясе карысць людзям, можа знайсці толькі па-сапраўднаму добры і шчыры чалавек, той, каму сам Бог шлях пакажа.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 2, спр. МС – 43/04.*

### Чабрэц

Даўным-даўно жыў славуты лекар, якога звалі Чабрэц. Ён ведаў лекі ад усіх хвароб. Яго вельмі паважалі і заўсёды хадзілі да яго. Надышоў час, калі Чабрэц памёр, а на яго магіле вырасла трава.

Потым людзі даведаліся, што яна чарадзейная, лекавая і таксама лячыліся ёю. А назвалі яе па імені славутага лекара — чабрэц. Гэтая трава расце і па сённяшні дзень.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 3, спр. МС — 110/05.*

### Зязюльчыны слёзы

Калісь вельмі даўно адзін хлопец пакахаў дзяўчыну, а яна — яго. І вось вырашылі яны ажаніцца. Падыйшоў час вяселля, сабралося шмат гасцей, гулялі вяселле.

Але ў самы шчаслівы момант у хаце з'явіўся злы калдун. Ён быў супраць усялякіх там вяселляў, кахання і ўвогуле простага шчасця людскога. Калдун ператварыў жаніха ў ваўкалака, нявесту — у птушку зязюлю. Мужчын гасцей — у ваўкоў, жанчын — у сарок.

З таго часу зязюлька шукае свайго любага. Ляціць яна над полем і плача, а па тых месцах, дзе ўпалі яе слёзы, выраслі кветкі, якія называюць — зязюльчыны слёзы.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 1, спр. МС — 32/06.*

### Крапіва

Жыла ў вёсцы дзеўка-прыгажуня па імені Крапіва.

Шмат хлопцаў да яе сваталіся, але ўсе былі не даспадобы ёй. І вось закахаўся ў гэтую дзяўчыну добры хлапчына. Але яна толькі пасмяялася з яго.

З гора пайшоў хлопец і патапіўся. Маці хлопца наслала на дзеўку-прыгажуню праклён: «Дзеўкай была — нікога не брала, травою будзеш — ніхто цябе браць не стане».

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 10/05.*

### Валошка

Здарылася гэта даўно. Людзі нават і не памятаюць, калі.

Жыў просты сялянскі хлопец Валошка са сваёй маці. Працаваў Валошка на сваёй зямлі, каля невялікай рачулкі. Цяжка даводзілася яму. Але, нягледзячы на стому, хлопец, ідучы за сахой, спяваў. Голас у яго быў чысты і звонкі. Ён прывабіў Русалку, што жыла непадалёку ў рацэ, і тая пакахала хлопца.

Аднойчы пасля цяжкай працы Валошка вырашыў памыцца. Ён падышоў да рачулкі вельмі блізка, як нечакана з-за чароту выйшла прыгажуня Русалка. Закахаліся яны адразу адзін у аднаго. Кожны дзень Русалка выходзіла з рачулкі на бераг і назірала, як працуе Валошка.

Аднойчы Русалка прыйшла да хлопца на поле і прамовіла:

— Навошта табе, мой дарагі, мой любы, надрывацца на гэтай камяністай зямлі? Хадзем да мяне ў блакітныя воды. Удваіх мы будзем шчаслівыя.

Валошка спыніў каня. Яму таксама падабалася Русалка, яе прыгожыя сінія вочы, ільняныя валасы. Але, падумаўшы, ён адказаў:

— Не магу я пайсці ў тваё сіняе гаспадарства. Нельга мне кінуць родную зямлю і маці: яна ў мяне адна. Прыходзь ты да мяне.

Русалка-вадзяніца адмовілася. Не змаглі дамовіцца паміж сабой каханыя. Не прыйшлі да адзінага рашэння. І тады Русалка вырашыла, што сілаю не адпусціць каханага ад сябе.

Пайшоў Валошка, як заўсёды, працаваць на сваю зямлю і не вярнуўся. Шукалі яго людзі і не знайшлі. Аднак праз нейкі час людзі ўбачылі, што на ўскрайку поля Валошкі вырасла прыгожая сіняя кветка: у яе Русалка-чараўніца ператварыла Валошку, каб ён заўсёды быў побач з ёю.

У гонар Валошкі назвалі людзі кветку — валошкай, а Русалку-вадзяніцу прагналі са сваёй рачулкі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 5. спр. МС — 194/06.*
*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 44/06.*

## Чароўныя травы

### Пералёт-трава

Расце недзе ў полі зелле шчасця — пералёт-трава. Расказваюць пра яе, што яна здольная пераносіцца з месца на месца. Кветка яе з колераў вясёлкі, надзвычай жывая і прыгожая, а ў сваім начным палёце блішчыць, нібы зорка. Шчаслівы той, хто яе сарве, бо не зазнае ён перашкод у сваім жыцці, усе яго жаданні збудуцца. Але ў пагоні за ёю не адзін беларус збіўся з дарогі і не вярнуўся да сваёй роднай хаты.

*Баршчэўскі, с. 18.*

### Разрыў-трава

Разрыў-траву ведаюць толькі вешчыя птушкі, напрыклад, сарока, сава і сойка, і некаторыя жывёлы. Таму здабываюць яе людзі своеасаблівым спосабам.

Знайшоўшы гняздо з птушанятамі адной з вешчых птушак, трэба ў ім замазаць глінай адтуліну так, каб птушка не магла карміць сваіх дзяцей. Пад дрэвам, на якім звіта гняздо, трэба разаслаць абрус і самому схавацца. Пачуўшы піск галодных птушанят і імкнучыся вызваліць іх з няволі і накарміць, птушка паляціць шукаць разрыў-траву. Здараецца, яна і знаходзіць яе. Тады прыкладвае разрыў-траву да гнязда — і замазка спадае. Вось тут і трэба глядзець на абрус: ці не ўпала разрыў-трава. Калі знойдзеш яе, разрэж далонь на правай руцэ і падсунь пад скуру траву. Тады варта толькі крануць гэтай рукой замкнутыя дзверы — яны адчыняцца, дастаткова толькі ўзяцца за замок — ён сам адамкнецца.

*Баршчэўскі, с. 18.*

### Сон-трава

Ёсць дзіўная трава, якую ведаюць толькі чарадзеі. Завецца яна сон-трава. Калі насенне гэтай травы рассыпаць паблізу людзей, то ўсе на нейкі час паснуць, як мёртвыя. Яе скарыстоўваюць злодзеі і чараўнікі дзеля сваіх нядобрых мэт.

*ЛіП, с. 371.*

## Крыніцы

### Чаму крыніца?

Даўным-даўно ў адной вёсцы жыў хлопчык, які хварэў на падучую хваробу. Ніхто не мог яго вылечыць. Тады нейкая бабуля параіла матцы завесці хлопца да святара па прозвішчу Крын.

Прыехалі яны да гэтага святара. Крын агледзеў хлопца і кажа:

— Там, у лесе, цячэ святая вадзіца. Знайдзі яе, абмой хлопца, і хвароба пройдзе.

Матуля знайшла тую вадзіцу. Абмыла хлопца, і ён ачуняў.

Жанчына расказала ўсім пра гэтую вадзіцу, а тое месца назвалі па імені святара, які паказаў яе людзям — Крыніца. З таго часу на Беларусі ваду, якая выцякае з зямлі, называюць крыніцамі.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 34/05.*

### Хабішчына крыніца

Калі людзі жылі ля ракі, у іх заўсёды была вада. Яе ўсе бераглі, бо яна давала і ежу, і пітво.

Пасялілася ля ракі дзяўчына Хабішчына. Аднойчы яна захацела набраць цэбар вады ў рацэ, але паслізнулася і бразнулася ля берага. Раззлавалася дзеўка, схапіла тры жмені пяску, кінула ў ваду і пайшла дадому.

Убачыў гэта Дух вады і сказаў:

— Усе людзі будуць піць і карыстацца вадой, а ты, як ні набярэш яе, то вада ў цябе будзе заўсёды пераўтварацца ў пясок.

І пачалося для дзеўкі мучэнне. Як любы чалавек, яна хацела піць, але, як ні паднясе кубак да вуснаў, там адзін пясок. Зачарпнула з ракі адзін раз, другі... і не заўважыла, як выкапала канаву доўгую і мелкую, а вады ніяк не можа набраць.

Заплакала з гора Хабішчына, слёзы яе пацяклі па гэтай канаве, і на гэтым месцы ўзнікла крыніца з гаючай вадой. Усе, хто пап’е з яе вады, пачынаюць яшчэ болей разумець вялікую сілу крынічнай вадзіцы.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 11/04.*

### Жывая і мёртвая вада

Ёсць у крыніцах такая вада, што калі чалавек яе нап’ецца, то будзе вельмі дужы і здаровы, як дуб. Ёсць і такія, што і апошнюю сілу адбірае. Знахары добра ведаюць, у якой крыніцы якая вада. Яны бяруць яе і даюць жывёле або людзям. Такая вада вельмі дапамагае.

Для загойвання ўсялякіх ран і лячэння хвароб ёсць жывая вада. Яна можа ажывіць нават мёртвага. Крыніца з такой вадой дзесьці на краі Свету, і яе вельмі цяжка здабыць. Пра такія крыніцы ведаюць птушкі і некаторыя звяры. А каб туды дайсці, трэба доўга ісці тою дарогаю, на якой заселі нядобрыя духі. Яны робяць усё, каб не дапусціць чалавека да таго цуда. Але мужны дзяцюк пераадолее духаў сваёй сілаю ці з дапамогаю чараў.

*Сержп.,-1, 254.*
*Коваль, с. 26—28.*

## Камяні

### Адкуль на зямлі камяні з’явіліся

Даўным-даўно камянёў на зямлі не было. Была зямля добрая, мяккая, рабіць на ёй, араць было дужа добра. Быў і пясок, але камення не было. Людзі сеялі хлеб, і ён добра радзіў, не дзіва ж — такая добрая зямля! Нельга было сказаць, што людзі дужа многа працавалі, але і такая работа хутка паказалася ім цяжкай. Чалавеку ж як ні ёсць, а ўсё хочацца, каб лепей было. І вось захацелася ім «лёгкага хлеба».

Тут і з’явіліся аднекуль старцы-чужынцы, якія за вялікую плату прадавалі нейкае насенне і казалі, што з яго хлеб расці будзе хутчэй. Толькі для гэтага трэба ўсім разам выйсці па вясне ў поле і пачаць сяўбу.

Казалі людзям вясковыя дзяды, што ўсё ад Бога, што не трэба сеяць абы-што. Дык не паслухаліся іх аднавяскоўцы. Казалі яшчэ, што ў ноч перад сяўбой бліскалі маланкі — Пярун папярэджваў людзей.

І вось як толькі людзі выйшлі ў поле, як толькі сыпнулі па жмені таго насення, так і скамянелі. Дзе быў чалавек — замест яго вялікі валун ляжыць, а дзе тое чортава насенне — там малыя каменьчыкі.

Патым каменне рассеялася так, што і не відаць, дзе тое поле было. Прыйшлося людзям палі ад яго чысціць. Ды ўсё ж не пазбіраеш. Вось і да гэтага часу ляжыць яно параскіданае па ўсёй зямлі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 2, спр. МС — 52/06.*

### Боскі камень

Людзі ніколі ў сваім жыцці яшчэ не бачылі зацьмення сонца. А калі яно адбылося, то яны пачалі галасіць, крычаць, думалі, што прыйшоў канец света. Дзень стаў раптам ноччу. Але праз нейкі час пачало світаць.

Аднак пасля гэтага здарэння ў вёсцы пайшлі чуткі аб тым, што Бог зрабіў цёмна ўдзень невыпадкова: мабыць, ён нешта на зямлю скінуў і не жадаў, каб людзі гэта бачылі.

Доўга хадзілі людзі па палях і лесах, шукалі, што там упала. І знайшлі вялікі валун, такі вялікі, што, каб абхапіць яго, трэба пяць чалавек.

Людзі пачалі прыходзіць да каменя і прападаць ля яго. У вёсцы ніхто не мог сказаць чаму. Аднак казалі, што той, хто дакранецца да яго, праваліваецца туды, адкуль упаў гэты камень.

Іншыя ж казалі, што ён лечыць усе хваробы, таму чалавек не жадае варочацца назад.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 11/05.*

### Сцёп-камень

Недалёка ад вёскі Баяры, стаіць Сцёп-камень.

Даўным-даўно жылі ў гэтых мясцінах Сцяпан са Сцепанідай. Жылі, працавалі, з горам-бядой змагаліся, але ніяк пазбавіцца бяды не маглі. Паехаў аднойчы Сцяпан на валах сваё поле араць. Рана ўстаў, сабраўся, а жонка не паспела і снеданне згатаваць. Сцяпан ёй кажа:

— Паеду нашча, а ты, Сцепаніда, сняданак мне прынясеш на поле. Тады і палудзень пазней будзе.

Так і зрабілі. Паехаў Сцяпан на поле, запрог у саху вала. Араў-араў, аж узмакрэў. Замарыўся і зґаладаў. На дом пазірае, чакае Сцепаніду. А ворыва цяжкае: камень на камені. Пад нарогамі пясочак-жаўцяк і невядома, ці будзеш з хлебам?

А Сцепаніды ўсё няма. Мужыка пачала злосць забіраць. Але вось і Сцепаніда паказалася з бельцам у руках. А што ў тым бельцы — зацірка ці крупнік, поліўка ці халаднік — Сцяпан не ведае. Кінуў ён араць. А жонка падышла ды давай упікаць:

— Ах, ты, завала, ах, ты, гультай! Спіш за сахою. Гоней не ўзараў, толькі час змарнаваў!

І пачалася паміж імі сварка, а за сваркай дайшло і да ляманту. Сцепаніда крычыць сабе, а Сцяпан ёй у адказ:

— Стань жа ты морам, сцюдзёнай вадой, можа б не знаўся я тады з бядою.

Тут раптам над іх галавамі ляснуў Пярун. Не стала на полі ні Сцепаніды, ні Сцяпана, ні яго вала. Сцяпан стаў вялікім каменем на чалавека падобным, а Сцепаніда — вялікім возерам, што раскінулася недалёка за спіной у Сцяпана. Назвалі тое возера Засцеп’е. Можа, у памяць пра Сцепаніду, а можа, што ляжыць яно за Сцяпанам.

Сцяпан стаіць не адзін: побач ляжыць яго скамянелы вол, каля яго той бялец-камень, у якім Сцяпаніда несла страву. Ляжаць тут і сцяпанавы каменныя рукі, якія, як кажуць людзі, адбіў яму Пярун. Толькі невядома, дзе дзелася Сцяпанава галава, і ці была яна ў яго. Бо каб была, то навошта было яму, мужчыну, клясці такой кляцьбой родную жонку? Лепш змаўчаў бы.

*ПАШ, ф., воп., спр. МС — 20/02.*

### Змееў камень

Недалёка ад вёскі быў узгорак ля дарогі, на ім ляжаў вялізны Змееў камень. Старыя людзі гэтак аб ім расказвалі. Раз улетку ў ціхую пагодлівую ноч ляцеў вогненны Змей з поўначы на поўдзень. Раптам адчынілася Неба, светласць вялікая разлілася. Людзі, молячыся, валяцца на зямлю, а Змей, выцяты нябеснымі косамі, валіцца на ўзгорак і пераварочваецца ў камень. Золата і срэбра, што ён нёс з сабой, там жа на месцы самі закапаліся ў зямлю.

З таго часу пачалі з'яўляцца на розных месцах узгорка розныя постаці. Адны бачылі Плачку на камені, якая выцірала сабе слёзы насоўкай, што палала агнём. Другія, позна ідучы дарогай, бачылі карлаў чорных і тоўстых, як бочка. Іншым з'яўляліся чорныя казлы, якія з зямлі скакалі на камень, а з каменя на зямлю, і шмат іншых дзівосаў. Кажуць яшчэ, што калі хто асмеліцца ля Змеевага каменя начаваць, то здабудзе гэтыя скарбы.

*ЛіП, № 609.*

# ЧАРЫ І ЧАРАЎНІКІ

## Пярэваратні

Каб ператварыцца ў якую-небудзь жывёліну, беларус уторквае ў глухім месцы лесу, аддаленай пусткі, дванаццаць аднолькавых нажоў у зямлю, вастрыём угору, і тройчы куляецца цераз іх, імкнучыся не скрануць нажы з месца. Пасля першага куляння чалавек губляе дакладныя рысы свайго твару, пасля другога — застаецца бясформеннай жывой істотай, пасля трэцяга — набывае поўны выгляд жывёлы, у якую пажадаў ператварыцца. Калі надыходзіць час вярнуць першапачатковы воблік, пярэварацень зноў тройчы куляецца цераз тыя ж нажы, але з адваротнага боку, прычым змена яго знешнасці адбываецца ў адваротным парадку.

Для ператварэння ў ваўка, лісу, тхара ці ласку дастаткова сямі нажоў, цераз якія адбываецца тое ж трохразовае кулянне. Але каб ператварыцца ў дробную птушку, паўзуна ці казяўку, можна абысціся і без нажоў, толькі з дапамогаю асінавага пня. Чалавек хапаецца за верхні край пня і імкліва куляецца цераз яго — на другім баку ён адразу робіцца жаданаю жывёлінай. Адваротным куляннем пярэварацень зноў ператвараецца ў чалавека.

Калі сам пярэварацень скрануў з месца адзін з прадметаў, цераз якія куляўся, ці гэта зрабіў староннi і тым больш знёс прадметы, пярэварацень назаўсёды застанецца ў набытым выглядзе, хіба што яго выручыць пасвечаны ў таямніцы такога пярэваратня блізкі чалавек.

Бывалі выпадкі, калі няшчасны пярэварацень гінуў ад стралы, трапляў у пастку, сіло, у паляўнічую сетку. Здымаючы скуру з забітага пярэваратня, знаходзілі пад ёю струхлелае адзенне, пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі, і адзначалі, што цела мае чалавечыя формы. Часцей за ўсё пярэваратні ператвараюцца ў жывёл для продажу — каня, карову, авечку, свінню, гусь, курыцу. Згодна з папярэдняй дамоўленасцю з блізкай асобаю пярэварацень прадаецца як сапраўдная жывёліна, якая неўзабаве сыходзіць ад свайго новага гаспадара. Прададзеная другі раз, у іншыя рукі, яна зноў сыходзіць ці ператвараецца ў новую жывёліну, і так некалькі разоў.

Ператварэнні пярэваратняў не адбываюцца беспакарана для іх саміх. З кожным такім дзеяннем жыццё іх скарачаецца на некалькі дзён. У выніку пад старасць пярэваратні адступаюцца ад сваёй дэманічнай дзейнасці, тым ці іншым сродкам выкупляюць жыццёвыя грахі і паміраюць звычайнымі дабрачыннымі людзьмі.

*Никифор.-1, с. 67—70.*
*Никифор.-2, с. 100—103.*
*Шейн-3, с. 233.*

## Ваўкалакі

### Адкуль пайшлі ваўкалакі

Некалі даўно жыў адзін хлопец па імені Ваўкалак, любіў дзяўчыну ды не захацеў яе ўзяць, а ўзяў другую. Перад шлюбам пайшоў ён кланяцца бацькам маладой, ды зайшоў да сваёй першай палюбоўніцы ў хату. Маці яе і кажа яму:

— Вот бачыш, якая добрая твая маладая, нават і на шыю нічога табе не дала. На, вазьмі хоць гэту хустачку і завяжы, каб шыя не была голая, — і падала яму беленькую хустачку.

Малады нічога не зразумеў, узяў ды завязаў яе сабе на шыю. Выйшаў ён з хаты, аглядваецца — ажно і рукі, і ногі яго абрастаюць воўчаю поўсцю, толькі на шыі, дзе была хустачка, засталася белая лапінка. Далей стаў ён глядзець, дык і зусім увесь аброс, а замест рук і ног парабіліся ў яго воўчыя лапы. Страшна стала яму ў сяле. Стаў ён на чатыры лапы і пабег у лес, і доўга жыў там з ваўкамі.

З таго часу і стала магчымым перавярнуць чалавека ў ваўкалака.

*Демидович, с. 142—143.*

### Чараўніца паддзелала

Пасварыўся я з суседкаю, а яна кажа:

— Добра, будзеш ты знаць.

Ну, папяняліся мы так, пасварыліся, ды і ўсё, і байдужа. Праз тыдзень паехаў я з кумам па справах. Па дарозе прыпыніліся коней папасці. І тут стала мне так на сэрцы тошна і нудна, і захацелася мне праз хамут пралезці.

Як я пралез, так і стаў ваўком, і пабег. І бегаў я тры гады без ваўкоў, адзін, а на чацвёрты яны прынялі мяне ў гурт да сябе.

Раз Ярыла загадаў нам рабага каня з’есці. Дак ён нам пах за сто вёрст, як ненача чалавеку жаранае. І беглі мы за гэтым канём сто вёрст і іншых не чапалі, таму што не загадана. З’елі таго каня і, пад’еўшы, цэлую нядзелю не хацелі есці.

У другі раз захацелі мы есці, дык ваўкі і паслалі мяне ў стады, дзе чараднік пас чараду. Я прыбег, парасёнка ўзяў. А чараднік кажа:

— Эй ты, што ж ты ўзяў без спросу?

Дак я і стаў, і ні з места. Ваўкі крычаць:

— Кідай да ўцякай!

А мне некуды ўцякаць. І стаю я, пакуль чараднік прышоў да сказаў:

— Кінь!

Тады я кінуў, а чараднік узяў пугу і ўдарыў мяне дванаццаць разоў. І так, што на мне шкура аб’ехала воўчая. Я зноў стаў чалавекам, толькі пашкоджаны відам і ўсім. А чалавечае ежы, дык ніякае не хацеў, акрамя мяса. Дык во як баба паддзелала.

*Романов-4, с. 102—103.*

### Як чалавек жыў ваўкалакам

Адзін чалавек пабыў трохі ваўкалакам, дык пасля расказваў, як ён жыў. Ежа вельмі кепская — усё сырое мяса. І які б, бывала, кажа, ні быў галодны, дык іншае падлы ані ў губу нават не возьмеш. Прыбяжыш, бывала, у грамаду авец ці ў быдла, дык тая, што трэба хватаць, каб была і найхудшая, дак стаіць такая, сытая, аж свеціцца, здаецца, уся. Задушыць адну, здаецца, нясмачна; задушыць другую. Усё шукаеш смачнейшае, а яны ўсе роўныя. Дык перадушыш многа скаціны і пойдзеш галодны.

Раз прыбягаў ён з ваўкамі на свой падворак, і пачалі хапаць парасятак: дык ваўкі бяруць, што большае і лепшае. А ён усё, што меншае і горшае: шкода ж свайго.

Спаць лажыўся разам з ваўкамі, але за ветрам, каб сіверам не цягнула на ваўкоў, бо яны б яго разарвалі. Напаследку неяк ён лёг проціў ветру. Прачнуўся ён, дык трашчыць яго скура. Ён хутчэй усхваціўся, да дай божа ногі — у сяло! А ваўкі за ім. Ледзь ён ускочыў у сені, кульнуўся цераз парог і зрабіўся чалавекам зноў. А на гэты час у сенях было яго дзіця, дык беднае, на ўсе сені нарабіла крыку: мама, мама, воўк, воўк! Выбегла маці ў сені, адно ж стаіць там яе мужык.

Чалавек той жыў яшчэ доўга. Нічога, быў сабе здаровы, толькі ніжняя губа была вельмі тоўстая.

*Демидович, с. 144—145.*

### Ваўкалака

Жылі два селяніна побач. У аднаго быў добры сад. Упала з яблынькі яблачка на зямлю суседа. Ішоў той у гумно, убачыў яблака і ўзяў. Ідзе ён назад з гумна, бачыць — з гумна суседа заваліўся на яго гумно саломы сноп. Ён і сноп узяў, на плечы паклаў і панёс у сваё гумно. Толькі паклаў у сваё гумно, адразу зрабіўся ваўкалакам.

Схаваўся чалавек-ваўкалак за жыта і сядзіць. Прыйшлі сыны яго малаціць і пытаюцца: «Дзе наш бацька?» А ён усё і чуе, але як сынам паказацца ў такім аблічы — заб’юць.

На другі дзень пайшоў ваўкалака да сябе ў пограб красці хлеб: есці ж хочацца. Прыйшоў у пограб, узяў бохан хлеба і гаршчок сыру і пайшоў зноў у гумно. Сядзіць і ёсць хлеб той з сырам, што ўкраў у сыноў. На другі дзень зноў пайшоў у пограб, а там няма ўжо ні хлеба, ні сыру. Што яму есці цяпер?

Пайшоў у поле і лёг у мяжу. Прыйшлі да яго ваўкі, павялі ў поле з сабой. Бачаць яны, што пасуцца гусі. Падкраўся адзін воўк і ўкраў адну гусь, а ваўкалака не хоча сырога есці.

Ваўкі гавораць: «Ідзі к начлежнікам, як толькі яны павядуць коней дамоў, ты на вугалях, па агнішчы пакачай ды еш!»

Пайшоў ваўклака і сцеражэ, пакуль коней дамоў пагоняць. Ён тады пайшоў да вогнішча, спёк мяса на вуголлях і стаў есці.

Потым ваўкі павялі яго вучыцца коней лавіць.

Ці доўга, ці не бегаў ён разам з ваўкамі, толькі раз прывялі яны яго к кажуху, які нехта згубіў на полі. Узяў ваўкалака кажух і нацягнуў на сябе. І адразу зноў стаў чалавекам. Прыходзіць дадому, сямейнікі прызналі яго, абрадаваліся. А яны ўжо паміналі яго як нябожчыка.

*Романов-4, с. 95—96.*

## Ваўкадлакі

### Сусед-ваўкадлак

Жылі ў адной вёсцы два суседа. Адзін быў бедны, другі — багаты. Багаты быў ведзьмаком, а бедны — добрым чалавекам.

Бедны сусед збіраў грошы, каб купіць каня. Доўга збіраў ён тыя грошы, але ўсё ж такі купіў каня. Вельмі радаваўся ён гэтаму каню, калі выганяў яго на выган ці рабіў з ім нейкую працу.

Аднойчы, калі выгнаў ён каня на выган, багаты сусед узяў тры нажы, утыркнуў іх у зямлю і стаў праз іх куляцца. Перакуліўся праз адзін нож — ногі і рукі сталі воўчыя, перакуліўся праз другі нож — тулава стала воўчым, перакуліўся праз трэці нож — замест чалавечай галавы з’явілася воўчая.

Паляцеў гэты ваўкадлак на выган і задушыў каня беднага суседа. А бедны сусед бачыў, як багатыператвараўся ў ваўкадлака, куляючыся праз нажы. Вырашыў ён адпомсціць за свайго каня. Пабег і выцягнуў нажы з зямлі.

Сусед-ваўкадлак прыбег назад к нажам, каб ператварыцца ў чалавека. Бачыць, а нажоў та няма! Так і застаўся багаты сусед ваўком назаўсёды.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 29/04.*

### Дзед-чараўнік

Вёска Шчыткавічы была не вялікай, можа са сто чалавек ў ёй жыло. Усе адзін аднаго ведалі. Разам радаваліся, разам бедавалі.

А ў адной хаце дзед адзінокі жыў. Яго ўся вёска не любіла. Баяліся яго. Днём дзед у хаце сядзеў, а ноччу, суседзі казалі, дзверы скрыпелі ў яго.

Адзін хлопец з дзяўчынай казалі, што неяк ноччу, калі яны шлі міма, то ўбачылі, што каля дзедавай хаты ці то воўк, ці то сабака сядзеў. Вочы чырвоныя блішчэлі, зубы аскаленыя, і слюні цяклі. Спужаліся яны і стаялі, як укапаныя ў зямлю.

А звер гэты ў цемень шмыгнуў. Раптам адтуль дзед выйшаў. Голы. Цела ўсё валасамі пакрытае, а вочы, як у таго звера, блішчэлі. Пабеглі хлопец з дзяўчынай па хатах, а раніцаю па вёсцы чутка пайшла, што нешта нядобрае ў дзедавай хаце робіцца. А дзяўчына з хлопцам раптам здурнелі, а потым наогул з вёскі зніклі.

Не спадабалася гэта людзям, і пачалі яны прыглядаць за дзедавай хатай. То хлеба зайдуць папросяць, то аб здароўі справяцца. А дзед у хату нікога не пускаў і сам не выходзіў. Казалі, дзённага святла баяўся.

Увечары вярталася суседка дзеда дадому. Убачыла каля хаты дзеда двух ваўкоў маладых. Не паспела і вочы ад страху заплюшчыць, як з хаты дзеда выскачыў воўк вялікі, і яны ўсё разам зніклі ў цемры.

Чаму бабка не здурнела, ніхто не ведаў. Можа, позірку чырвоных воўчых вачэй не паспела ўбачыць. Расказала яна пра бачанае ўсёй вёсцы. Вырашылі людзі, што гэта нядобры чараўнік ў іх вёсцы пануе і робіць з людзей ваўкалакаў.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 147/06.*

## Чараўнікі

### Казанне чараўнікоў

Гэта казанне перадаецца ў чараўнікоў з пакалення ў пакаленне, як і іх сіла.

«Ішлі два чараўнікі, няслі сыр. І вось пачалі яны спрачацца, хто мацнейшы. Адзін узяў сыр, хукнуў і сыр стаў чорным. Тады другі кажа:

— Адрабі назад.

Першы адказвае:

— Не магу!

Другі ўзяў сыр, тыцнуў ім "у морду" першаму і загадаў:

— Не ўмееш адрабіць — і рабіць не бярыся».

*ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС — 27/03.*

### Злодзей і чараўнік

Мядзведзь перш быў такі ж самы чалавек, як і ўсе мы. Даўно тое было. Людзей было мала. Людзі жылі сям-там па лесе, лавілі звера, птушак, а ў азёрах ды ў рэках — рыбу. Улетку збіралі ягады, грыбы або капалі карэнне і запасалі на зіму. Найболей запасалі арэхі і мёд. Пчол тады было багата. Яны самі вадзіліся ў дуплах і ў зямлі ў норах.

Людзі шукалі пчол у дуплах, і хто першы знайшоў, таго і былі тыя пчолы. Ён абвязваў дрэва, дзе знаходзіў пчол, і ўжо ніхто не меў права іх чапаць. Але быў адзін гультаяваты мужык. Яму не хацелася самому шукаць пчол, дык ён выдзіраў чужыя. Вось толькі цяжка было яму ўзлазіць на дрэвы.

Пачаў ён шукаць чарадзея, які б мог зрабіць нешта такое, каб мужыку лягчэй было лазіць на дрэвы. За сямю лясамі ды сямю балотамі жыў такі чарадзей, што ўсё мог рабіць. Пайшоў той чалавек да таго чарадзея. Ідзе ён лесам, бачыць — ліпа абвязана, значыць — пчолы. Падышоў бліжэй, бачыць, аж дупло нізка, а ў ім мёд. Выдраў ён тыя пчолы і пайшоў далей. Бачыць — другое дрэва абвязана. Выдраў ён і тыя пчолы. Падыходзіць да зямлянкі таго чарадзея, а яго няма дома, глядзіць — аж тут жа пры самай зямлянцы ў дрэве пчолы. Давай ён і іх драць.

А тут ідзе чараўнік. Зірнуў ён на таго чалавека ды і кажа:

— З гэтай пары і ты, і твае дзеці, і ўвесь твой род будзеце толькі пчол драць.

І абярнуў чарадзей таго чалавека ў мядзведзя. Вось з таго часу і пайшлі мядзведзі.

*Сержп.-2, № 46.*

### Чараўніца і жанчына

У вёсцы Высачаны па суседству жылі дзве жанчыны, і было ў іх па карове. Адна жыла бедна, малака хапала толькі дзецям, а другая зробіць і сыр, і масла, дзяцей накорміць, яшчэ і прадасць.

Аднойчы прыйшла бедная жанчына да суседкі і пытаецца:

— Чаму так? У мяне столькі ж дзяцей, колькі ў цябе. Карова ў мяне таксама добрая, а малака толькі дзецям хапае. Калі ты якія чары ведаеш, навучы ты мяне, як маю гаспадарку наладзіць.

Сапраўды, суседка была чараўніцай. Яна і кажа:

— Добра, навучу. Вось заўтра на досвітку прыходзь да сажалкі і прынясі сыру.

— Дзе ж я вазьму яго? — кажа бедная жанчына. — Малака ледзь дзецям хапае.

— Ну, хоць які-небудзь!

На гэтым і разышліся.

Назаўтра, на досвітку, сустрэліся суседкі ля сажалкі. Бедная жанчына, прынесла маленькі сырок, а чараўніца — вялікую галаву. Вось суседка-чараўніца і кажа:

— Кідай свой сыр у ваду!

Кінула бедная жанчына свой сырок, ён так і ляжыць на дне. Тады чараўніца кінула свой сыр у ваду, і з усіх бакоў папаўзлі розныя гады і расцягалі яго па кавалачках.

— Вось, — кажа чараўніца, — калі ты памрэш, тваё цела ніякі гад чапаць не будзе, а маё — сама бачыш. Ну, хочаш чарам навучыцца?

Жахнулася бедная жанчына і больш не звярталася да суседкі-чараўніцы.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 09/04.*

### Чараўнік-лекар

Жыў у адной вёсцы чараўнік, пра яго хадзіла слава добрага лекара.

І вось аднойчы прыйшла ў вёску бяда: людзі пачалі хварэць нейкай незвычайнай хваробай. Ім нічога не заставалася, як звярнуцца да чараўніка.

Кожнаму, хто прыходзіў да яго, чараўнік даваў нейкае зелле, але не проста так, а за збожжа або золата. Людзям зелле не дапамагала, і яны вымушаны былі прыходзіць да чараўніка ўсё часцей і часцей. І кожны раз трэба было плаціць.

Нарэшце людзі зразумелі, што чараўнік іх не лечыць, а толькі абірае, і наслалі на яго праклён. Чараўнік захварэў, ён ляжаў на ложку і не выходзіў на вуліцу. Раніцай людзі сабраліся і падпалілі хату разам з чараўнікам.

Пасля гэтага над месцам, дзе жыў чараўнік, навісла хмара і пайшоў вялікі дождж. І як толькі ён скончыўся, усе людзі паправіліся.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 12/05.*

### Чараўнік і пастух

Аднойчы малады хлапец пагнаў досвіткам коней пасвіць за сяло. Толькі прылёг на паляне і бачыць: бяжыць голы чалавек па расе і цягне за сабой кусок сукна. Аказалася — гэта «адзілка»[1]. Пра тое, што нехта адбірае ў кароў малако, даўно ў вёсцы гаварылі, ды злавіць чараўніка ніхто не мог.

Пастух неўпрыкметку падкраўся і схапіў чараўніка. І адразу павёў у сяло на суд жыхароў, каб растлумачыў, што за чары ён наводзіць. За такія справы жыхары вёскі жорстка распраўляліся з чараўнікамі. Яны прывязвалі іх да слупа і закідвалі каменямі ці палянякамі.

Але чараўнік выкруціўся: ён сказаў пастуху, што ад гэтага надоі малака ў кароў павінны павялічыцца. Пастух, малады і даверлівы хлопец, паверыў чараўніку і адпусціў яго.

Праз нейкі час жыхары зноў пачалі скардзіцца адзін аднаму, што малако ў кароў прападае і кісне вельмі хутка. Тады пастух і расказаў ім пра гэтага чалавека.

Але пакуль вяскоўцы адумаліся, то чараўнік збег з вёскі. А вяскоўцы больш не паслі кароў на тым месцы, дзе пастух прыхапіў чараўніка, бо лічылі яго заклятым.

*ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС — 29/03.*

---

[1] Кавалак тканіны малако прачышчаць.

### Чараўніца, якая адбірала малако ў кароў

Пачалі людзі вёскі Крычына заўважаць, што каровы не сталі малака даваць. Прыйдуць з паствы, малако ёсць. А як пастаяць ноч у хляве, дык раніцай і малака няма, і стаяць не хочуць, злуюць, капытамі ляскаюць, галовамі круцяць. Быццам баяцца нечага. І вырашылі гаспадары начамі не спаць, каля хлявоў пастаяць, каб даведацца, у чым тут справа.

І вось адзін мужык сярод ночы бачыць, што ідзе па яго двары жанчына голая. Прыгледзеўся, а гэта ягойная суседка. Ідзе яна і нібы нешта шукае. А потым ператварылася ў вялікую жабу, якая забралася да каровы і пачала піць малако.

Спалохаўся мужык і пабег зваць тых, хто каля сваіх хлявоў вартаваў. Прыйшлі ўсе да хлева, а жаба яшчэ малако п’е. Адзін з дзецюкоў смялейшы быў, схапіў палку, падбег да жабы ды як ударыць са ўсёй моцы і адбіў ёй лапу. Жаба закрычала чалавечым голасам і знікла.

Раніцай усе ведалі і бачылі, што жанчына-чараўніца з перавязанай рукой ходзіць. Малако ў кароў з той пары ўжо не прападала.

Усе вяскоўцы пасля гэтага пачалі баяцца чараўніцы, перасталі да яе хадзіць. А чараўніца ці то сілу страціла і не змагла ачуняць ад раны на руцэ, ці па нейкіх яшчэ прычынах, але хутка памерла. Паміpала цяжка і доўга. Пакуль не прарубілі столю, душа яе не магла адыйсці на Той Свет.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 4, спр. МС — 139/05.*

### Хлопец і чараўніца

Даўно гэтае было. Прыйшоў неяк у вёску Вал малады хлапец. Пабудаваў ён сабе хату і жыў на водшыбе. Вабны быў хлапец, але вось дзіва: ніхто не бачыў, каб ён з кім-небудзь сябраваў. Але казалі людзі, што ноччу хтось у яго хаце бывае.

Ніхто б, можа, на гэта не звяртаў асаблівай увагі, каб не здарылася наступнае. Пачалі ў вёсцы гінуць маладыя дзяўчаты, ды і нябожчыцы былі нейкія дзіўныя: здаецца, патопла, а як выцягнуць, дык быццам жывая. Думалі, гадалі людзі, а потым прыйшлі да высновы, што гэта хлапец гэты іх губіць, бо ўсё нешта неяк дзіўна заглядаўся ён перад гэтым на загінуўшых дзяўчат.

Вырашылі мужыкі паглядзець, хто гэта ноччу да хлопца ходзіць. Сабраліся ды і пайшлі. Ідуць, цёмна, неяк жудасна. Падышлі да хаты, зазірнулі ў акно, аж бачаць: сядзіць на лаве ведзьма, страшэнная, з доўгімі валасамі, пулятымі вачыма, у лахманах, і аб нечым з хлопцам гутарыць.

Так і прасядзелі яны ўсю ноч, а раніцай, калі заспявалі пеўні, ператварылася вядзьмачка ў мыш і выбегла з хаты. А праз дзень загінула ў вёсцы яшчэ адна дзяўчына. Тады зразумелі людзі, што гэта ведзьма сваіх саперніц забівае.

Пагаварылі, параіліся мужыкі між сабою і вырашылі ведзьму забіць.

У наступную ноч зноў пайшлі да хаты таго хлопца, пачакалі, калі ведзьма з'явіцца і пачне размаўляць з хлопцам. Уварваліся ў хату, хацелі яе забіць, але скамянелі, не змаглі скрануцца з месца, так і прастаялі ўсю ноч.

Уцямілі мужыкі, што голымі рукамі ведзьму не возьмеш, і вырашылі яе перахітрыць. Заўважыў адзін мужык, што бегае мыш увесь час праз адну і тую ж дзірку. І на наступную ноч зноў пайшлі да хаты хлопца. Пачакалі яны, пакуль ведзьма абернецца мышшу, а пасля падставілі збан, мыш убегла туды, а яны хоп і зачынілі збан. Пасля забілі тую мыш і спалілі.

З тае пары перасталі гінуць дзяўчаты, а хлапец той некуды знік.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 2, спр. МС — 49/04.*

### Удава-чараўніца

Жыла ў вёсцы ўдава. Ды такая ўжо паскудлівая была баба, што, казалі, сама свайго мужыка са свету звяла. Ды яшчэ шапталіся між сабой маладзіцы, што яна з Нядобрымі Сіламі зналася. Не любіла яна нікога ў вёсцы і кожны раз нейкую шкоду наводзіла вяскоўцам. Жнуць бабы і дзеўкі свае палоскі, і калі хто дужа ўжо яе абганяць пачне, дык тая чараўніца як гляне ў іх бок, дык у тых спіну так скруціць, што яны паўдня працаваць не могуць.

Была ў той удавы дачка. Не сказаць, што дужа непрыгожая, але ўсё адно хлопцы на яе не глядзелі. Можа не падабалася, а можа, маткі яе баяліся.

Гады ідуць, дзеўку даўно замуж трэба аддаваць, а да яе так ніхто і не пасватаўся. Але аднойчы пад восень узяўся аднекуль чужы хлопец у сяле: прыйшоў падзарабіць. Узяла яго ўдава, каб жыта змалаціў, ды так ён там і прыжыўся. Можа, і жыў бы ён з той дзеўкай, каб не гэта чараўніца: тое не так зрабіў, гэта не ў той час...

Прыйшла зіма, там і вясна, хутка і Купала. Падгаварылі хлопца людзі з той вёскі падгледзець, як чараўніца будзе зелле збіраць і шаптаць. Тады трэба было яе напужаць, і стала б яна простай жанчынай — страціла ўсе чары свае.

У поўнач схаваўся хлопец за печкай, а чараўніца расклала чароўныя травы ды давай на іх шаптаць і акурваць. Тут малец як выскачыў, як крыкнуў! Чараўніца ж як учапілася ў яго абедзвюма рукамі, так яны ўдвух і прапалі, усё роўна, што скрозь зямлю праваліліся.

Там, дзе хата ўдавы-чараўніцы была, луг стаў і, кажуць, травы там растуць тыя, што баба збірала на Купалле, ды ўсе ядавітыя. Барані Бог натрапіць на тую мясціну збіраць якую траву на лекі.

Дык як бы там у жыцці не было, а ні з чараўнікамі, ні з іх дзецьмі звязвацца не трэба.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 110/06.*

## Гаспадар-змей і дзяўчына

Гаспадар-змей можа перакінуцца ў што захоча, нават стаць чалавекам, і ніхто яго не пазнае.

Адзін раз закахаўся Гаспадар-змей у вясковую дзяўчыну. У выглядзе дзецюка пачаў ён хадзіць да яе. Летам гэта якраз было. Сена пакасілі, трэба яго сушыць, грэбці, а тут гэты дзяцюк прыйдзе, сядзе, гаворыць, дык дзяўчына не можа пайсці на работу. Бацька злуе, хацеў дзяўчыну паклікаць на работу, але толькі глянуў у хату ды назад.

Дзяцюк-змей і пытае:

— Чаго твой бацька злуецца?

— А гэта ж сена абкасілі многа, а сабраць яго цяжка, хоць Гаспадара змей прасі, — адказвае дзяўчына.

Сядзяць яны і далей размаўляюць.

Назаўтра бачаць гаспадары: усё сена чыста грэбена, складзена ў копы, усюды парадак. А хто зрабіў — невядома. Тут дзяўчына пачала здагадвацца, што хлопец, які да яе ходзіць, відаць, няпросты.

Стала дзяўчына хлопца баяцца і захацела з ім разысціся. Параілася яна са сваімі бацькамі, тыя — з людзьмі. Аказалася, што Гаспадар-змей надта баіцца грому. А любіць, каб яму ў галаве шукалі, тады ён моцна спіць. Нараілі дзяўчыне пайсці з гэтым хлопцам да возера, пагладзіць, пашукаць яму ў галаве, а як ён засне і пачнецца грымота, разбудзіць яго раптоўна. Так яна і зрабіла.

Селі яны на беразе возера. Залашчыла дзяўчына хлопца-змея, моцна ён заснуў. Але вось паявілася хмарка, загрымеў гром. Дзяўчына разбудзіла раптоўна змея. Ён спужаўся грому, кінуўся ў возера, але рукой па шчацэ дзеўцы пляснуў. У вадзе ён стаў змеем і ўжо ў чалавека не мог ператварыцца.

Кожны дзень у добрае надвор'е змей вылазіў з вады на тое месца, дзе сядзеў з дзяўчынай. Баяліся яго ўсе. Скінуць яго назад у ваду, а ён зноў вылезе. Закапаюць у зямлю, а назаўтра змей зноў на сваім месцы. Нарэшце знайшлі раду: выкапалі глыбокую яму, палажылі дванаццаць птушыных чарапоў, закапалі змея, і ён болей не вылазіў.

А ў дзяўчынцы на шчацэ на ўсё жыццё застаўся след, як ёй змей ударыў па твару.

*Сержп.-2, с. 91–96.*

## Лясун і Галавач

Пайшоў неяк вечарком, уже змрокам, селянін Галавач шукаць коней. Пахадзіў ён па хмызняку, каля выгану — няма. Што тут рабіць? Пайшоў ён у лес. Хадзіў, хадзіў, далёка зайшоў у лес, а коней няма.

— Кося, кося, дам аброку! — крычыць ён. А па лесе рэха адзываецца.

Тым часам сцямнела, што хоць выкалі вока. Рашыў чалавек вярнуцца назад, ды не ведае, куды ісці: заблукаў у лесе. Хацеў паглядзець на зоркі, ды за галлём не бачны. І тут напаў на яго страх. Хацеў ён лезці на дрэва, але ніяк не можа падняцца — ногі дрыжаць, а ў руках сілы няма. Спрабаваў гукаць — горла сціснула. Бяда! Сабраў усю сілу і так гукнуў, што далёка і доўга рэха лунала. А як заціхла, чуе — нехта абазваўся, зусім блізка. Давай чалавек зноў гукаць — зноў абзываецца.

Пайшоў чалавек насустрач. Залез у такую нетру, што і выкарабкацца не можа.

— Згінь Мара, прападзі. Можа, — думае, — гэта мяне Лясун сюды завёў.

А над ім нешта на дрэве жаласна плача аж заліваецца. Узяў Галавача жах, не ведае, што рабіць. Пастаяў ён трохі, пастаяў, ачухаўся, паправіў за плячыма торбу, памацаў, ці ёсць за поясам сякерка, ды памаленечку бокам-бокам давай выходзіць адтуль назад.

Толькі выбраўся Галавач з гушчэчы на прагаліну, чуе, хтось ціхенечка выняў у яго з-за пояса сякерку ды кінуў яе долу. Абярнуўся чалавек, падняў сякерку, а за спіной Лешы рагоча, бы жарабец.

— Чаго там рагатаць, — думае чалавек. — От вялікае дзіва зрабіў, што выцягнуў сякерку з-за пояса.

Тым часам Лешы даведаўся, аб чым падумаў чалавек, забег наперад ды і рассыпаўся па палянцы, бы жар. От так і гарыць уся зямля, толькі няма ні полымя, ні дыму.

Тут Галавач успомніў, што ў яго павінна быць красала. Мацнуў ён, аж красала целяпаецца на матузе каля пояса. Выкрасаў ён агонь ды падпаліў галле. Потым узяў галавешку, абвёў вакол сябе кола, лёг каля агню ды толькі дровы падкладае. Бачыць Лешы, што чалавек не баіцца яго і спакойна ляжыць у крузе, то давай яго адтуль выманьваць.

От ляжыць Галавач каля агню і бачыць, што недалёка ад яго па зямлі рассыпана золата: блішчыць ад агню, бы жар, ззяе. Паглядзеў ён ды і кажа сам сабе: «Добра, няхай ляжыць. Калі яно суджана мне, то ніхто не возьме. Маё маім будзе».

А Лешы рагоча, як конь, то бегае па лесе, як апантаны, то стукае аб карэнне ды калоддзе. Альбо залезе ў куст, шамаціць, трэ яго, аж іскры сыплюцца. Але бачыць, што чалавек сядзіць пры агні, а з круга не выходзіць. Лешы яшчэ трохі пасвістаў, пабегаў і адкаснуўся ад чалавека.

Тым часам даў Бог дзень. Падняўся Галавач з зямлі. Бачыць — агонь дагарэў.

— Няўжо то я, — думае, — задрамаў? Быццам не спаў усю ноч і якіх толькі страхаў не нацярпеўся.

Зірнуў ён вакол, аж начаваў каля самай дарогі, што вяла да сяла. Пайшоў Галавач дахаты. Ідзе ён паўз паляначку і бачыць: коні яго пераскочылі праз завалу і пасуцца сабе ў аўсе.

З тых часоў Галавач пачаў баяцца страхаў, і як змеркне, то нізашто адзін не пойдзе ў лес.

*Сержп.-2, с. 91—96.*

## Гаспадар-вуж і Гарыслава

Аднойчы пайшлі дзяўчаты купацца на лясную рэчку. Выкупаліся, выйшлі на бераг і пачалі апранацца. Падбегла Гарыслава да сваёй вопраткі і бачыць: на яе сукенцы аграмадны вуж ляжыць. Схапіла яна галінку і давай яго адтуль зганяць. А вуж падняў галаву, паглядзеў на яе і чалавечай мovaю кажа:

— Калі згодзішся выйсці за мяне замуж, дык аддам тваё адзенне.

Дзяўчына засмяялася і, не падумаўшы, згадзілася.

— Добра, — гаворыць, — выйду.

Пачуўшы гэта, вуж споўз з вопраткі і падаўся ў рэчку.

Апрануліся дзяўчаты, заспявалі вясёлую песню і пайшлі ў сваё сяло. Не спявалася толькі Гарыславе, нейкая трывога ў яе сэрца закралася. Прыйшла яна дамоў, а сама ўся задуменная. Заўважыла гэта маці і пытае:

— Што з табою, дачушка?

Расказала дачка ёй, што ля рэчкі здарылася. Маці засмяялася ды кажа:

— Кінь сумаваць, яшчэ такога і на свеце не чуваць было, каб вуж жаніўся з дзяўчынаю.

Прайшло колькі часу, аж аднаго дня бачаць яны: у бок іхняй хаты паўзе аграмадная чарада вужоў, а наперадзе яе — самы найбольшы.

Прытулілася збялелая ад жаху дзяўчына да матулі, заплакала:

— Ой, матуля, гэта ж мой суджаны са сваёй вясельнаю дружынаю па мяне ідзе!

Кінуліся яны абедзве ў хату, ды дзверы — на засаўку.

Вужы абпаўзлі вакол хаты, але нідзе дзіркі ў хату не знайшоўшы, сабраліся ў гародчыку перад акном і нешта зашыпелі між сабою. Раптам адзін з іх скруціўся ў спружыну, узвіўся ў паветра і ўсім целам ударыў у вакно. Вылецела яно. Вужы ўпаўзлі цераз выбітае акно ў хату і забралі Гарыславу.

Міналі дні і месяцы, праходзілі гады, а пра дзяўчыну і чутак няма. Плакала маці, сумавалі родзічы. Але ж аднаго разу пайшла маці да крыніцы па ваду і бачыць: ідзе яе дачка з дваімі дзецьмі, хлопчыкам

і дзяўчынкаю. Узрадаваліся яны, у абдымкі кінуліся цалуюцца, плачуць. А калі ўжо нацешыліся, адна на адну гледзячы, маці і пытае:

— Дзе твой муж, дачушка, дзе ж ты жывеш?

— Дома мой муж застаўся, матуля, а жывём мы ў Падводным гаспадарстве.

— А ці хоць добры твой муж?

— Добры ён і ласкавы, і дзяцей надта ж любіць.

— А як жа ты цяпер вернешся да яго?

— Зайду на бераг рэчкі і крыкну: «Якуб, выйдзі і вазьмі мяне!» Ён выплыве з вады і забярэ нас.

Пагаварылі яны, пагаварылі, дачка і кажа:

— Час ужо нам, пойдзем да сябе.

Маці ж пачала прасіць:

— Век цябе не бачыла, пабаўся яшчэ хоць крыху.

І ўгаварыла дачку з дзецьмі пераначаваць.

Калі ўсе паснулі, узяла маці сякеру і пайшла на рэчку. Стала на беразе і крыкнула:

— Якуб, выйдзі і вазьмі мяне.

Ускалыхнулася вада, і з яе вынырнула вужачая галава. Маці замахнулася сякераю і — цях! Забушавала рэчка, забурліла, а маці вярнулася дахаты, нікому нічога не сказала ды легла спаць.

Сабралася раніцаю дачка з дзецьмі да мужа вяртацца. Зайшла на бераг рэчкі ды бачыць: акрываўленая галава мужа на хвалях гойдаецца, а далей і ўсе яго мёртвае цела плавае. Заламала яна рукі, загаласіла, заплакалі дзеці.

— Жыць мне цяпер удованькай бяздольнаю, — прычытвала, — а вам, дзеткі, сіротанькамі бязроднымі.

Схілілася да рэчкі, далонню вады з мужавай крывёй пачарпнула, на сябе ды на дзяцей ёю пырснула. Абярнуліся яны ўсе ў птушак: маці ў шэрую зязюлю, дачка ў ластаўку, а сын у салаўя. Ад таго часу ластаўка і салавей штагод уюць сабе гнёзды і дзетак выводзяць, а шэрая зязюля сабе гняздзечка не ўе, вечнаю ўдавою па лесе кружыць, гукаючы: «Якуб! Якуб!» А ў куванні яе сум па мужу чуваць.

*Ніва. 1975. № 47. С. 4.*

## Як Лесавік дзяўчыну вадзіў

Была ў маці дачка па імені Міласлава. Неяк апоўдні пачала дачка прасіць есці ды звяганнем сваім раззлавала матку. А ў поўдзень, маці, не лайся на сваё дзіця і не кляні яго, а дзіця — не даводзь да лаянкі: ёсць такая хвіліна ў поўдні — што маці ні прагаворыць, то ўсё адбудзецца.

Раззлавалася маці ды і кажа:

— Ідзі ты к Ліху! Чаго ты да мяне прычапілася?!

У адзін момант з'явіўся ў хаце Лесавік. Маці не бачыць Лешага, а дзяўчына бачыць яго. Узяў Лесавік Мілаславу за руку і павёў з хаты.

Папрыходзілі сямейнікі з поля палуднаваць, маці гукае і дачку, а тая не з’яўляецца.

— Дзе ж Міласлава дзелася? Яна ж тут была, з хаты пайшла нядаўна. Пагукайце яе: яна недзе тут на ваколіцы.

Пачалі яны гукаць дзяўчыну — няма яе нідзе. Забалела ў маці сэрца, заплакала яна. Дзе ні шукалі Мілаславу, у каго ні пыталі — ніхто не бачыў.

Год прайшоў і другі прайшоў — няма дзяўчыны. Сем год дзяўчыны не было: вадзіў яе Лешы па лесе. Як жыла яна з Лесавіком гэтыя сем год, расказвала пазней.

Чым яна сілкавалася? Дасць ёй Лешы губяшачку[1], а тая смачная такая. «Як з’ем, так да заўтра есці не хачу». Настане час адпачываць, лягуць яны на купінкі — ёй і мякка, і цёпла.

Хадзіў Лешы разам з ёю і па хатах. Прыйдуць на вяселле. Калі там ціха, сумна чагосьці, то з іх прыходам адкуль што возьмецца: пачынаюцца гульні, жарты, рогат. Толькі пройдуць міма стала — і песні, і шум, і гоман, маладыя цалуюцца.

А ў хаце Лешы глядзіць, каб быў парадак. Калі што не ў парадку — дужа незадаволены. Калі хлеб з сеянай мукі прыгатаваны — паспрабуе яго, а калі з нясеянай — нават у рукі не возьме. Калі хлеб пасля абеду на лаўку кладуць, то таго ён таксама не паспрабуе. Яшчэ ж, людцы, муку трэба захоўваць прыкрыўшы.

Звычайна яны бывалі ў двух дварах і вярталіся ў лес.

Стаялі яны раз перад акном. Сядзіць маці над хворым дзіцяткам, а дзіцёнак крычыць — і ўдзень, і ўночы ўсё крычыць.

— О, Божа літасцівы, прышлі чалавечка, каб ён пакалыхаў крыху ды хваробу зняў!.. — просіць маці.

Лесавік стаяў, слухаў, потым кажа:

— Пойдзем, дзеўка, калыхнём дзіцёнка.

Як ён увайшоў у хату, тры разочкі калыхнуў, дзіцё супакоілася і заціхла, дало маці паспаць. Праспаў пасля гэтага дзіцёнак тры дні. Прыходзім мы праз тры дні, а дзіцё зноў закрыкваецца.

— Зойдзем, дзеўка, пакалыхаем яго зноў, пакуль жыццё яго не закончыцца: ён няшмат часу пажыве.

Як мінула сем гадоў, дазволіў Лешы Мілаславе вярнуцца дадому. Прывёў дахаты і адпіхнуў ад сябе. Стала яна бачнай для людзей. Кінулася дзяўчына маці на шыю, а тая стала, як бяроза белая.

— Ажно, дачушка, ты мохам абрасла, і шматкі ад адзення прыраслі да целічка твайго! Нахадзілася дачушка?!

— Нахадзілася, вой нахадзілася, матуленька!

Нічога, адышла дзеўка, але сур’ёзная, дужа сур’ёзная стала. Пачала варажыць, і ўсім усю праўду гаварыць.

За тое, што Лясун вадзіў яе, атрымала Міласлава дар знахарства.

*Добровол.-1, с. 78—81.*

---

[1] Грыб чага на бярозе.

## Сож і Дняпро

Сярод пушчаў і бароў, на прыгорку, стаялі калісь харомы вялікага валадара, сівавалосага старца Рыдана. З канца ў канец зямлі хадзілі чуткі пра рыданава багацце. Больш усяго славілася скрытая за дванаццаццю дзвярамі, дванаццаццю замкамі залатая рыданава карона. Як адмыкалі замкі, адчынялі дзверы і выносілі тую карону на свет, то, калі была ноч, яна днём станавілася, а калі была зіма, то перамянялася ў лета, — так зіхацелі дарагія камяні на рыданавай кароне.

Зайздросцілі суседнія валадары гэтай кароне і вырашылі здабыць яе ў Рыдана. Зазвалі чараўнікоў, загадалі ім прыдумаць спосаб, каб украсці карону з рыданавай скарбніцы. Тыя думалі тры дні і тры ночы і прыдумалі скарыстацца разрыў-травой, каб адчыніць замкі, а каб варту ўсыпіць, выкарыстаць сон-траву.

Прыдумаўшы гэта, паслалі злодзеяў красці залатую рыданаву карону. Тыя, прыйшоўшы пад харомы, сыпнулі сон-зелля, і ўся варта паснула. Дакрануліся разрыў-травой да замкоў — тыя паспадалі. Тады ўзялі яны залатую рыданаву карону і пусціліся назад.

Устаў раніцай сівы Рыдан, падышоў да акна, ажно глядзь: уся варта покатам спіць, увесь народ у сне беспрабудным валяецца. І зразумеў старац адразу, што няма ў скарбніцы яго залатой кароны. Падышоў ён тады да звона, ударыў раз, ударыў два. Прабудзіліся толькі два рыданавы сыны — асілкі Сож і Дняпро. Звярнуўся бацька да Дняпра і кажа:

— Вазьмі, сынок, сталёвую зброю, каваны меч і бяжы садамі, лугамі аж да скалістых гор, дагані цікунцоў з каронай.

Схапіўся Дняпро і пабег, а Сож застаўся пры бацьку. Сеў на залаты пасад стары Рыдан і кажа Сожу:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай, ці бяжыць Дняпро?

Прылажыў Сож вуха да зямлі і кажа:

— Бегма бяжыць і не стаміўся яшчэ.

І другі раз кажа бацька:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай.

Прылажыў сын вуха да зямлі і кажа:

— Бяжыць, але ўжо цяжка дыхае — шум зямлёй ідзе.

І ў трэці раз сказаў бацька паслухаць сыну. Сын прылажыў вуха да зямлі і кажа:

— Гул зямлёй ідзе і крык вялікі.

Тады ўстаў Рыдан з пасада і загадаў:

— Бяжы ж ты, сынку, імхамі, балотамі на падмогу брату, бо адзін Дняпро не праб'ецца праз скалістыя горы.

Пусціўся Сож імхамі, балотамі на падмогу брату, а стары бацька застаўся чакаць сыноў.

Доўга чакаў стары, не дачакаўся, з маркоты вялікай пачаў плакаць:

— Бадай нам, дзеткі мае, слязьмі разліцца.

Ды ўлучыў ён на такі момант, што такі сапраўды разліліся слязамі браты і стары бацька: у рэкі ўсе тры ператварыліся. Дняпро плыве

садамі ды лугамі, Сож — імхамі ды балотамі, а Рыдан — куды вочы глядзяць.

*ЛіП, № 648.*

### Радзім і Лесавіха

Касіў Радзім сена на ўзлеску. Бачыць, ляжыць дзіця голенькае. Пашкадаваў ён таго дзіцяці, прыкрыў яго сваёй курткаю. А тут з'яўляецца перад ім прыгожая дзяўчына, валасы распушчаны і кажа:

— Што даць табе, мужык, за тое, што ты прыкрыў маё дзіця: ці багацця ты хочаш, ці ўлады, ці ведаў?

— Не хачу я ўлады, не трэба мне багацця. Калі можна, хачу атрымаць веды.

Спадабалася гэта прыгожай дзяўчыне.

— Добра, я зраблю для цябе гэта. Ты набудзеш веды, вялікія веды і прынясеш многа карысці людзям і жывёле.

З тых пор і стаў Радзім знахарам, а прыгожая дзяўчына яго не забывала і часта наведвала, і ён раіўся з ёю і шмат размаўляў, але аб чым — людзям невядома.

А жанчынам жонка Радзіма баяла:

— Ляжу з мужам, а да яго падыходзіць прыгожая дзяўчына, валасы распусціўшы, уся ў белым. Я ляжу ні жывая, ні мёртвая, прыціхшы, а яна мне: «Што ты, куманька мая…» Страшна мне, але не хачу перашкаджаць іх бяседзе, калі яны размаўляюць, што да чаго. Ох, хітра, дужа хітра. Паразмаўляюць яны, і пойдзе яна ад яго, як прыйшла.

*Добровол.-1, с. 89—90.*

### Павіла ў змяіным Выраі

На Узвіжанне нельга ў лес хадзіць. Але ж селянін Павіла пайшоў. Ішоў, ішоў ён па лесе і ўляцеў у нейкую яму, якая за ім адразу закрылася.

Аглядзеўся ён і бачыць: ляжыць там вялікая змяя і галава ў яе вялікая, як у кабылы. Яна як зашыпіць, іншыя змеі выглядам як звычайныя, што вакол віліся, як кацёлкі, ад Павілы раскаціліся ў бакі. Сеў мужык, змей не чапае, і яны яго не чапаюць. Сядзіць дзень, сядзіць другі, сядзіць і трэці.

Каля сцяны ямы ляжаў камень белы. Камень той, як асвеціць, так відненька ў яме. Як вялікая змяя той камень лізне, так і астатнія змеі ўсе да адной стануць лізаць.

Глядзеў на гэта Павіла, глядзеў, а голад цярпець няма сіл. Вырашыў, паспрабую і я лізнуць гэты камень: што будзе, тое і будзе. Устаў, рушыў да каменя. Нічога, змеі месца саступаюць. Прыгнуўся да таго каменя, лізнуў тры разы і сыты. Вярнуўся на сваё месца. Зразумеў Павіла, што папаў у змяіны Вырай, месца — куды на зіму сыходзяць змеі.

Як асвеціць камень, вялікая змяя ўстае, тры разы лізне яго і сыта. Астатнія змеі ўсе тое ж робяць. І Павіла прыляжа к камню і таксама лізне. Прызвычаіўся, а ў галаве адна думка: «Ці доўга ж я тут буду сядзець?»

Аднойчы яма крыху асвятлілася: праз шчылінку ўверсе свет ідзе. І пайшлі змеі ў тую дзірачку: адна за адной лезуць і лезуць, глядзець на іх і слухаць іх шолах — жах бярэ. Заварушылася і вялікая змяя, падняла галаву, зямля рассунулася ў бакі, і відна чалавеку ўсё стала.

Змяя засіпела, абгарнула Павілу хвастом, сціснула дужа і выпаўзла на паверхню і чалавека вынесла на сабе ды на зямлю паставіла.

Кінуўся Павіла бегчы дахаты. Тут і даведаўся, што прышоў Ярылаў дзень.

*Добровол.-1, с. 94—96.*

### Баб'ягорац і Пошасць

Каля вёскі Баб'я Гара, што знаходзіцца на высокім пагорку паміж ракой Нарвай і паўночнай ускраінай Белавежскай пушчы, з'явілася Пошасць. Мужчыны запрагалі ў ярмо сівога вала і абворвалі сахой навокал вёску, каб хвароба не перайшла цераз баразну. Але чамусьці гэта не перашкодзіла Пошасці ўвайсці ў вёску. Яна ўскочыла ў вёску, імчалася па вуліцы ды касцянымі сваімі пальцамі стукала ў вокны хат, крычала: «Была бяда, была бяда, а цяпер будзе вам ліха!».

І вось, калі бегла Пошасць па вуліцы Баб'яй Гары і стукацела па вокнах, адзін баб'ягорац сядзеў сабе на прызбе сваёй хаты. Бачыць, мара нейкая белая каля акна яго хаты стаіць ды касцяным пальцам у шыбіну стукоча. Баб'ягорац, доўга не думаючы, — цап яе за касцяную руку ды і кажа:

— Дзеці і жонка паснулі, перастань барабаніць!

— Ах, дык ты асмеліўся мяне за рукі чапаць! — узлавалася Пошасць. — Ці ты не ведаеш, хто я?! — ускрыкнула яна.

— Адкуль жа мне ведаць, жанчынка, — атрупянеў са страху баб'ягорац ды задам да дзвярэй сваёй хаты пачаў падавацца.

— Ну, дык ведай: я — сама Пошасць! — выкрыкнула яна ды так дзіка зарагатала, што ў баб'ягорца ад жаху аж мову адняло.

— Чаго затросся? — накінулася на яго Пошасць. — Пакуль я цябе не ўмару, ты мне яшчэ патрэбны для іншага. Бач, я ўжо зусім прыстала, пехатою па свеце бегаючы. Бяры мяне на свае плечы ды насі па свеце. Толькі не абмінай ніводнага сяла ці горада. Калі пастараешся, дык пажывеш яшчэ крышку.

Сказала яна так баб'ягорцу ды на плечы яму ўзабралася.

Паправіў той жудасную ношу на плячах і адчувае, што яна не толькі лёгкая, але зусім, бы тое паветра, вагі не мае. Падумаў ён сабе: «Вядома, Пошасць ж яна», ды павалокся да бліжэйшага сяла.

У тым сяле якраз мужчыны пад яравое поле аралі, жанкі ў гародахварыва садзілі, а дзеткі-малалеткі на вуліцы, каля хат сваіх,

забаўляліся. Убачыла гэта Пошасць, скрыганула са злосці зубамі, махнула сваёй белай плахтаю, што ахутвала яе касцістае цела. Пайшоў ад плахты смяротны павеў, і ад яго пачалі мерці мужчыны, жанчыны і дзеці там, дзе хто ў тую пару знаходзіўся. Як прайшоў баб'ягорац з Пошасцю па тым сяле, адны пустыя сцены хат засталіся.

Паброў баб'ягорац адтуль да другой вёскі. А там святкавалі, спевы ды весялосць на кожным твары. Але як толькі ён затрымаўся пасярод вёскі, а Пошасць узмахнула сваёй плахтаю, спынілася адразу музыка, змоўклі песні, боль пакарэжыў людскія твары. Куды ні глянь — вуліцы ды панадворкі трупы ўсцілаюць.

Наглядзеўся баб'ягорац на гэтую жудасць, абамлелі ў яго рукі ды ногі і сэрца крывёй аблілося ад жаласці да людзей. Прысеў ён на прыдарожны камень і цяжка ўздыхнуў, а Пошасць яму на тое:

— Што, жыццё табе надакучыла?!

Воляй-няволяй падняўся ён ды пасунуўся куды вочы глядзяць. Але ўсё так меркаваў, каб па лясах, пустэчах ды багнах хадзіць, дзе меней людзей сустракаецца. Заўважыла яго хітрыкі Пошасць ды кажа:

— Ты глядзі, каб я цябе мёртвым на якой-небудзь пустэчы не пакінула!

І давялося баб'ягорцу насіць Мару па вёсках ды гарадах. Насіў ён яе, насіў, доўга ці коратка, ажно і ў свой родны край прыблукаў. Бачыць, за рэчкаю на пагорку яго родная вёска стаіць. Усплылі ў яго перад вачыма родныя дзеткі-малалеткі, старыя бацька ды маці і любая сэрцу жонка. Зашчымела ягонае сэрца ад болю, а Пошасць тым часам падганяе:

— Чаго стаў? Ці ж табе даражэй жыцццё тваіх родных, чым сваё ўласнае?

Выбраў тады баб'ягорац месца ў Нарве найглыбейшае ды ў раку пайшоў. Ішоў і з кожным крокам усё глыбей у ваду акунаўся. Моцнамоцна ўхапіў ён за касцістыя ногі Пошасць ды цалкам пад ваду пайшоў. Але Пошасць, як паветра, усплыла над вадою. Баб'ягорац жа так і застаўся на дне віру.

Перапужалася Пошасць такой настойлівасці баб'ягорца, які свайго жыцця не пашкадаваў, каб толькі ўратаваць ад смерці родных дзяцей, бацьку, маці, жонку ды сяло. Пабегла яна спачатку ў Белавежскую пушчу. Паблукала па ёй некалькі дзён, а потым у іншыя краі падалася.

Так вось і выратаваў баб'ягорац ад смерці не толькі сваю сям'ю, радню ды вёску, але і ўсё наваколле.

*Зорка. 1976. № 44, с. 4—5.*

## Каваль і аднавокае Ліха

У аднаго каваля былі тры сыны: адзін — шавец, другі — кравец, а трэці, як і бацька, каваль. Дажывалі яны ўжо свой век, а ніколі не бачылі Ліха. Вось і вырашылі яны пахадзіць па свеце, пашукаць ды даведацца, што гэта за Ліха.

Шмат людзей спаткалі яны па дарозе. З кім не загаворацць, у кожнага свая бяда. Адзін кажа: «Бяда, хлеба нямашака», другі — «Кароўку задавілі ваўкі», трэці — «Мядзведзь выдраў пчолкі». А кавальчукі глядзяць, слухаюць ды дзівяцца, чаго гэта людцы гаруюць ды бядуюць. У іх сям'і ўсё дужа добра вялося, і за ўсё сваё жыццё не бачылі яны ніякага гора.

Аднойчы ішлі каля лесу, а на іх напалі разбойнікі. Бяда! Як гэта ад іх абараніцца? Але неяк-такі адбіліся, хоць і ім трохі дасталася.

Пайшлі браты далей па дарозе, а там звярнулі зусім у лес. Хадзілі яны па лесе, хадзілі, аж глядзь — стаіць вялікая хата, а ля дзвярэй ляжыць дужа вялікі камень. Яны ў хату — а там нікога няма. Паглядзелі ў печ — аж там пячэцца цэлая авечка; а пад лаўкаю і пад сталом ходзяць яшчэ тры авечкі.

Дасталі з печы пячыстую, ды і давай есці. А тут уваходзіць у дзверы нейкі дужа ж вялікі чалавек з адным вокам. Убачыўшы іх,аднавокі боўдзіла кажа:

— Добра ж, пачакайце, я вярнуся і паабедаю вамі.

Сказаў ён гэта, выйшаў з хаты і заваліў каменем дзверы, а сам пайшоў кудысьці. А гэта было Ліха.

Бедныя браты і есці перасталі, стаяць пасярод хаты ды гаруюць:

— Во, дзе Гора! Чаго нас пагнала нядобрая сіла з дому? Што тут рабіць? Як гэта адсюль выбрацца!

Паспрабавалі яны адчыніць дзверы, ды не змаглі: дужа вялікі камень, каб яго маці прапала! Паспрабавалі вылезці ў вокны, дык дужа тыя малыя, не пралезці. А, Ліха матары, мабыць, прыходзіцца прападаць!

Тут чуюць — ідзе той мужык, што заваліў каменем дзверы, аднавокае Ліха, і кажа ім:

— Во, якое шчасце, што вас трое — будзе чым закусіць! Хто ты? — пытаецца яно ў аднаго.

— Я — шавец.

— А, у мяне боты шчэ цэлыя — не трэба мне шаўца! Сказаў, ды схапаіў шаўца за ногі і ў гарачую печ усадзіў яго.

Пячэцца той небарака ў печы, а гэтыя два стаяць ды трасуцца, як асіны.

— А ты хто?— пытаецца аднавокае Ліха ў другога.

— Я — кравец.

— Не трэба ж і ты мне!

Сказаў — да і таго ў печ. Пякуцца ўжо двое, застаўся трэці.

— А ты ж хто? — пытаецца Ліха ў трэцяга.

— Я — каваль.

— А ці добры ж ты каваль, — пытаецца ў яго аднавокае Ліха. — Ці не ўставіў бы ты мне адно вока?

А каваль быў дужа хітры мужык.

— А чаму не? Калі трэба, дык устаўлю. Толькі ты прынясі мне вяровак і жалезны штых, бо мне трэба звязаць цябе, каб можна было ўставіць вока, а то ты не будзеш стаяць спакойна.

Пайшло некуды аднавокае Ліха, прынесла вяровак і жалезны штых. Каваль узяў ды і звязаў Ліха вяроўкамі і кажа яму:

— Страпяніся!

Ліха страпянулася, ды так, што і вяроўкі яго не ўтрымалі. Каваль нанова прывязаў Ліха. На гэты раз як яно ні трапяталася, не змагло развязацца. Моцна каваль звязаў яго.

Тады каваль узяў жалезны штых ды нагрэў яго ў печы да чырвонага колеру. Выняўшы з цяпла гарачы штых, каваль і кажа Ліху:

— Ну, глядзі ж, стой ціха, а я табе ўстаўлю другое вока.

Да і сунуў штых у відушчае вока…

— А бра.., — як рванецца Ліха, як закрычыць, — а што ж ты гэта зрабіў, трасца тваёй матары? Навошта ж ты выкалаў мне відушчае вока! Стой жа, вырадак, не выйдзеш жа ты адсюль.

Да і пачало мацаць і лавіць каваля па хаце. А каваль чуць жыў забіўся ў куточак, ды й сядзіць моўчыкам. Ліха мацала, мацала па хаце, лавіла, лавіла, ды не злавіла каваля, а толькі абмацала сваіх авечак; яны былі пад сталом і пад лаўкай. Тады Ліха села на парог ды і кажа:

— Ну, нікуды ж ты не дзенешся: праз дзверы будзеш выходзіць, тут я цябе і схаплю.

Каваль вылез тады ціхенька з куточку, злавіў адну авечку да кідзель сляпому Ліху на калені. Ліха памацала — зразумела, што гэта авечка, узяло ды і выкінула яе за дзверы. Каваль і другую авечку кінуў на калені Ліху; Ліха і гэту авечку выкінула за дзверы. Тады каваль узяў, вывярнуў кажух, надзеў яго да і бабух на калені Ліху; Ліха думала, што гэта ўжэ трэцяя авечка, узяло ды замест авечкі выкінула каваля за дзверы.

— А дзякуй жа ж табе, Ліха, што ты вызваліла мяне, — закрычаў каваль здалёку.

— А, ліха ж тваёй матары і бацьку твайму, калі гэта я цябе выкінуў!.. Ну, злодзей, маеш шчасце, не жыў бы ты болей! Глядзі ж, будзеш ты ісці ў лесе ля калоды, не ўздумай узяць там маю сякеру — залатое лязо, срэбны абушок, што ўткнута ў калодзе!

— Трасца табе ў бок, хвароба ў жывот, ды не сякерка! Выхвараеш ты, пакуль я не вазьму яе! Абы толькі знайшоў!

Ідзе каваль па лесе, аж бачыць: ляжыць вялізная калода, а ў калодзе ўткнута сякера: залатое лязо, срэбны абушок. Каваль хоп за тапарышча, аж рука і прыстала да тапарышча. Ён і так, і сяк рваўся, рваўся — нічога: ніяк не адарве рукі. Ажно тут чуе — бяжыць сляпое Ліха. Ён рвецца зноў, ніяк, а тут ужо і Ліха блізка.

— Вось жа ж ты цяпер не збяжыш ад мяне! — крычыць Ліха.

Што тут рабіць? Намацаў каваль у сябе на поясе нож, дастаў яго хутчэй ды чырах! Адрэзаў сабе руку ды бегчы, што ёсць моцы. Выратаваўся, ды яшчэ рад быў, што толькі рукой адкупіўся.

Пасля ж таго годзе ўжо і Ліха шукаць, бо ўжо бачыў, якое яно.

*Шейн-2, с. 151—154.*

### Яраш і цешча-чараўніца

Жыў у вёсцы хлопец адзін. Звалі яго (як людзі кажуць) Яраш. Добры ён быў хлопец, працавіты, што тут гаварыць. А людзі казалі: «Ох, і пашанцуе яго жонцы будучай, добры муж будзе».

З самага дзяцінства Яраш быў з бацькам у полі, з маці ў хаце, дапамагаў ім. Жылі яны бедна, ды час ішоў, юнак вырас, зрабіўся вельмі прыгожым дзецюком. Знайшоў ён сабе прыгажуню. Пакахалі яны адзін аднаго. А праз некаторы час і пажаніцца вырашылі.

Але не ўзлюбіла цешча свайго зяця будучага з-за беднасці яго, усяляк спрабавала перашкодзіць шлюбу дачкі с Ярашам. Дзеці ж, шчыра кахаючы адно аднаго, пайшлі супраць бацькоў.

І вось аднойчы быццам вядзьмедзь у лесе іздох, ці што? Бо вельмі ж цешча зяця раптам палюбіла. Сыночкам называць пачала. Мабыць задумала нешта ліхое. Так яно і здарылася.

Казалі людзі, што мела зносіны яна з чорнай, Нячыстай Сілай.

Было гэта напярэдадні Купалля. Кажа дзеўчына Ярашу: «Любы мой, я на лужок збегаю, вяночкі табе і сабе саўю, а ты пакуль дома мяне пачакай». Яраш згадзіўся, і дзеўчына пабегла.

Раптам аднекуль маці яе ў хату заходзіць.

— Сыночак мой, — так ласкава загаварыла яна, — а што ж ты робіш тут зусім адзін?

— Дачку вашу чакаю, — адказаў той.

— То ж дзе яна падзелася?

— На лужок пабегла, вяночкі сплясці хоча, бо вечарам на Купалле збіраемся.

— Што ж, дзеткі мае, пойдзеце, вы ж яшчэ зусім маладыя, гуляць вам хочацца.

Крыху памаўчала, быццам аб нечым разважала ды і кажа:

— Можа квасу вып’еш?

— Нядрэнна было б выпіць, — адказаў Яраш.

— Ну тады ж пачакай, я хуценька.

Сама выйшла з хаты. Праз хвілін колькі вяртаецца і прыносіць кубачак квасу.

— Любая цешча, то які ж гэта квас? — пытаецца Яраш.

— Ліпавы, — адказала старая.

Ліпавы ён быў ці не, ніхто не ведае. Толькі Яраш глынуў, адразу кудысці знік, толькі кубак аб падлогу бразнуся.

А ў гэты ж час трава і кветкі прыгожыя на лузе, дзе Ярашава каханая разам з іншымі дзяўчынамі вяночкі пляла, — усё на міг зчарнела. Перапалоханая дзяўчына прыбегла дамоў. Кінулася сюды-туды — няма Яраша.

— Мамка, мамачка! — скрозь слёзы закрычала яна. — Штосьці дрэннае адбылося, дзе мой Яраш? Дзе ж ён, мамачка?

Маці маўчала. І зусім не таму, што не знала што адказаць, а таму, што мова ў яе аднялася. Людзі кажуць, што яна моцна сама спалоха-

лася, здагадалася, што бяды нарабіла. Бог яе пакараў, бо нельга супрацьстаяць маладым — грэх вялікі.

А як убачыла дзяўчына гліняны кубачак разбіты на падлозе, то аб усім здагадалася, бо не раз папярэджвалі яе, каб абараняла свайго каханага ад маці сваёй. Ды дзе ж там, не верыла. Думала, што паклёпы ўсё. Языкі людскія злыя: усё, што хочаш, наплятуць.

Не вытрымала дзяўчына гэтага гора вялікага. Бегла яна праз вёсачку, праз той лужок, дзе кветкі рвала да возера. А як прыбегла, то не доўга думала: кінулася ў ваду ды і ўтапілася.

Маці ж не змагла ўтрымаць яе, бо сама паварушыцца не магла. Яе ногі прыраслі да зямлі, пераўтварыліся ў карэнне. Тулава — у ствол, а рукі і галава — у крону. У дрэва ператварылася, у ліпу. Людзі кажуць, што і муж яе ў ліпу ператварыўся, бо дапамагаў ёй у чорнай справе. Хто ведае, можа гэта і ёсць яны, муж і жонка, якія перашкаджалі сваім дзецям у шлюбе, бо ў вёсцы растуць дзве ліпы, вялізныя-вялізныя, адна каля адной, і ніхто не ведае, колькі ім гадоў і скуль яны ўзяліся.

Яшчэ казалі, што раніцою, калі скончылася купальскае гулянне ля вогнішча, і моладзь вярталася дамоў, на возеры бачылі дзіва-дзіўнае. Быццам нейкі Дух сядзеў на камяні і плакаў. Плакаў ён так жаласліва, што ўсім сумна рабілася, дзяўчаты многія нават плакалі. Напэўна, гэта і быў той самы Яраш, які галасіў па сваёй каханай. Усе вочы праплакаў, ды слязьмі бядзе не дапаможаш.

Трава на том лузе, дзе дзяўчына вяночкі пляла, у ноч на Купалле чарнее на нейкае імгненне, але гэтага, на вялікі жаль, не кожны бачыць. З гэтай з'явы ўтварылася шчэ назва той мясціны «Чорны лужок».

І назва вёскі ідзе з таго часу — Ярашава.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 05/04.*

## Асілак і Домелька

Жыў на свеце асілак. Ён быў такі моцны, што каменне лёгка варочаў, дрэвы з карэннем вырываў. Але быў ён ветлівы, шчыры з людзьмі.

Кахаў асілак дзяўчыну адну, ласкава называў яе Домелька мая. Дзяўчына прыгожая была. Ніводнай такой прыгажуні не было па ўсёй акрузе. І яна кахала свайго асілка. Каханне іх было такое, што ўсе вакол зайздросцілі. Шмат дзяўчат заляцаліся да хлопца-асілка, слёзы па ім лілі, а ён кахаў толькі сваю Домельку.

І да Домелькі, дзяўчыны-прыгажуні, не раз сватацца прыходзілі, а яна нікога і бачыць не жадала.

Раззлаваліся сваты, бацькі сыноў, якім яна адмовіла, на Домельку і яе каханага. Сталі дапамогі ў чорных сіл прасіць і праклялі маладых. Звярнуліся за дапамогай да чараўнікоў. Тыя ператварылі асілка ў вялізную гару. «Хай асілак усё сваё жыццё, як пастух, на адным месцы стаіць». А дзяўчыну ператварылі ў рэчку.

Гару людзі назвалі Пастухом, а рэчку Домелькай. Так і стаіць непарушна асілак і глядзіць на сваю каханую Домельку.

Потым пачалі будаваць новыя вёскі каля гары і за ракой. Тую вёску, што каля гары стаіць, назвалі Пастухом, а што за ракой назвалі, Задомляй.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 5, МС — 200/05.*

## Балдук і Балдучыха

Сярод лесу, дзе цяпер азёры Балдук і Балдучыха, стаяла раней вёска. Жылі ў ёй працавітыя людзі. Але пасля таго, як у вёсцы з'явіўся злы вядзьмар, жыццё ў вёсцы разладзілася. Заразіў ён людзей зайздрасцю, сквапнасцю. Дзеці перасталі паважаць бацькоў, бацькі апекавацца дзецьмі.

Быў сярод людзей мудры чалавек — вяшчун, які ўмеў прадказваць будучыню. Двойчы ратаваў ён вёску: раз ад голаду і раз ад пошасці. А мог ён зрабіць гэта толькі тройчы. І стаў ён гатаваць чарадзейнае зелле, каб выратаваць вёску і яе жыхароў ад чараў ведзьмара.

Даведаўся пра гэта вядзьмар, прыйшоў і кажа:

— Дарэмна стараешся, людзі сапсаваліся канчаткова. Хоць ты і ведаеш сакрэт чароўнага зелля, але не знойдзеш людзей, якія пагодзяцца ахвяраваць сабой дзеля іншых. Я нашлю на вёску бяду і калі хоць дзесятая частка тваіх суседзяў праявіць клопат пра іншых, то я адступлюся, у вёсцы запануе дабрыня. А калі не, то не жыць людзям на гэтым месцы.

Цудадзейнае зелле паказала, што выратаваць людзей ад бяды з дапамогай чароўнай вады змогуць сяляне Балдук і Балдучыха.

Купальскай ноччу Балдук і Балдучыха пайшлі ў лясную глухамань за чарадзейнай вадой. Калі вярнуліся ў вёску, то ўзняўся вецер, пачаў ламаць дрэвы, зрываць стрэхі з хат, стаў лупіць Пярун, а з неба хлынула вада. Людзі ад страху павыскоквалі з хат, ратавалі кожны сам сябе, ні пра дзяцей, ні пра хворых ніхто не падумаў.

Тады Балдучыха і Балдук вылілі частку вады са збаночка, і навальніца адразу супакоілася. А людзі ператварыліся ў буслоў і пачалі разлятацца ў розныя бакі. Як толькі дакраналіся да зямлі, зноў ператвараліся ў людзей.

Балдук і Балдучыха стаялі, трымаючыся за рукі, а потым ператварыліся ў азёры. Як яны трымаліся за рукі, то зараз азёры Балдук і Балдучыха звязаны між сабой рукой-пратокай. Рэшткі чарадзейнай вады са збаночка распырскаліся па наваколлю і па сённяшні дзень сцякаюць у азёры дзесяткамі крыніц.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 126/06.*

## Як пастух зрабіў каханую прыгажуняй

Жылі ў вёсцы двое маладых людзей: ён і яна, пастух і пастушка. Пастух Мацак быў высокі, чарнявы, магутнага целаскладу, адным сло-

вам, прыгожы асілак. А пастушка Багдана была добрая, лагодная, працавітая, але вось тварам не выйшла, нейкая рабаватая. Хлопец і дзяўчына разам пасвілі суседнія чароды кароў, сябравалі ды і пакахалі яны адзін аднаго.

Збіраліся яны ажаніцца, ды бацькам Мацака не падабалася Багдана. Рабая нейкая. Ды што ты зробіш з маладымі! Сэрцам не загадаеш і не прымусіш разлучыцца.

Задумаў Мацак зрабіць так, каб твар у яго каханкі змяніўся, стаў прыгожым, а калі не прыгожым, то хоць прывабным, каб бацькі не пярэчылі яго жаніцьбе. Падвучылі яго старыя людзі, што для гэтага трэба злавіць самога Гаспадара-вужа, забіць яго і зварыць. Потым астудзіць і даць дзяўчыне з'есці. Чакаў хлопец да Узвіжання. Днём у лес ісці пабаяўся, бо людзі маглі адлучыць яго ад сваёй вёскі за забойства Гаспадара-вужа, а пайшоў пасля заходу сонца.

Што ён там бачыў у лесе ў гэты жахлівы дзень, што выцярпеў, ніхто і да гэтага часу не ведае, але Гаспадара-вужа забіў і прынёс дамоў. Сапраўды вуж быў вельмі вялікі і незвычайнай таўшчыні. Зрабіў з ім пастух тое, чаму яго вучылі. Астудзіў і даў каханай з'есці міску свайго варыва. Тая і не здагадалася, што там было, а ўсё ела і хваліла суджанага за добра звараную ежу.

Прайшоў дзень, другі, трэці, а Багдана заставалася ўсё той жа рабаватай дзяўчынай. І вось нарэшце пасля трох дзён твар яе перамяніўся, і яна стала самай прыгожай дзяўчынай у вёсцы.

Ажаніліся Мацак з Багданай і сталі жыць у згодзе і міры. Не адзін дзесятак гадоў пражылі яны разам. Выгадавалі шасцярых дзяцей, унукі ўжо вялікія выраслі, і ў гаспадарцы ўсё добра ішло, бо абодва працавітыя былі.

Усё ішло сваёй чаргой. Жыццё да скону кацілася, старасць надышла. Аднойчы вечарам старыя пачалі ўспамінаць сваю далёкую маладосць, згадваць тое, як пасябравалі, як пакахаліся. І тут Мацак вырашыў расказаць сваёй жонцы ўсё, як было на самой справе. Пасля таго, як ён гэта расказаў, Багдану пачало моцна ванітаваць. Так працягвалася трое сутак. Баба Багдана амаль не ўставала з ложка. І калі прайшло роўна тры дні і тры ночы, старая памерла.

Калі бабу Багдану пахавалі, то на другі дзень на яе магіле ўбачылі вялізнага вужа, які пагрозліва сыкаў, але ўцякаць з магілы не збіраўся. Мацак не дазволіў вяскоўцам яго забіваць, бо зразумеў, што гэта лёс ягонай жонкі.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 1, спр. МС — 02/04.*

### Прокша і Ждана

У вёсцы Агатава жылі хлопец Прокша і дзяўчына Ждана, якія з самага дзяцінства сябравалі. Жылі па-суседску, раслі разам. Яны думалі, што заўсёды будуць разам, але бацькі хлопца былі супраць

таго, каб ён ажаніўся са Жданай. Яны хацелі знайсці свайму сыну багатую нявесту.

Аднойчы Прокша і Ждана даведаліся пра тое, што бацькі Прокшы знайшлі яму багатую і прыгожую нявесту і што заўтра да яе збіраюцца пасылаць сватоў.

Трэба было нешта рабіць, і тады Прокша і Ждана вырашылі «саграшыць». Яны думалі, што пасля гэтага прыдуць, пакаюцца бацькам, і тыя ўжо змірацца і не будуць пасылаць сватоў да другой дзяўчыны. Але калі яны прыйшлі да бацькоў Прокшы і пакаяліся перад імі, то тыя яшчэ больш раззлаваліся і зусім забаранілі хлопцу бачыцца са сваёй каханай дзяўчынай.

Пасля гэтага Прокша і Ждана амаль не бачылі адзін аднаго. Бацькі ж хлопца паслалі сватоў да багатай нявесты. Тыя аб усім дамовіліся і быў прызначаны дзень вяселля.

А тут бедная Ждана даведалася, што яна цяжарная. Ад безвыходнасці дзяўчына вырашыла скончыць жыццё самагубствам. Але перад гэтым яна вырашыла схадзіць да чараўніцы, каб тая ёй паваражыла.

Чараўніца нагадала Ждане, што яе каханы будзе добра жыць са сваёй новай нявестай, а потым прапанавала дзяўчыне адпомсціць ім: «Чаму яны будуць жыць добра, а ты хочаш накласці на сябе рукі?» Пасля гэтых слоў чараўніцы дзяўчына пагадзілася на помсту.

Чараўніца папярэдзіла Ждану, што калі яна пагодзіцца і чараўніца зробіць закляцце, то назад ужо дарогі не будзе. Калі дзяўчына захоча гэта ўсё спыніць, ёй прыйдзецца паплаціцца сваім жыццём. Дзяўчына пагадзілася з гэтай умовай.

Чараўніца навяла закляцце на дарогу, па якой маладыя пасля вяселля ў маладой будуць ехаць дадому. Іх воз перавернецца і яны заб'юцца.

Ждана вельмі кахала свайго хлопца. У той дзень, калі павінна было ехаць вяселле, дзяўчына не вытрымала і пабегла да чараўніцы. Кінулася перад ёю на калені і пачала прасіць яе спыніць чараўніцтва. Чараўніца адказала, што спыніць яго можа толькі сама дзяўчына, аддаўшы за любага сваё жыццё. Дзяўчына пагадзілася з гэтай умовай. І тады чараўніца зачаравала дзяўчыну і ператварыла яе ў быка, наказаўшы ёй, што яна павінна перабегчы дарогу ў зачараваным месцы перад возам з маладымі.

Шумнае вяселле з дружкамі і дружынай імчала па дарозе. Нечакана ў адным месцы дарогу перад возам з маладымі перабег бык. Дружына гыркнула на яго, маўляў, куды яго нясе, і вяселле паляцела далей.

Бык прабег яшчэ крыху і мёртвы ўпаў на абочыне дарогі.

А Прокша з маладой жонкай без прыгод даехаў да дому. Жыў доўга і ў згодзе са сваёй жонкай, меў дзяцей, унукаў...

*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС — 184/06.*

## Галубка

Вёска Качор стаіць на абрывістым беразе возера. Калісьці на яе месцы была высокая гара, тут рос ядловец. Аднойчы сюды трапіў малады паляўнічы. Паляванне было дрэнным, хлопец стаміўся. А калі стаў аглядаць наваколле, стома знікла. Вакол быў прыгожы краявід: на поўнач віднеліся пагоркі, невялікі паўвостраў уразаўся ў возера. Там жылі рыбакі, бо было бачна, што на жэрдках сушыліся сеткі.

Прылёг паляўнічы на цёплую зямлю, лук і стрэлы паклаў побач і задрамаў. Прачнуўся, азірнуўся: няма лука і стрэл. Хто мог імі завалодаць? Тут да яго данеслася вуркатанне галубоў. Узняў галаву і бачыць: дзве галубкі стаяць на самым высокім месцы гары, дзюбамі паказваюць у бок возера. А потым адбыўся цуд! Скідваюць апярэнне і ператвараюцца ў дзяўчат. Але раптам адна з дзяўчат паляцела ў ваду, бо гара раскалолася на дзве часткі.

Тут не стрымаўся хлопец. Не распрануўшыся, кінуўся ў ваду, каб ратаваць дзяўчыну. Ён падхапіў яе на рукі і прынёс на пагорак, а там нікога няма. Другая дзяўчына зноў ператварылася ў галубку і паляцела.

Выратаваная дзяўчына дрыжала ад холаду і ад страху, што голая перад незнаёмцам. Хлопец расклаў вогнішча, даў апрануць сваю куртку. Паступова разгаварыліся. Дзяўчына сказала, што мачыха-чарадзейка, якая жыве на хутары, яе і сястру ператварыла ў галубоў і выгнала з хаты. А сёння ім захацелася пакупацца: скінулі крылы, дзюбы і пайшлі да вады. Што цяпер рабіць? Вяртацца да злой мачыхі?

— Ні ў якім разе! — сказаў хлопец. — У мяне таксама няма жытла. Спачатку пабудуем будан, а потым пабачым.

Потым хлопец пабудаваў хату і кузню, а дзяўчына стала яго жонкай. Малады каваль падкоўваў коней, рабіў плугі.

Часта маладыя выходзілі вечарам на бераг, стаялі абняўшыся ды ўспаміналі выпадак, які звёў іх разам і зрабіў шчаслівымі.

— Вунь глядзіце, як галубкі мілуюцца, наш каваль і яго гаспадыня Галубка! — казалі людзі.

З таго часу той бераг возера ўсе сталі называць Галубкай.

А другую сястру-галубку злавіў у сетку хлопец з бліжэйшай ад возера Нарачы вёскі. І назвалі потым сваё паселішча Галубенькі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 101/06.*

## Дзянніца і Куваль ратуюць закаханых

Жыў у вёсцы Падгай малады каваль па мянушцы Дабрыня. І вельмі ж добры майстар быў; чуткі аб яго майстэрстве далёка разнесліся, з усяго наваколля да яго прыязджалі людзі.

Сям’я ў маладога каваля была вялікая: бацька, маці, яшчэ пяцёра сясцёр і братоў. Трэба было ўсіх пракарміць, гаспадарка вялікая таксама была.

Даляцелі чуткі аб майстэрстве каваля і да баярына, які жыў непадалёку. А баярын быў злы, усе яго баяліся, ды ўпарты такі, што ні скажа, зрабі і ўсё. Прыехаў неяк баярын да Дабрыні ў кузню ды і кажа: «Выкуй мне дзесяць прутоў, ды добрых-добрых, я іх дам сваім слугам лупцаваць імі тых, хто мне пярэчыць ці не падпарадкоўваецца».

Каваль выслухаў баярына, ды адмовіўся: яго бацькі таксама сяляне ды ўсе вакол сяляне, не будзе ж ён для таго пруты каваць, ды яшчэ і добрыя, каб яго аднавяскоўцаў ды добрых людзей нявечылі. Баярын у гневе зароў, потым аб нечым падумаў і, не сказаўшы больш ні слова, выйшаў з кузні. Каваль жа падумаў, што баярын да яго болей не будзе звяртацца.

Але праз некалькі дзён прыязджаюць у вёску панскія служкі, хапаюць кавалёву сястру ды вядуць на баярскі двор.

Дзень няма дзеўкі, два няма. Сабраўся Дабрыня ды паехаў паглядзець, дзе ж яго сястра. Прыязджае на баярскі двор ды бачыць: стаіць дзяўчына пасярод двара, прывязаная да слупа. Раззлаваўся малец ды да баярына.

Тут наляцелі служкі, схапілі яго. Выходзіць баярын і кажа: «Заставайся працаваць на мяне, у маёй кузні, а не згодзішся, застанецца твая сястра прывязанай да слупа, пакуль з голаду не памрэ». Што ж рабіць кавалю, застаўся ён у пана, але пруты каваць не пагадзіўся. Цяпер усе ездзілі да каваля на панскі двор, увесь прыбытак пан сабе забіраў.

Неяк у адным сяле кірмаш быў, Дабрыня папрасіўся паехаць на яго са сваімі вырабамі. Баярын трохі пабурчэў, але згадзіўся. Каваль прыехаў на кірмаш, расклаўся; пачалі падыходзіць да яго, купляць, тут падыходзіць купец, відаць, багаты, з дачкою сваёю. Дачка прыгожая, статная. Каваль яе ўпадабаў, і яна на яго заглядзелася.

А купец распытвае каваля: адкуль ён, хваліць яго, што добры майстар, і прапаноўвае, каб да яго ехаў працаваць. Дабрыня расказаў, адкуль ён і што з радасцю працаваў бы на купца, ды баярын не дазволіць. Купец, відаць, упарты быў, сказаў, што хутка прыедзе да ягонага баярына вырашаць справу.

Не прайшло і тыдня, як сапраўды прыязджае купец з дачкою да баярына, каб забраць сабе ў майстры каваля. Баярын запрасіў купца да сабе, а дачка тым часам пайшла шукаць каваля.

Сустрэліся яны, і Дабрыня адразу прызнаўся, што вельмі пакахаў яе яшчэ з таго часу, як убачыў на кірмашы. Дзяўчына таксама прызналася, што любы ёй хлопец.

А тым часам купец з баярынам частуюцца, дамаўляюцца па справе. А ўжо вечарэе, і баярын прапанаваў купцу з дачкою застацца. Купец пагадзіўся, і дачка яго была не супраць: ёй жа вельмі хацелася сустрэцца з кавалём. Калі баярын з купцом захмялелі і паснулі, дачка ціхенька ўцякла з пакояў ды пабегла да Дабрыні.

Цэлую ночку маладзёны гулялі непадалёку, каля рэчкі. Хутка ўжо віднець пачне, а закаханыя не могуць налюбавацца адзін на аднаго, сядзяць каля рэчкі.

Служкі баярына і купца ўбачылі, што дзяўчыны няма, пабудзілі бацьку яе і баярына. Кінуліся тыя з дворняй шукаць маладых.

Чуе Дабрыня, нешта корпаецца навокал, тут і галасы ўжо чутны. Баярын грозіцца, што заб'е каваля, а купец — што і Дабрыню, і дачку-здрадніцу, якая з нейкім кавалём цешыцца.

Дабрыня супакойвае сваю каханую, а сам просіць Куваля, абаронцу ўсіх кавалёў, каб той дапамог; дзяўчына просіць, моліць Дзянніцу, каб ранак не пачынаўся. А ўжо днець пачынае…

І тут ноч становіцца, яшчэ цямнейшая, чым была. І нейкі волат з прутом жалезным з цемры выйшаў ды сцябае баярына і купца, а тыя наўцёкі. А з п'яну ды жаху не разгледзіўшы дарогі, у раку пападалі і патанулі. Служкі ж іхнія разбягаліся.

Усё багацце баярскае засталося Дабрыне. Ён ажаніўся са сваёй каханай.

Кажуць, гэта Дзянніца, Багіня ранку, ды Куваль ім дапамаглі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 160/06.*

### Пярун і Гардзіслава

Закахаўся Пярун у прыгожую простую сялянскую дзяўчыну Гардзіславу, якая жыла ў вёсцы Ялова. Вырашыў авалодаць ёй і ў выглядзе звычайнага чалавека з'явіўся ў вёсцы, дзе яна жыла.

Пасяліўся ў хаце аднаго селяніна і пачаў кожны дзень прыходзіць пад вокны дзяўчыны. Але Гардзіслава і блізка бачыць яго не жадала. На гулянках моладзі заўсёды ад яго ўцякала. Яна ж не ведала, што гэта Бог і што ён можа пакараць не толькі яе, але і ўсіх аднавяскоўцаў, калі не па яго будзе.

Доўга так Пярун хадзіў за дзяўчынай, і пачалі людзі заўважаць, што нешта з ім нядобрае робіцца: на вачах пачаў старэць, сівець, ды і злосным нейкім зрабіўся, загаварваць з ім людзі баяліся. І недзе праз пару месяцаў зусім ён ператварыўся ў нейкага старога. І аднойчы ў такім вось выглядзе зноў пайшоў ён да Гардзіславы, апошні раз хацеў з ёй па-добраму паразмаўляць. А дзяўчына яго нават і не пазнала, а як пазнала, то смяяцца пачала прама ў вочы.

Другі мужык даўно развярнуўся бы ды пайшоў і думаць забыў бы пра яе, а ён не, і ўсё на сваім стаіць: угаворвае, а дзяўчыне што аб сценку гарохам, толькі смяецца. Ну, Пярун не вытрымаў і паабяцаў, мол, пашкадуеш ты, дзеўка, аб усім, а тая зноў пасмяялася.

Праз пару дзён вялікая хмара зацягнула неба над вёскай. А нехта бачыў, што перад хатай, дзе жыў хлопец, стаяла нейкая павозка, як залатая, і запрэжаны ў яе былі нейкія незвычайныя коні. Потым з хаты выйшаў хлопец, апрануты ў нейкае незвычайнае адзенне. Толькі ён сеў у свой вазок, як узвіхурыліся коні, узляцелі адразу на неба.

І ў гэты момант ударыў моцны гром, неба разарвалася на дзве часткі, маланкі ўдарылі ў зямлю. Усе вяскоўцы былі так уражаны гэтым дзівам, што не заўважылі, што вёска пачала гарэць з двух бакоў. Калі ж людзі ўбачылі пажар, то патушыць ужо не маглі. А пасля ўсе ўбачылі на небе выяву хлопца, які пасміхаўся.

Стрымаў Пярун сваё слова. І ўспомніла Гардзіслава тады словы хлопца.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС — 127/06.*

### Дый і Вітагосць

Кажуць старыя людзі, што заўсёды лес каля вёскі Зелянькі багаты на дары быў. Шмат там ягад, грыбоў, арэхаў было, дрэвы магутныя раслі. Чаму ж гэты лес, які быў такі багаты, зараз так сабе, звычайны. І казалі людзі, што нейкі лясны гаспадар Дый жыве ў гэтым лесе.

Жыў у вёсцы каля леса некалі мужчына, Вітагосць звалі. Добры чалавек быў, хату паставіў, жонку, дзяцей прыдбаў, усё як у людзей. Быў ён паляўнічым. Здабыча, казаў дзед, заўсёды ў яго была розная. Казалі, быў у добрых зносінах ён з гаспадаром лесу — Дыем.

Але аднойчы няшчасце сталася з Вітагосцем і сям’ёй яго.

Пайшла жонка яго з малымі ў лес. Невядома адкуль, кажуць, бура наляцела. То ўжо як там было, не вядома, але не вярнуліся яны з лесу. Хадзіў Вітагосць два тыдні ў лес, шукаў, усе сцежкі-дарожкі абхадзіў, але нікога не знайшоў.

Тады, кажуць, і пачаў ён клясці Дыя, праклінаў яго за жонку і дзяцей. А пасля сабраў свае пажыткі і знік некуды.

Пакрыўдзіўся Дый на Вітагосця і скупы на дары стаў. Можа і так. То ўжо не нам судзіць.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 20/05.*

### Як Жыцень правучыў Няждана

Жыў у вёсцы Рудня селянін па імені Няждан, ды такі труцень быў: жонка працуе, дзеці працуюць, а ён ляжыць у цяньку — яму хоць бы што.

Позна садзіў, позна прыбіраў ураджай, усё рабіў абы з рук збыць. Позняй восенню засеяў поле жытам. Ды ўсё вясёлы такі: зараз будзе адпачываць. А ад чаго яму адпачываць, не ўвярэдзіўся ж так моцна. Жонка просіць Няждана, каб прынёс дроў у печ, а ён кажа, што стаміўся. Жонка і так і сяк, а яму хоць бы што. Яна ўзлавалася, пачала на яго сварыцца, крычыць, што ён лайдак, труцень і ёй такі муж не патрэбны, забрала дзяцей ды да маткі пайшла.

А што матка, у ёй нічога няма есці самой. А тут яшчэ дачка з цэлым вывадкам дзяцей. А мужык тым часам з голаду памірае, у хаце холадна. Вырашыў Няждан ісці прасіць жонку, каб тая назад вярну-

лася. Жонка паслухалася, што ж ёй заставалася рабіць. Толькі з адной умовай, каб мужык кінуў гультанічаць, а дапамагаў ёй.

Хутка настала вясна, жыта ўзышло ва ўсіх, а ў мужыка не ўзышло, ён ні разу за зіму не паставіў загароджу, каб снег затрымаўся на палетках і жыта не мерзла.

Жыцень — бацька жыта і жытняга коласу — вырашыў пажартаваць з мужыком і навучыць яго, як трэба даглядаць палетак. Пастурова жыта і ў мужыка ўзышло.

Лета выдалася добрае, спякотнае, з дожджыкамі. Жыта ва ўсіх добрае стаяла, як сцяна. Мужык таксама задаволены ходзіць і кажа ўсім:

— Вы дурні, вясну, лета клапаціліся, даглядалі і што? Я нічога не рабіў, а ў мяне жыта такое ж самае, як і ў вас.

Пра гэта даведаўся Жыцень, раззлаваўся вельмі. На раніцу ўсё жыта ляжала на зямлі ў мужыка, як посцілка. Мужык, канешне ж, не ведаў, яму суседзі расказалі, смяяліся над ім. Жонка плакала, бо што ж зімой рабіць без мукі, без жыта? Чым дзяцей карміць? Як жыць далей?

Мужык паспрабаваў зжаць, дык і салому да канца не вывез. Жыцень зноў узлаваўся. Палеткі чыстыя ва ўсіх, толькі ў мужыка паласа белая ад саломы. На раніцу глядзіць мужык у засек, а ён паўпусты. Мужык прысеў, не ведае, што ж жонцы сказаць.

Прыйшоў Няждан у хату, расказаў усё, пачаў каяцца, што болей не будзе лайдачыць. Жонка плача ды кажа, што Жыцень хоча яго гультая правучыць, гэта ён і жыта паклаў улетку і з засекаў яго прыбраў. Жыта — гэта жыццё, яго трэба даглядаць, шанаваць. Што з таго, што ты каешся, бо ўсё роўна мы зімой з голаду памром.

Мужык усё зразумеў, пагадзіўся з жонкай. А Жыцень за ўсім гэтым назіраў.

Праз два месяцы жыта скончылася. Што ж цяпер ім есці? Адпраўляе жонка мужыка па хатах, каб ішоў прасіць мукі. А ніхто лайдаку і не даў нічога.

Вярнуўся Няждан з пустой торбай. Зайшоў у стопку. Сеў каля засека, плача, успомніў пра Жыценя і просіць, каб той прабачыў яго, што болей ён не будзе гультаіць, а будзе добра даглядаць палетак.

На раніцу ў засеках з’явілася жыта.

З таго часу Няждан пачаў шчыра працаваць і пасля некалькіх гадоў пачалося вадзіцца ў яго і лішняе жыта.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 4. спр. МС — 157/06.*

### Залатая гара

Даўным-даўно, калі на тэрыторыі Беларусі былі вялікія абшары лесу, топкія балоты, прыгожыя азёры, жылі нашых продкі, ствараліся маленькія і вялікія вёскі.

Аднойчы з поўдня прыйшоў з добра ўзброенай дружынай на нашы землі чужы князь. Пачаў князь рабаваць мясцовых жыхароў, спальваць

сёлы, знішчаць дзяцей і жанчын, а мужчын браць у рабства. Нарабаваў князь многа дабра і вырашыў пабудаваць на нашых землях сабе замак.

На пабудову замка патрабавалася шмат рабочай сілы і матэрыялу. Але спачатку трэба было выбраць месца. Знайшлі высокую гару, а каб замак быў бачны з усіх бакоў, князь загадаў ачысціць усю гару ад лесу і абкапаць яе, зрабіўшы вялікі роў, а ў роў напусціць вады з ляснога возера, якое знаходзілася недалёка.

Амаль цэлы год працавалі людзі. За гэты год шмат хто памёр. Памерлых не закапвалі як людзей, а аддавалі трупы сабакам. Людзі шмат нацярпеліся ад князя і вырашылі адпомсціць яму. Паўстанне супраць князя рыхтавалася доўга. Збіраліся ўсе, хто застаўся жывы. Рабілі сабе зброю: лукі, стрэлы, мячы.

Усё было гатова. Паўстанцы выбралі самую цёмную ноч і вырашылі напасць. Яны прыгледзелі месца, якое менш ахоўвалася, і пераплылі праз роў. Паўстанцаў было значна больш, чым дружыны, і яны перамаглі. Людзі ўварваліся ў пакой да князя, схапілі яго, звязалі і кінулі ў цямніцу.

Калі развіднела, князя вывелі ў двор замка і пачаўся суд. Князю адсеклі спачатку адну руку, але ён не вымавіў ні слова, як быццам гэтая рука была не яго. Вочы ў князя сталі як люстэркі. Яго злосны від жахнуў усіх. Затым яму адсеклі і другую руку. Вочы князя наліліся крывёй, пачалі расці клыкі, сам ён пачаў ператварацца ў злобнага птаха, які, здавалася, гатовы разарваць усіх.

Адзін малады хлопец не спалохаўся, падбег і адсек галаву князю. Галава пакацілася па зямлі, але цела не звалілася, а пачало выпырскваць кроў на людзей. На каго пападала кроў, той як звар’яцелы пачынаў забіваць сваіх. Пачалася бойка паміж паўстанцамі. Але адзін дзяцюк заўважыў, што галава кіруе гэтым жахлівым крывавым целам князя. Ён падскочыў і рассек галаву мячом. Раптам цела князя звалілася на зямлю. Бойка паміж паўстанцамі спынілася, кожны стаў самім сабой і ўсе супакоіліся.

Замак спалілі з усім дабром князя, а роў высушылі. А значна пазней, калі гара зноў парасла лесам, людзі на той гары, дзе быў княжацкі замак пачалі знаходзіць каштоўныя камяні. І гару тую празвалі Залатой.

*ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС — 05/03.*

### Хвалімір і Прокша

Пасярод лясоў стаяла невялікая вёска Малажын. Людзі там жылі бедна, многа працавалі і кожны дзень наракалі на свой лёс.

І вось аднойчы з’явіўся ў гэтай вёсцы незвычайны стары. Ён быў незвычайны тым, што меў шэсць пальцаў на руках і нагах, насіў з сабой доўгі кій, але асабліва незвычайным быў у яго твар. Калі пільна прыглядзецца да яго, то кожны бачыў самога сябе — як адбітак у люстэрку.

Зайшоў гэты стары да адной сям'і. Гаспадар хаты адразу насупіўся, бачачы перад сабой такога незвычайнага чалавека, але трошкі паразмаўляўшы з ім, зразумеў, што гэта добры чалавек. Старац стаў пытацца, чым і як жыве вёска? Гаспадар, якога звалі Хвалімір, пачаў расказваць пра жыццё тутэйшых сялян, што жывуць бедна яны і адзіны сродак жыцця — праца на зямлі.

Стары застаўся ў Хваліміра нанач. Раніцой Хвалімір прачнуўся, выйшаў на двор і ўбачыў, што стары збіраецца сыходзіць. Стары падышоў да Хваліміра і сказаў:

— Дзякуй табе вялікі, што не прагнаў мяне з хаты і даў нанач прытулак. Я хачу аддзячыць табе.

Ён стукнуў сваім кіем па зямлі, і няведама адкуль з'явілася горка золата. Стары запытаў:

— Ці хопіць гэтага золата?

Хвалімір адказаў:

— Досыць.

Стары павярнуўся і пайшоў.

Чутка пра гэтага чалавека і яго ўзнагароду разнеслася па ўсёй вёсцы. Вечарам стары зайшоў да другой сям'і, гаспадаром якой быў Прокша. Прокша быў вельмі скупым чалавекам і не любіў, каб да яго хто-небудзь у хату заходзіў. Але, пачуўшы пра гэтага чалавека, пусціў яго на начлег.

Уранні Прокша выйшаў на двор і ўбачыў, што стары ўжо збіраецца сыходзіць. Стары падышоў да Прокшы і сказаў, што хоча аддзячыць яму. Ён стукнуў сваім кіем па зямлі, і на гэтым месцы з'явілася кучка золата. Стары запытаў:

— Ці хопіць гэтага золата?

Прокша адразу ж сказаў:

— Не.

Стары стукнуў другі раз кіем — кучка стала ў два раза большай. Але Прокша сказаў, што і гэтага яму мала. Тады стары стукнуў трэці раз, і ў золаце апынулася ўся вёска, акрамя Хвалімiравай хаты.

Выйшаў Хвалімір на двор і анямеў, бачачы такое. З гора ён заплакаў. Зжаліўся над ім старац. Стукнуў сваім кіем, і ўсё золата паднялося на неба.

І цяпер ноччу мы бачым гэтае золата, якое блішчыць зоркамі. Але нават неба не вытрымлівае яго, і яно раз-пораз падае.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 105/06.*

### Паляўнічы і Лясун

Аднойчы дзяўчына з вёскі Лошніца, не спытаўшы ні бацьку, ні маці, пайшла ў лес гуляць ды знікла. Прайшло з таго часу тры гады.

У той жа Лошніцы жыў смелы паляўнічы. Кожны дзень хадзіў ён з сабакам на паляванне. Аднойчы, калі ён ішоў па лесе, сабака яго

залаяў. Глянуў у яго бок паляўнічы і бачыць, што на пні нейкі мужык сядзіць.

Паляўнічы паглядзеў на яго і падумаў пра сябе: «Мужык быццам бы яшчэ сабою малады, а ўжо ўвесь сівы». Толькі падумаў гэтак паляўнічы, а той як быццам бы яго думкі пачуў:

— Таму-та я і сед, што Духаў лясных Дзед!

Тут паляўнічы зразумеў, што перад ім не просты мужык, а Лясун сядзіць. Паляўнічы хуценька ўзняў лук і стрэліў у Лесуна. Страла ўдарыла Лесуну ў грудзі, той застагнаў, кульнуўся цераз калоду, ды ў той жа час падхапіўся і пайшоў у глыб лесу. Следам пабег сабака, а за сабакам пайшоў і паляўнічы.

Ішоў ён, ішоў і дайшоў да гары. А каля гары хата стаяла. Зайшоў паляўнічы ў хату — а там Лясун памерлы ляжыць, а каля яго дзяўчына сядзіць ды плача.

— Дзень добры, красна дзяўчына.

А дзяўчына адказвае:

— Я і сама не ведаю, быццам зусім белага свету не бачыла.

Паляўнічы забраў дзяўчыну з сабой і павёў да вёскі. Па дарозе на дрэвах меткі пакідаў, каб знайсці пазней хату Лесуна. Калі яны прыйшлі ў вёску, паляўнічы адразу ж павёў яе да хаты, дзе тры гады таму прапала дзяўчына. Бацька і маці ў адзін голас:

— Гэта ж наша дачка.

Маці адразу ў слёзы, а дзяўчына глядзіць на іх, ды толькі вачыма лыпае: нічога зразумець не можа. А пасля стала прыходзіць паціху ў сябе. Ды і расказала, што яе Лясун у лесе схапіў ды знёс да сябе, закрываў у хаце і не даваў збегчы.

Бацькі аддалі дачку замуж за паляўнічага і надзялілі маладых усякім дабром, якое толькі мелі.

Усім вяскоўцам цікава было пабачыць жытло Лесуна. Пачалі мужыкі разам з паляўнічым шукаць тую хату, але так і не знайшлі.

*ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС — 95/06.*

### Стома і Таміла

Жыў у вёсцы Таль хлопец Стома. Ладны быў, здаровы, прыгожы, але не шанцавала яму ў каханні. Таміла, якую ён кахаў, не пажадала за яго замуж пайсці, ды яшчэ пацяшалася над хлопцам. Усім казала, што Стома труслівы хлопец, ды смяялася з яго.

Шкадуючы хлопца, людзі неяк падказалі яму, што калі ён ў Купальскую ноч пойдзе ў лес і знойдзе папараць-кветку, то разбагацее і Таміла адразу будзе яго.

Прыйшло Купалле. Ноччу Стома пайшоў у лес. Хадзіў, хадзіў ды зайшоў у такі гушчар, што прасвету не было нідзе. Чуваць толькі, што совы недзе гукочуць ды ўсялякія гады кругом сыкаюць. Спужаўся Стома, аж потам халодным абдало, вырашыў дадому вяртацца, ды дарогі не можа знайсці. Тут пачаў хлопец прасіцца і маліцца:

— Божачка-Сварожачка, асвяці мне дарогу дадому. Не трэба мне Тамілы, ды гэтай папараць-кветкі, больш ніколі не буду шукаць лёгкага хлеба!

Ды, мабыць, не было праўды ў яго малітвах, бо не адазваўся Бог Сонца, нічым не дапамог. У хлопца ад жаху калені пачалі дрыжаць. Сеў ён на пень, сядзіць, думае, як гэта з лесу жывым выйсці. Нечакана ўбачыў Стома, што блізка, кроках у трох, свеціцца нешта. Пайшоў туды, і праўда — папараць-кветка. Забыўся ён у адну хвіліну і на свой страх, і на абяцанні Богу. Ухапіў кветку і за пазуху яе. Толькі зрабіў ён гэта, як вакол усё нібы ажыло, чуе ён як дрэвы пачалі шаптацца паміж сабою:

— Глядзі ж ты, як яму пашанцавала, зараз ён самы багаты чалавек у свеце.

Стому ад пыхі аж пачало распіраць. Задраў ноздры ўверх ды ідзе па лесе, як так і трэба. А ўжо Нядобрыя Духі ўзрадаваліся, аж падскоквалі і вішчалі ад радасці, што яны авалодаюць душой хлопца.

Ішоў Стома, ішоў і раптам пачаў чуць, як скарбы з-пад зямлі пачалі зваць яго:

— Гаспадар, уладар, куды ідзеш? Забяры і нас з сабою, мы столькі чакалі цябе. Забяры!

А гэты дурань і збіраў іх ва ўсе кішэні і торбу, запазуху, у боты — ўсюды клаў, куды толькі можна было пакласці. Набраў столькі, колькі ўлезла, нават у жменях трымаў. Нарэшце вырашыў Стома дамоў ісці.

А наперадзе было балота, перабрацца праз яго з поўнымі рукамі ды з такім грузам золата было вельмі цяжка. Але не хацеў Стома кінуць хаця б лішак золата. Пайшоў цераз балота. Ішоў, ішоў, узмок ужо ад таго грузу, што цягнуў на сабе. Заўважыў нейкую цвёрдую мясціну і вырашыў адпачыць на ёй.

Дабраўся да той мясціны Стома, сеў, разглядае золата. Цешыўся ад свайго скарба, марыў, як будзе жыць бесклапотна да канца жыцця. Ды ў нейкі момант пачуў шум за спінай і мімаволі глянуў назад. Валасы ў хлопца дыбаром усталі: прама на яго з лесу неслася кодла чорных страшыдлаў. Спалохаўся Стома, падхапіўся, схапіў золата і ўцякаць, а чуе ззаду галасы шыпучыя:

— Аддай, аддай намі нажытае, аддай, усё роўна ж адбяром ды ўтопім.

Стома бег і праклінаў Тамілу, як мог. Бег і ўваліўся ў балота ды трапіў у яго, прама ў лапы, Балотніка, які і пацягнуў хлопца да сябе.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 1, спр. МС — 13/05.*

**Дзявочая гара**

Жыла ў вёсцы Дубрава вельмі прыгожая дзяўчына. Шмат хлопцаў заляцалася і сваталася да яе, але ўсім яна адказвала. І вось аднойчы пасваталіся да яе хлопцы з нашай вёскі. А дзяўчыне надакучылі

бясконцыя сватанні, і прыдумала яна для іх выпрабаванне. Сказала: «Вазьміце па вялікаму каменю-валуну, а я стану вунь на той гары, і хто першы закаціць валун да мяне, за таго замуж пайду».

Выбрала хлопцам па валуну, і пачалі яны каціць іх угору. Камяні былі вялікія і цяжкія, а гара высокая, сэрцы абодвух хлопцаў не вытрымалі і амаль на самай вяршыні гары разарваліся.

Хлапцоў пахавалі. А над дзяўчынай вяскоўцы ўчынілі суд. Народ парашыў закапаць дзяўчыну жывой на вяршыні гары. А на магілу паклалі вялікі камень, які каціў адзін з хлопцаў.

*ПАШ. Ф. 9, воп. 5, МС — 200/05.*

### Прадслаў і закаханая Змяя

Калісьці даўно сярод вялікага лесу стаяла невялікая вёска Падбярэззе. А ў лесе вакол вёскі было шмат усялякай жыўнасці: звяроў, птушак, змей.

Унадзілася Змяя прыпаўзаць у хату да аднаго гаспадара, у якога быў дарослы сын Прадслаў. Аднойчы ноччу хлопец прачнуся і адчуў, як нехта абвіў яму шыю. Ад страху Прадслаў баяўся крыкнуць, паклікаць каго. Змяя з пяшчотай абдымала яго, вілася каля яго, а раніцай знікла. Спачатку ён думаў, што гэта быў сон, але гэта паўтарылася на наступную ноч і на наступную… Потым хлопец звыкся і перастаў яе баяцца.

Праз нейкі час бацька вырашыў ажаніць сына і сасватаў дзяўчыну з суседняй вёскі.

Гуляла вяселле. Позна за поўнач Прадслава з маладой жонкай адвялі адпачываць. Нябачна праслізнула Змяя ў хату да хлопца. Знайшла хлопца і абвіла з усёй моцы. Маладая жонка ад жаху страціла мову і прытомнасць.

Раніцай, калі бацькі і сваты прыйшлі будзіць маладых, убачылі хлопца мёртвым, а шыю яго абвівала змяя, якая таксама была мёртвай.

*ПАШ. Ф. 8, воп. 2, спр. МС — 50/04.*

### Марэна і Стах

У адной вёсцы жыў хлопец Стах. Быў ён вельмі прыгожы, працавіты, але ж і ганарысты, ды такі хупавы і на ўсялякія выдумкі здольны, ад якіх у людзей аж дух сцінала. Любіў паказаць сябе так, каб усе з яго дзівіліся і гаварылі пра яго.

Жыў той хлопец з бацькамі, братамі, сястрамі ды з бабкаю-чараўніцай. Тая бабка зусім старая была, еле яшчэ крахтала. Людзі казалі, што гэта бабка навараджыла, каб такі ўнук нарадзіўся, ды яшчэ казалі, што бабка ўсё рабіла, каб Смерць ніколі ўнука яе не ўзяла. Але ж усё роўна папярэджвала, каб унучак зімою ў далёкую дарогу не выпраўляўся: узімку ёй цяжка ўнука аберагаць, бо Марэна — халодная смерць — не шкадуе нікога, марозіць людзей, і яны засыпаюць у снезе. А на Марэну чары бабкі не дзейнічалі.

Непадалёку ад вёскі стаяў векавы бор, ды так у ім дрэвы перапляліся, што ні прайсці, ні пралезці цераз гэту гушчэчу немагчыма было. Людзі абыходзілі гэты бор яшчэ і таму, што баяліся, бо казалі, быццам Марэна жыве ў ім, і хто ёй пападаецца, той памірае ад холаду і ліхаманкі.

Аднойчы зімой вясковая моладзь сабралася, пасела на сані ды паехала ў суседнюю вёску на кірмаш. І хлопец разам з усімі. Ехалі яны, Стах на гуслях іграў, спяваў, баіў нешта смешнае. Праязджаюць яны міма таго бору: усе прыціхлі. А ў тым бары і сапраўды чуваць, што вецер мацней гудзе, дрэвы неяк моцна заледзянелыя стаяць. Моладзь прыціхла, а Стах, каб паказаць сябе вельмі смелым, узяў ды крыкнуў: «Марэна, выходзь да нас, я табе на гуслях сыграю, а ты паскачаш».

Ад гэтых слоў усе аж знеякавілі. А коні рванулі, аж моладзь ледзь у санях утрымалася. Едуць яны далей лаяць хлопца, нашто ён Марэну злуе, а той толькі пасміхаецца ды жартуе.

Пагулялі на кірмашы, трохі выпілі медавухі, едуць назад. Сцямнела ўжо. Пад’язджаюць к бору, а тут моцная мяцеліца пачынаецца: вецер, снег у твар ды такі, што, здаецца, і бор хадуном ходзіць. Страшна ўсім стала, сцюжа да касцей праймае, а дадому яшчэ далёка. Нечакана коні як укопаныя сталі і толькі ржуць. Моладзь у санях дрыжыць.

А тут над борам нейкае белае воблака са снегу ўзнялося, а потым з яго жанчына ў белым убранні і валасамі доўгімі, да самых пят, з’явілася. Валасы гэтыя быццам усё неба закрылі. А белае ўбранне з доўгімі стужкамі па тварах хлопцаў і дзяўчат праляцела: тыя і вочы пачалі закрываць і засынаць. Толькі Стах узяў у рукі гуслі, саскочыў з саней, стаіць упарта, грае і крычыць, каб дзяўчаты і хлопцы не засыналі. Марэна толькі глянула на яго, так ён і застаўся стаяць на месцы і зварухнуцца не можа — прымёрз. А коні з месца зрушылі і за Марэнай пайшлі, а яна іх да сябе ў бор вядзе. Там яны ўсе: Марэна, коні, сані з моладдзю і зніклі.

Узняўся вецер, ды нейкі цёплы, сняжок мягкі па твары лашчыць, Стах закрыў вочы, але гуслі з рук не выпускае і здаецца яму, ляціць ён, плыве разам з ветрыкам. Адкрывае вочы — аж на парозе хаты сваёй стаіць. Зайшоў, а бабка яго сядзіць і варожыць нешта. Расказаў ён усё бабцы, а тая і кажа, што гэта ён ва ўсім вінаваты, не трэба жартаваць з Багіняй смерці. Хлопец выслухаў бабку і выйшаў з хаты.

Бабка за ўнукам ва двор, а там такая мяцеліца ўзнялася, што за крок нічога не бачна. Гукала, гукала старая — не адазваўся ўнук. Дачку з зяцем разбудзіла старая, расказала, што адбылося. Усе разам шукалі яны хлопца — не знайшлі.

Ранкам сабраліся бацькі ўсіх дзяўчат і хлопцаў, што не вярнуліся з кірмашу, пайшлі шукаць дзяцей сваіх па палях і лясах, ды так нікога і нічога не знайшлі.

І па сённяшні дзень кажуць, што ў тым бары ў самыя халодныя зімнія ночы чутны галасы і гукі гусляў. Потым уздымаецца нейкі быццам цёплы, не зімні вецер, між дрэў мільгаюць белыя стужкі і коні,

запрэжаныя ў сані, у якіх моладзь сядзіць. Моладзь у санях гукае Стаха, а сустрэцца ўсе разам ніяк не могуць.

А ў гэты ж час нейкі хлопец ходзіць вакол бору і на гуслях грае, грае, грае…

*ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС – 161/06.*

### Вецер і Лаза

Жыла ў адной вёсцы дзяўчына па імені Лаза. Краса-дзяўчына з вачамі-валошкамі і валасамі колеру спелага жыта. Быў у яе тонкі стан, ды такі тонкі, што, здавалася, вецер яго мог пераламіць.

Адзін раз Вецер пралятаў тым месцам, дзе жыла дзяўчына. Убачыў ён яе, і вельмі спадабалася яна яму. Вецер вырашыў забраць яе з сабою па яе згодзе. З'явіўся ён перад дзяўчынай і прапанаваў ёй быць яго жонкай.

Дзяўчына ведала, што Вецер можа быць злым і прынесці шмат гора людзям з яе вёскі, але ж і адмовіць памагатаму Стрыбога нельга. Вырашыла яна, што пагадзіцца, але пры адной умове: «Не рабі людзям шкоды».

Вецер толькі зарагатаў з тых слоў і вырашыў забраць Лазу сілаю. Але нечакана ў дзяўчыны замест ног пачалі расці карэнні. Постаць ператварылася ў легкую сцябліну кушэра жоўтага колеру.

Моцна зароў зняважаны дзяўчынаю Вецер, крутнуўся віхрам шалёным і знік.

З таго часу людзі з цудоўных лазовых галінак пачалі плясці лубкі. Вёску, дзе жыла Лаза, назвалі Палюбоўцамі ў памяць аб прыгожай дзяўчыне.

Не забыў пра прыгажуню Лазу і Вецер. Час ад часу ён наведвае вёску, вырывае дрэвы, бушуе, зрывае дахі з хат, але нічога не можа зрабіць з лазовымі кустамі.

*ПАШ. Ф. 9, воп.5, МС – 200/05.*

## Крыніцы па міфалогіі беларусаў


*Анимелле* — Анимелле Н. Быт белорусских крестьян // Этнографический сборник. — СПб., 1854. — Вып. 2.

*Беларус. міфалог.* — Беларуская міфалогія / склад. У. А. Васілевіч. — Мінск, 2001.

*Бел. эпас* — Беларускі эпас. — Мінск, 1959.

*Баршчэўскі* — Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. — Мінск : Маст. літ., 1990.

*Бобровский* — Бобровский П. Материалы для географии и статистики России : Гродненская губерния. — СПб., 1863. — Ч. 1.

*Богданович* — Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : этнографический очерк / А. Е. Богданович. — Гродно, 1895.

*Боричевский* — Боричевский И. Народные славянские рассказы / И. Боричевский. — СПб., 1844.

*Булгаковский* — Булгаковский Д. Г. Пинчуки / Д. Г. Булгаковский. — СПб., 1890.

*Бяздон. багацце* — Бяздоннае багацце : легенды, паданні, сказы / склад. А. І. Гурскі. — Мінск, 1990.

*Гадавік БНТ* — Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні. — Вільня, 1933. — Кн. 1.

*Дембовецкий* — Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии : в 3 кн. / А. С. Дембовецкий. — Кн. 1. — Могилев – на Днепре.

*Демидович* — Демидович П. П. Из области верований и сказаний белорусов / П. П. Демидович // Этнографическое обозрение. — 1896. — № 1—3.

*Добровол. Словарь* — Добровольский В. Н. Смоленский областной словарь / В. Н. Добровольский. — Смоленск, 1914.

*Добровол.-1* — Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. — СПб., 1891. — Ч. 1.

*Добровол.-2* — Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. — СПб., 1894. — Ч. 2.

*Добровол.-3* — Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. — СПб., 1894. — Ч. 3.

*Добровол.-4* — Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. — СПб., 1894. — Ч. 4.

*Древлянский* — Древлянский П. Белоруские народные поверья / П. Древлянский // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1846. — Кн. 2. — Прибавления.

Живопис. Росс. — Живописная Россия : Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт., значении : Литов. и Белорус. Полесье : репринт. воспроизведение изд. 1882 г. — Мінск, 1993.

*Зайкоўскі* — Зайкоўскі Э., Дучыц Л. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э. Зайкоўскі, Л. Дучыц. — Мінск, 2001.

*Иванов* — Иванов В. В. Приметы и поверья Витебского уезда Витебской губернии / В. В. Иванов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. — Кн. 1. — Вильна, 1910.

*Кацар* — Кацар М. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. Кацар; навук. рэд. Я. М. Сахута. — Мінск : БелЭн, 1996.

*Киркор* — Живописная Россия : Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. — Т. 3. — Ч. 2. — Белорусское Полесье. — СПб.; М., 1882.

*Коваль* — Коваль У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы : даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. — Гомель, 1995.

*Крачков.* — Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина / Ю. Ф. Крачковский. — М., 1874.

*Ластоўскі* — Ластоўскі В. Колькі слоў аб даўняй веры беларусаў / В. Ластоўскі // Наша Ніва. — 1910. — № 15—17.

*ЛіП* — Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; рэд. тома А. С. Фядосік. — Мінск : Навука і тэхніка, 1983.

*Ляцкий-1* — Ляцкий Е. А. Представления белоруса о нечистой силе / Е. А. Ляцкий // Этнографическое обозрение. — М., 1890. — Кн. 4, 7.

*Ляцкий-2* — Ляцкий Е. А. Болезнь и смерть по представлениям белорусов / Е. А. Ляцкий // Этнографическое обозрение. — М., 1892. — № 2—3.

*Максимов* — Максимов С. В. Обитель и житель : из очерков Белоруссии / С. В. Максимов // Древняя и Новая Россия. — СПб., 1876. — Т. 2.

*Минько* — Минько Л. И. Суеверия и приметы : истоки и сущность / Л. И. Минько. — Минск, 1975.

*Могилевские приметы* — Могилевские приметы // Могилевские губернские ведомости. — 1849. — № 4(5). — С. 63—65, 85—86.

*Нар. міф.* — Народная міфалогія Гомельшчыны. — Мінск, 2003.

*Неверович* — Неверович В. О праздниках, поверьях и обычаях у крестьян белорусского племени, населяющих Смоленскую губернию / В. О. Неверович // Памятная книжка Смоленской губернии на 1859. — Смоленск, 1859.

*Никифор.-1* — Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... / Н. Я. Никифоровский. — Витебск, 1897.

*Никифор.-2* — Никифоровский Н. Я. Нечистики : свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. — Вильна, 1907.

*Ніва* — Ніва (Штотыднёвая газета беларусаў Польшчы).

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 4.

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 5.

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 7.

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 8.

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 9.

*ПАШ* — Прыватны архіў А. Шамака. Ф. 10.

*Пщелко* — Пщелко А. Деревенские праздники / А. Пщелко // Витебские губернские ведомости. — 1904. — № 161.

*Родная прырода* — Родная прырода. — 1977. — № 3.

*Романов-4* — Романов Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. — Витебск, 1891. — Вып. 4.

*Романов-8* — Романов Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. — Вильна, 1912. — Вып. 8.

*Россия* — Россия : Полное географическое описание нашего отечества. — Т. 9 : Верхнее Поднепровье и Белоруссия. — СПб., 1905.

*Сержп.-1* — Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі; прадм. У. К. Касько; маст. В. Р. Мішчанка. — Мінск : Універсітэцкае, 1998.

*Сержп.-2* — Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков / А. К. Сержпутоўскі. — СПб., 1911.

*Славутинский* — Славутинский А. Этнографические очерки Гродненской губернии / А. Славутинский // Виленский вестник. — 1867. — № 119—120.

*Соболевский* — Соболевский Д. Белорусы и белоруссия / Д. Соболевский // Чырвоны шлях. — 1918. — № 9—10.

*Суеверия* — Суеверия и предрассудки в Могилевской губернии // Могилевские губернские ведомости. — 1849. — № 6—8.

*Толстая-1* — Толстая С. М. Материалы к описанию полесского купальского обряда / С. М. Толстая // Славянский и балканский фольклор. — М., 1978.

*Шаховіч* — Шаховіч М. Дэманічныя постаці і з’явы ў народным вераванні на стыку польскай і беларускай культур / М. Шаховіч // Мост праз стагоддзі : зб. навук. прац. — Беласток, 1982.

*Шейн, Бел. песни* — Шейн П. В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями / П. В. Шейн. — СПб., 1873.

*Шейн-1* — Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. — Т. 1. — Ч. 1. — СПб., 1887.

*Шейн-2* — Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. — Т. 2. — СПб., 1893.

*Шейн-3* — Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. — Т. 3. — СПб., 1902.

*Шлюбскі* — Шлюбскі А. Матэрыялы для вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны / А. Шлюбскі. — Мінск, 1927. — Ч. 1.

*Шпилевский-1* — Шпилевский П. М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках / П. М. Шпилевский // Пантеон. — СПб., 1854. — № 6.

*Шпилевский-2* — Шпилевский П. М. Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий / П. М. Шпилевский // Москвитянин. — 1853. — Т. 2. — № 5.

*Шпилевский-4* — Шпилевский П. Белоруские народные поверья / П. Шпилевский // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1846. — Кн. 4. — Прибавления.

*Эремич* — Эремич И. Очерки Белорусского Полесья / И. Эремич. — Вильна, 1868.

*Янчук* — Янчук Н. А. По Минской губернии : заметки из поездки в 1886 году / Н. А. Янчук. — М., 1889.

*Czarnowska* — Czarnowska Maryja. Zabytki mitologii słowiańskiej w zwyczajach ludu na Białej Rusi dochowywane (gub. Mogilewska) // Dziennik Wileński. — 1817. — T. VI. — № 34. — S. 396—408.

*Fed.-1* — Federowski M. Lud Białoruski na Rusi Litewskiej. — T. 1. — Kraków, 1897.

*Jeleśnka* — Jelenska E. Wies Komarowicze w powiecie Mozyrskim // Wisła. — 1891. — T. 5. — S. 503.

*Moszyński* — Moszycski K. Polesie wschodnie. — Warszawa, 1928.

*Pietkiewicz* — Pietkiewicz Czesław. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materjały etnograficzne. — Warszawa, 1938.

*Sielicki* — Sielicki Franciszek. Wierzenia na dawnej Wilejszczyźnie. — Slavia orientalis. — T. XXXV. — № 2. — 1986. — S. 195—222.

## Змест


**Прадмова** ........................................ 3

*Частка першая*
**УВОДЗІНЫ Ў МІФАЛОГІЮ БЕЛАРУСАЎ**

Глава 1. **Міфалогія — феномен нацыянальнай культуры** ................ 6
- Міфалогія ў жыцці сучаснага беларускага грамадства............... 6
- Паняцці «міф» і «міфалогія»........... 7

Глава 2. **Гістарыяграфія міфалогіі беларусаў** ....................................... 9
- Вывучэнне міфалогіі беларусаў у XIX — пачатку XX ст. .................. 9
- Вывучэнне міфалогіі ў савецкі перыяд .......................................12
- Сучасны этап даследавання міфалогіі беларусаў.....................14

Глава 3. **Крыніцы вывучэння міфалогіі беларусаў**.......................18
- Пісьмовыя крыніцы......................18
- Фальклор ....................................21
- Этнаграфічныя крыніцы ...............22
- Археалагічныя крыніцы ................23
- Мова і тапаніміка .........................24

Глава 4. **Генезіс і фарміраванне міфічных уяўленняў беларусаў**.....25
- Архаічны перыяд развіцця міфічных уяўленняў .....................26
- Старажытная міфалогія беларусаў...................................29

Глава 5. **Міфалогія беларусаў: агульная характарыстыка** .............31
- Міфалогія — першы этап развіцця культуры........................31
- Спецыфічныя рысы язычніцкай міфалогіі беларусаў.....................32
- Асаблівасці міфічнага мыслення беларусаў-язычнікаў ...................33
- Міфалогія беларусаў як сістэма тэкстаў .........................................35

Глава 6. **Касмагонія і міфічная тапаграфія** ....................37
- Паходжанне і стварэнне Сусвету .......................................37
- Асноўныя часткі Сусвету..............38
- Багонь ..........................................39
- Той Свет ......................................41
- Гэты Свет.....................................41
- Уяўленні аб міфічным часе...........43

Глава 7. **Сістэма персанажаў міфалогіі беларусаў**.......................44
- Пантэон багоў і духаў ..................44
- Чараўнікі.......................................49
- Героі ............................................50

Глава 8. **Чалавек у міфалогіі беларусаў** .......................................51
- Тры пакаленні людзей .................51
- Зямное жыццё беларуса-язычніка .......................................52
- Чалавек у зямных гаспадарствах багоў і духаў ................................54
- Лясное гаспадарства ..................54
- Балотнае гаспадарства ...............55
- Воднае гаспадарства ..................55

Глава 9. **Жывёльны і раслінны свет у міфалогіі беларусаў**............56
- Жывёлы.........................................56
- Міфалагізаваныя жывёлы ............57
- Міфічныя жывёлы ........................59

Расліны ......................................59
Міфалагізаваныя расліны ............60
Міфічныя расліны ........................61

Глава 10. **Сімволіка ў міфалогіі беларусаў** ......................................62
Віды сімволікі ..............................62
Геаметрычныя сімвалы ................63
Адлюстраванне аб'ектаў прыроды......................................64
Адлюстраванне міфічных уяўленняў ....................................67

*Частка другая*
**ТЭКСТЫ МІФАЎ І ПАДАННЯЎ**

**СУСВЕТ. БАГІ І ДУХІ**

**Стварэнне Сусвету** ........................72
Нараджэнне Белбога і Чарнабога..................................72
Як Белбог змагаўся з Чарнабогам ..............................73
*Рабіў Белбог Зямлю* ..................74
**Тры пакаленні людзей** ...................74
Волаты ........................................74
Асілкі ..........................................75
Людзі...........................................77
**Багі і Духі Багоні** .............................79
Белбог...........................................79
Пярун ...........................................81
*Жаніцьба Перуна* .......................82
Цёця............................................82
Маланне .......................................83
Сварог і Дажбог...........................84
*Дажбог даглядае Сонца* ............84
Дзянніца.......................................85
Стрыбог і вятры...........................85
Посвіст .........................................86
Ярыла...........................................87
*Гнеў Ярылы* ..............................89
Макаш ..........................................89
Аўсень ..........................................90
Лада .............................................91
Ляля і Лель ..................................91
Каляда і Шчадрэц. Пераплут .......92
Кляскун ........................................93
**Духі хаты**........................................94
Гаспадары хаты ............................94
Хатнік ..........................................94
Хатніца ........................................97
Шкадлівыя Духі хаты......................98
Пячурнік ......................................98
Кікімары ......................................99
Бай.............................................100
Валасень ....................................101
Шэшкі.........................................101
Нядобрыя Духі хаты .....................102
Злыдні........................................102
Бадзюля .....................................102
Сербай .......................................103
Меша .........................................103
**Духі гаспадарчых пабудоў** ..........103
Вісус...........................................103
Хлеўнік .......................................104
Вазіла.........................................105
Ёўнік ..........................................106
Пуннік.........................................108
Лазнік.........................................108
**Багі і Духі палёў і агародаў**..........109
Жыцень ......................................109
Талака ........................................110
Русалкі-палявіцы (жытніцы) ........................................111
Палявік .......................................112
Жалезная Баба ...........................113
**Багі і Духі Ляснога гаспадарства** 114
Купальскі Дзядок .......................114
Гаспадар лесу.............................114
Лесуны .......................................115
*Русалка і Лесавік* ....................118

Русалкі-лесавіцы ....................... 119
Пушчавік ................................... 119
Ягіня ........................................ 120
Дабрахочы ................................ 121
Гаёвы Дзед ............................... 122
Гаёўкі ....................................... 122
Зазоўка .................................... 123
Лоймы ...................................... 124

**Апраметная — Той Свет** ............... 125
Падземнае гаспадарства ........... 125
Падземныя Выраі ....................... 125
Наўе ......................................... 125
Падводнае гаспадарства ........... 125

**Багі і Духі Падземнага гаспадарства** ................................ 126
Чарнабог ................................... 126
Вялес ....................................... 126
Жыжаль .................................... 127
Ох ............................................ 128
Кладнік ..................................... 128
Зюзя ........................................ 129
Мароз ....................................... 131

**Духі Падводнага гаспадарства** ... 132
Гаспадар рыб ............................ 132
Жэўжык .................................... 133
Вадзянік .................................. 133
Русалкі-вадзяніцы .................... 136
Баламуцень .............................. 138
Азярніцы .................................. 139
Расамахі .................................. 139

**Багі і Духі Балотнага гаспадарства** ............. 140
Лазавік ..................................... 140
Кадук ....................................... 141
Тры балотныя браты ................. 141
*Балотнік* ................................ 142
*Багнік* .................................... 143
*Аржавеннік* ............................. 143
Русалкі-балотніцы .................... 143
Хапун ....................................... 144
Лознікі ..................................... 144
Паветрыкі ................................. 145

**Духі ночы** ............................... 145
Паўночнікі ................................ 145
Кумяльган ................................. 146
Стрыга ..................................... 147
Мара ........................................ 147
Начніцы ................................... 149
Касны ....................................... 150
Шатаны .................................... 150
Прахі ........................................ 151
Ератнікі ................................... 151
Клікун ...................................... 152
Чорная Баба .............................. 152

**Духі хвароб** ............................ 152
Паветрые .................................. 152
Падвей ..................................... 153
Воспа ....................................... 154
Паралікі ................................... 154
Лядашчык ................................. 155
Чума ........................................ 155
Халера ..................................... 156
Моравая Дзева .......................... 157
Пошасць ................................... 157
Паморак ................................... 157

**Багі і Духі Наўя** ...................... 158
Паляндра .................................. 158
Марэна ..................................... 158
Смерць ..................................... 158
Копша ...................................... 159
Белая Баба ................................ 159
Дзева смерці ............................ 160
Ліхаманкі (трасцы) ................... 160

**ЗЯМНОЕ ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА**

*Палешукі і палевікі* .................. 163
*Князь Бой і яго сабакі* ............. 164
*Бой і яго сыны* ........................ 164

*Тры Долі* ........ 165
*Чаму нованароджанае дзіця хадзіць не ўмее* ........ 167
*Лёс чалавечы вырашаюць Багі* ........ *167*
*Чаму мы не ведаем калі памром* ........ 168

**Багі і людзі** ........ 168
*Спрэчка Багоў* ........ *168*
*Вёска Пад'яменцы* ........ *169*
*Цётка дапамагае ўдаве* ........ *170*
*Макаш і жанчына* ........ *170*
*Кляскун жартуе з мужыком* ........ *171*
*Кляскун ратуе мужыка* ........ *171*
*Зюзя адзначае любімага гаспадара* ........ *172*
*Ох выводзіць мужыка з лесу* ... *172*
*Любмел выратоўвае маладых* ........ 173

**Гаспадары і Духі сядзібы** ........ 174
*Калі Бог стварыў Сусвет* ........ *174*
*Маладуха і Хатніца* ........ *174*
*Хатніца і Паляха* ........ *175*
*Хатнік і чараўнік* ........ *175*
*Кікімара і няверная жонка* ........ *176*
*Хлеўнік абараняе каня* ........ *177*
*Вазіла і вядзьмарка* ........ *177*
*Два агні* ........ *178*
*Палявік палохае злодзея* ........ 179

**Чалавек у Лясным гаспадарстве** ........ 179
*Дар Русалкі-лесавіцы* ........ *179*
*Лукаш і Русалка-лесавіца* ........ *180*
*Лясун і мужыкі* ........ *180*
*Прасі дазволу ў Гаёвага Дзеда* ........ *181*
*Лесавіха* ........ *181*
*Лясун і жанчына* ........ *182*
*Лясун і Міхалка* ........ *182*
*Івашынавіцкая Зазоўка* ........ 183

**Чалавек і Духі Падводнага гаспадарства** ........ 183
*Ігуменскія Русалкі* ........ *183*
*Жадаў Баламуцень ажаніцца* ... *184*

**Чалавек у Балотным гаспадарстве** ........ 185
*Лешніцкая Балотніца* ........ *185*
*Вёска Грыбы* ........ 186

**Чалавек і Духі хваробы** ........ 186
*Мужык і Халера* ........ *186*
*Пошасць і селянін* ........ *187*
*Пошасць і Паморак* ........ *187*
*Паморак і мужык* ........ *188*
*Сяляне і Паморак* ........ 188

**Жывёлы** ........ 190
Мядзведзі ........ 190
*Праклён мядзведзіцы* ........ *190*
*Мядзведзь і дзеўка* ........ 190
Ваўкі ........ 191
Ліса ........ 192
Заяц ........ 192
Чаму змеі сталі ворагамі людзей ........ 193
Змеі ........ 193
*Гаспадар-змей* ........ 193
Вужы ........ 194
*Гаспадар-вуж* ........ 194
*Вужалкі* ........ 195
Гаспадар гадзюк ........ 195
Чароўныя жывёлы ........ 196
*Кот* ........ 196
*Змей* ........ 196
*Змей і чараўнік* ........ 197

**Птушкі** ........ 198
*Гаспадар птушак* ........ *198*
*Бусел* ........ *199*
*Чорны бусел* ........ *199*
*Дзяцел* ........ *200*
*Верабей* ........ *200*
*Жаўранкі і ластаўкі* ........ *201*
*Зязюля* ........ 201

**Расліны** ........ 201
*Бяроза і асіна* ........ *201*
*Вярба, арэхавае дрэва, Божае дрэўка* ........ *202*
*Іва* ........ 202

*Дуб, бяроза і асіна* .................202
*Змеявік-трава* .........................203
*Чабрэц* ...................................203
*Зязюльчыны слёзы* .................204
*Крапіва* ..................................204
*Валошка* ................................204
Чароўныя травы .........................205
*Піралёт-трава* ........................205
*Разрыў-трава* ..........................205
*Сон-трава* ..............................206
**Крыніцы** ........................................206
*Чаму крыніца?* .........................206
*Хабішчына крыніца* ..................206
*Жывая і мёртвая вада* .............207
**Камяні** ..........................................207
*Адкуль на зямлі камяні з'явіліся* .................................207
*Боскі камень* ...........................208
*Сцёп-камень* ...........................208
*Змееў камень* .........................209

## ЧАРЫ І ЧАРАЎНІКІ

**Пярэваратні** .................................210
**Ваўкалакі** .....................................211
*Адкуль пайшлі ваўкалакі* ..........211
*Чараўніца паддзелала* .............211
*Як чалавек жыў ваўкалакам* .....212
*Ваўкалака* ..............................212
**Ваўкадлакі** ....................................213
*Сусед-ваўкадлак* .....................213
*Дзед-чараўнік* ........................214
**Чараўнікі** ......................................214
*Казанне чараўнікоў* .................214
*Злодзей і чараўнік* ...................215
*Чараўніца і жанчына* ................215
*Чараўнік-лекар* ........................216
*Чараўнік і пастух* .....................216
*Чараўніца, якая адбірала малако ў кароў* ........................217
*Хлопец і чараўніца* ..................217
*Удава-чараўніца* ......................218

## ГЕРОІ

*Гаспадар-змей і дзяўчына* .......219
*Лясун і Галавач* ........................220
*Гаспадар-вуж і Гарыслава* .......221
*Як Лесавік дзяўчыну вадзіў* .....222
*Сож і Дняпро* ...........................224
*Радзім і Лесавіха* .....................225
*Павіла ў змяіным Выраі* ...........225
*Баб'ягорац і Пошасць* .............226
*Каваль і аднавокае Ліха* ..........227
*Яраш і цешча-чараўніца* ..........230
*Асілак і Домелька* ....................231
*Балдук і Балдучыха* .................232
*Як пастух зрабіў каханую прыгажуняй* .............................232
*Прокша і Ждана* ......................233
*Галубка* ..................................235
*Дзянніца і Куваль ратуюць закаханых* ...............................235
*Пярун і Гардзіслава* .................237
*Дый і Вітагосць* .......................238
*Як Жыцень правучыў Няждана* 238
*Залатая гара* ...........................239
*Хвалімір і Прокша* ....................240
*Паляўнічы і Лясун* ....................241
*Стома і Таміла* .........................242
*Дзявочая гара* .........................243
*Прадслаў і закаханая Змяя* ......244
*Марэна і Стах* ..........................244
*Вецер і Лаза* ...........................246

**Крыніцы па міфалогіі беларусаў** ................247

*Навуковае выданне*

**Шамак** Алесь Анатольевіч

# Міфалогія беларусаў

Адказны за выпуск
С. М. Рыбарава

Рэдактары С. М. Рыбарава, Р. А. Маслоўская
Карэктар В. К. Жолтак
Графіка М. С. Рыбарава
Макет і вёрстка Ю. В. Шабан

Падпісана ў друк 12.12.2013. Фармат 60x84 1/8.
Папера афсетная.
Ул.-выд. арк. 19,2. Ум. друк. арк. 29,76. Тыраж 150 экз. Зак.

ДУА «Інстытут культуры Беларусі».
ЛИ № 02330/0131818 ад 02.08.2011.
220086, г. Мінск, вул. Каліноўскага, 12.

РУП «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
ЛП № 02330/0494120 ад 11.03.2009.
Вул. Кальварыйская, 17, 220004, г. Мінск.